# Лідскі Летапісец

*Народ, які не ведае свайго мінулага, не мае будучыні*



Краязнаўчы, гістарычна-літаратурны часопіс
Выходзіць з 1997 года

№ 3-4 (95-96) ЛІПЕНЬ - СНЕЖАНЬ 2021 г.



# Героі Беларусі






*Камандзір звяна вучэбна-баявой эскадрыллі*
*116-й ШАБ (г. Ліда)*
*маёр Андрэй Уладзіміравіч Нічыпорчык*



*Лётчык звяна вучэбна-баявой эскадрыллі*
*116-й ШАБ (г. Ліда)*
*лейтэнант Мікіта Барысавіч Куканенка*

# Лідскі Летапісец

*Народ, які не ведае свайго мінулага, не мае будучыні*



**Краязнаўчы, гістарычна-літаратурны часопіс**
**Выходзіць з 1997 года**


## У НУМАРЫ:




*Стар. 2. III фестываль памяці З. Фядэцкага.*
*Стар. 4. Фестваль лідскіх кнігі і друку.*
*Стар. 6. Прыпынена выданне “Нашага слова”.*



*Стар. 7. Кроніка Ліды.*

*Стар. 15. Аграмястэчку Дворышча - 500 гадоў.*
*Стар. 17. Лідскай авіябазе споўнілася 80 гадоў.*
*Стар 19. Да 60-годдзя 49-й ракетнай дывізіі.*



*Стар 20. "Лідчанка" адзначыла 60-годдзе .*
*Стар. 22. "Каханачцы" - 40.*
*Стар. 23. "Шалому" - 25.*

*Стар. 25. Лідскія юбіляры.*



*Стар 32. Прыход у Ракавічах.*

*Стар. 42. Новае пра цэрквы Лідчыны.*

*Стар. 52. Новае пра Тэадора Нарбута.*



*Стар. 60. Звесткі пра сялянскае жыццё, навучанне і вучняў у Ганчарскай акрузе.*



*Стар. 74. Стары дом.*

*Стар. 75. З долі і няволі. Успаміны выгнанкі.*

*Стар. 85. Красовы двор і яго суседзі.*


**На першай старонцы вокладкі: Ганчарская школа. Сучасны выгляд.** *Здымак С. Судніка.*


**Выдаецца ў адпаведнасці з п. 7.4 артыкула 13 ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ “Аб сродках масавай інфармацыі” ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З**

Выдавец:
**Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства “Пружмень”**

Рэдактар:
**Станіслаў Вацлававіч Суднік**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**231293, г. Ліда, вул. Лётная, 7 а.**
**АДРАС САЙТА:**
**http// nslowa.by**

**Наклад 150 асобнікаў**
**13 друк. аркушаў**

**Часопіс падпісаны да друку 30.12.2021 г.**

**Часопіс надрукаваны 28.06.2022 г. у Лідскай друкарні: 231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23.**

**Замова № 1410.**

ISSN 2218 – 1792



**Мы просім усіх, хто мае цікавыя матэрыялы па гісторыі Ліды і краю, дасылаць іх на адрас: 231282, Ліда-2, п/с 7, або E-mail: kajety@list.ru**


**Аўтары цалкам адказныя за гістарычную дакладнасць сваіх матэрыялаў**


pawet.net

# *Цёплыя вечары ... ды халодныя ранкі ...*







Землі, па якіх цячэ рэчка Лебяда, як і ўся Лідчына, знаходзяцца на тэрыторыі колішняга яцвяжскага племені дайнава. Дайна па-яцвяжску - песня. Таму дайнаўцаў можна назваць песенным народам. Дык і не дзіва, што на Лідчыне спяваюць: усюды, многа і прыгожа. Па законе прыроды адходзяць пакаленні, узрастаюць новыя, адходзяць і песні.

Клопат захаваць, запісаць гэтыя песні з'явіўся яшчэ ў пачатку 19-га стагоддзя. Не будзем тут, аднак, імкнуцца пераказаць гісторыю беларускага фальклоразнаўства. Засяродзімся на Лідчыне.

У 1992 годзе ў Польшчы выйшла кніга Земавіта Фядэцкага з маёнтка Лебяда Лідскага павета **"Цёплыя вечары ….. ды халодныя ранкі, czyli co spiewano w Fieliksowie"**, у якую ўвайшлі беларускія народныя песні, запісаныя пераважна ў вёсцы Феліксава Лідскага раёна ў 1942-43 гадах. Земавіт Фядэцкі хаваў рукапіс гэтых песень амаль 50 гадоў, як быццам не было нічога больш каштоўнага, што варта было б схаваць ці вазіць з сабой: і праз вайну, і праз пасляваенную разруху, і праз варшаўскі побыт, такі далёкі ад страчанай, як падавалася, навек Беларусі. За ўсім гэтым бачна вялікая любоў Земавіта Фядэцкага да малой радзімы. І радзіма адказала яму такой жа любоўю. У 2017 годзе на Лідчыне па ініцыятыве рэдактара часопіса "Лідскі летапісец" і газеты "Наша слова" Станіслава Судніка і дзяржаўнай установы "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" быў заснаваны адкрыты рэгіянальны фестываль песеннага фальклору памяці Земавіта Фядэцкага. Гэта адбылося ўсяго праз восем гадоў пасля смерці Фядэцкага, што і многім вялікім было б за гонар.

Сёлета фестваль праходзіў ужо ў трэці раз і ўжо па традыцыі пачаўся з загалоўнай песні "Цёплыя вечары..." ў выкананні жаночай фальклорнай групы з Мажэйкаўскага Дома культуры. Сёлета выступленні адбываліся на адкрытай пляцоўцы ў самым цэнтры Мажэйкава, і песні, як і некалі, разляталіся далёка па наваколлі, магчыма, дасягалі і недалёкага таго самага Феліксава.



У конкурсе бралі ўдзел 12 удзельнікаў (выканаўцаў і калектываў) з усёй Лідчыны. Майстар-клас даваў Заслужаны аматарскі калектыў "Гасцінец" з Ракава Валожынскага раёна пад кіраўніцтвам Лізаветы Пятроўскай.



Гучалі песні са зборніка Земавіта Фядэцкага, а таксама запісаныя ў розных іншых вёсках Лідскага раёна.

Доўгі час зборнік Земавіта Фядэцкага лічыўся адзіным зборнікам лідскага песеннага фальклору. Аднак у 2018 годзе падчас працы над дакументальнай аповесцю пра славуты род Іваноўскіх з Лябёдкі (сённяшняя вёска Галавічполле) лідскі пісьменнік Леанід Лаўрэш знайшоў інфармацыю пра тое, што Алена Іваноўская, сястра беларускага нацыянальнага дзеяча Вацлава Іваноўскага, выпускніца Кембрыджскага ўніверсітэта ў перыяд недзе ад 1905 да 1912 года запісала ў ваколіцах Лябёдкі вялікую колькасць беларускіх народных песняў. І недзе праз 110 гадоў пасля запісу на Лідчыне прагучалі дзве песні са зборніка "Закуй, закуй, зязюленька рана..." Алены Іваноўскай, які быў выдадзены да фестывалю пры чынным удзеле газеты “Наша слова”.

Выступленні ўдзельнікаў можна было слухаць без канца. Але конкурс ёсць конкурс, і журы, якое ўзначальваў рэдактар газеты “Наша слова” Станіслаў Суднік, было вымушана вызначаць пераможцаў.

Лаўрэатамі І ступені сталі:

1. Жаночы фальклорны гурт, філіял "Мажэйкаўскі Дом культуры";





2. Філіпава Аляксандра, Жыдзіс Данута, Кавалеўская Зінаіда ("У канцы грэблі шумяць вербы"), в. Мінойты.

Лаўрэаты ІІ ступені:

1. Кароль Іван, (песня "Ходзіць туман", са зборніка З. Фядэцкага), ам. Ваверка;

2. Сакалоў Дзмітрый ("А ў полі бяроза"), п. Першамайскі.

Лаўрэаты ІІІ ступені:

1. Парфенчык Інэса ("Сабірала дзяўчынунька" са зборніка А. Іваноўскай), ам. Бердаўка;

2. Фальклорнае аматарскае аб'яднанне "Ульяніца", філіял "Ганчарскі Дом культуры".

Усе астатнія атрымалі дыпломы ўдзельнікаў.

Трэці фестываль песеннага фальклору памяці Земавіта Фядэцкага паспяхова адбыўся. І гледзячы па тым, што акрамя носьбітаў народныя песні выконваюць і моладзь, і дзеці, можна сцвярджаць: беларуская народная песня на Лідчыне жыве і будзе жыць. Курс - на чацвёрты фестываль.



***Яраслаў Грынкевіч.***

# Хто з кнігаю дружыць, ніколі не тужыць

## *Фестываль кнігі і друку "Зоркі лідскіх небасхілаў"*

15 верасня на пляцоўцы каля Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы было шматлюдна, панавала святочная атмасфера - тут адбыўся фестываль кнігі і друку "Зоркі лідскіх небасхілаў", які з'яўляецца традыцыйным для нашага горада культурна-масавым мерапрыемствам у Дзень бібліятэк. З году ў год фестываль закліканы нагадаць аб вялікіх беларускіх асветніках і друкарах мінуўшчыны і ўшаноўваць работнікаў бібліятэк, а таксама ўсіх, хто мае дачыненне да стварэння друкаванай кнігі, іншай друкаванай прадукцыі.

У час фестывалю на пляцоўцы каля раённай бібліятэкі былі разгорнуты кніжныя выставы, забаўляльныя пляцоўкі, дзіцячая гульнявая зона, розныя майстар-класы - кожны наведвальнік змог знайсці сабе занятак па гусце. Месцам жа асноўных дзеянняў фестывалю стала імправізаваная сцэна ля ўваходу ў бібліятэку. Падцягвацца бліжэй да гэтай сцэны заклікалі людзей удзельніцы фальклорнага гурта "Талер" аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры.

Спачатку з Днём бібліятэк усіх прысутных павіншавалі галоўны спецыяліст аддзела культуры райвыканкама Наталля Вайцюкевіч і сакратар Лідскай епархіі протаіерэй Максім Цыгель.











- Без кніг жыццё чалавека абядняецца, - падкрэсліў у сваёй прамове айцец Максім. - Калі чалавек чытае добрыя кнігі, ён абнаўляе свой вобраз і вобраз Божы ў сабе.

Многае гаварылі вядоўцы імпрэзы аб бібліятэках як захавальніках духоўных, культурных і інтэлектуальных скарбаў, аб кнігах як падмурку духоўнага жыцця народа, крыніцах ведаў. "Хто з кнігаю дружыць - ніколі не тужыць", - сцвярджалі яны. Прысутным (а сярод іх было многа школьнікаў) нагадалі пра беларускіх асветнікаў









Ефрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Кліменція Смаляціча і, канешне ж, пра Францішка Скарыну.

Падзякавала раённай бібліятэцы за супрацоўніцтва і перадала ёй у дар кнігу аб журналістах Гарадзеншчыны член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу



Рэспублікі Беларусь, галоўны рэдактар "Лідскай газеты" Кацярына Серафіновіч. З гісторыяй і днём сённяшнім Лідскай друкарні азнаёміла яе спецыяліст Валянціна Нічыпар. Стаць сябрамі магазіна "Кніжны свет" заклікала прысутных яго загадчыца Галіна Станевіч. Подзвігам назваў летнюю акцыю раённай бібліятэкі "Літфэст па-лідску" з выхадамі з кнігамі ў народ, да дзяцей паэт, рэдактар газеты "Наша слова", гістарычна-літаратурнага часопіса "Лідскі летапісец", а таксама літаратурна-мастацкага альманаха "Ад лідскіх муроў" Станіслаў Суднік і прачытаў свой верш, прысвечаны друкаванай кнізе, якая і ў век інтэрнэту застанецца з намі.

Вершы на розныя тэмы - аб бібліятэцы, "Лідскай газеце", Радзіме, роднай мове, помніку Вялікаму князю Гедыміну - чыталі з імправізаванай сцэны сябры літаб'яднання "Суквецце" пры рэдакцыі "Лідскай газеты" Ірына Маркевіч, Станіслава Белагаловая, Людміла Русь, Тарэза Смольская, кіраўнік літаб'яднання Аляксандр Мацулевіч.



У завяршэнне імпрэзы аб двух новых маштабных праектах, у якіх змогуць прыняць удзел паэты Лідчыны, - моладзевым праекце "І з мышкай, і з кніжкай" і конкурсе на атрыманне літаратурнай прэміі імя Валянціна Таўлая за найлепшы патрыятычны твор - коратка расказала першы сакратар Лідскага раённага камітэта БРСМ Вольга Міхаловіч.

***Аляксей КРУПОВІЧ.***

# Прыпынены выхад газеты “Наша слова” на паперы

30 снежня 2021 года выйшаў апошні (1567-мы) нумар газеты “Наша слова”. 8 лістапада Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь ліквідаваў заснавальніка газеты - Грамадскае аб’яднанне “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” - і паводле Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі” ад 17 ліпеня 2008 г. газета вымушана была спыніць выхад.

У другі раз прыпыняецца выхад папяровай версіі “Нашага слова”. Першы раз гэта адбылося ў 1997 годзе. Тады слаўны горад Ліда ўстаў на падмогу.

24 гады з лішнім газета выходзіла ў Лідзе. Тут, у Лідскай друкарні, былі надрукаваны 1237 нумароў рознага накладу і рознага аб’ёму. Апошнім часам гэта былі 8 чорна-белых палос фармату А-3. У Лідзе (пасля некаторых трэнняў) былі створаны надзвычай спрыяльныя ўмовы для выдання газеты. Былі моманты, калі Лідская друкарня магла да паўгода друкаваць газету ў крэдыт і на ўласнай паперы.

За 24 лідскія гады газета надрукавала многія тысячы артыкулаў, падняла мноства актуальных для Беларусі тэм. Усе гэтыя гады газета стаяла на варце інтарэсаў беларускай мовы і беларускага этнасу.

Аўтарамі газеты былі выдатныя людзі краіны: акадэмікі, прафесары, дактары і кандыдаты навук, пісьменнікі, паэты, краязнаўцы і інш. У газеце мог надрукавацца любы чалавек планеты Зямля, які валодаў беларускай мовай і меў што сказаць беларусам. Праз газету прайшло многа кніг: аўтэнтычна беларускіх і перакладных, якія і да гэтага часу не з’явіліся асобнымі выданнямі. Амаль на працягу ўсяго існавання газеты публікацыі на старонках “Нашага слова” залічваліся пры абароне дысертацый.


Наша слова

З Новым 2022 годам!

Папа Рымскі заклікаў да дыялогу і міру

Таварыства беларускай мовы пакінула свой менскі офіс

1237-мы нумар “Нашага слова”, выдадзены ў Лідзе

Усё жыццё ТБМ прайшло праз газету - ад заснавання да закрыцця. Высокі нацыянальны чын аматараў беларускай мовы паўставаў са старонак “Нашага слова” кожны тыдзень.

Чытачы газеты жылі ва ўсіх кутках Беларусі. Часта “Наша слова” было адзінай газетай, якая трапляла ў самыя далёкія вёсачкі.

Ці адновіцца “Наша слова” яшчэ раз?

Рэдакцыя робіць для гэтага ўсе неабходныя захады, але атмасфера ў грамадстве яшчэ не спакойная і аднавіць газету будзе не лёгка. Таму адразу, з 5 студзеня 2022 года, пачне выходзіць электронная газета “Наша слова.*pdf*”. Гэта - не электронная версія “Нашага слова”, гэта - новая газета. Газета будзе размяшчацца на тых жа сайтах *nslowa.by, pawet.net, kamunikat.org, belkiosk.by, racyja.com.* Аператыўныя матэрыялы будуць размяшчацца ў тэлеграм-канале “Наша Слова”.

***Станіслаў Суднік.***

## Ты вернешся

Ты вернешся, я веру, "Наша слова",
Як з выраю вяртаюцца буслы.
Хоць час цяпер далёка не мядовы,
Ён рэжа душу, думкі нам і слых.

Ты вернешся, бо нельга не вяртацца
Да сваіх гоняў, вёсак, гарадоў.
Ты вернешся, каб назаўжды застацца,
Як першае каханне, як любоў.

Ты вернешся і загучыш над краем,
Як пошчак жаўрукоў у паднябессі.
Бо без цябе мы Беларусь губляем,
Бо без цябе, як Беларусь без песні.

Ты вернешся, бо мы чакаем "… слова" -
Яно заўжды павінна з намі быць,
Як Бацькаўшчына, воля, сцяг і мова,
Нам на чужыя іх не замяніць.

Ты вернешся, мы верым, "Наша слова",
Каб больш ад нас ніколі не знікаць.
Мы будзем лёгка, шчыра, адмыслова
Чытаць цябе, чытаць цябе, чытаць!

***Сяргей Чыгрын,** Слонім.*

# КРОНІКА ЛІДЫ



У ліпені медалём “За працоўныя заслугі” ўзнагароджаны: намеснік дырэктара па транспарце ААТ "Лідаспецаўтатранс" Іван Буйко, галоўны бухгалтар ААТ "Лідскі малочна-кансервавы камбінат" Святлана Івуць, кіроўца легкавога аўтамабіля ААТ "Лідахлебапрадукт" Генадзь Косый, дырэктар філіяла "Лідскі хлебазавод" ААТ "Гроднахлебпрам" Лявон Кулік і жывёлавод філіяла "Дзітва" ААТ "Лідахлебапрадукт" Вольга Шымановіч.



У ліпені-жніўні ў касцёле Узвіжання Святога Крыжа ў Лідзе (Фарны касцёл) аднаўлены гістарычны арган.

У 2020-2021 гадах у храме вёўся капітальны рамонт і рэстаўрацыя гістарычнага аргана (14/II/P) фірмы "A. A. Homan St. Jezierski w Warszawie", які быў пабудаваны ў чэрвені 1939 года. Ініцыятарам і асноўным фундатарам рэстаўрацыі аргана быў Юры Зісер - заснавальнік беларускага інтэрнэт-партала.

Працяглыя падрыхтоўчыя работы пачаліся яшчэ пры жыцці Юрыя Зісера ў 2019 годзе (адразу пасля завяршэння рамонту аргана ў Пінску), а асноўны этап работ быў пачаты ўжо праз некалькі месяцаў пасля яго смерці.




У жніўні 2021 г. у Варшаве ў выдавецтве “Poligraf,” выйшла кніга Леаніда Лаўрэша “Szept pozolklych stron. Ziemia Lidzka w zwierciadle prasy lat 1922-1939”. 338 ст.

У канцы жніўня ў польскім горадзе Цехануў адбылося першынство Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод юнакоў і дзяўчат да 15 гадоў.

У складзе зборнай каманды Рэспублікі Беларусь выступаў выхаванец СДЮШАР прафсаюзаў "Юнацтва", навучэнец Лідскага філіяла УА "Гарадзенская дзяржаўная вучэльня алімпійскага рэзерву" Эльдар Нячаеў, які стаў чэмпіёнам Еўропы ў вагавай катэгорыі 102 кг:

- 1-е месца ў рыўку - 119 кг;
- 1-е месца ў штуршку - 145 кг;
- вынік сумы дваяборства - 264 кг.






У канцы жніўня да дня беларускага пісьменства літаб’яднанне “Вясёлка” пры Капыльскай раённай бібліятэцы імя Анатоля Астрэйкі выдала літаратурны альманах “Родныя пагоркі”. Укладальнік і аўтар прадмовы - Ірына Пятровіч, рэдактар - Станіслаў Суднік. Альманах выйшаў у Лідзе пры падтрымцы газеты “Наша слова”.






17 верасня, калі ўся краіна адзначала Дзень народнага адзінства, па ініцыятыве старшыні раённага выканаўчага камітэта Сяргея Ложачніка на трасе М-6 каля павароту на аграгарадок Ваверка ўрачыста адкрылі памятны знак. Фундатарам малой архітэктурнай формы выступіла мясцовае прадпрыемства ААТ "БМТ № 19". Памятная таблічка была зроблена на заводзе ЗАТ "Каскад".

Новы аб'ект - памяць пра мірнае пагадненне 1392 года (Востраўскае пагадненне), падпісанае паміж Ягайлам і Вітаўтам у наваколлях Ліды.

У верасні 2021 года Вярхоўны суд на пазоў Міністэрства юстыцыі зліквідаваў Таварыства беларускай школы (ТБШ). Адпаведна падлегла ліквідацыі Лідская раённая арганізацыя ТБШ.

1 кастрычніка 2021 года Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь задаволіў пазоў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь аб ліквідацыі грамадскага аб'яднання "Саюз беларускіх пісьменнікаў". У Саюз беларускіх пісьменнікаў у свой час уваходзілі лідскія літаратары: Валянцін Таўлай, Ніна Тарас, Данута Бічэль, Валер Санько, Крысціна Лялько, Ірына Багдановіч, Станіслаў Суднік, Уладзімір Васько, Пятро Макарэвіч, Алесь Стадуб, Леанід Лаўрэш.

8 кастрычніка пайшоў з жыцця найстарэйшаы краязнавец Лідчыны Мікола Дзікевіч



Мікалай Мікалаевіч ДЗІКЕВІЧ нарадзіўся 20 верасня 1924 г. у в. Дзітрыкі Беліцкай гміны Лідскага павета Наваградскага ваяводства. Да 1936 г. вучыўся ў Дзітрыкаўскай чатырохкласнай школе, у 1939 г. закончыў Ганчарскую паўшэхную школу, у 1945 г. - Лідскае педвучылішча, пачаў настаўніцкую працу. Служыў у арміі (1946-1947). Закончыў Менскі інстытут фізічнай культуры (1955). 46 гадоў працаваў настаўнікам у школах Лідчыны - Цыбарскай, Дзітрыкаўскай, Папернянскай, Ганчарскай, Нёманскай, да 1993 г. З іх - 44 у Нёманскай (Сялецкай). Узнагароджаны медалямі "За доблесную працу" (1970), "За працоўную доблесць" (1981). Аўтар краязнаўчых кніг "Дзітрыкі. Згукі заснулай цывілізацыі" (200 стар.) "Сялец. Прынёманская рэчаіснасць" (294 стар.), а таксама шэрагу публікацый у перыядычным друку..



10 кастрычніка ў Лідзе асвечана капліца і месца пад будаўніцтва касцёла ў гонар святога Іосіфа і Блажэнных Сясцёр-Назарацянак Пакутніц. Удзел у мерапрыемстве прынялі вернікі, а таксама біскуп Гарадзенскай каталіцкай епархіі Аляксандр Кашкевіч, які высвянціў капліцу, крыж і месца пад будаўніцтва будучага храма.

Зараз у капліцы штодня праходзяць службы. Побач з ёй будуецца касцёл, работы вядзе ТАА "Вега".






У кастрычніку 2021 года ў Лідскай друкарні выйшла кніга Ірэны Сліўко “Выток пачынаўся ад Гаўі”. 264 ст. 100 асобнікаў.




У кастрычніку 2021 года паводле ліста намінальнага як бы заснавальніка часопіса “Лідскі летапісец” Валерыя Сліўкіна Міністэрства інфармацыі анулявала Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі часопіса.

Часопіс працягвае выхад у адпаведнасці з п. 7.4 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі” ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-3.




Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь 8 лістапада 2021 года ліквідаваў Грамадскае аб’яднанне “Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны”.

Адпаведна падлеглі ліквідацыі ўсе арганізацыі і суполкі ТБМ Лідскага раёна (Лідская раённая, Лідская гарадская, Ёдкаўская, Бердаўская і інш.)




10 лістапада на падставе пазову Міністэрства юстыцыі Вярхоўны суд пастанавіў ліквідаваць ГА БНФ "Адраджэньне". У выніку ліквідаваны таксама Лідская раённая і Лідская гарадская арганізацыі Грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне".







24 лістапада лідскім лётчыкам Андрэю Нічыпорчыку і Мікіце Куканенку пасмяротна прысвоена званне "Герой Беларусі".

Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы. Гэта найвышэйшая ўзнагарода, якая існуе ў нашай краіне, прысвойваецца за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам. Разам з адважнымі вайскоўцамі сярод уганараваных - усяго 13 чалавек.




Намаганнямі дзяржаўнай установы "Лідскі гісторыка-краязнаўчы музей" і рэдакцыі газеты "Наша слова" ў Лідзе заснавана каляндарная серыя "Скарбы Лідчыны". У гэтай серыі ў канцы лістапада выйшаў з друку першы каляндар на 2022 год. Ён прысвечаны заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі мастаку Уладзіміру Мурахверу (1931-2017).



У пачатку снежня чэмпіянат Еўропы па сучасным пяціборстве U24 прынёс зборнай Рэспублікі Беларусь золата ў міксце і срэбра ў камандным заліку ў жанчын.

Сярод спартоўцаў беларускай моладзевай зборнай выступаў лідзянін Максім Марук, выхаванец СДЮШАР № 2 г. Ліды (раней - Лідская КДЮСШ № 4). Падчас спаборніцтваў Максім, заняўшы лідарскую пазіцыю ў фехтаванні і канкуры, не саступіў яе і па выніках лазер-рана. У выніку ён заваяваў тытул чэмпіёна ў змешанай эстафеце.

10 снежня 100 гадоў з дня нараджэння адзначыла жыхарка Ліды Вольга Якаўлеўна Грышановіч.





14 снежня начальнікам Лідскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя прызначаны Андрэй Вячаслававіч Ерамейчык.



У снежні новым начальнікам лідскага РАУС прызначаны палкоўнік Сяргей Сыцевіч.




У снежні ў Гародні выйшаў з друку Гарадзенскі настольны перакідны краязнаўчы каляндар на 2022 год. Каляндар з'явіўся, дзякуючы прафесару і пісьменніку з Гародні Аляксею Пяткевічу, а таксама пісьменніку і рэдактару газеты "Наша слова" з Ліды Станіславу Судніку.



У снежні ў Гарадзенскім абласным інстытуце развіцця адукацыі адбылася цырымонія ўручэння Прэмій імя Героя Беларусі Мітрапаліта Філарэта, першага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

Лідскі раённы навучальна-метадычны кабінет кіравання адукацыі ганараваны першай прэміяй у намінацыі "Лепшая сістэма духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання".

Трэцяя прэмія ў намінацыі "Лепшая інавацыйная распрацоўка года" - у педагога СШ № 11, краязнаўцы Наталлі Анашкевіч.

У снежні 2021 года выйшла кніга Кацярыны Янчэўскай “Белае шматкроп’е”.









У снежні ў Лідскай ЦРБ пасля капрамонту адкрылі хірургічны корпус.

Удзел у цырымоніі адкрыцця прынялі дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч, старшыня Гарадзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік, міністр аховы здароўя Дмітрый Піневіч, старшыня Лідскага райвыканкама Сяргей Ложачнік.

27 снежня ў фінале беларускага «Х-фактару» перамогу атрымаў 28-гадовы **Андрэй Панісаў** з Бердаўкі Лідскага раёна, якога рыхтавала Вольга Бузава.



# "Гуляй, спявай, Дварышчанскі край!": *аграмястэчку Дворышча - 500 гадоў*



У сілах кожнага чалавека зрабіць сваю малую радзіму прыгажэйшай і лепшай за іншыя. Яркі прыклад таму - аграмястэчка Дворышча. Тут жывуць людзі, якія на справе даказваюць сэнс знаёмай усім прыказкі: дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. 18 ліпеня 2021 года дварышчанцы - і цяперашнія, і тыя, хто па якіх-небудзь прычынах адгэтуль з'ехаў - адзначылі юбілей роднага краю.

На імправізаванай сцэне ля Дома культуры разгарнулася канцэртная праграма лепшых калектываў Лідскага раёна, паралельна працавалі дзіцячыя пляцоўкі, праводзіліся майстар-класы па рамёствах, ішоў святочны гандаль.

На свяце ўшаноўвалі ганаровых жыхароў, ветэранаў вайны і працы. Медалём, падзячным лістом і грашовым падарункам ганаравалі Галіну Рубель, якая 40 гадоў прапрацавала загадчыцай Дварышчанскга ФАПа. Дзякуючы яе ўмелым рукам і моцным нервам на свет з'явілася нямала малянят.



- Ці ведаеце вы, што праца сельскай акушэркі - кругласутачная? - усміхаецца Галіна Іванаўна і па яе твары разбягаюцца добрыя маршчынкі. - Па дапамогу аднавяскоўцы звярталіся да мяне і днём, і ўначы. Памятаю, у 7 раніцы каля маёй хаты спыніўся рэйсавы аўтобус, які ішоў у Геранёны. З яго выбеглі людзі і пачалі клікаць на дапамогу. Аказалася, што ў дарозе ў жанчыны пачаліся роды. Я заскочыла ў аўтобус, і мы панесліся на ФАП. Апынуўшыся на кушэтцы, парадзіха слёзна маліла дастаць з яе кішэні аплатку і пакласці ёй у рот. І хоць радавы працэс быў імклівым, прыйшлося прычасціць жанчыну і ўжо толькі тады прымаць дзіцятка.

Мабыць, у кожнага, хто хоць неяк знаёмы з аграмястэчкам Дворышча, узнікаюць асацыяцыі з конямі. І гэта, вядома, нездарма. Аддзяленне коннага спорту Лідскай комплекснай ДЮСШ № 4 - адмысловы гонар дварышчанцаў. У дзень святкавання 500-годдзя аграмястэчка тут быў дадзены старт адкрытаму першынству





Гарадзенскай вобласці па конным спорце.

- На баявое поле выйшлі 29 спартовых пар з Ліды, Шчучына, Гародні і Берасця, каб у сумленнай барацьбе вызначыць наймацнейшых у трох катэгорыях "Аматарская язда", "Дзеці 2004 г.н. і маладзей", "Маладыя коні", - распавядае галоўны суддзя спаборніцтваў Наталля Савіцкая. - Выхаванцы Лідскай ДЮСШ паказалі выдатныя вынікі, перамогшы амаль на ўсіх маршрутах.



Конным спортам лідзянка Каця Зуевіч займаецца ўжо тры гады. Кажа, доўга не магла вызначыцца ў сваіх захапленнях: спрабавала сябе і ў барацьбе, і ў плаванні, пакуль аднойчы мама не прывезла яе ў Дворышча. Апынуўшыся першы раз у сядле, дзяўчынка адчула велізарны стрэс. Але калі эмоцыі ўлегліся, зразумела: коні - гэта яе жарсць. На занятці ў Дворышча Каця прыязджае 5 дзён у тыдзень. І ў зімовыя халады, і ў летнюю спёку, на аўтобусе ці на машыне - усё роўна. Галоўнае, апынуцца там, дзе сэрцу міла.



- Мой любімчык - конь Норык. Люблю яго даглядаць - мыць, расчэсваць, размаўляць. Але выступаць сёння я буду ў пары з іншым канём - Флейтай. Нажаль, гэта залежыць не ад мяне, а ад трэнера - зыходзячы з досведу вершніка, менавіта ён выбірае нам чацвераногага напарніка. Дарэчы, на спаборніцтвах выступаю ўпершыню. Хвалююся!

Каларытнасць святу надавала выстава старадаўніх побытавых і працоўных прылад. Такую экспазіцыю прама ля сваёй хаты арганізаваў былы дырэктар эксперыментальнай базы "Ніва" Віктар Кудла - за 20 гадоў, якія ён прысвяціў калекцыянаванню, сабралася больш за сотню экспанатаў. Дзе яшчэ сучаснае пакаленне ўбачыць малатарню з конным прывадам, драўляныя вагі і нават слайсер для тытуню?

- З дапамогай садніка - даставалі з печы хлеб, а з дапамогай вілак - чыгункі. Вось рубель - яго выкарыстоўвалі для мыцця бялізны, - Віктар Іванавіч знаёміць моладзь з "вымерлымі" прадметамі побыту. - Для чаго патрэбныя "кошыкі", думаю, вы ведаеце, яны яшчэ не зусім састарэлі. Іх у мяне таксама цэлая калекцыя - кожны выкананы розным майстрам і ў рознай тэхніцы пляцення. А зараз пытанне "на засыпку": для чаго служыў гэты прадмет? - трымаючы ў руках драўляную "педальку", Віктар Кудла ўмела заінтрыгаваў наведвальнікаў сваёй выставы...



Сваё 500-годдзе аграмястэчка Дворышча адзначыла весела і з размахам. Было шмат музыкі і душэўных песень, слоў падзякі і пажаданняў, успамінаў і планаў на будучыню... Хочацца толькі дадаць: і яшчэ 500 гадоў будзе жыць!

***Наталля Валканоўская,***
***lidanews.***

# Гісторыя, якой ганарацца лідскія авіятары

## *Лідскай авіябазе споўнілася 80 гадоў*



Гісторыя 116-й гвардзейскай Радамскай Чырванасцяжнай штурмавой авіяцыйнай базы пачынаецца з часоў Вялікай Айчыннай вайны, калі ў перыяд з 12 па 17 верасня 1941 года на аэрадромах Раменское і Клін Маскоўскай вобласці быў сфармаваны 563-ці знішчальны авіяцыйны полк (ЗАП) дзвюхэскадрыльнага складу.

Вайну авіяполк прайшоў у складзе розных авіяцыйных злучэнняў СССР на Бранскім, Варонежскім, Сталінградскім, Данскім і Беларускім франтах.

За перыяд Вялікай Айчыннай вайны 563-ці ЗАП правёў 519 паветраных баёў, у тым ліку 194 групавых, было збіта 316 самалётаў праціўніка, полк страціў 62 лётчыкаў і 105 самалётаў. За мужнасць і геравічнасць, паспяховае выкананне заданняў камандавання на фронце і ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі, высокую дысцыпліну загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага СССР № 266 ад 3 верасня 1943 года 563-ці ЗАП пераўтвораны ў 116-ты гвардзейскі знішчальны авіяцыйны полк.

За ўзорнае выкананне заданняў камандавання ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, праяўленыя доблесць і гераізм Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета ад 8 кастрычніка 1943 года 116-ты авіяполк узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. А за паспяховае выкананне задач падчас правядзення ў студзені 1945 года Вісла-Одэрскай наступальнай аперацыі, адвагу і гераізм загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага СССР палку прысвоена ганаровае найменне "Радамскі".

У 1982 годзе 116-ы гв. ЗАП перавучыўся на новы баявы авіяцыйны комплекс Су-24. Баявая моц палка павялічылася больш, чым ў тры разы.

У сувязі з падпісаннем дамовы аб скарачэнні звычайных узбраенняў у Цэнтральнай Еўропе і працэсам перабудовы ў СССР, у ліпені - жніўні 1989 года полк быў перабазаваны з аэрадрома Бранд на аэрадром Рось у Беларусі. У Беларускую вайсковую акругу 116 гв. ЗАП прыбыў у складзе трох эскадрылляў па 10 Су-24М у кожнай. Полк увайшоў у склад 1-й гвардзейскай бамбавальнай дывізіі.

У ліпені 1992 года полк увайшоў у склад ВПС Рэспублікі Беларусь, асабовы склад прыняў прысягу на вернасць Рэспубліцы Беларусь.

Падчас рэформы ВПС Рэспублікі Беларусь 116-ты гв. ЗАП быў перафармаваны ў 116-ю гвардзейскую бамбавальную авіяцыйную базу з захаваннем усіх узнагарод і ганаровых найменняў.

У ліпені 1994 у склад авіябазы была ўключана выведвальная эскадрылля на самалётах Су-24МР, з расфармаванага 10-га АРАП са Шчучына. З прыбыццём эскадрыллі Су-24МР, 2-я бамбавальная эскадрылля была расфармавана, і гэта эскадрылля стала 2-й АЭ 116-й гв. авіябазы, а сама база была пераназвана ў 116-ю гвардзейскую бамбавальна-разведвальную авіяцыйную базу.

У ліпені 2010 года 116-я гв. БРАБ была расфармавана. У Лідзе шляхам аб'яднання 116-й БРАБ і 206-й штурмавой авіябазы была сфармавана 116-я гвардзейская штурмавая авіяцыйная база з захаваннем узнагарод і ганаровых найменняў 116-й БРАБ. Да наяўных у Лідзе Су-25 з Расіі пераляцела частка Су-24М.

У лютым 2012 года Міністэрства абароны Беларусі абвясціла пра рашэнне зняць усе самалёты Су-24М/МР з узбраення ВПС і СПА Беларусі. Выдаткі на падтрыманне лётнай гатоўнасці Су-24 былі прызнаны неапраўдана вялікімі. Такім чынам у наш час 116-я гвардзейская штурмавая авіяцыйная база эксплуатуе толькі штурмавікі Су-25 і Су-25УБ.

На дадзены момант на ўзбраенні 116-й авіябазы стаяць тры тыпы самалётаў: штурмавікі Су-25 (Су-25УБ), навучальна-баявыя самалёты Як-130 і навучальна-трэніровачныя самалёты Л-39. Авіятары шануюць гераічныя старонкі гісторыі, паважаюць традыцыі, якія склаліся ў часці.

Сёння 116-я гвардзейская Радамская Чырвонасцяжная штурмавая авіяцыйная база - згуртаваны калектыў аднадумцаў, гатовых у любы момант стаць на абарону Радзімы.

* * *

12 верасня 116-й штурмавой авіяцыйнай базе споўнілася 80 гадоў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў асабовы склад і ветэранаў 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай Радамскай Чырванасцяжнай базы з 80-годдзем з дня ўтварэння часткі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што баявая гісторыя







***Шэўроны падчас дыслакацыі ў Росі Ваўкавыскага раёна***

авіябазы пачалася ў лёсавызначальным 1941 годзе.

*"У час Вялікай Айчыннай вайны, змагаючыся з ворагам на Ленінградскім, Бранскім, Варонежскім, Сталінградскім і Цэнтральным франтах, лётчыкі 563-га знішчальнага палка, правапераемнікам якога з'яўляецца 116-я штурмавая авіяцыйная база, пакрылі сябе нягаснучай славай. Асаблівая старонка летапісу часткі - удзел авіяпалка ў вызваленні Беларусі"*, - гаворыцца ў віншаванні.







***Шэўрон падчас дыслакацыі ў Лідзе***

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вайскоўцы 116-й авіябазы, наследнікі гэтых пераможных традыцый, праяўляючы бяспрыкладную мужнасць і высокі прафесіяналізм, сёння сумленна і самаахвярна выконваюць свой воінскі абавязак. *"Асабовы склад авіябазы паспяхова асвойвае найноўшую тэхніку, пастаянна ўдасканальвае лётнае майстэрства, на належным узроўні вырашае пастаўленыя задачы па ўмацаванні абараназдольнасці краіны і забеспячэнні мірнага жыцця грамадзян"*, - адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт падзякаваў асабоваму складу часткі за службу і пажадаў вайскоўцам моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту, мірнага неба і новых дасягненняў у ратнай працы на карысць Беларусі.

У сувязі з правядзеннем сумеснага стратэгічнага вучэння Узброеных сіл Беларусі і Расіі "Захад-2021" правядзенне святочных мерапрыемстваў было перанесена на больш позні час.

***Лілея Лапшына.***

# Да 60-годдзя 49-й ракетнай дывізіі

Яшчэ на адзін памятны знак у Лідзе стала больш. 24 ліпеня 2021 г. ля ўваходу на тэрыторыю Лідскага памежнага атрада было шматлюдна і святочна: тут адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака ў памяць пра 49-ю ракетную дывізію, з дня ўтварэння якой сёлета споўнілася 60 гадоў. Апроч ветэранаў-ракетчыкаў, многія з якіх з гэтай нагоды былі ў параднай форме, з камплектамі ўзнагарод, на мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі раённай улады, іншых ветэранскіх арганізацый, памежатрада, Лідскага гістарычна-мастацкага музея, навучэнцы ваенна-патрыятычных класаў.



Памятны знак каля вайсковай часткі Паўночнага гарадка распрацаваны і ўсталяваны па ініцыятыве савета ветэранаў 49-й ракетнай дывізіі. Рашэнне ўвекавечыць памяць пра гэтую дывізію ў памятным знаку, які стаяў бы ля ўваходу на тэрыторыю яе былога штаба, было прынята саветам ветэранаў-ракетчыкаў яшчэ ў 2019 годзе. Праца па стварэнні мемарыяла пачалася ўвосень 2020 года. Ветэраны РВСН актыўна ўдзельнічалі падчас распрацоўкі, галоўным жа распрацоўнікам стаў маёр у адстаўцы Эдуард Дварэцкі. Дапамога ў будаўніцтве мемарыяла аказалі Лідскі памежатрад, ААТ "Будвектар", СЗАТ "Ліпласт-Спб", Лідская ДБПМК-72. Кіраўніцтву названых арганізацый і камандаванню памежатрада ветэраны-ракетчыкі вельмі ўдзячныя.

Паколькі адкрыццё памятнага знака было прымеркавана да 60-годдзя з дня ўтварэння 49-й ракетнай дывізіі, старшыня РГА "Ветэраны РВСН" Іван Кірычэнка нагадаў прысутным яе гісторыю. Поўнае яе найменне: 49-я гвардзейская Чырвонасцяжная Станіслаўска-Будапешцкая ракетная дывізія - успадкавана ад 18-га армейскага гвардзейскага Станіслаўска-Будапешцкага Чырванасцяжнага корпуса. Як ужо адзначалася, штаб камандавання дывізіі знаходзіўся ў Лідзе. На працягу амаль сарака гадоў яе ракетчыкі бесперапынна неслі баявое дзяжурства па абароне заходніх меж Савецкага Саюза і Рэспублікі Беларусь. Служба была нялёгкай, але ракетчыкі з гонарам і добрай якасцю выконвалі ўскладзеныя на іх задачы. 49-я ракетная дывізія лічылася адной з лепшых у ракетных войсках стратэгічнага прызначэння Савецкага Саюза. Яе вайскоўцы актыўна ўдзельнічалі ў добраўпарадкаванні Ліды, будаўніцтве Паўночнага гарадка, лакафарбавага завода, дапамагалі калгасам ва ўборцы ўраджаю. Цяпер некаторыя выхадцы з 49-й ракетнай дывізіі займаюць высокія камандзірскія пасады ў РВСН Расійскай Федэрацыі. Напрыклад, генерал-лейтэнант Ігар Фазлятдзінаў - начальнік генеральнага штаба РВСН РФ.

- З 1997 года на тэрыторыі Беларусі няма ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння, - адзначыў у канцы свайго выступу Іван Васільевіч, - але жывуць і жывуць тысячы ветэранаў-ракетчыкаў, якія па ініцыятыве савета ветэранаў 49-й ракетнай дывізіі ў чэрвені 2018 года стварылі ў маштабе ўсёй рэспублікі грамадскую арганізацыю ветэранаў РВСН.

Ганаровае права адкрыць памятны знак каля ўваходу ў вайсковую частку было прадстаўлена намесніку старшыні райвыканкама Генадзю Владыку, старшыне РГА "Ветэраны РВСН" Івану Кірычэнка, самым старэйшым лідскім ветэранам-ракетчыкам Уладзіміру Дронаву і Пятру Баягіну.



- Гэты мемарыял, - сказаў пасля адкрыцця знака Генадзь Владыка, - закліканы спрыяць захаванню памяці пра слаўныя справы ветэранаў-ракетчыкаў, пра 49-ю ракетную дывізію як неад'емную частку нашай гісторыі. Пакуль Беларусь памятае - яна непераможная ў любых войнах, у тым ліку інфармацыйных.

Пра важнасць памяці пра гісторыю 49-й ракетнай дывізіі, асабліва для падрастаючага пакалення, гаварылі ў той дзень і некаторыя яе ветэраны. Дабраславіў і высвянціў памятны знак протаіерэй Сергій Шафарост. Многія з прысутных на свяце ўсклалі да мемарыяла кветкі.

***Алесь Мацулевіч.***

# Разам па шляху творчасці - да поспеху!

## *Народны ансамбль песні і танцу "Лідчанка" адзначыў юбілей - 60-годдзе з дня заснавання*

Народны ансамбль песні і танцу "Лідчанка" - мясцовы культурны брэнд. Калектыў добра вядомы жыхарам раёна, а без выступлення таленавітых артыстаў не абыходзіцца ніводнае ўрачыстае мерапрыемства, прымеркаванае да важнай даты. Кожны нумар - сапраўднае свята танцу і творчасці, якога так чакаюць і гледачы, і самі танцоры. І ў снежаньскія дні 2021 года ўсенародны любімец адзначае юбілей - 60-годдзе з дня заснавання.

З нагоды гэтай важнай падзеі мы паразмаўлялі з мастацкім кіраўніком ансамбля. Пра гісторыю, творчасць, дасягненні калектыву і вечныя каштоўнасці расказала **Вольга Сяргеева**.

***- Вольга Віктараўна, 60 гадоў - сур'ёзная дата для самадзейнага калектыву: ёсць што ўспомніць, пра што расказаць. З чаго ўсё пачыналася?***

- Народны ансамбль песні і танцу "Лідчанка" Палаца культуры г. Ліды быў заснаваны ў 1961 годзе. Першым кіраўніком ансамбля стаў заслужаны работнік культуры БССР Васіль Іванавіч Аламаха і практычна 20 гадоў ім з'яўляўся. Як вядома, за любым поспехам у творчасці стаіць вялікая праца. Вось і ў пачатку дзейнасці калектыў імкнуўся пашырыць рэпертуар, а разам з ім расло і майстэрства артыстаў. Васіль Іванавіч запрашаў для працы ў калектыве сталічных знака-мітасцей, напрыклад, кіраўніка Беларускага дзяржаўнага нацыянальнага ансамбля танца Рыгора Апанасенку, вядомага беларускага кампазітара Мар'яна Наско. І ў 1970 годзе калектыву было прысвоена званне "Народны".

Практычна 20 гадоў Васіль Іванавіч быў кіраўніком ансамбля. Першым балетмайстрам была Аляксандра Іосіфаўна Місяноўская. У якасці акампаніятара працаваў Пётр Шаблыкін. Вялікі ўклад у творчае развіццё калектыву ўнеслі спецыялісты Анатоль Конанаў, Канстанцін Казячы, Уладзімір Гарачоў, Марына Лесагор, Тамара Харашылава. А таксама ўдзельнікі, якія працавалі на сцэне па некалькі дзесяцігоддзяў: Альберт Рыжыкаў, Раман Крыпан, Георгій Лятохін, Анатоль Матчанка, Уладзімір Некрашэвіч, Славамір Шкленнік, Яўген Пелін, Галіна Іванова, Лілея Галактыёнава, Таццяна Шамахян.



За 60 гадоў калектывам пройдзены вялікі творчы шлях, выканана мноства яркіх народных песень. А колькі станцавалі!

***- Цяперашні склад - гэта…***

- 35 удзельнікаў ва ўзросце ад 19 да 50 гадоў. Яркімі прадстаўнікамі маладога пакалення і салісткамі з'яўляюцца Валянціна Страчынская, Таццяна Какошка. Моладзі даём дарогу і магчымасць паказаць сябе, не перашкаджаючы творчай ініцыятыве і жаданню шукаць нешта новае. Таксама працяглы час сваім выступленнем радуюць Марына Буян, Гражына Карэлава, Ірына Чвікава, Алена Лапушкіна, Ірына Скорб, Ганна Карэнік. Удзельнікі ансамбля - энергічныя, таленавітыя людзі, сапраўдныя аматары беларускай народнай творчасці. Я заўсёды і ва ўсім падтрымліваю свой калектыў, люблю сваіх супрацоўнікаў, і гэта з'яўляецца асновай нашай сумеснай дзейнасці.

***- Многія песні і танцавальныя нумары непарыўна звязаны з традыцыямі нашага краю. І мне здаецца, што вы ведаеце сакрэт, як зрабіць народнае сучасным, цікавым сённяшняму гледачу…***

- У кожнага сур'ёзнага калектыва павінен быць свой куфар "залатога фонду". У нас ён таксама ёсць. Гэта вакальныя і харэаграфічныя кампазіцыі, беларускія, рускія, польскія, літоўскія песні, творы *a capella*, народныя танцы, творы ў стылі фольк-мадэрн, сумесныя музычныя нумары з эстраднымі выканаўцамі. Гледачам прапануюцца беларускія народныя песні "Смутны вечар" (апрацоўка Ларысы Кулакоўскай), "А ў гародзе чорна рэдзька" (апрацоўка Вячаслава Пыпеця), "Ой, я жыта ды не сеяла" (музыка Якава Навуменкі), "А, чалом-чалом" (апрацоўка Івана Кашпура), "А ў гародзе ярыца", "Ой, пайду я на даліну", вакальна-харэаграфічныя кампазіцыі "Зязюлька" (з рэпертуару ансамбля "Неруш"), "Добры дзень" (апрацоўка Тамары Харашылавай), "Пасею руту" (апрацоўка Тамары Харашылавай), музычна-тэатралізаваныя паказы "Запрашаем на кірмаш", "Гуляць дык гуляць", "Абрад Купалле" і шмат іншых. Знайшлі сваё арыгінальнае сцэнічнае ўвасабленне беларускія абрады і святы: "Дажынкі", "Каляды", "Кірмаш". Асноўная мэта ансамбля - папулярызацыя народнага мастацтва, захаванне нацыянальных традыцый, развіццё беларускай песні і танцавальнай культуры. Як я заўсёды кажу, народныя песні стагоддзямі перадаваліся з пакалення ў пакаленне, і сёння мы павінны захаваць гэтую нітачку. Таму пры дапамозе народнай музыкі мы гаворым аб тым, што фарміруе наш светапогляд, аб тых спрадвечных ісцінах, якія робяць нас такімі, якія мы ёсць.




***- Дзе вам даводзілася бываць, з кім супрацоўнічаць?***

- Сёння мы супрацоўнічаем з рознымі творчымі калектывамі. Прымаем актыўны ўдзел у гарадскіх, раённых і абласных фестывалях і конкурсах, штогадовых урачыстасцях, прысвечаных Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дню горада, народных гуляннях ("Праводзіны Зімы", "Купалле", "Кірмаш"), у мерапрыемствах, прысвечаных Году народнага адзінства. Нас заўсёды з ветлівасцю сустракаюць і ў іншых гарадах краіны. Так, калектыў прадстаўляў Лідчыну на абласным фестывалі-кірмашы працаўнікоў вёскі "Дажынкі", браў удзел ва ўрачыстым адкрыцці свята "XXVI Дзень беларускага пісьменства" ў Слоніме. Неаднаразова выступаў у Літоўскай Рэспубліцы - Вільні, Троках, Клайпедзе, Салечніках. Асноўная мэта замежных тураў - папулярызацыя беларускіх народных традыцый, самабытнасці і індывідуальнасці нацыянальнай культуры.

***- Што даюць такія паездкі?***

- У першую чаргу дазваляюць паказаць сябе. А яшчэ гэта ўнікальная пляцоўка для зносін і перадачы вопыту. Заўсёды адчуваем радасць ад магчымасці ўбачыць новыя месцы, знайсці новых сяброў, а галоўнае - паказаць усе грані свайго таленту.

***- Ведаю, што ў "Лідчанкі" заўсёды ў рабоце ёсць новая праграма, бо ансамбль нязменна ў пошуку. Што ў планах на 2022 год?***

- Калектыў працуе над пашырэннем жанравага дыяпазону, увесь час знаходзіцца ў творчым пошуку, папаўняючы свой рэпертуар. І гэта, паверце, велізарная праца, якая часта застаецца незаўважанай. Людзі бачаць толькі канчатковы прадукт - удалае выступленне ці добры канцэрт. Але ўсё гэта - сур'ёзная, карпатлівая праца ўсяго калектыву. Не стаяць на месцы, ісці ў нагу з часам, заўсёды знаходзіцца ў творчым тонусе, не адставаць ад сучасных павеваў і актыўна выкарыстоўваць у сваіх канцэртах інавацыйныя тэндэнцыі - стыль сённяшняга ансамбля.

Вядома, будзем цешыць жыхароў горада новымі творчымі праектамі і надалей. Упэўнена, што новыя ідэі і задумы змогуць пакарыць сэрцы нашых слухачоў і прыхільнікаў таленту.

***- За гады свайго існавання калектыў дасягнуў высокага ўзроўню прафесіяналізму. Ваша майстэрства неаднаразова пацвярджалася перамогамі ў раённых, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсах і фестывалях…***

- Іх за ўсю гісторыю было нямала. Ансамбль песні і танцу "Лідчанка" неаднаразова з'яўляўся дыпламантам раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў і конкурсаў, выязджаў з абменнымі канцэртамі ў краіны блізкага замежжа. Так, у 2001 годзе мы атрымалі Залаты дыплом і Залаты кубак IV міжнароднага конкурсу харавых калектываў (Італія), у 2005 годзе наведалі міжнародны фестываль фальклору "Ля возера" (Трокі, Літва), у 2006 годзе з гонарам насілі званне дыпламантаў другой ступені II абласнога конкурсу народных хароў "Над сінім Нёманам", а ў 2009 годзе сталі дыпламантамі III ступені рэспубліканскага конкурсу грамадскага нацыянальнага тэлебачання "Песні маёй краіны". За гады працы было шмат сур'ёзных міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў. Усё не пералічыш! І ні разу мы не вярнуліся ў Ліду з пустымі рукамі. Мы рады, што наша праца не застаецца незаўважанай. Гэта з аднаго боку, падразумявае вялікую адказнасць. З іншага - падштурхоўвае ісці наперад, рабіць нешта цікавае і новае.

***- За поспехамі стаіць праца многіх людзей…***

- Так. Як я ўжо казала, не адно пакаленне мясцовых жыхароў аддало свой талент і энергію "Лідчанцы". Асабліва дзякуем ветэранам калектыву, якія ўнеслі вялікі ўклад у яго фарміраванне і станаўленне. З дапамогай прафесіяналізму гэтых людзей ансамбль атрымліваў прызнанне і высокія адзнакі не толькі ў горадзе, але і далёка за яго межамі. Кожны з артыстаў быў і застаецца яркай і ўнікальнай асобай, бездакорным талентам свайго часу. За сваю багатую творчую гісторыю "Лідчанка" не страціла музычнага каларыту і працягвае радаваць публіку беларускай музычнай культурай.

***- Што б вы хацелі пажадаць сваім калегам у сувязі з юбілеем?***

- Перш за ўсё хочацца пажадаць здароўя, таму што гэта самае галоўнае ў наш час, а таксама міру, дабра, кахання, невычэрпнай творчай энергіі, каб заўсёды з'яўляліся свежыя ідэі і ўсе яны былі ўвасоблены ў жыццё.

***Вольга Капцевіч.***

# Народнаму ансамблю побытавых інструментаў "Каханачка" - 40

*Нешта ў клубе блішчыць?*
*Мусіць там гуляначка?*
*Не, не можа быць…*
*Няйначай грае там "Каханачка".*
*Хто з будоўлі, хто са школы,*
*Хто з майстэрні ўсё бяжыць,*
*Каб сабрацца ўсім часова,*
*Ды каб людзям паслужыць…*

Гісторыя ансамбля побытавых інструментаў "Каханачка" дзяржаўнай установы "Лідскі раёны цэнтр культуры і народнай творчасці" пачалася ў Маламажэйкаўскім сельскім клубе. Туды ў 1981 годзе прыехаў на працу малады хлопец Валянцін Жамойцін. Менавіта ў яго з'явілася ідэя граць музыку на побытавых інструментах. Кожны дзень ён асвойваў новы прадмет, які ўжываецца ў звычайным гаспадарчым жыцці чалавека вёскі. У ход ішла накавальня, піла, каса, тарка, пранік і яшчэ шмат усяго таго, з чаго атрымоўваецца гук.

Валянцін няшмат прарабіў у Маламажэйкаўскім клубе, але перад сыходам падзяліўся сваім уменнем з Людмілай Уладзіславаўнай Масевіч (у 1981 годзе - дырэктар Маламажэйкаўскага СК), якая і працягнула дзейнасць калектыва, канчаткова стварыўшы ансамбль побытавых інструментаў "Каханачка". Пазней, па прычыне склаўшыхся абставін, кіраўніцтва ансамблем было перададзена Аліне Уладзіміраўне Грынкевіч , пад кіраўніцтвам якой ў 1994 годзе ансамблю было нададзена ганаровае найменне "Народны".

Зараз ансамбль складаецца з энтузіястаў, якія працуюць у розных сферах сельскай гаспадаркі ЛРСУП "Мажэйкава", і іх аб'ядноўвае любоў да роднай зямлі і да песні. У калектыве сяброўская творчая атмасфера. І



як вынік - разнастайныя канцэртныя праграмы з цікавай паслядоўнасцю інструментальных, вакальных і сольных кампазіцый.

Калектыў ажыццяўляе актыўную творчую дзейнасць па прапагандзе народнай творчасці на канцэртных пляцоўках раёна і вобласці. За гады свайго існавання ансамбль даў больш за 700 канцэртаў.

Удзельнікі ансамбля імкнуцца максімальна дакладна перадаць прыгажосць народнай музыкі і песень, нават калі яны гучаць у сучаснай апрацоўцы. Таму, сапраўдны творчы вобраз калектыву выяўляецца ў выкананні твораў мясцовага фальклору, запісаных Алінай Грынкевіч. Гледачам падабаюцца танцы: "Аляксандра" і "Каханачка", песні "Лята, мае лята", "Сухая каліна", "Явар". У рэпертуары шмат абрадавых песень: калядныя, вясельныя, велікодныя, зажыначныя.

Штогод народны ансамбль побытавых інструментаў "Каханачка" з'яўляецца актыўным удзельнікам свята "Дажынкі" рэспубліканскага, абласнога і раённага ўзроўню.



Калектыў прымаў удзел у днях культуры Беларусі ў Клайпедзе, у фестывалі нацыянальных культур ў Троках, а таксама ў канцэртнай праграме, прысвечанай Інаўгурацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ансамбль з'яўляецца неаднаразовым лаўрэатам і дыпламантам міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых фестываляў і конкурсаў.

У 2021 годзе народны ансамбль побытавых інструментаў "Каханачка" адзначыў сваё 40-годдзе. З новымі творчымі задумамі, крэатыўнымі ідэйнымі памкненнямі ансамбль уступае ў Новы 2022 год.

***lidanews.***

# Брава, "Шалом"!

## *Чвэрць стагоддзя лідскі ансамбль нясе людзям святло і габрэйскую культуру*

*У лістападзе 2021 года свой 25-гадовы юбілей адзначыў Народны ансамбль габрэйскай музыкі "Шалом" Палаца культуры горада Ліды.*



Чвэрць стагоддзя названы ансамбль захоўвае габрэйскую культуру і далучае да яе сваіх прыхільнікаў, цешачы музычнымі творамі і песнямі. А яшчэ - нясе людзям у розных кутках Зямлі святло і паразуменне (нездарма назва калектыва перакладаецца як "Святло вам"). За гэты адрэзак часу музычны калектыў дасягнуў многага і стаў вядомы не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Велізарны творчы багаж "Шалома", шырокая геаграфія яго выступаў, вялікая скарбонка ўзнагарод. Юбілей - нагода больш падрабязна распавесці пра калектыў, успомніць асноўныя вехі яго творчага шляху, а таксама з чаго гэты шлях пачынаўся 25 гадоў назад.

Ансамбль габрэйскай музыкі "Шалом" быў утвораны ў 1996 годзе. Адразу ж склаўся імідж музыкаў "Шалома", абавязковымі складнікамі якога сталі кацялкі і камізэлькі. З музычных інструментаў - скрыпка, кларнет і фартэпіяна. Пазней у выступах пачалі выкарыстоўвацца мінусовыя фанаграмы.

Ужо ў першыя гады свайго існавання "Шалом" выступаў у многіх гарадах Беларусі, у Польшчы, Ізраілі. Вельмі хутка ён здабыў шырокую вядомасць і любоў гледачоў. У 2001 годзе яму было прысвоена званне Народнага. Дагэтуль "Шалом" - адзіны ў Беларусі ансамбль габрэйскай музыкі, які носіць гэтае ганаровае званне.

- У нашым рэпертуары, - распавядае нязменны мастацкі кіраўнік ансамбля Міхаіл Дзвілянскі, - клезмерская музыка, песні на ідыш, іўрыце, а таксама на беларускай, рускай, польскай мовах, інструментальныя п'есы. Асабліва палюбіліся слухачам як у Беларусі, так і за мяжой выконваныя "Шаломам" "Тум-балалайка", "Ешка", "Ерушалаім", інструментальныя клезмерскія творы.

* * *

Далей Міхаіл Дзвілянскі распавядае пра юбілейную праграму "Музыка, з якой мы жывём" Народнага ансамбля габрэйскай музыкі "Шалом", што адбылася надоечы ў Палацы культуры:

- Незвычайнасць нашай юбілейнай праграмы ў тым, што ў выкананні "Шалома" ўпершыню прагучалі вершы, сугучныя музычнаму зместу праграмы:

*Музыки хочется…*
*Музыки… Звука…*
*Музыки - нежности,*
*музыки - муки,*
*Музыки - счастья,*
*надежды, удачи…*
*Музыки - радости,*
*музыки - плача…*

(Вершы Лізаветы Полеес, чытае Ларыса Шабаліна.)

Затым песню "Шалом" бліскуча выканала Кацярына Клімовіч:

*Я тебе навстречу просто улыбнусь*
*И словами сердца твоего коснусь,*
*Пожелаю счастья и удач в пути,*
*Станет легче и светлей тебе идти.*

(З рэпертуару спявачкі Жасмін.)

Далей прагучалі клезмерские інструментальныя творы - характэрныя габрэйскія танцы. Адмысловы каларыт выкананню надае кларнет Станіслава Мішкеля, які ў ансамблі "служыць" ужо 23 гады.

Другая частка праграмы нагадала пра сумныя, трагічныя старонкі гісторыі:

*Мне круг последний ада показали,*
*Но я и сам его б нашел легко -*
*По заревам, что в небе полыхали,*
*По пеплу, что вздымался высоко.*

(Максім Танк, "Гета".)



Затым прагучалі музычныя творы "Спіс Шындлера", "Мелодыя" ў выкананні Міхаіла Дзвілянскага, "Мястэчка" ў выкананні Кацярыны Клімовіч. Гэтыя творы напоўнены адпаведнымі трагічнымі інтанацыямі.

Трэцяя частка праграмы - пра прыгажосць беларускай прыроды, яе жыццесцвярджальную сілу:

*Вновь приехал домой*
*после долгой разлуки,*
*Снова Неман родной*
*пожимает мне руки.*
*И дождя пелена*
*снова даль застилает,*
*И ветвями сосна*
*вновь меня обнимает.*
*Этот воздух люблю*
*и спешу им напиться.*
*Неужели не сплю?*
*Неужели не снится?*
*Как слова подобрать,*
*ноту выбрать какую,*
*Чтобы нарисовать*
*красотищу такую?*
(Аркадзь Дзвілянскі, "Нёманскія пейзажы")

Прагучаўшыя затым "Бацькаўшчына" і "Наладчык" (спявае Міхаіл Дзвілянскі), "Ясу" (спявае Кацярына Клімовіч) і заключны "Фрэйлехс" у выкананні квартэта "Шалом" выклікалі ў слухачоў яркія эмоцыі, у тым ліку вокліч "Брава, "Шалом"!"

* * *

За чвэрць стагоддзя калектыў запісаў дзесяць песенных кампакт-дыскаў, выпусціў нотныя зборнікі "Габрэйскія малітвы", "Габрэйскія танцы", кнігі "Музыка, з якой мы жывём", "Музыка габрэйскага супраціву", фотаальбом. У памяць пра Аркадзя Дзвілянскага, брата кіраўніка ансамбля, які стаяў каля яго вытокаў, кампазітара, паэта, музыказнаўца, кандыдата мастацтвазнаўства, выдадзены зборнік яго выбраных вершаў "Знайду бераг мора". У юбілейны дыск "Музыка, з якой мы жывём", прысвечаны 25-годдзю калектыва, увайшлі лепшыя творы з рэпертуару розных гадоў.

Калектыву спадабалася ідэя злучэння музыкі з вершамі - ансамбль плануе музычна-паэтычную праграму "Нёманскія пейзажы" з вершамі Аркадзя Дзвілянскага і п'есамі "Шалома".

25-гадовая гісторыя "Шалома" яркая і багатая падзеямі. Першай буйной узнагародай ансамбля стаў дыплом II Маскоўскага міжнароднага конкурсу выканаўцаў габрэйскай музыкі (2000 год). Калектыў выступаў у многіх гарадах Беларусі, у Ізраілі, Расіі, Украіне, Польшчы, Літве, Эстоніі, Малдавіі, Славеніі, Італіі, Аўстрыі. Ансамбль з'яўляецца лаўрэатам фэстаў у Беларусі, Польшчы, Украіне, дыпламантам шматлікіх міжнародных конкурсаў выканаўцаў габрэйскай музыкі. Увесь час удзельнічае ў Рэспубліканскім фэсце нацыянальных культур у Гародні.

Варта асобна сказаць пра кіраўніка ансамбля. Міхаіл Якаўлевіч ганараваны граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, кіравання культуры Гарадзенскага аблвыканкама, Лідскага райвыканкама, Падзячнымі лістамі ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. А яшчэ Міхаіл Дзвілянскі ўзначальвае ў Лідзе рэлігійную грамаду прагрэсіўнага юдаізму, якая таксама носіць назву "Шалом".

- Я ўдзячны ўсім удзельнікам ансамбля "Шалом" за той неацэнны ўклад, які яны ўносяць у яго дзейнасць, - кажа Міхаіл Дзвілянскі. - Велізарную падзяку выказваю дырэктару Палаца культуры горада Ліды Ірыне Эдуардаўне Тур за разуменне і шматгадовую падтрымку ў нашай творчай дзейнасці.

Варта таксама адзначыць, што перад юбілейным канцэртам у фае Палаца культуры дзейнічала выстава дыпламоў, дыскаў, кніг, фатаграфій, афіш, якая знаёміць наведвальнікаў з асноўнымі дасягненнямі ансамбля за чвэрць стагоддзя. Ад Лідскага райвыканкама на канцэрце прысутнічала галоўны спецыяліст аддзела культуры Наталля Вайцюкевіч. З Менска на юбілейны канцэрт "Шалома" былі запрошаны галоўны рабін рэлігійнага аб'яднання грамад прагрэсіўнага юдаізму ў Рэспубліцы Беларусь Рыгор Абрамовіч і выканаўчы дырэктар аб'яднання Міхаіл Кемераў.

Ансамбль-юбіляр у той дзень быў узнагароджаны Ганаровай граматай кіравання культуры Гарадзенскага аблвыканкама, Падзячным лістом старшыні Лідскага райвыканкама. Госці з Менска перадалі калектыву памятны сувенір ад мэрыі горада Іерусаліма - знак горада ў выглядзе льва.

***Алесь Мацулевіч.***

# Лідскія юбіляры

## Вандроўнік шляхамі паэтаў і герояў

### *Да 100-годдзя з дня нарадджэння Уладзіміра Урбановіча*

**Уладзімір Урбановіч** (1921-1999) у 1960-1990 гадах быў самым вядомым у Беларусі краязнаўцам, педагогам, вандроўнікам, калекцыянерам і музейшчыкам. А яшчэ - шчырым беларусам, дэлегатам Устаноўчага з'езда Таварыства беларускай мовы ў Менску. Сёлета 1 жніўня яму споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння.

Нарадзіўся Уладзімір Урбановіч у 1921 годзе ў вёсцы Пудзіна на Лідчыне ў сялянскай сям'і. У 1932 годзе скончыў пяць класаў і працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. У 1938 годзе экстэрнам здаў экзамен за сямігодку і ў 1939 годзе паступіў у Жыровіцкую польскую сельскагаспадарчую гімназію Слонімскага павета. Пры "саветах" зноў здаваў экзамены за 7 класаў і паступіў у Менскі політэхнікум. Падчас акупацыі скончыў настаўніцкія курсы ў Навагрудку, пасля якіх працаваў настаўнікам пачатковых класаў у Лідзе і ў вёсцы Біскупцы на Лідчыне. Пасля вайны завочна скончыў Лідскую педагагічную вучэльню і літаратурны факультэт Гарадзенскага педінстытута. А калі скончыў педінстытут, то ўладкаваўся настаўнікам роднай мовы і літаратуры ў Райцаўскую сярэднюю школу Карэліцкага раёна, а з 1959 года працаваў у Валеўскай сярэдняй школе Наваградскага раёна.

Уладзімір Урбановіч адзін з першых у тыя пасляваенныя гады, напісаў і выдаў у Беларусі краязнаўчую кнігу "Па дарагіх мясцінах" (Мн., 1964), дзе дзяліўся досведам краязнаўчай работы па беларускай літаратуры ў сваёй Валеўскай сярэдняй школе Навагрдскага раёна. Настаўнік Уладзімір Урбановіч у той час паказаў і апісаў, як трэба выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял на ўроках у школе. Вывучаючы жыццё і творчасць беларускіх пісьменнікаў, а таксама пісьменнікаў-землякоў, ён з вучнямі на раварах і пяшком абыйшоў, аб'ехаў, і зноў жа апісаў тыя мясціны, дзе нарадзіліся пісьменнікі, творчасць якіх вывучалі ў школе. Настаўнік-краязнавец са школьнікамі наведаў мясціны Адама Міцкевіча, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Цішкі Гартнага, Ежы Путраманта, літаратурныя Лідчыну, Баранавіччыну, Дзятлаўшчыну, Навагрдчыну, Стаўбцоўшчыну, Слонімшчыну і Уздзеншчыну, збіраючы новыя звесткі пра творчасць беларускіх літаратараў, запісваючы не толькі ўспаміны сваякоў, якія тады яшчэ жылі, але і займаўся зборам вуснай народнай творчасці.

У 1955 годзе ў Валеўскай сярэдняй школе быў створаны краязнаўчы музей. Спачатку ў ім былі тры аддзелы: гістарычна-этнаграфічны і прыроды. Калі ў школу прыехаў на працу Уладзімір Урбановіч, то ён дапоўніў музей чацвёртым аддзелам - літаратурным. Ужо ў 1980 годзе ў Валеўскім народным краязнаўчым



*Уладзімір Урбановіч, 1960 г.*

музеі налічвалася 1895 экспанатаў, з іх 978 арыгінальных. Уладзімір Аляксандравіч па ўсім свеце збіраў для музея розныя экспанаты, асабліва ў свой літаратурны аддзел. Тады ў музеі былі каштоўныя рэчы, звязаныя з "Хронікай Быхаўца", з гісторыяй Любчанскай друкарні, матэрыялы пра Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Цётку, кнігі, паштоўкі, выдадзеныя суполкай "Загляне сонца і ў наша ваконца", друкарнямі Марціна Кухты і "Нашай нівы". Шырока была прадстаўлена заходнебеларуская літаратура кнігамі Б. Тарашкевіча, І. Дварчаніна, Г. Леўчыка, К. Буйло, В. Таўлая, М. Танка, М. Васілька, Н. Тарас, газетамі і часопісамі той пары, фотаздымкамі беларускіх літаратараў, каштоўнымі дакументамі і кнігамі А. Міцкевіча, Г. Сянкевіча, М. Рылеева, І. Катлярэўскага, С. Нерыс і іншымі асобамі, лёс якіх непасрэдна быў звязаны з Навагрдчынай.

У 1970 годзе Уладзімір Урбановіч выдае сваю новую кнігу "Шляхамі паэтаў і герояў". Гэта было дапоўненае выданне, дзе аўтар цікава расказваў пра школьны літаратурны гуртом, пра музей, апісваў паходы вучняў па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменнікаў і герояў беларускага народа, аўтар дзяліўся шматгадовым досведам выкарыстання краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры. Пра кнігі настаўніка з Валеўкі пісалі Аляксей Пяткевіч, Рыгор

Шкраба, Янка Саламевіч, Уладзімір Калеснік, Вера Ляшук, Сцяпан Александровіч і многія іншыя вядомыя асобы.

Чалавек, жывучы ў глыбінцы, дзеля беларускай справы працаваў даволі сур'ёзна і актыўна. Да яго звярталіся па дапамогу і параду навукоўцы, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, педагогі, архівісты і літаратуразнаўцы з усёй Беларусі, а таксама з Літвы, Польшчы, Украіны. Уладзімір Урбановіч вёў вялікую перапіску, тысячы пісем ад вялікіх людзей, на жаль, згубіліся, але і шмат захавалася ў беларускіх архівах і музеях, у прыватных сховішчах. Уладзімір Урбановіч сябраваў амаль з усімі дзеячамі беларускай культуры і пісьменнікамі. У яго доме і ў школе ў Валеўцы шмат разоў пабывалі Максім Танк, Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль, Генадзь Каханоўскі, Уладзімір Калеснік, Ігар Лучанок, Аляксей Карпюк, Барыс Сачанка,









Навагрудчына. Злева направа: Уладзімір Урбановіч, Васіль Бондар і пісьменнік Ян Скрыган, 1960-я гады



ПАСВЕДЧАННЕ

Тав. Урбановіч У. А.

з'яўляецца дэлегатам Устаноўчага з'езда Таварыства беларускай мовы.

Аргкамітэт.

К. «Растр». З. 30. Т. 500.

Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Фёдар Янкоўскі, Ян Скрыган, сваякі Якуба Коласа і Адама Міцкевіча і сотні іншых вядомых нам асобаў. Ён заўсёды знаёміў гасцей з Валеўкай, школьным музеем і вядома ж адвозіў іх на Свіцязь, дзе частаваў, дзе вяліся шчырыя гутаркі пра Беларусь, родную мову і культуру…

За сваю педагагічную і краязнаўчую дзейнасць Уладзімір Урбановіч быў унагароджаны рознымі граматамі і дыпломамі, а таксама значком "Выдатнік народнай асветы". Ён так пры жыцці і не атрымаў звання Заслужны работнік культуры ці Заслужаны настаўнік Беларусі. І толькі пасля смерці (памёр 2 лютага 1999 года ў Валеўцы, дзе і пахаваны), яго пасмяротна занеслі ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна.

Даўно пара на будынку Валеўскай школы адкрыць Уладзіміру Урбановічу мемарыяльную шыльду, устанавіць у Валеўцы яму помнік і ўсе яго артыкулы выдаць асобнай кнігай.



Уладзімір Урбановіч з жонкай, пляменнікам і Міхасём Петрыкевічам, 1960-я гады

**Сяргей ЧЫГРЫН.**

*Фота з архіва аўтара.*

# Краязнаўцу Віктару Кудлу - 80

Кудла Віктар Іванавіч нарадзіўся 17 кастрычніка 1941 года ў сялянскай сям'і ў в. Дроздава Лідскага раёна. У бацькоў былі чатыры сыны, на іх долю выпалі палахлівыя гады ваеннага ліхалецця, пасляваеннай галадухі і цяжкай працы. Пасля Жучкоўскай пачатковай школы прадоўжыў навучанне ў Ганчарах. Тут у 1957 годзе ўступіў у камсамол, быў старшынём вучнёўскай вытворчай брыгады. Неадразова быў пераможцам у раёне па кулявой стральбе з мк вінтоўкі. За выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны атрымаў "Пахвальны ліст" Лідскага гаркама камсамолу. Скончыў Ганчарскую сярэднюю школу ў1959 годзе на 4-5 і без экзаменаў паступіў у Гарадзенскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Акрамя паспяховай вучобы прымаў актыўны ўдзел у камсамольскім жыцці: афармляў наглядную агітацыю, унікальную светлагукавую газету, адзначаны "Пахвальным лістом" Гарадзенскага райкама камсамолу (1962) і Граматай абкама камсамолу (1962). Да прызыву на вайсковую службу некалькі месяцаў працаваў заатэхнікам калгаса "Нёман" (в. Дзітрыкі) Лідскага раёна.



У лістападзе 1962 г. быў прызваны ва Узброеныя Сілы. Чатыры гады тэрміновай службы з 1962 па 1966 год праходзіў на крэйсеры "Камсамолец" Талінскай ваенна-марской базы Двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. Асвоіў ваенна-марскія спецыяльнасці вежавага артэлектрыка і старшыны рэйдавага камандзірскага кацера. З'яўляўся выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі, спецыялістам першага класу. Быў намеснікам, а апошні год тэрміновай службы абраны сакратаром камітэта камсамолу карабля на правах райкама. Арганізаваў выпуск і быў рэдактарам арыгінальнай светлагукавой газеты "Камсамольскі фіціль". Удзельнічаў у візіце савецкіх караблёў у Данію (травень 1964 г.), у Швецыю (травень 1965 г.), у далёкім паходзе ў Паўночнае мора, у вучэннях краін Варшаўскай дамовы. З'яўляўся арганізатарам і актыўным удзельнікам Усесаюзнага турыстычнага паходу па месцах баёў абаронцаў Маандзунскага архіпелага. У скадзе каманды былі: Герой Савецкага Саюза Анатоль Каняеў, камандзір падводнай лодкі, якая ўпершыню прайшла пад ільдамі Фінскага заліва, зампаліт палка, узняўшага Сцяг Перамогі над рэйхстагам - палкоўнік Арцюхоў.



Вахтавы журнал паходу, фотаматэрыялы і светлагукавыя газеты перададзены ў музей Балтыйскага флоту. Закончыў службу старшыной першай стацці, а пасля перападрыхтоўкі прысвоена званне “старшы лейтэнант ВМФ”.

Зрэшты, за гады ваенна-марской службы Віктару Іванавічу давялося сустрэцца з легендарнымі асобамі. Падчас інспектарскай праверкі ён на камандзірскім кацеры правёз па гаванях Талінскай ВМБ двойчы Героя Савецкага Саюза Міністра абароны маршала Андрэя Грэчку.

Падчас пераходу эскадры караблёў з Таліна да Балтыйска з экіпажам крэйсера сустракаліся: Маршал Савецкага Саюза Кірыл Маскаленка, генерал арміі Хетагураў, Міністры абароны краін Варшаўскай дамовы, аб чым Віктар Кудла аформіў для іх фотаальбомы. Але больш за ўсё маладому мараку запомнілася сустрэча з лётчыкам-касманаўтам № 2, Героем Савецкага Саюза Германам Цітовым, які падчас рэйду з крэйсера на востраў Саарэма сфатаграфаваўся ў рубцы кацера і падарыў яму кнігу "На касмадроме" з

асабістым аўтографам.

За поспехі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы і актыўную камсамольскую працу быў узнагароджаны Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ, Граматай ЦК ЛКСМ Эстоніі, Граматамі камандзіра карабля, сфатаграфаваны каля разгорнутага сцяга крэйсера і тройчы адзначаўся адпачынкам з выездам на радзіму.

Падчас вучэнняў Узброеных сіл краін Варшаўскай дамовы за доблеснае выкананне адказнага і даволі рызыкоўнага задання ў час штармавой непагадзі па дастаўцы кацерам камандавання эскадры з порта Свінавусце (Польшча) да караблёў на рэйдзе ўзнагароджаны юбілейным медалём "20 гадоў перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-45 гг.". Медаль уручыў Старшыня Савета Міністраў СССР А.Н. Касыгін.

Напрыканцы службы стаў членам кампартыі, і была прапанова застацца сакратаром камсамольскай арганізацыі Талінскага мараходнага вучылішча, але трэба было вяртацца на радзіму да састарэлых бацькоў…

Пасля дэмабілізацыі Віктара Іванавіча запрасілі заатэхнікам у родны калгас імя Чкалава ў в. Жучкі (1966 г.), а праз год перавялі намеснікам старшыні калгаса імя ВС СССР у в. Мыто (1967-70 гг.). Пасля заканчэння Гарадзенскага сельгасінстытута і курсаў па падрыхтоўцы кіраўнічых кадраў у 1970 годзе, кіраўнікі раёна настойліва прапаноўвалі стаць старшынём калгаса "Ударнік" (в. Хадзюкі). Але, не даўшага згоду, са спагадай накіравалі галоўным заатэхнікам самага адсталага ў раёне саўгаса "Дворышча", а ў 1973 годзе прызначылі дырэктарам саўгаса "Савецкі" (в. Крыніцы). За 5 гадоў узначалены ім працоўны калектыў дамогся значнага павелічэння вытворчасці і продажу сельгаспрадукцыі. Былі пабудаваны: дзіцячы сад на 90 месцаў, пасялковая кацельня, жывёлагадоўчы комплекс на 400 галоў, зернясховішча, бульбасховішча на 2 тысячы тон з нямецкім сартавальным пунктам, два 4-х кватэрныя жылыя дамы, вясковы вадаправод. За высокія вытворчыя вынікі гаспадаркі Кудла В.І. быў узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", значком "Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1975 года" і жэтонам "Ударнік 11-ай пяцігодкі".

У сакавіку1979 года па прапанове Лідскага РК КПБ, Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову аб узбуйненні экс. базы "Савецкая" за кошт далучэння саўгаса "Дворышча". Аб'яднаная гаспадарка атрымала назву эксперыментальная база "Ніва", а дырэктарам быў зацверджаны Кудла В.І.

Шмат сіл і стараннаў давялося прыкласці маладому кіраўніку, дарэчы, самай буйной на той час гаспадаркі ў раёне, каб з'яднаць аб'яднаны працоўны калектыў, умацаваць працоўную дысцыпліну, нацэліць спецыялістаў і працаўнікоў на рашэнне перспектыўных задач.

За гэтыя гады шмат было зроблена па стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы, навядзенні парадку на зямлі, уладкаванні палявых дарог, будаўніцтве і рэканструкцыі з поўнай механізацыяй працаёмкіх працэсаў на жывёлагадоўчых фермах Мігуны, Гурыны, Гімбуты, Сліжы. (Дарэчы, тры апошнія цяпер знішчаны.) Пасля мадэрнізацыі па навейшай тэхналогіі, свінагадоўчая ферма "Мяргінцы" была прызнана лепшым у вобласці мінікомплексам замкнёнага цыклу: вырошчвалі 2 тыс. парасят і прадавалі 200 тон свініны. (Сёння там разваліны).

Дзякуючы кіраўнікам будаўнічай справы Лабецкаму У.Ю., Юхно В.Г. і зладжанай працы будаўнічай брыгады ў складзе поўсотні чалавек, а ў летні перыяд студэнцкім будатрадам "Маладосць" і "Граніт", былі пабудаваны: аграхімцэнтр, збожасховішча вежавага тыпу з зернесушылкамі, сенасховішча і буракасховішча з кармацэхам, склады для будматэрыялаў, новыя гаражы і навесы для сельгастэхнікі.

Было шмат зроблена па сацыяльна-культурным развіцці гаспадаркі: пабудаваны адміністрацыйны будынак, сярэдняя школа, ФАП, быткамбінат, катэджы па вуліцах Цэнтральнай і Зорнай. Функцыянавалі дзве лазні ў вёсках Дворышча і Крыніцы, а для жыхароў астатніх вёсак душавыя на ўсіх фермах Гурыны, Сліжы, Мігуны, Мяргінцы, Гімбуты, а ў раммайстэрні "Дворышча" - саўна з міні-басейнам. (На сёння нават у Дворышчы лазня не працуе.)



У красавіку 1982 года гаспадарку наведалі кіраўнікі Рэспублікі і вобласці: першы сакратар ЦК КПБ Кісялёў Т.Я., старшыня Прэзідыума ВС БССР Палякоў І.Я., першы сакратар абкама КПБ Кляцкоў Л.Г., старшыня аблвыканкама Арцыменя Д.К. Далі высокую адзнаку стану спраў у гаспадарцы, і была прапанова Віктару Іванавічу на павышэнне, але адмовіўся, каб не абрываць пачатае і запланаванае.

Па ініцыятыве і пры актыўным удзеле Кудлы В.І. у пачатку 80-

х гадоў для аднаўлення былых будынкаў Дварышчанскага панскага фальварка быў распрацаваны праект сядзібна-этнаграфічнага комплекса. У рэстаўраванай чатырохпавярховай вежы быў створаны гістарычна-этнаграфічны музей "Зямля і людзі". Экспазіцыі музея асвятлялі гістарычнае мінулае і сучаснасць Дварышчанскага краю. Вадзяны млын быў рэканструяваны пад гасцініцу і рэстаран, у якім працавалі б свае работнікі, выкарыстоўваючы саўгасныя прадуты. У млыне былі замацаваны падмуркі, сцены, зноўку ўсталяваны дах, пакрыты чырвонай дахоўкаю. Выкладзены падлогі, столі абабіты арыгінальнай вагонкай, устаўлены вокны з вітражамі і дубовыя дзверы. На трох паверхах ўладкаваны тры каміны, грузавы ліфт, пракладзены электраправодка, трубы і вадзяныя радыятары, устаноўлены перагародкі пакояў, санвузел. У мансарднай частцы млына была абсталявана малая банкетная зала, а пад ім - лазня з мінібасейнам.



На сёняшні дзень усе гэтая аб'екты аграэкатурызму давалі б працу дзесятку дварышчан і прыносілі б значны прыбытак гаспадарцы.

На жаль, большасць з гэтага ўжо ў мінулым, разбурана і знішчана…

Пасля сустрэчы з алімпійскім чэмпіёнам па конным спорце Віктарам Угрумавым і зацікаўленай размовы, у 1985 годзе былі закуплены першыя спартыўныя коні, і арганізавана коннаспартыўная школа, якая і сёння працуе. Для аматараў парыбачыць на забалочаных і хмызняковых нізінах сваім эскаватарам і за сродкі гаспадаркі былі выкапаны сажалкі ў вёсках Мігуны, Мяргінцы, Крыніцы, Дворышча, Гурыны.

У старадаўнім парку на летняй эстакадзе праходзілі святочныя мерапрыемствы і масавае гулянне вяскоўцаў (цяпер тут выгул для коней). Уздоўж рэчкі Жыжма каля клуба быў пасаджаны новы парк імя 40-годдзя вызвалення Беларусі, аднак усе годы там пасвіліся каровы знішчыўшы пасадкі.

Па цэнтральнай вуліцы пакладзены ходнікі, пароблены газоны і кветнікі. Пракладзены ліўнёвая каналізацыя, падземны кабель вулічнага асвятлення з таршэрамі (за апошнія гады гэта разбурана). У падвальным памяшканні пад канторай быў цір для стральбы з малакаліберныай вінтоўкі і трэнажоры. Часта на эксбазе праходзілі раённыя спаборніцтвы.

Значную дапамогу гаспадарка аказала Дварышчанскай школе па ўнутраным аздабленні класаў, вестыбюля. Каля школы былі пабудаваны стадыён і арыгінальная дзіцячая пляцоўка з малымі архітэктурнымі формамі (ад іх нічога не захавалася), перададзены ў выкарыстанне фруктовы сад.

Былі закуплены картынгі, лыжы, спартыўная форма. Многія выпускнікі заставаліся працаваць у гаспадарцы (яны і сёння касцяк механізатараў) і часта за кошт гаспадаркі паступалі ў сельскагаспадарчыя інстытуты і тэхнікумы.

У гаспадарцы працавала больш за сто камсамольцаў і 70 партыйцаў. Санітарная дружына займала першыя месцы ў раёне і вобласці.

Па творчай прапанове і эскізе Віктара Іванавіча менскімі скульптарамі Батвінёнкам А.У., Патапавым Н.Ф. быў выраблены і ўстаноўлены на школьнай пляцоўцы помнік-манумент у памяць аб зямляках-змагарах за народное шчасце і дабрабыт. Нездарма ў лідскай газеце, на той час "Уперад" (1985 г.), была падборка матэрыялаў пра "дырэктара-архітэктара", а вёска Дворышча ўпершыню названа "аграгарадком". За планамерную і ўмелую забудову цэнтральнай сядзібы Дворышча, гаспадарка была ўзнагароджана дыпломам ВДНГ, а дырэктар Кудла В.І. - бронзавым медалём.

У эксперыментальнай базе "Ніва" кожны год праходзілі раённыя і часта абласныя семінары з удзелам кіраўніцтва вобласці і раёнаў. "Ніве" было прысвоена званне "Гаспадарка высокай культуры земляробства і жывёлагадоўлі" . Гаспадарка выйшла на перадавыя пазіцыі ў раёне па продажы бульбы (4-5 тыс. тон штогод), па вытворчасці кармоў і малака. Прыбытак гаспадаркі складаў больш за два мільёны рублёў, а сярэдняя зарплата працаўнікоў была самая высокая ў раёне і большая за сярэднерэспубліканскую. Пенсіянеры тых часоў сёння атрымліваюць пенсію ў два разы большую за цяперашніх.

Віктару Іванавічу неаднаразова прапаноўвалі ісці на павышэнне, а ён цвёрда вырашыў усе сілы і намаганні аддаць Дварышчанскаму краю. Але гэта не прайшло бясследна для здароўя. І калі дактары цвёрда сказалі, што яго сэрца больш можа не вытрымаць дырэктарскай нагрузкі, яму прапанавалі працу, як думалася, больш

спакойную - старшынём райкама прафсаюза работнікаў АПК.

Нягедзячы на значныя дасягненні па сацыяльна-эканамічным развіцці гаспадаркі, кіраўніцтву раёна не падабалася самастойна-прынцыповая пазіцыя дырэктара, а падчас і крытыка ў іх адрас. І, мажліва, таму ў раённых кіраўнікоў не знайшлося сумлення, каб па справядлівасці адзначыць сямігадовую працу ў эксбазе "Ніва" Кудлы Віктара Іванавіча ўрадавай узнагародай. І толькі пасля пераводу ў прафсаюз "удагонку кінулі" Ганаровую грамату ВС БССР.

У перыяд эканамічнай разрухі і палітычнай нестабільнасці Віктар Іванавіч, маючы актыўную грамадзянскую пазіцыю, прынцыпова стаў на абарону сацыяльна-працоўных правоў работнікаў праз заключэнне калектыўных дамоў. Прафсаюзны актыў удзельнічаў у справядлівым размеркаванні тавараў павышанага попыту, пуцёвак санаторна-курортнага лячэння. У падпарадкаваным прафсаюзу аздараўленчым лагеры "Бярозка" была праведзена значная рэканструкцыя памяшканняў, закуплена абсталяванне, мэбля і інвентар, што дазволіла значна павялічыць колькасць адпачываючых дзяцей і якасць аздараўлення. Каб прафсаюзным работнікам не жыць за кошт узносаў, было створана і працавала гаспадарча-разліковае малое прадпрыемства "Белагруда".

Віктар Іванавіч, верны сялянскаму пакліканню, пасля выхаду на пенсію сумесна з сынамі Вадзімам і Артурам арганізаваў фермерскую гаспадарку "Расінка-2002", дзе па сучасных тэхналогіях вырошчваецца прадукцыя. Узначальваючы асацыяцыю фермерскіх гаспадарак Лідчыны, стараецца адстойваць роўныя ўмовы гаспадарання для сельгасвытворцаў.

Напрыканцы лета 2015 года прайшло масавае запамінальнае свята фермераў Лідчыны з дэманстрацыяй дасягненняў фермерства, выставай старыннай рэрытэтнай сельскагаспадарчай тэхнікі і прыладаў працы.

Па ініцыятыве і пры актыўным удзеле Віктара Іванавіча было арганізавана свята роднай вёскі Драздава. Аднавяскоўцы і госці з цікавасцю выслухалі яго экскурс у мінулае вёскі, змаглі ўбачыць цікавыя архіўныя матэрыялы пра даўнейшых насельнікаў вёскі, выставу яго карцін і разьбу па дрэве…

На аснове захаваўшыхся дакументаў і ўспамінаў бацькі ў "Лідскім летапісцы" надрукаваны "Экскурс у гісторыю беларускага бежанства ў Першую сусветную вайну". А цяпер Віктар Іванавіч працуе над "Звесткамі аб сялянскім жыцці, навучэнцах і навучанні ў Ганчарскай акрузе", якія ўжо не адзін год друкуюцца ў "Лідскім летапісцы".

Абраны старшынём ветэранскай арганізацыі Дварышчанскага сельсавета. Свой аўтарытэт і здольнасці выкарыстоўвае на вырашэнне надзённых праблем ветэранаў. Былі праведзены сходы ветэранаў у вёсках і "агеньчык" "Вечар успамінаў". Заўвагі і прапановы перададзены ў сельвыканкам і дырэкцыі. На жаль, усё засталося па-за ўвагай і без выканання.

Па праекце Кудлы В.І. пад старыну быў пабудаваны з бутавага каменю васьмівугольны будынак, у якім цяпер размясцілася царква імя святой Сафіі Слуцкай. У 2014 годзе здолеў сустрэцца з архіепіскапам Гурыем і адстаяць святара ад пераводу ў іншую грамаду і абрысаваць планы па абсталяванні царквы… Актыўна займаецца краязнаўствам малой радзімы, рупліва абараняе гістарычна-архітэктурную спадчыну. На аснове сабраных ім архіўных матэрыялаў у "Лідскім летапісцы" быў апублікаваны артыкул "Дворышча". Па яго ініцыятыве летам 2021 года адзначылі 500-годдзе Дворышча. Тут былі выстаўлены яго карціны і выстава старадаўняй сельскагаспадарчай тэхнікі і сялянскіх прыладаў працы. Шукае разрабаваныя экспанаты, каб зноў абсталяваць знішчаны музей, а, мажліва, і аграсядзібу…

- Мой святы абавязак - пастарацца зрабіць як мага больш, каб гісторыя засталася ў памяці нашчадкаў.

Партрэт Віктара Іванавіча, напэўна, быў бы няпоўным без некалькіх штрыхоў аб яго здольнасцях і захапленнях. Адно з іх - гэта фатаграфіі, з якіх па жыццёвай храналогіі і пра наведванне 18-ці замежных краін, аформіў больш за 20 фотаальбомаў. Другое: здатна малюе алейнымі фарбамі на палатне карціны з роднымі краявідамі, асвоіў разьбу па дрэве і інкрустацыю, але на гэта мае мала часу…

Прысядзібны ўчастак сям'і запоўнены фруктовымі дрэвамі, вінаградам і дэкаратыўнымі туямі, якія разводзіць сам. Добры мёд дае і невялікая пасека. Альпійскую горку і газоны ўпрыгожваюць кветкі жонкі Яніны Станіславаўны, а ў адмысловых цяпліцах вырошчваецца агародніна.

І сёння Віктар Іванавіч поўны ідэй і задум. Ён ніколі не спыняецца на дасягнутым - "Увесь час у актыўным жыццёвым паходзе".



***Дзікевіч М.М.,***
***Суднік С.В.,***
***Сліўкін В.В.,***
***Яхантава В.М.***

# Жыхар Ліды зрабіў у бацькоўскай хаце тэматычны куток: там муляжы шабляў, мячоў, рыцарскія даспехі і іншыя рэчы мінуўшчыны



Для Уладзіміра Ступновіча Ліда - родны горад. Тут ён нарадзіўся, вырас, выгадаваў дачку. І хаця зараз лідзянін жыве са сваёй сям'ёй у добраўпарадкаванай кватэры ў мікрараёне Індустрыяльны, не зарастае сцяжынка і да бацькоўскай хаты, што па вуліцы Калініна, 34.

Сцены роднага дома нібыта даюць падтрымку ў жыцці, тут заўсёды адчуваеш сябе утульна. "Радавое гняздо" Уладзімір Рышардавіч наведвае амаль кожны дзень. Лета праводзіць на малой радзіме і яго сястра Святлана, якая больш за дваццаць гадоў таму пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў абласны цэнтр.



Калі ж выдаецца вольная хвілінка, Уладзімір Ступновіч, якому днямі споўнілася 60 гадоў, з задавальненнем што-небудзь майструе. Не так даўно з яго лёгкай рукі на брамцы з'явілася ўпрыгожанне - герб горада Ліды. Ідэю гаспадар хаты пераняў у жыхароў вуліцы Свярдлова, ды рэалізаваў яе трохі па-свойму. Цяпер мужчына працуе над флюгерам, які ў хуткім часе з'явіцца на даху. У бліжэйшыя планы таксама ўваходзяць добраўпарадкаванне двара і рамонт унутры дома.

- Лепш за Ліду горада няма, - упэўнены лідзянін. - Не аднойчы заўважаў: як бы добра ні было ў гасцях, а дома ўсяроўна лепей. Бо менавіта тут, у месцы, дзе ты нарадзіўся, вырас, твае карані. Напэўна, таму любоў да малой радзімы кожны чалавек нясе ў сваім сэрцы праз усё жыццё, як бы далёка яму ні было наканавана лёсам паехаць з роднай старонкі. Станоўчыя перамены, тое, што Ліда прыгажэе з года ў год, толькі радуюць. Але трэба памятаць і пра тое, што парадак і чысціня ў нашым горадзе залежаць ад кожнага, хто тут жыве.

А яшчэ Уладзімір Рышардавіч цікавіцца даўнінай, гісторыяй роднага краю. Асабліва вабіць лідзяніна сярэднявечча. З вялікім задавальненнем мужчына наведвае рыцарскія баі, што праводзяцца ў Лідскім замку, глядзіць гістарычныя фільмы. А каб наблізіць да сябе поўную рамантызму эпоху рыцарства, лідзянін нават стварыў для душы тэматычны куток. Муляжы шабляў, мячоў, рыцарскія даспехі і іншыя рэчы мінуўшчыны, многія з якіх зроблены самім гаспадаром, займаюць пачэснае месца ў хатняй экспазіцыі.

***Лілея Лапшына.***

***Леанід Лаўрэш***

# Прыход у Ракавічах

Самыя раннія звесткі аб царкве Раства Багародзіцы ўзыходзяць да 1515 г., калі пад храм была адведзена зямля і на ёй збудавалі драўляную царкву, адпаведныя дакументы яшчэ захоўваліся ў царкве ў сярэдзіне XIX ст.[1]

Можна не сумнявацца ў вышэй прыведзенай інфармацыі, бо Ракавічы згадваюцца ў 14-й кнізе Метрыкі ВКЛ, дзе змешчаны ліст ад 25.06.1524 г. *"До пана старосты городенского в справе князя Тимофея Пузыны зъ Юхном Ванкевичом и жоною его"*. Гэты ліст склаў *"дворанинъ королевое ее милости, великое кнегини Боны князь Тимофеи Пузыня"*, ён скардзіцца на дваран Юхну Ванькавіча і яго жонку. З ліста даведваемся, што князь Цімафей Пузыня разам са сваім братам князем Васілём выслужыў людзей у Гарадзенскім павеце *"у Глубокомъ, и въ Баличахъ, а в Раковичахъ"*[2]. Лідскі павет у той час яшчэ не склаўся, і яго заходняя частка належала да Гарадзекага павета. Здаецца - гэта першае згадванне Ракавічаў, якое я знайшоў.

У 1540 г. будучы праваслаўны мітрапаліт Міхаіл Дзевачка бярэ шлюб з дачкой князя Цімафея Пузыны Ганнай, і Ракавічы, разам з іншымі маёнткамі Пузынаў, становяцца яго маёмасцю. Цікава, што гэта быў другі шлюб будучага мітрапаліта Кіеўскага, Галіцкага і Усёй Русі Анісіфара Пятровіча Дзевачкі[3].

У 1690 г. святар тутэйшай царквы а. Ян Звінкоўскі меў 1 дым[4]. У падымнам рэестры 1728 г. зноў згадваецца грэка-каталіцкі святар *"а. Ян Дзванкоўскі, свяшчэннік Ракавіцкі, тры чвэрці дыма"*. Магчыма, гэта сын Звінкоўскага, але магчыма, што гэта тая самая асоба, толькі прозвішча святара замест "Звінкоўскі" пішацца як "Дзванкоўскі", што мне здаецца больш дакладным. У гэтым ж рэестры, прысутнічае *"Яп Казімір Макрэцкі з Ракавічаў-Макрацоў, тры дымы"*[5].

Дзяржаўца рагачоўскі Антон Казімір Макрэцкі (Макрыцкі) з 10.06.1728 г. быў лідскім канюшым, на пасаду лідскага чашніка намінаваны 10.02.1757 г. і займаў гэтаю пасаду да 06.02.1764 г. Памёр у траўні 1766 г.[6] Лідскі чашнік Антоні Казімір Макрэцкі прысутнічае і ў "Перапісе шляхты Лідскага павета 1765 г."[7]

У падымным тарыфе 1775 г. аднымі Ракавічам валодае сын Антона Казіміра Ян Макрэцкі, якому, як убачым ніжэй, у 1757 г. было 13 гадоў. У маёнтак Ракавічы ўваходзяць наступныя вёскі: Сухары (4 дымы), Сямягі (3 дымы), Валенчыцы (1 дым), Чэрахі (1 дым), Карповічы (1 дым).

Другімі Ракавічамі валодае таксама чын Антона Казіміра Юзаф Макрэцкі якому ў 1757 г. было 17 гадоў, ён мае вёскі: Макрацы (1 дым), Сухары (3 дымы), Мардасы (2 дымы). Пра абодвух сыноў Антон Казімір Макрэцкі пісаў у сваім тэксце, які я падам ніжэй.

А маёнткам Макрэц валодае Тадэвуш Макрэцкі[8], магчыма, брат лідскага чашніка Антона Казіміра. У вёсцы Карповічы і Турыйск ён мае 2 дымы. Таксама ў рэестры прысутнічае яшчэ адзін гаспадар Макраца Людвік Макрэцкі (мае 1 дым у вёсцы Чэрахі), і Габрыэль Макрэцкі (меў 1 дым у Чэрахах, і 1 дым у Карповічах і 1 дым здаваў шляхце ў Сухарах). Нейкай часткай Макраца таксама валодаў Антон Прастынскі і Антон Бразоўскі[9].

Антон Казімір Макрэцкі стаў галоўным героем гістарычнай аповесці Віктара Гамуліцкага (1848-1919) "Сёмы амін Ягомосці пана Макрэцкага" якая была два разы выдадзена ў Варшаве, першы раз у добрым выданні 1910 г. а другі ў серыі "Танная бібліятэка" (Bibljoreka groszowa) у 1925 г.[10] Аповесць стылізавана пад сармацкую "гавэнду" ў духу раманаў Ржавускага ці Ходзькі і расказвае пра прыгоды нашага шляхціца па імені Ягамосці Макрэцкага і яго трэці шлюб. Ідэальна напісаная аповесць пераканаўча рэканструе ментальнасць і рэлігійнасць шляхты ў другой палове XVIII ст., знаёміць з рэаліямі, характэрнымі для эпохі. Прынятая формула рамана-падарожжа дазваляла апавядальніку даехаць да ўсіх месцаў разам з выбраным героем - у магнацкую сядзібу, палац, манастыр, карчму, засценак, шляхецкую сядзібу. Гамуліцкі паказаў, як жыў шляхціц-сармат, як частаваўся, напіваўся, маліўся, спаў, любіў,

[1] Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Виленская губерния. СПб., 1861. С. 551.

[2] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 14 (1524-1529). Vilnius, 2008. P. 113.

[3] Лісейчыкаў Д.В., Бобер І.М. "Варуючы и милуючы малъжонку мою законную веньчалъную...": жыццё і смерць мітрапаліта-"дваяжэнца" Анісіфара Дзевачкі // Беларускі гістарычны часопіс. - № 5. 2018. С. 14.

[4] Metryka Litewska. Rejestry Wielkiego Ksestwa litewskiego. Wojewodztwo wilenskie 1690 r. Warszawa, 1989. S. 221.

[5] Vilnius University Library. F. 5. Ap. 8. B. 1915. Podymny rejestr szlachty powiatu Lidzkiego, 1728. Аркуш без нумара.

[6] Urzadnicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Pod redakcja Andrzeja Rachuby. Warszawa, 2004. S. 329-330; 324.

[7] Malewski Czesslaw. Popis szlachty lidzkiej z 1765 roku // Rocznik Stowarzyszenia Naukowcow Polakow Litwy. 2005. S. 168-183.

[8] Тадэвуш Макрэцкі, лідскі гараднічы ў 1770-1775 гг. - Гл: Urzadnicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Pod redakcje Andrzeja Rachuby. S. 328.

[9] Taryfa podymnego powiatu lidzkego z 1775 roku // Архіў аўтара. Арк 158 адв. - 159.

[10] Gomulicki Wiktor. Siodme amen Imci Pana Mokrzeckiego. Warszawa, 1910 (1925).




ненавідзеў і ваяваў. Як ён жыў у сваім маленькім, але цалкам упарадкаваным вясковым сусвеце. У гэтым сусвеце не было вялікіх людзей, але ўвесь твор напоўнены духам элегічнага шкадавання аб мінулых часах гістарычнай Літвы[11]. У аповесці неаднаразова згадваюцца Ліда і Ракавічы.

Відочна, што Віктар Гамуліцкі працаваў з нейкімі ўспамінамі Макрэцкага, бо фактура аповесці супадае з гістарычнымі падзеямі, а запісы Макрэцкага, з якіх пачынаецца аповесць, цалкам рэалістычныя і маюць толькі невялікія памылкі, як напрыклад замест 1757 г., калі Макрэцкі ўжо быў лідскім чашнікам, галоўны герой запісвае сябе чашнікам ужо ў 1751 г. Але, гэта цалкам зразумелая памылка пры чытанні рукапісу, бо не цяжка пераблытаць "1" і "7". Наогул, каб Гамуліцкі не меў нейкіх успамінаў лідскага чашніка, было б цалкам немагчыма зразумець, чаму аўтар, які нарадзіўся ў Астраленцы і ўсё жыццё пражыў у Варшаве, узяўся пісаць пра лідскага шляхціца, які зусім не быў магнатам, а валодаў толькі трыма дымамі. У асноўным супадае з рэальнымі гістарычнымі асобамі і інфармацыя пра яго жонак, недакладнасць з першай жонкай таксама можна палічыць за праблему чытання рукапісу. Таму, я дам пераклад тэксту, напісанага чашнікам пра сваю сям'ю, з гэтага тэксту ўзятага ў двухкоссе, і пачынаецца аповесць:

*"1751 г.*[12]*, 20 ліпеня мая наймілейшая жонка, мая дабрадзейка, развіталася, памерла а 7-й гадзіне пасля поўдня, мела яна 46 гадоў.*

*Мы жылі разам 20 гадоў з ласкі нашага Пана Бога, якія прайшлі як 20 тыдняў.*

*Пахавана яна ў ракавіцкай царкве.*

*Хай Пан Бог, Творца неба і зямлі, будзе міласцівы да яе душы і дасць ёй вечны адпачынак і пратэкцыю Найсвяцейшай Панны і ўсіх Божых святых і асабліва святых Кацярыны і Ефрасінні.*

*Аман.*

*Яе звалі Кацярына Ефрасіння з дома Гуневічаў* (магчыма, маецца на ўвазе скарбнік Гутаровіч[13])*, яе маці - Ганна з Красінскіх, гомельская старасцянка.*

*Для славы Пана Бога, Святой Тройцы і Найсвяцейшай Панны мы нарадзілі сабе сем дзетак - пяць сыноў і дзве дачкі.*

*Першы сын, Яўхім Януарый, памёр у Рагачове за два тыдні да першага годзіка і пахаваны ў рагачоўскіх базыльянаў. Хай Пан Бог, Творца неба і зямлі, прыме яго паміж анёлаў.*

*Аман. Аман.*

*Дачка Альжбета жыве, і хай Пан Бог дабраславіць яе ў далейшым жыцці, засталася без маці ў 18 гадоў.*

*Сын Юзаф мае 17 гадоў, хай жыве ў Боскім дабраславенні.*

*Сын Ян мае 13 гадоў, і дай яму, Пане, доўгі век з тваім Боскім дабраславенствам.*

*Сын Андрэй Урсын памёр у Бярдзічаве і там пахаваны ў кармелітаў - паўтара годзіка. Пане Божа Усемагутны, дай яму месца сярод анёлаў.*

*Аман. Аман. Аман.*

*Сын Станіслаў некалькі тыдняў не дажыў да першага годзіка свайго жыцця, памёр і быў пахаваны ў ракавіцкай царкве. Залічы яго, Пане, у свае палкі анёлаў, серафімаў і херувімаў.*

*Аман. Аман. Аман. Аман.*

*Дачка Урсула памерла 28 кастрычніка 1750 г., мела чатыры месяцы, пахавана ў ракавіцкай царкве. Хай ёй свеціць Вечнае святло.*

*Аман. Аман. Аман. Аман. Аман.*

*Станіслаў і Урсула з іх маці і маёй жонкай і дабрадзейкай ляжаць у адным склепе. Вечны адпачынак дай ім, Пане.*

*Дзеля памяці, гэтай маёй рукой я напісаў для памяці і, каб мае дзеці ведалі.*

*Пісана ў Ракавічах, 28 ліпеня 1751 г. Падпісана сваёй рукой: Антон Казімір Макрэцкі, чашнік Лідскага павета, ротмістр Вялікай булавы войска ВКЛ".*

На адвароце таго ж ліста Макрэцкі напісаў наступнае:

---

[11] Maria Jolanta Olszewska. Powiesci historyczne Wiktora Gomulickiego // Zeszyty Naukowe Ostroleckiego Towarzystwa Naukowego. 2008. S. 28-29.

[12] Насамрэч, відочна, што ў 1757 г.

[13] Urzadnicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Pod redakcja Andrzeja Rachuby. S. 290.

*"Першую жонку меў з дома Гальеўскіх, скарбнікаўна Ашмянскага павета*[14]*, у першым шлюбе была за Фашчам, стaрадубскім суддзём. Жыла з ім 13 гадоў, але патомства не мела.*

*Узяў першую жонку ўдавой і жыў з ёй добра і шчасліва пяць з паловай гадоў, меў анёла ў жаночай постаці. Нарадзілі з ёй дзве дачкі: Ганну і Канстанцыю.*

*Мая жонка-дабрадзейка Багуміла з Гальеўскіх памерла 1 траўня 1731 г., у дзень святых апосталаў Піліпа і Якуба.*

*Яе цела пахавана ў бабінцы гомельскага касцёла, пры касцельных дзвярах, ля самага парога, як яна сама жадала. Хай спачывае з Панам Богам адзіным у Святой Тройцы, у вечным святле, каля Найсвяцейшам Панны і ўсіх святых, а асабліва яе патронкі святой Багумілы.*

*Аман. Аман. Аман. Аман. Аман. Аман.*

*Гэта напісана 28 ліпеня 1728 г. у Ракавічах.*

*А. К. Макрэцкі"* [15].

У аповесці не згадваецца цудадзейны абраз, але, як бачым, Макрэцкі быў вельмі пабожным чалавекам і фундаванне новага будынка царквы для цудадзейнага абраза, прыблізна супадае з часам, калі ён пахаваў сваю другую жонку ў фамільным склепе ракавіцкай царквы.

Згодна з паданнем, лідскаму чашніку Антону Макрэцкаму ў сне з'явілася Найсвяцейшая Панна і сказала знайсці на рацэ яе абраз. Зранку Макрэцкі выправіўся ў паказанае месца і ўбачыў там абраз Дзевы Марыі, які рухаўся супраць воднай плыні. Макрэцкі узяў з вады ікону і насупраць таго месца, дзе яна спынілася, на свае сродкі збудаваў храм. Пазней рэчка амаль што перасохла і змяніла рэчышча, але на яе месцы стала біць цудадзейная крыніца, вада з якой ацаляла багамольцаў. Менавіта да гэтых святыняў штогод 10 жніўня і сёння ідуць паломнікі.

Па інфармацыі ракавіцкага святара і мясцовага настаўніка, якую яны далі на пачатку 1890-х гг. складальніку саліднага зборніка "Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда" Фёдару Пакроўскаму, абраз найсвяцейшай Багародзіцы з надпісам на грэцкай мове з'явіўся на грушы ў садзе Макрэцкага, *"дзе і была першачаткова пабудаваная царква"* [16].

Аднак у сучаснай праваслаўнай літаратуры, абшарнік Макрэцкі, стаў мешчанінам Макрэцкім, што ідэалагічна зразумела, бо і сапраўды, каталік Макрэцкі не мог прычыніцца да культу праваслаўнага абраза. А пра тое, што першасна абраз быў грэка-каталіцкім, а ў царкоўным склепе пахаваны жонка, дачка і сын абшарніка, і, верагодна, тут жа пахаваны і сам фундатар царквы, лідскі чашнік Антон Казімір Макрэцкі - пра гэта казаць нікому не трэба. Зразумела, што недзе там, дзе стаяла старая драўляная царква, і зараз спачываюць парэшткі Макрэцкіх.

У адрозненне ад паданняў, у фундаментальнай кнізе-даведніку "Віленская губерня" памерам больш за 700 старонак, якую ў 1861 г. выдаў капітан расійскага генеральнага штаба А. Карэва, напісана наступнае: *"Ракавіцкая драўляная св. Бараpодзіцкая царква стаіць у сяле Ракавічы ... пабудавана ў 1754 г. абшарнікам Макрэцкім. У гэтай царкве знаходзіцца цудадзейны абраз найсвяцейшай Багародзіцы"* [17]. Зразумела, што драўляны храм 1754 г. быў пабудаваны замест струхнеўшага храма, пастаўленага недзе каля 1515 г.

У 1784 г. Ракавічы - двор і царква васпанства Макрэцкіх (як бачым царква і насамрэч стаяла ў двары абшарніка, а вёска Ракавічы, "ritus graeci" (рускага абраду, г. зн. уніяцкая), належала тым жа Макрэцкім[18].

Царква ў гэтым годзе выглядала наступным чынам: *"Царква пад тытулам Унебаўзяцця Панны Марыі, фундацыі і каляцыі Яп Макрэцкіх, знаходзіцца ў Лідскім павеце і дэканаце. Драўляная, стаіць на каменным фундаменце, з дзвюма вежамі, крытая гонтай, паміж вежаў, пасярэдзіне знаходзіцца фацыята. На іх тры жалезныя крыжы, шырокі купал ... з жалезным крыжам. Ёсць малы купал з жалезным крыжам"* [19].

Звяртае ўвагу наяўнасць у царкве, фундаванай рыма-каталікам, царскіх варот і іканастаса, што ў тыя часы было ўжо выключэннем з правіл: *"Дэісус* (іканастас з абразамі дэісуснага чыну - *Л. Л.*) *з абразом св. апосталаў і прарокаў, пафарбаваныя падвойныя царскія дзверы сніцарскай работы на жалезных завесах з зашчапкай"* [20].

Цудадзейны абраз мае вялікае шанаванне: *"Алтар Дэісуса. Сталярнай работы, пафарбаваны, з абразам Найсвяцейшай Панны, ласкамі слыннай, на ім 2 срэбныя зоркі, добрая срэбная шата ..., другая срэбная белая, белых штофавых фіранак - 1 пара"* [21].

Акрамя святара (ці святароў) Яна Дзванкоўскага, нам вядомы наступныя грэка-каталіцкія святары рака-

[14] Багуслаў Гальеўскі - скарбнік Ашмянскага павета з 1737 па 1745 гг. - Гл: Urzadnicy Wielkiego Ksiestwa Litewskiego. Spisy. Pod redakcja Andrzeja Rachuby. S. 289.

[15] Gomulicki Wiktor. Siodme amen Imci Pana Mokrzeckiego. Warszawa, 1910. S. 1-4.

[16] Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. Отдел II. Вильна, 1893. С. 103.

[17] Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Виленская губерния. СПб., 1861. С. 551.

[18] Вопісы парафій Лідскага дэканату ў 1784 г. Парафія Ражанкаўская // Лідскі летапісец. 2013. №3(63). С. 23.

[19] ДГАЛ. Ф.634. Воп. 1. Спр. 53. Візіты цэркваў Лідскага і Слонімскага Дэканата. 1784 г. Арк. 113 адв.

[20] Там жа. Арк. 114.

[21] Там жа.

віцкай царквы.

У 1732 г. тут служыць а. Н. Радзевіч[22].

У 1752 г., прыкладна ў той час, калі была пабудавана новая царква і з'явіўся цудадзейны абраз, святаром ракавіцкай царквы быў а. Геранім Багдановіч[23].

А. Міхал Бубаловіч - святар царквы ў 1772-1775 гг., ён памёр да 02.08.1788 г.[24]

А. Антон Снарскі высвечаны пінска-тураўскім епіскапам Г. Дашковічам-Гарбацкім у 1782 г., у 1782 - 1784 гг. ён - вікары царквы ў мястэчку Астрына, у 1782 г. - адміністратар царквы ў Ракавічах[25].

А. Ануфры Ясінскі - з 28.05.1788 па 21.01.1792 г. святар царквы ў Ракавічах. Паходзіў з сям'і месцічаў, высвечаны мітрапалітам Л. Шаптыцкім на пасаду вікарыя царквы ў мястэчка Свіслач Менскага павета, з 1784 г. служыць у вёсцы Радамысль Жытомірскага павета, потым у Ракавічах, пасля чаго, з 1793 г. з'ўляецца адміністратарам царквы ў мястэчку Орля на Лідчыне[26].

А. Марцін Брадоўскі, ракавіцкі святар у 1795 г., *"звычаяў ухвальных, навук слабых, не найлепшы гаспадар, занядбаў плябанскую забудову"* [27].

А. Альвіян (Альбін) Фармасевіч (1797 - 09.12.1898) святар ў Ракавічах у 1832 - 1837 гг., з 1835 г. лідскі віцадэкан, меў сына Лангвіна (1824 г. н.), пахаваны каля царквы ў в. Гошчава тагачаснага Слонімскага павета[28]. Цікава, што ў сярэдзіне XIX ст. ў вёсцы Гошчава (сучасны Івацэвіцкі р-н) мясцовы святар Лангвін Фармасевіч кіраваў раскопкамі курганоў, быў самадзейным археолагам[29].

А. Альвіян Вікенцьевіч Фармасевіч нарадзіўся ў сям'і сабакінскага святара Вікенція Фармасевіча[30], і імя Альбін святар ўзяў ужо пасля скасавання уніі, хрышчаны ён быў Рамуальдам, але, пэўна, гэтае імя аказалася занадта каталіцкім. Закончыў гарадзенская вучылішча пры гімназіі, пасля чаго нейкі час служыў чыноўнікам у чыне калежскага рэгістратара. Звольніўшыся з чыноўніцкай пасады, пайшоў вучыцца ў Літоўскай семінарыі і ў 1826 г. быў высвечаны ў святары сабакінскай



***Ракавічы. Рамонт царквы каля 1900 г.***

[22] Лісейчыкаў Дзяніс. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596?1839 гг. Мінск, 2015. С. 442.

[23] Там жа. С. 124.

[24] Там жа. С. 150.

[25] Там жа. С. 485.

[26] Там жа. С. 590.

[27] Там жа. С. 147.

[28] Там жа. С. 523.

[29] Дучыц Людміла. Папярэднікі // Маладосць. 2012. № 8. С. 115.

[30] Архив Лидского благочиния. Ф.1, Вопп.1, Спр. 6. Арк. 247.

царквы, а ў 1832 г. пераведзены ў ракавіцкую царкву[31].

У 1864 г. святар ракавіцкай царквы, шчучынскі віца-дабрачынны а. Альвіян Фармасевіч, зрабіў новую падлогу і адрамантаваў падмурак старой, яшчэ ўніяцкай царквы[32].

Памёр Фармасевіч 6 лютага 1872 г., і адразу з'явіліся чуткі пра самагуубства 82-х гадовага святара. "Літоўскія Епархіяльныя ведамасці" абверглі "краснобайство" і чуткі, паведаміўшы пра смерць старога святара ад апалексічнага ўдару[33].

8 верасня 1877 г. была высвечана новая, мураваная ракавіцкая царква[34], пабудаваная ў архітэктуры псеўда-рускага стылю.

Пры канцы 1920 - пачатку 1921 г. па пастановах сялян на свой кошт у Ракавіча была адчынена беларуская школа[35].

У 1924 г. прыхаджане царквы збіралі грошы для рамонту царквы (тынкоўка, рамонт купала). Працы былі зроблены толькі ў 1926 г.[36]

Абраз Маці Божай Ракавіцкай вельмі шануецца і сёння. Штогод 9-10 жніўня шматлікія паломнікі прыходзяць у вёску Ракавічы, каб прасіць абраз аб дапамозе, падзякаваць за міласць і памаліцца.

*Дадаткі*

**Візітацыя царквы ў Ракавічах, 1784 г.[37]**

Царква пад тытулам Унебаўзяцця Панны Марыі, фундацыі і каляцыі Яп Макрэцкіх, знаходзіцца ў Лідскім павеце і дэканаце. Драўляная, стаіць на каменным фундаменце, з дзвюма вежамі, крытая гонтай, паміж вежаў, пасярэдзіне знаходзіцца фацыята. На іх тры жалезныя крыжы, шырокі купал … з жалезным крыжам. Ёсць малы купал з жалезным крыжам … Уваходныя дзверы аднастворкавыя на падвойных завесах з зашчапкай, прабоямі і навясным замком. Пасля ўваходных дзвярэй маюцца другія дзверы на завесах у чатыры створкі, дзверы пагабляваныя і пафарбаваныя, з унутраным замком. Над гэтымі дзвярыма - хоры з балясінамі. Столь з дошак, старая, падлога з дошак. 7 вокнаў. Амбон сталярнай работы, пафарбаваны. 3 лаўкі сталярнай работы. З левага боку - сакрыстыя, у якой адно акно белага шкла з акяніцай на завесах з зашчапкай, тут жа прастол з шуфлядамі. Дзверы на завесах. З правага боку каля вялікага алтара - падвойныя дзверы на завесах з зашчапкай.

**Вялікі алтар.** Сталярнай работы, пафарбаваны, з абразом … Найсвяцейшай Панны. Над алтаром праменні Святога Духа. Прастол драўляны з пафарбаванай заслонай. На ім пафарбаваная дараносіца сталярнай работы, дзе Святыя дары ў срэбнай дараносіцы з верхам і крыжыкам. Срэбнае ўкрыжаванне і дзве пары па сем падсвечнікаў. Ручнікоў - 2, адзін тканы, другі з швабскай тканіны ў кветкі. Антымінс ЯВ мітрапаліта Грабніцкага … з накрыўкай. Падушачка пад мшал. Дэісус (іканастас з абразамі дэісуснага чыну - *Л. Л.*) з абразом св. апосталаў і прарокаў, пафарбаваныя падвойныя царскія дзверы сніцарскай работы на жалезных завесах з зашчапкай, паўночныя дзверы на завесах, пафарбаваныя.

**Алтар Дэісуса**. Сталярнай работы, пафарбаваны, з абразом Найсвяцейшай Панны, ласкамі слыннай, на ім 2 срэбныя зоркі, добрая срэбная шата …, другая срэбная белая, белых штофавых фіранак - 1 пара. Уверсе абраз Пана Езуса з каронай … срэбнай. Драўляны прастол з пафарбаванай заслонай. На ім пафарбаваная алавяная дараносіца, якая замыкаецца, драўлянае ўкрыжаванне. Добрых алавяных падсвечнікаў - 2. Тканых ручнікоў … - 3. Палатняная накрыўка. Падушачка пад мшал.

**Другі алтар.** Пад Дэісусам і Небаўзяццем Панны Марыі. На ім - 4 срэбныя кароны, таблічка - 1. Шнуркоў з бісерам - 5, караляў - 4. Фіранак з кітайшчыны … - 1 пара. Уверсе абраз Найсвяцейшай Панны. На драўляным пафарбаваным прастоле - дараносіца сталярнай работы, якая замыкаецца, на прастоле драўлянае ўкрыжаванне. Драўляных падсвечнікаў - 2. Адзін ручнік. Заслона прастола пафарбаваная. Перад прастолам прыступка.

**Бакавы алтар**. Пафарбаваны, сталярнай работы з абразом св. Юзафа, на ім фіранкі з кітайшчыны … - 1 пара. Уверсе - абраз св. Антонія. На прастоле - драўлянае ўкрыжаванне. Драўляных падсвечнікаў - 2 пары. Абрус. Заслона прастола пафарбаваная.

**Царкоўнае начынне**. Срэбная даразахавальніца з крыжыкам, пазалочаная ўнутры. Срэбны пацір з дыскасам пазалочаны ўнутры. Другі срэбны, пазалочаны ўнутры пацір, паламаны …, срэбная даразахавальніца … . Сардэчак вялікіх і малых - 10 штук. Таблічак вялікіх і малых - 44 штукі. Ручак - 21 штука. … - 1 конік. Шнуркоў з перламі - 5. Сярэдніх (памераў) караляў - 2 штукі. Заручальных пярсцёнкаў шырокіх - 2. Заручальных пярсцёнкаў … - 2. Заручальных пярсцёнкаў вялікіх - 2. Бісеру - 6 шнуркоў і 8 шнуркоў большых. У кукардзе - 5 шнуркоў. Бісеру ў кароне … - 1. Кукардаў - 2, адна з … каменчыкаў, другая з бісерам. … завушнічак - 2 пары. Галантарэі з рэкліквіараў - 6. Шкаплераў - 2 пары. Універсум таблічак … сардэчка … - 4. Вага - 13 грывень і 6 лотаў. Пацір з дыскасам - 1 грыўня і 10 лотаў. Пацір з

[31] ЛЕВ. 1872. № 5. С. 153.
[32] ЛЕВ. 1864. № 7. С. 233.
[33] ЛЕВ. 1872. № 6. С. 203-207.
[34] ЛЕВ. 1877. № 39. С. 310.
[35] Ляхоўскі Уладзімір. Беларуская справа падчас польскай акупацыі 1919 - 1920 гг. // Спадчына. № 6. 1994. С. 67.
[36] Архіў аўтара.
[37] ДГАЛ. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 53. Візіты цэркваў Лідскага і Слонімскага Дэканата. 1784 г. Арк. 113 адв. - 117 адв.

дыскасам і лыжачкай срэбныя - 1 грыўня і 11 лотаў. Срэбнае ўкрыжаванне - 1 грыўня і 12 лотаў. Срэбная даразахавальніца з покрыўкай - 1 грыўня і 9 лотаў. 2-я срэбная даразахавальніца з покрыўкай - 1 грыўня і 10 лотаў. Дараносіца для хворых - 8 лотаў. Шата з каронамі і 12 зоркамі на Найсвяцейшай Панне важыць 24 грыўні. 10 званкоў важаць 2,5 фунта. Падсвечнікі алавяныя - 3 пары, важаць 54 фунты. Мерніца важыць палову фунта. Кадзіла малое … крыж працэсіяльны … дзве харугвы. Кітайка ў паскі за абразом …

Літургічнае ўбранне. Арнат штафовы … белы ў кветкі, з усім неабходным. 2-гі адамашкавы кармазынавы з белым каўняром, з усім неабходным. 3-ці … на белым фоне з каўняром, з усім неабходным. 4-ты блакітны, стары …, з усім неабходным 5-ты адамашкавы, кармазынавы. Арнат лацінскі, грэдутовы, блакітны … 2-гі … у кветкі … 2 альбы з тканіны з карункавымі гумераламі. … комжа з тканіны. Швабскіх кампаралаў - 3. Пурыфікатараў - 10.

**Кнігі.** Службоўнікаў - 2 ін-фоліо, віленскія, старыя. Трэбнік не цэлы. Стары актоіх. Мінея старая. Польская евангелічка. Метрыкі шлюбаў і пахаванняў.

**Могілкі.** Агароджаны плотам з галля. Званіца на 3 слупах з 3-ма званамі, адзін важыць паўтара камяні і другі столькі ж. Трэці паламаны, важыць 90 фунтаў. Сігнатурка ў купале - 6 фунтаў.

**Плябанія.** Першы пакой паліцца па беламу. Дзверы сталярнай работы на завесах з клямкай, 3 акны белага шкла. У другім пакоі дзверы на жалезных зашчапках з унутраным замком, 2 акны, кафляная печ на пакой і камору … У сенях - дзверы на жалезных завесах з клямкай, насупраць - пякарня, у яе дзверы на завесах, 3 акны, простая печ …

**Свіран** стары і ў дрэнным стане.

**Гумно** новае, на 6 сохах, вароты з дошак.

**Абора** добрая, на 8 сохах …

**Адрына** новая, пакрытая саломай. …

**Царкоўная зямля.** Адна ніва ва ўрочышчы Зэрдзінаўшчына, пачынаецца ад дарогі, якая вядзе з Лапатаў да Турэйска …2-я ніва пад гаем …. 3-я ніва каля ўрочышча Крывое. …

**Падданыя плябаніі.** 1-шы. Стэфан Шыш, жанаты, мае 3 сыны: Грышку, жанатага сына, Казіміра, нежанатага сына, Тамаша Міхала, нежанатага сына. Хата старая з каморай і сенямі, свіронак малы і стары, гумно на 2 сохах, малы хляўчук. 1 конь, 2 валы, 1 карова, 1 свіння, 8 авечак, зямлі палова валокі.

2-гі. Лукаш Шыш, … жанаты. Брат Стэфан нежанаты. Сын Раман, старая хата з каморай і сенямі, адрынка на дзвюх сохах і малы драўляны хлеў. 2 валы, 1 конь, зямлі палова валокі.

3-ці. Ян Шыш, жанаты. Сын Геранім. Старая хата з каморай і сенямі. Новы свіронак, новае гумно на дзвюх сохах, адрынка на 2 сохах … 1 конь, 1 вол, 2 каровы, 3 свінні, 3 авечкі.

…

**Дакументы.** Фундушу ў царквы няма. Маюцца акты візітаў: Яв святара Высеўскага ў 1758 г., Яв святара, лідскага дэкана Пятровіча ў 1766 г., Яв святара Кастрэвіча ў 1768 г., Яв святара Бялькевіча ў 1763 г. …

У гэтай царкве адміністратарам Антон Снарскі …

**Парафіяне царквы ў Ракавічах, 31 ліпеня 1829 г.**[38]

**Мястэчка Ракавічы:**

1. Ежы Стасюкевіч, 32 г.; Васіль, яго пляменнік, 18 г.; жонка Ежы Тэадора, 20 г.; дачка Тэадора, 13 г.

2. Міхал Жаўнерчык, 41 г.; яго сын Ян, 13 г.; 2-гі Андрэй, 4 г.; 3-ці Базыль, 2 г.; жонка Міхала Анастасія, 32 г.; маці Анастасіі Альжбета, 61 г.; дачка Альжбеты Ганна, 18 г.

3. Раман Стасюкевіч, 52 г.; сын Рамана Ян, 23 г.; сын Яна Юзаф, 1 г.; брат Рамана Аляксандр, 34 г.; сын Аляксандра Тамаш, 8 г.; 2-гі сын Себасцян, 6 г.; жонка Яна Клара, 18 г.; маці Клары Агата, 48 г.; Ганна, дачка Рамана, 13 г.; 2-я дачка Паўліна, 11 г.; жонка Аляксандра Пракседа, 29 г.; дачка Пракседы Петранеля, 4 г.; 2-я Крысціна, 4 г.; 3-я Кацярына, 1 г.

**Вёска Сямяхі:**

1. Якуб Бабіч, 51 г.; сын Якуба Юзаф, 26 г.; 2-гі сын Казімір, 24 г.; 3-ці сын Ян, 12 г.; сын Юзафа Мікалай, 3 г.; кузен Якуба Бабіча Пётр Кукаль, 39 г.; жонка Якуба Магдалена, 48 г.; дачка Магдалены Анастасія, 20 г.; 2-я дачка Таццяна, 11 г.; жонка Язафа Магдалена, 23 г.; жонка Казіміра Тарэза, 18 г.; жонка Пятра Барбара, 25 г.;

2. Тамаш Ступакевіч, 39 г.; сын Тамаша Даміан, 16 г.; 2-гі сын Стэфан, 11 г.; 3-ці сын Пётр, 5 г.; 4-ты сын Ежы, 1 г.; жонка Тамаша Крысціна, 33 г.; служка Мар'яна Чарняк, 18 г.; 2-я служка Антаніна Сакалоўская, 7 г.

3. Яўхім Асавік, 46 г.; сын Яўхіма Ян, 23 г.; 2-гі сын Антон, 14 г.; 3-ці сын Якуб, 10 г.; 4-ты сын Кандрат, 1 г.; Ян Трахімчык, швагер, 35 г.; сын Яна Ягор, 3 г.; жонка Яўхіма Францішка, 46 г.; дачка Францішкі Вікторыя, 20 г.; жонка Яна Ганна, 22 г.

4. Себасцян Грыневіч, сын Себасцяна Леан, брат Себасцяна Андрэй, у гэтай хаце ўсе мужчыны лацінскага абраду; жонка Себасцяна Мар'яна, 38 г.; дачка Мар'яны Антаніна, 12 г.; 2-я дачка Ганна, 7 г.; 3-я дачка Барбара, 1 г.; жонка Андрэя Ганна, 32 г.; дачка Ганны Петранеля, 1 г.

5. Міхал Асавік, 31 г.; сын Міхала Андрэй, 5 г.; брат Міхала Леан, 29 г.; сын Леана Ян, 4 г.; 2-гі брат Міхала Пётр, 20 г.; жонка Міхала Пракседа, 30 г.; дачка Пракседы Антаніна, 8 г.; 2-я дачка Антаніна, 1 г.; жонка Леана Ева, 25 г.; дачка Евы Барбара, 1 г.; сястра Міхала Тэадора, 24 г.; 2-я сястра Антаніна, 18 г.; мачаха Міхала Анастасія, 48 г.; дачка Анастасіі Магдалена, 14 г.; 2-я дачка Мар'яна, 9 г.

6. Сымон Зайчкоўскі, 56 г.; сын Сымона Ян, 28 г.; 2-гі сын Сымон, 19 г.; жонка Сымона Агнешка, 51 г.;

---

[38] ДГАЛ. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 10. Спіс парафіян Лідскага дэканату 1829 г. Парафія ў Ракавічах. А

дачка Агнешкі Тэадора, 26 г.; жонка Леана Агата, 24 г.; дачка Агаты Ганна, 5 г.

7. Ян Бабіч, 41 г.; сын Яна Мікалай, 15 г.; пляменнік Яна Марцін, 25 г.; жонка Яна Ганна, 30 г.; дачка Ганны Юстына, 8 г.; 2-я дачка Мар'яна, 5 г.; пляменніца Яна Барбара, 9 г.; дачка Марціна Юстына, 1 г.

8. Гжэгаш Асавік, 36 г.; сын кутніцы Анастасіі Міхал, 13 г.; служка Міхал Чарняк, 19 г.; Адам Цмяневіч (?) 24 г.; Міхал Залеўскі, лац. абраду; жонка Гжэгаша Ганна, 30 г.; дачка Гжэгаша і Ганны Ганна, 9 г.; здымае кут (кутніца) Анастасія Іванчык, 51 г.; служка Антаніна Асавік, 18 г.; жонка Міхала Агата, лац. абраду.

9. Ян Зайнчкоўскі, 49 г.; сын Яна Кандрат, 26 г.; 2-гі сын Фелікс, 14 г.; 3-ці сын Андрэй, 8 г.; пляменнік Яна Марцін, 27 г.; 2-гі пляменнік Ігнат, 17 г.; сын Марціна Юзаф, 1 г.; дачка Яна Зоф'я, 17 г.; жонка Кандрата Ганна, 24 г.; дачка ўдавы Кацярына Таццяна, 23 г.; 2-я дачка Пракседа, 16 г.; жонка Ігната Юстына, 22 г.

10. Сымон Ступакевіч, 29 г.; брат Сымона Міхал, 23 г.; сын Міхала Рыгор, 1 г.; 2-гі брат Сымона Тэадор, 17 г.; жонка Сымона Разалія, 26 г.; дачка Разаліі Ганна, 7 г.; 2-я дачка Кацярына, 6 г.; жонка Міхала Мар'яна, 25 г.; удава Анастасія Ступакевіч, 34 г.; дачка Анастасіі Анюта, 11 г.;

11. Яўхім Дробыш, 33 г.; сын Яўхіма Андрэй, 9 г.; 2-гі сын Яўхіма Леан, 4 г.; брат Яўхіма Антон, 19 г.; Адам Рудкевіч, лацінскага абраду; жонка Яўхіма Ганна, 31 г.; дачка Ганны Пракседа, 13 г.; 2-я дачка Мар'яна, 8 г.; 3-я дачка Тарэза, 1 г.; жонка Антона Вікторыя, 31 г.; жонка Адама Ганна, 34 г.; дачка Пракседа, 6 г.; сястра Яўхіма Тарэза, 26 г.; 2-я, родная сястра Яўхіма Тарэза, 31 г.;

12. Ежы Асавік, 41 г.; сын Ежы Цыпрыян, 11 г.; паўдомнік (здымае палову дома - *Л. Л.*) Андрэй Чарняк, 45 г.; сын Андрэя Міхал, 15 г.; 2-гі сын Мікалай, 14 г.; жонка Ежы Мар'яна, 31 г.; дачка Мар'яны Зоф'я, 9 г.; 2-я дачка Тэкля, 6 г.; 3-я дачка Марыя, 4 г.; пляменніца Ежы Ганна, 20 г.

**Вёска Мардасы:**

1. Міхал Шэўчук, 27 г.; брат Міхала Эльяш, 26 г.; 2-гі брат Ян, 13 г.; 3-ці брат Базыль, 10 г.; стрыечны брат Сымон, 41 г.; жонка Міхала Мар'яна, 26 г.; сястра Міхала Канстанцыя, 25 г.; 2-я сястра Ганна, 24 г.; 3-я сястра Кацярына, 15 г.; удава Анастасія, 56 г.

2. Мацей Шэўчук, 39 г.; сын Мацея Гжэгаш, 12 г.; 2-гі сын Мацей, 9 г.; 3-ці сын Міхал, 4 г.; пляменнік Мацея Ежы, 34 г.; сын Ежы Міхал, 8 г.; 2-гі сын Павел, 4 г.; Караль Маўкала (?), 18 г.; жонка Мацея Тэкля, 34 г.; дачка Тэклі Тэкля, 8 г.; 2-я дачка Юлька, 2 г.

3. Адам Асцюкевіч, 55 г.; сын Адама Ян, 9 г.; выхаванец Адам Асцюкевіч, 15 г.; сын Яна Барталамей, 9 г.; Тэадор Асцюкевіч, 30 г.; сын Тэадора Міхал, 4 г.; жонка Адама Люцыя, 32 г.; дачка Люцыі Зузанна, 9 г.; жонка Яна Тарэза, 44 г.; дачка Яна Барбара, 4 г.; жонка Станіслава Мар'яна, 30 г.

4. Леан Асцюкевіч, 43 г.; сын Леана Стэфан, 12 г.; пляменнік Леана Себасцян, 19 г.; сын Леана Ян, 1 г.; дачка Леана Марыля, 18 г.; 2-я дачка Міхаліна, 9 г.

5. Стэфан Шэўчук, 66 г.; сын Стэфана Ян, 25 г.; 2-гі сын Ясюк, 15 г.; пляменнік Стэфана Стэфан, 22 г.; сын Яна Стэфан, 5 г.; пляменнік Стэфана Ян, 2 г.; жонка Стэфана Крысціна, 60 г.; дачка Крысціны Кацярына, 32 г.; жонка Яна Разалія, 28 г.; дачка Разаліі Антаніна, 8 г.

6. Адам Яцкевіч, 63 г.; сын Адама Захарыюш, 32 г.; 2-гі сын Антон, 31 г.; 3-ці сын Юзаф, 12 г.; сын Захарыюша Адам, 13 г.; 2-гі сын Якуб, 10 г.; 3-ці сын Язафат, 8 г.; выхаванец Ян Шэўчук, 16 г.; пасынак Андрэй Шэўчук, 21 г.; жонка Адама Пракседа, 61 г.; дачка Пракседы Разалія, 13 г.; 2-я дачка Брыгіда, 10 г.; жонка Захарыюша Крысціна, 32 г.; дачка Крысціны Тарэза, 19 г.; 2-я дачка Хелена, 1 г.; удава Агаф'я Пузава, 61 г.; дачка Адама Ганна, 1 г.

7. Лукаш Асцюкевіч, 35 г.; сын Лукаша Ян, 16 г.; 2-гі сын Стэфан, 13 г.; 3-ці сын Якуб, 10 г.; 4-ты сын Міхал, 3 г.; жонка Лукаша Мар'яна, 32 г.; дачка Мар'яны Анастасія, 11 г.

8. Пётр Дробыш, 69 г.; сын Пятра Ежы, 30 г.; 2-гі сын Базыль, 27 г.; сын Базыля Стэфан, 5 г.; жонка Пятра Мар'яна, 52 г.; жонка Ежы Ганна, 30 г.; дачка Ганны Міхаліна, 5 г.; 2-я дачка Магдалена, 3 г.; жонка Базыля Анастасія, 25 г.; дачка Анастасіі Альжбета, 4 г.; служка Мар'яна Дробыш, 19 г.; дачка Васіля Альжбета, 1 г.

**Вёска Валанчыцы:**

1. Ян Яцкевіч, 52 г.; сын Яна Сымон, 17 г.; 2-гі сын Яўхім, 14 г.; стрый Яна Гжэгаш, 60 г.; пляменнік Яна Адам, 24 г.; жонка Адама Разалія, 27 г.; дачка Разаліі Караліна, 8 г.; удава Ганна, 56 г.; дачка Яна Ева, 8 г.

2. Леан Піліпчык, 43 г.; сын Леана Грынь, 8 г.; жонка Леана Кацярына, 32 г.; дачка Кацярыны Рэгіна, 17 г.; 2-я дачка Ганна, 9 г.; 3-я дачка Еўдакія, 4 г.; жонка Пятра Агата, 45 г.; яе дачка Тэкля, 14 г.

2. Мікалай Санчук, 24 г.; брат Мікалая Ежы, 21 г.; 2-гі брат Якуб, 20 г.; 3-ці брат Пётр, 17 г.; жонка Мікалая Мар'яна, 24 г.; дачка Мар'яны Марыя, 4 г.; жонка Якуба Кацярына, 21 г.; братавая Мар'яна, 58 г.; яе дачка Ганна, 22 г.

**Вёска Навасёлкі:**

1. Кандрат Эльяшэвіч, 53 г.; сын Кандрата Мацей, 25 г.; 2-гі сын Антон, 17 г.; 3-ці сын Ежы, 15 г.; 4-ты сын Юры, 12 г.; 5-ты сын Андрэй, 1 г.; жонка Кандрата Аксіння, 54 г.; сястра Аксінні Агата, 39 г.; жонка Мацея Кацярыны, 26 г.

2. Васіль Кратовіч, 62 г.; сын Васіля Мікалай, 33 г.; 2-гі сын Ваўжынец, 22 г.; жонка Васіля Рэгіна, 68 г.; дачка Рэгіны Петранеля, 26 г.; жонка Мікалая Аляксандра, 23 г.; жонка Ваўжынца Ганна, 22 г.; дачка Рэгіны Даміцэля, 1 г.; жонка Адама Агата, 53 г.

3. Адам Аксавік 52 г.; сын Адама Тэадор, 29 г.; 2-гі сын Юзаф, 10 г.; сын Тэадора Ігнат, 5 г.; 2-гі сын Ян, 1 г.; жонка Адама Агата, 53 г.; дачка Агаты Магдалена, 14 г.; жонка Тэадора Ганна, 33 г.

**Вёска Хільчыцы:**

1. Леан Карпяйчук, 53 г.; сын Леана Францішак, 26 г.; 2-гі сын Тамаш, 10 г.; брат Леана Ян, 48 г.; сын Яна Тэадор, 23 г.; 2-гі сын Гжэгаш, 15 г.; 3-ці сын Сымон, 7 г.; жонка Леана Элеанора, 38 г.; жонка Францішка Тэкля, 24 г.

2. Ян Шымка, 55 г.; сын Яна Ян, 24 г.; 2-гі сын Міхал, 13 г.; 3-ці сын Сымон, 10 г.; сын 2-га Яна Андрэй, 6 г.; 2-гі сын Казімір, 5 г.; жонка Яна Разалія, 18 г.

3. Міхал Шымка, 46 г.; сын Міхала Адам, 16 г.; 2-гі сын Вінцэнт, 7 г.; брат Міхала Тэадор, 56 г.; сын Тэадора Ян, 13 г.; 2-гі сын Сымон, 4 г.; 2-гі брат Міхала Юзаф, 38 г.; жонка Юзафа Анастасія, 36 г.; дачка Анастасіі Юзэфа, 12 г.; 2-я дачка Барбара, 9 г.; 3-я дачка Тэадора, 6 г.; жонка Міхала Зоф'я, 38 г.; дачка Міхала Настасся Хелена, 5 г.; дачка Юзафа Ганна, 5 г.

**Вёска Заполле:**

1. Якуб Асцюкевіч, 46 г.; сын Якуба Юзаф, 21 г.; 2-гі сын Ян, 10 г.; Ян Асцюкевіч, 83 г.; дачка Якуба Мар'яна, 16 г.; 2-я дачка Ганна, 14 г.; жонка Яна Агата, 51 г.; дачка Агаты Ева, 24 г.

2. Казімір Курыловіч, 60 г.; сын Казіміра Казімір, 21 г.; 2-гі сын Ян, 7 г.; жонка Казіміра Анастасія, 59 г.; дачка Анастасіі Агата, 21 г.; жонка Вайтовіча Мар'яна, 30 г.; дачка Мар'яны Ганна, 10 г.; жонка … Ева, 20 г.; дачка Евы Агата, 5 г.

3. Станіслаў Курыловіч, 62 г.; сын Станіслава Ян, 30 г.; жонка Станіслава Апалонія, 53 г.; здымае кут Фрызына Лішка, 48 г.; дачка Фрызыны Агата, 24 г.; 2-я дачка Анастасія, 8 г.

4. Ваўжынец Клышэвіч, 56 г.; сын Ваўжынца Юзаф, 26 г.; сын Юзафа Стэфан, 3 г.; 2-гі сын Ваўжынца Міхал, 13 г.; жонка Юзафа Ганна, 26 г.

5. Ян Асцюкевіч, 50 г.; сын Яна Стэфан, 22 г.; 2-гі сын Мацей, 20 г.; 3-ці сын Марцін, 8 г.; жонка Стэфана Мар'яна, 18 г.

6. Мацей Клышэвіч, 45 г.; сын Мацея Адам, 5 г.; брат Мацея Юзаф, 22 г.; сын Юзафа Ігнат, 1 г.; 2-гі брат Мацея Ян, 8 г.; сын Тадуша Ян, 5 г.; жонка Мацея Агата, 26 г.; дачка Агаты Ганна, 8 г.; жонка Юзафа Тарэза, 20 г.; дачка Тарэзы Анастасія, 6 г.; 2-я дачка Канстанцыя, 5 г.

7. Юзаф Пекар, 50 г.; сын Юзафа Ян, 21 г.; 2-гі сын Міхал, 10 г.; сын Казіміра Тадуш, 9 г.; 2-гі сын Казіміра Стэфан, 7 г.; маці Казіміра Агата, 51 г.; дачка Агаты Анастасія, 12 г.

8. Ваўжынец Пекар, 59 г.; сын Ваўжынца Юзаф, 11 г.; сын Базыля Ян, 40 г.; сын Тадуша Ян, 5 г.; 2-гі сын Тадуша Адам, 4 г.; пасынак Тадуша Ян, 13 г.; жонка Ваўжынца Мар'яна, 46 г.; дачка Мар'яны Агата, 18 г.; 2-я дачка Вікторыя, 17 г.; удава Крысціна Пекар, 38 г.; дачка Крысціны Ганна, 13 г.; Еўдакія, жонка Базыля, 58 г.

9. Юзаф Курыловіч, 49 г.; сын Юзафа Тадуш, 17 г.; 2-гі сын Міхал, 15 г.; 3-ці сын Казімір, 11 г.; брат Юзафа Базыль, 34 г.; Еўдакія, жонка Базыля, 58 г.; жонка Юзафа Тэадора, 50 г.; дачка Тэадоры Агаты, 13 г.; жонка Яна Лішкі Ганна, 26 г.

10. Адам Курыловіч, 26 г.; жонка Курыловіча Кацярына, 36 г.; дачка Кацярыны Агата, 18 г.; 2-я дачка Ганна, 14 г.; 3-я дачка Магдалена, 7 г.; сястра Кацярыны Магдалена, 24 г.

11. Антон Курыловіч, 51 г.; сын Антона Ян, 24 г.; 2-гі сын Мацей, 17 г.; 3-ці сын Адам, 15 г.; 4-ты сын Казімір, 11 г.; 5-ты сын Крысціян, 8 г.; сын Яна Стэфан, 4 г.; жонка Яна Мар'яна, 20 г.; дачка Антона Тарэза, 28 г.

12. Ян Курыловіч, 65 г.; сын Яна Якуб, 30 г.; 2-гі сын Адам, 26 г.; сын Адама Леан, 1 г.; 3-ці сын Яна Міхал, 15 г.; жонка Якуба Элеанора, 28 г.; швагерка Мар'яна, 21 г.

13. Казімір Курыловіч, 38 г.; сын Казіміра Міхал, 3 г.; брат Казіміра Адам, 7 г.; 2-гі сын Адама Юзаф, 1 г.; брат Казіміра і Адама Ян, 21 г.; жонка Казіміра Фрэдзя, 36 г.; дачка Фрэдзі Ганна, 17 г.; жонка Адама Настасся, 27 г.; дачка Настассі Кацярына, 4 г.; сястра Адама Мар'яна, 24 г.

**Вёска Шляхты:**

1. Якуб Шляхтун, удавец, 90 г.; сын Якуба Ян, 40 г.; сын Яна Мацей, 7 г.; 2-гі сын Ваўжынца, 3 г.; 3-гі сын Леан, 1 г.; пляменнік Якуба Юзаф, 9 г.; здымае кут Канстанты Трахімчык, 66 г.; сын Канстантага Гжэгаш, 17 г.; жонка Яна Ганна, 30 г.; дачка Ганны Францішка, 10 г.; жонка Канстантага Мар'яна, 53 г.

2. Мацей Іванчук, 50 г.; сын Мацея Ян, 20 г.; 2-гі сын Казімір, 12 г.; дачка Мацея Кацярына, 15 г.

3. Казімір Трахімчык, 40 г.; сын Казіміра Вінцэнт, 16 г.; 2-гі сын Стэфан, 9 г.; 3-ці сын Ян, г.; 4-ты сын Антон, 1 г.; пляменнік Казіміра Войцех, 13 г.; 2-гі пляменнік Юзаф, 11 г.; паўдомнік Ян Чабар, 33 г.; сын Яна Казімір, 9 г.; служка Рыгор Трахімчык, 23 г.; жонка Казіміра Тэадора, 38 г.; дачка Тэадоры Ева, 11 г.; маці Тэадоры Элеанора, 76 г.; жонка Яна Чабара Ганна, 36 г.; дачка Ганны Мар'яна, 8 г.; 2-я дачка Элеанора Ганна, 1 г.

4. Міхал Шляхтун, 25 г.; Казімір, сын Міхала, 4 г.; брат Міхала Стэфан, 17 г.; жонка Міхала Ганна, 26 г.; дачка Ганны Мар'яна, 7 г.; 2-я дачка Войцеха Анастасія, 10 г.; удава Мар'яна Шляхтун, 38 г.; дачка Мар'яны Люся, 19 г.; 2-я дачка Ганна, 14 г.; 3-я дачка Агата, 11 г.; 4-я дачка Стэфана, 9 г.;

5. Казімір Шляхтун, 26 г.; брат Казіміра Пётр, 18 г.; 2-гі брат Антон, 11 г.; Мікалай Шляхтун, 40 г.; служка Ян Чабан, 27 г.; Канстанцыя маці гэтых, 41 г.; жонка Мікалая, Ганна, 28 г.; дачка Ганна Тарэза, 1 г.

6. Антон Рымка, 26 г.; брат Антона Леан, 11 г.; стрый Антона Леан, 30 г.; удава Мар'яна, 46 г.; дачка Мар'яны Мар'яны, 16 г.; 2-я дачка Канстанцыя, 9 г.; жонка Леана Мар'яна, 27 г.

7. Марцін Іванчук, 79 г.; жонка Марціна Мар'яна, 70 г.; дачка Мар'яны Ганна, 27 г.; 2-я дачка Тарэза, 24 г.; 3-я дачка Зоф'я, 16 г.; жонка Марціна Тарэза, 27 г.

**Вёска Лагоды:**

1. Ян Каспяровіч, 59 г.; пляменнік Яна Міхал, 20 г.; здымае палову дома Войцех Шляхтун, 38 г.; сын Войцеха Войцех, 17 г.; швагер Войцеха Гжэгаш, 32 г.; сын Гжэгаша Андрэй, 2 г.; 2-гі сын Тэадор, 1 г.; служка

Пётр Шляхтун, 13 г.; жонка Яна Анастасія, 40 г.; дачка Анастасіі Ганна, 18 г.; жонка Войцеха Тарэза, 33 г.; дачка Войцеха і Тарэзы Ганна, 6 г.; жонка Гжэгаша Зоф'я, 28 г.; дачка Зоф'і Агата, 4 г.; маці Міхала Кацярына, 56 г.

2. Ян Ліпскі, 51 г.; сын Яна Пётр, 26 г.; 2-гі сын Казімір, 19 г.; сын Пятра Ян, 2 г.; жонка Яна Агата, 46 г.; дачка Агаты Ганна, 14 г.; маці Яна Барбара, 70 г.; жонка Францішка Ганна, 32 г.; дачка Ганны Тарэза, 6 г.; жонка Мацея Тарэза, 18 г.; дачка Тэрэзы Агата, 1 г.

3. Тэадор Трахімчык, 69 г.; сын Тэадора Ян, 36 г.; 2-гі сын Пётр, 24 г.; 3-ці сын Андрэй, 14 г.; жонка Тэадора Кацярына, 59 г.

4. Пётр Лагоцкі, 50 г.; брат Пятра Ян, 35 г.; сын Яна Казімір, 17 г.; 2-гі сын Мікалай, 9 г.; 3-гі сын Андрэй, 2 г.; жонка Яна Кацярына, 30 г.; дачка Кацярыны Ганна, 8 г.; 2-я дачка Анастасія, 7 г.; 3-я дачка Магдалена, 4 г.; 4-я дачка Крысціна і Петранеля, 1 г.; здымае кут Агата Путраневіч, 47 г.

**Вёска Слушкі:**

1. Удавец Ян Сыч, 55 г.; пляменнік Яна Мацей, 35 г.; сын Мацея Мацей, 6 г.; 2-гі сын Сымон, 3 г.; служка Сымон Краскоўнік, 23 г.; Петранеля, жонка Мацея, 30 г.; дачка Петранелі Ганна, 1 г.; сястра Мацея Магдалена, 23 г.

2. Міхал Ліпскі, 40 г.; сын Міхала Юзаф, 17 г.; 2-гі сын Казімір, 12 г.; 3-ці сын … Аляксандр, 7 г.; Станіслаў брат Міхала, 32 г.; жонка Міхала Агата, 38 г.; дачка Агаты Петранеля, 15 г.; 2-я дачка Агата, 8 г.; 3-я дачка Тарэза, 11 г.; 4-я дачка Ганна, 1 г.; жонка Станіслава Еўдакія, 30 г.; жонка Гжэгаша Таццяна, 54 г.; дачка Таццяны Аляксандра, 24 г.; жонка Яна Тарэза, 19 г.; дачка Тарэзы Юлія, 4 г.; жонка Казіміра Анастасія 20 г.; дачка Анастасіі Кацярына, 5 г.

3. Ян Пятраневіч, 40 г.; сын Яна Гжэгаш, 17 г.; 2-гі сын Юзаф, 11 г.; жонка Гжэгаша Зоф'я, 23 г.; цётка Яна Агата, 66 г.

4. Тамаш Васільчык, 40 г.; сын Тамаша Ян, 13 г.; 2-гі сын Юзаф, 11 г.; 3-ці сын Хілярый, 9 г.; 4-ты сын Міхал, 1 г.; брат Тамаша Францішак, 37 г.; сын Францішка Мікалай, 11 г.; 2-гі сын Міхал, 10 г.; 3-ці сын Андрэй, 1 г.; здымае кут Адам Ліварtоўскі, 51 г.; сын Адама Мікалай, 1 г.; сястра Тамаша Тарэза, 30 г.; дачка Францішка Марыя, 4 г.; 2-я дачка Ева, жонка Адама Тарэза, 40 г.; сястра Тарэзы Аляксандра, 29 г.; 2-я сястра Наталля, 25 г.

**Вёска Трафімчыкі:**

1. Тамаш Трахімовіч, 73 г.; сын Тамаша Лукаш, 40 г.; сын Лукаша Юзаф, 1 г.; брат Тамаша Андрэй, 35 г.; жонка Тамаша Зоф'я, 71 г.; жонка Лукаша Мар'яна, 34 г.; дачка Мар'яны Тарэза, 17 г.; 2-я дачка … Юстына, 8 г.; жонка Андрэя Тарэза, 32 г.; здымае кут Агата Пятраневіч, 45 г.

2. Ян Трахімчык, 40 г.; сын Яна Казімір, 12 г.; 2-гі сын Ян, 8 г.; 3-ці сын Леан, 4 г.; служка Ян Васільчык, 27 г.; дачка Яна Зоф'я, 16 г.; 2-я дачка Мар'яна, 15 г.; 3-я дачка Петранеля, 1 г.; дачка Васільчыка Петранеля, 5 г.; 2-я дачка Ганна, 2 г.

3. Яўстах Трахімчык, 56 г.; яго сын Ян, 26 г.; 2-гі сын Андрэй, 8 г.; 3-ці сын Стэфан, 4 г.; Якуб, сын Гжэгаша, 8 г.; жонка Яўстаха Зоф'я, 34 г.; маці Яўстаха Зоф'я, 76 г.

4. Павел Трахімчык, 68 г.; Адам, сын Паўла, 29 г.; 2-гі сын Юзаф, 26 г.; 3-ці сын Якуб, 15 г.; пляменнік Паўла Міхал, 25 г.; 2-гі пляменнік Юзаф, 22 г.; жонка Адама Барбара, 27 г.; дачка Барбары Разалія, 5 г.; 2-я дачка Анастасія, 1 г.; служка Ганна Верамейчык, 18 г.; 2-я служка Петранеля Верамейчык, 10 г.

5. Юзаф Трахімчык, 66 г.; сын Юзафа Яўстах, 21 г.; 2-гі сын Ежы, 9 г.; Якуб, брат Юзафа, 53 г.; сын Якуба Станіслаў, 11 г.; 2-гі сын Леан, 9 г.; дачка Якуба Тарэза, 8 г.; 2-я дачка Зоф'я, 7 г.; дачка Юзафа Мар'яна, 2 г.; швагерка Якуба Тарэза, 49 г.; 2-я швагерка Барбара, 46 г.

6. Казімір Трахімчык, 40 г.; сын Казіміра Ян, 13 г.; 2-гі сын Міхал, 1 г.; брат Казіміра Марцін, 37 г.; сын Марціна Ян, 12 г.; 2-гі сын Андрэй, 5 г.; жонка Казіміра Юльяна, 36 г.; дачка Юльяны Тарэза, 7 г.; жонка Марціна Маря'на, 26 г.; дачка Маря'ны Ганна, 9 г.; 2-я дачка Агата, 2 г.

**Вёска Філіпавічы:**

1. Барталамей Канюк, 56 г.; сын Барталамея Ян, 32 г.; 2-гі сын Андрэй, 7 г.; жонка Барталамея Ульяна, 47 г.; дачка Ульяны Ганна, 16 г.; жонка Яна Зоф'я, 33 г.; дачка Зоф'і Разалія, 8 г.; 2-я дачка Марыля, 6 г.; дачка Тарэзы Зоф'я, 8 г.

2. Ігнат Канюк, 31 г.; брат Ігната Юзаф 29 г.; сын Юзафа Дамінік, 7 г.; 2-гі сын Сымон, 5 г.; сын Тамаш, 9 г.; сын Гжэгаш, 8 г.; жонка Ігната Тэкля, 22 г.; жонка Юзафа Еўфрасіння, 26 г.; Францішка, дачка Крысціны, 18 г.

**Вёска Ручыцы:**

1. Юзаф Асцюкевіч, 29 г.; сын Юзафа Сымон, 8 г.; 2-гі сын Астап, 4 г.; брат Юзафа Людвіг, 16 г.; сын Сымона Рудкевіча Антон, 2 г.; служка Антон Цяміновіч, 15 г.; сын Юзафа Асцюкевіча Мікалай, 1 г.; сын Антона Яўстах, 1 г.; жонка Юзафа Кацярына, 23 г.; сястра Юзафа Мар'яна, 15 г.; здымае кут Мар'яна, 40 г.; яе дачка Брыгіда, 9 г.; Мар'яна Рудкевіч, 26 г.; удава Сымона Рудкевіча, 32 г.; дачка Антона Марыя, 4 г.; 2-я дачка Юльяна, 1 г.;

2. Мужчыны рымскага абраду; дачка Захара Ганна, 4 г.; жонка Міколы, 29 г.; Агата, жонка Ежы, 50 г.; дачка Агаты Анастасія, 11 г.; 2-я дачка Кацярына, 10 г.; жонка Яна Мар'яна, 26 г.; дачка Мар'яны Ганна, 7 г.; жонка Станіслава Мар'яна, 30 г.; дачка Мар'яны Петранеля, 3 г.; жонка Юзафа Мар'яна, 22 г.; служка Антаніна Сакалоўская, 17 г.

**Вёска Сямянякі:**

1. Леан Лёсік, 67 г.; Мар'яна, жонка Леана, 50 г.

2. Кандрат Гайла, 17 г.; брат Кандрата Якуб, 15 г.; 2-гі брат Габрыель, 11 г.; 3-ці брат Міхал, 10 г.; стрый Кандрата Стэфан, 40 г.; сын Стэфана Кандрат, 7 г.; брат Стэфана Сымон, 30 г.; сын Сымона Раман, 7 г.; 2-гі сын Андрэй, 6 г.; 3-ці сын Філіп, 5 г.; брат Стэфана Андрэй,

27 г.; сын Андрэя Антон, 3 г.; сястра Кандрата Марыля, 5 г. жонка Сымона Апалонія, 29 г.; дачка Апалоніі Люцыя, 7 г.; жонка Андрэя Ганна, 20 г.

3. Васіль Астаповіч, 44 г.; сын Васіля Юзаф, 16 г.; 2-гі сын Мікалай, 11 г.; 3-ці сын Габрыэль, 9 г.; 4-ты сын Лукаш, 7 г.; 5-ты сын Максім, 4 г.; брат Васіля Сымон, 30 г.; сын Сымона Ян, 4 г.; жонка Васіля Еўфрасіння, 37 г.; дачка Еўфрасінні Анастасія, 13 г.; жонка Сымона Ганна, 27 г.; дачка Ганны Мар'яна, 9 г.; 2-я дачка Язафата, 5 жонка Юзафа Марыля, 20 г.; дачка Марылі Петранеля, 5 г.

**Вёска Сухары:**

1. Даміан Піліпчык, 73 г.; сын Даміана Ян, 30 г.; 2-гі сын Юзаф, 28 г.; 3-ці сын Сымон, 25 г.; брат Даміана Андрэй, 71 г.; сын Яна Рыгор, 4 г.; сын Сымона Рыгор, 5 г.; сын Юзафа Ігнат, 2 г.; жонка Яна Мар'яна, 29 г.; дачка Мар'яны Анеля, 6 г.; жонка Юзафа Ганна, 28 г.; дачка Ганны Ульяна, 5 г.; жонка Сымона Анастасія, 24 г.; дачка Даміана Мар'яна, 15 г.

2. Вінцэнт Лясіца, 25 г.; сын Вінцэнта Ягор, 8 г.; 2-гі сын Базыль, 4 г.; Антон Гайла, 50 г.; сын Антона Якуб, 1 г.; жонка Вінцэнта Ганна, 24 г.; дачка Ганны Петранеля, 3 г.; дачка Яна Гайлы Юстына, 1 г.; сястра Яна Агаф'я, 32 г.; дачка Агаф'і Аляксандра, 10 г.; удава Анастасія, 48 г.; дачка Анастасія, Ганна, 11 г.; 2-я дачка Ганна, 6 г.

3. Яна Гайла, 46 г.; сын Яна Якуба 9 г.; 2-гі сын Канстанты, 8 г.; жонка Яна Анастасія, 36 г.; дачка Анастасіі Аляксандра, 15 г.; 2-я дачка Петранеля, 10 г.; 3-я дачка Маря'на, 7 г.; 4-я дачка Юстына, 2 г.; жонка Мацея Аляксандра, 48 г.; маці Мацея Петранеля, 75 г.

4. Аляксандр Піліпчык, 39 г.; сын Аляксандра Ігнат, 8 г.; брат Аляксандра Мікалай, 37 г.; жонка Аляксандра Тэадора, 38 г.; дачка Тэадоры Анастасія, 6 г.; маці Тэадоры Ганна, 57 г.; жонка Мікалая Барбара, 32 г.

5. Пётр Каліноўскі, 36 г.; сын Пятра Павел, 9 г.; 2-гі сын Гжэгаш, 2 г.; стрый Пятра Юзаф, 35 г.; сын Юзафа Мікалай, 11 г.; 2-гі сын Ян, 9 г.; жонка Пятра Кацярына, 33 г.; дачка Кацярыны Таццяна, 13 г.; 2-я дачка Паўліна, 3 г.; 3-я дачка Анастасія, 2 г.; жонка Юзафа Тэадора, 34 г.; дачка Тэадоры Францішка, 8 г.; 2-я дачка Петранеля, 5 г.; удава Анастасія, 45 г.

6. Андрэй Каліноўскі, 50 г.; сын Андрэя Ян, 26 г.; жонка Андрэя Таццяна, 49 г.; дачка Таццяны Тарэза, 19 г.; жонка Яна Мар'яна, 26 г.; дачка Мар'яны Паўліна, 6 г.; 2-я дачка Ганна, 4 г.

7. Андрэй Стасюкевіч, 40 г.; сын Андрэя Стэфан, 8 г.; 2-гі сын Сымон, 5 г.; брат Андрэя Раман, 22 г.; маці Андрэя Аксіння, 69 г.

8. Аляксандр Лясіца, 37 г.; сын Аляксандра Юзаф, 5 г.; жонка Аляксандра Мар'яна, 33 г.; дачка Мар'яна Анастасія, 11 г.

У гэтай жа парафіі па дварах, ваколіцах і засценках абодвух палоў грэка-уніятскага абраду:

**Двор Ракавічы Ігната Макарэвіча:**

1. Ян Піліпчык, 38 г.; Павел Піліпчык, 21 г.; Ян Дземянчук, 18 г.; Раман Сяргяевіч, 14 г.; жонка Яна Піліпчыка Анастасія, 30 г.; дачка Ганна, 20 г.

**Макрэц Крыштапоўскі:**

2. Мужчыны лацінскага абраду; Пракседа Жаўнерык, 20 г.; Мар'яна Задрога, 19 г.; яе сястра Агаф'я, 21 г.; 2-я сястра Апалонія, 15 г.

**Макрэц Андрэеўскі.**

3. Аляксандр Канюк, 20 г.; Юзаф Канюк, 17 г.; жонка Анастасія, 19 г.; Зоф'я Валовіч, 26 г.;

**Двор Уніхаўшчына:**

4. Пётр Кралевіч, 18 г.; Сымон Жаўнерчык, 15 г.; Якуб Цямяновіч, 17 г.; Ян Герамчук, 15 г.; Апалонія Бабіч, 50 г.; Ева … 14 г.; Разалія Зайкоўская, 12 г.; Мар'яна Чарняк, 16 г.

**Двор Хільчыцы:**

5. Раман Санчук, 32 г.; Рыгор Яцкевіч, 50 г.; Эльяш Шанчук, 17 г.; Ганна Яхімовіч, 40 г.; Канстанцыя Галавач, 15 г.; Крысціна Казлова, 18 г.; Аляксандра Яхімовіч, 14 г.

**Двор Ражанка:**

6. Адам Патапчык, 49 г.; сын Адама Ежы, 9 г.; 2-гі сын Феля, 6 г.; Тэадор Хвядчук, 42 г.; Мікалай Алісерка, 52 г.; Ян Путрашка, 40 г.; Ян Пранкевіч, 50 г.; Ян Якусік, 48 г.; Васіль Кароўскі, 52 г.; сын Васіля Ежы, 31 г.; 2-гі сын Юзаф, 27 г.; Францішак Шутовіч, 43 г.; Лукаш Максімчык, 56 г.; Стэфан Путрашка, 35 г.; Андрэй Рымка, 38 г.; жонка Яна Путрашкі Пракседа, 36 г.; жонка Яна Пранкевіча Тарэза, 32 г.; жонка Яна Якусіка Агата, 28 г.; Зоф'я Тамковіч, 68 г.; Ганна Бачка, 27 г.; жонка Макара Ганна, 25 г.; Ева Бабрыцкая, 30 г.; Барбара Насюр, 39 г.; Разалія Трахімчык, 37 г.; Мар'яна Адашка, 35 г.

**Ваколіца Пашыцы:**

7. Тэадор Суднік, 50 г.; Тэадор Лашынскі, 40 г.; Юзаф Пілецкі, 30 г.; Ян Мякевіч, 38 г.; Аляксандра Ненартовіч, 50 г.; Кацярына …, 35 г.; Пракседа Баўкевіч, 38 г.; Таццяна Саўчанка, 18 г.

Разам у парафіі мужчын: да споведзі - 314, не да споведзі - 124.

Разам у парафіі жанчын: да споведзі - 300, не да споведзі - 119.

*Інвентар склаў святар Язафат Жукоўскі.*

***Леанід Лаўрэш***

# Новае пра цэрквы Лідчыны ў другой палове XIX - першай палове XX стст.

Рыхтуючы матэрыял пра стаўленне кіраўніцтва Літоўскай праваслаўнай епархіі да беларускага адраджэння ў 1910-х гг., я чарговы раз перагартаў усе нумары “Літоўскіх епархіяльных ведамасцей” і “Весніка Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва”. Паралельна з нарыхтоўкай матэрыялаў па тэме, зрабіў шмат выпісак пра жыццё лідскіх цэркваў. Гэтыя нарыхтоўкі, разам з многімі іншымі матэрыяламі і ляглі ў аснову артыкула.

**Лідская Свята-Георгіеўская царква**

Свята-Георгіеўская царква пабудавана з дрэва ў 1875 г. на сродкі Антона Васнеўскага[1]. Прэса паведамляла: "*25 кастрычніка, Лідскім дабрачынным высвечана новапабудаваная драўляная царква ў імя Вялікапакутніка Георгія на Лідскіх могілках. Царква каштуе 1878 руб. 62 кап., якія ахвяраваў аднадворац Антоні Васнеўскі.*

*Перад высячэннем могілкавай царквы зроблены наступныя ахвяраванні:*

*- ад жонкі генерал-маёра Маўраса, Кацярыны Маўрас, 30 рублёў.*

*- ад судовага следчага Наўродскага-Апашанскага, ядвабны ўбор на прастол, ядвабнае малінавае пакрывала на прастол, палатняныя сурвэткі на прастол, убор для ахвярнікаў і столік, разам на суму 60 рублёў.*

*- ад міравога пасярэдніка Фларыяна Лаўрыновіча, абраз Іверскай Божай Маці ў кіёце і пазалочаным акладзе, з меднай пазалочанай лампадкай, усё - 30 рублёў.*

*- ад судовага прыстава Сцепуржынскага лампадка за 8 руб.*

*- ад дзяцей нябожчыка Васнеўскага - будаўніка гэтай царквы, абраз Віленскіх пакутнікаў з лампадкай коштам 10 руб*[2] (абраз прысутнічае ў царкве і сёння - *Л. Л.*)".

Аднадворац - гэта шляхціц які не змог пацвердзіць свае шляхецкае паходжанне. Гэта ўскосна пацвярджаецца публікацыяй у “Літоўскіх Епархіяльных ведамасцях”: *"На праваслаўных могілках знаходзіцца невялікая але вельмі прыгожая драўляная царква, пабудаваная ў 1875 г. за грошы, ахвяраваныя адным лідскім гараджанінам рыма-католікам"*[3]. Дадам, што ў 1842 г. Васнеўскія валодалі маёмасцю ў Кір'янаўцах (Лідская парафія) і ў ваколіцы Ваўчкі (Жалудоцкая парафія)[4].

Рускі афіцэр Іван Любарскі, які да 1863 г. служыў у Лідзе, у сваіх белетрызаваных мемуарах некалькі разоў піша пра мясцовага чалавека, ардынатара вайсковага шпіталя ў Лідзе, доктара Гілярыя Васнеўскага, які максімальны лаяльна ставіўся да ўлады[5]. Успаміны Любарскага напісаны праз 30 гадоў пасля падзей, якія яны апісваюць, і таму аўтар мог забыць сапраўднае імя доктара. Таму, магчыма, што менавіта доктар Васнеўскі фундаваў гэтую царкву. Але, гэта толькі версія.

3 - 4 траўня 1914 г. літоўскі архіепіскап Ціхан (будучы патрыярх Ціхан) наведаў горад Ліду. На другі дзень, пасля службы ў царкве, *"уладыка адправіўся ў царкву на могілках, агледзеў яе і здзейсніў кароткі малітваслоў на магіле нядаўна памёршай жонкі протаіерэя Каяловіча"* [6].

У верасні 2009 г., праз 90 гадоў пасля смерці, камісія ў складзе 6-ці святароў знайшла месца пахавання Іосіфа Каяловіча, бо на той час месца пахавання святара было страчана. Было вядома, што ён пахаваны ў сямейным склепе недалёка ад алтарнай часткі Свята-Георгіеўскай царквы. І насамрэч на поўнач, каля храма, меўся сямейны склеп Каяловічаў, які меў наступны выгляд: на паверхні зямлі, бетоннымі борцікамі быў агароджаны ўчастак зямлі памерам 4 х 10 метраў. Унутры агароджы меліся два мармуровыя помнікі, а ўся паверхня выкладзена керамічнай пліткай. Адзін помнік быў Андрыяну Каяловічу (21.02.1861 - 29.03.1882, сын протаіерея), другі Ізабелі Маліцкай (памерла 25.12.1904 на 76-м годзе жыцця, верагодна, цёшча протаіерэя). Паміж помнікамі было месца на яшчэ адну магілу, таксама вольнае месца мелася ўправа ад магілы Маліцкай. Па ўспамінах, Каяловіча пахавалі тайна, паміж магіламі сына і Маліцкай.

Таму ў верасні 2009 г. была знята керамічная плітка і на глыбіні 25 см знойдзена трохслойная цагляная кладка залітая зверху бетонам. Пад кладкай знайшлі цаглянае скляпенне і ўваход у склеп. У склепе стаяла вялікая цынкавая труна з чатырма ручкамі і бронзавым ўкрыжаваннем на верхнім вечку. Труну ускрылі і там знайшлі шкілет чалавека апрануты ў вопратку: *"Чэрап*

[1] Литовские Епарх. Ведомости № 43-1887. С. 370.

[2] ЛЕВ. 1875. № 47. С. 391.

[3] ЛЕВ. 1887. № 43. С. 370.

[4] Malewski Czeslaw. Rodziny szlacheckie na Litwie w XIX wieku. Powiaty lidzki, oszmianski i wilenski. Warszawa, 2016. S. 213.

[5] Любарский И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний). // Исторический вестник. Март, 1895. С. 833., 834., 838.

[6] Первое обозрение Высокопреосвященным Тихоном Литовской епархии // Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 13. С. 293.

*цёмна-карычневага колеру, адзенне, прадметы, кісці рук у асноўным чорнага колеру".* Так была знойдзена верагодная магіла жонкі протаіерэя Лізаветы Каяловіч.

Потым ускрылі вольнае месца каля магілы Ізабелі Маліцкай і таксама знайшлі цагляны склеп у якім чамусьці без труны, ляжалі чалавечыя парэшткі ў сатлелым святарскім убранні. Труна цалкам струхнела і былі бачны толькі кавалкі дрэва[7]. Так былі знойдзены парэшткі былога лідскага дабрачыннага.

Перад наступам немцаў, у канцы лета 1915 г. протаіерэй Каяловіч эвакуіраваўся з Ліды ў Петраград і жыў тут па адрасе: Кабінетная вул., д. 9, кватэра прафесара Тэхналагічнага інстытута Б. М. Каяловіча[8], пляменніка святара і сына гісторыка М. Каяловіча. Як і іншыя былыя гаспадары нашага краю, збег ад бальшавікоў з Расіі і вярнуўся на радзіму ў канцы 1918 г. Але да гэтага часу на радзіме ўсё памянялася, і былыя гаспадары цалкам страцілі свой уплыў. Гэтыя людзі працяглы тэрмін, як маглі, сціскалі спружыну людскіх пачуццяў, вайна абвастрыла норавы людзей, і шмат хто з іх, у тым ліку і Каяловіч, заканамерна патрапілі пад удар адваротнага ходу спружыны гісторыі. Але гэта гісторыя вядомая, і я не буду зноў пісаць пра яе[9]. Дадам толькі, што протаіерэй Каяловіч усё жыццё быў зацятым русіфікатарам і таму меў да сябе адпаведныя адносіны з боку лідзян[10].

Жыхар г. Ліды пісаў у 1923 г. у беларускай газеце "Новае Жыццё": *"З прыходам сюды польскай улады была адабрана ад праваслаўных беларусаў ядыная ў месце царква* (Святога Арханёла Міхаіла - *Л. Л.*)*. Уся зямля, належачая да царквы, адабраная ад царкоўнага прычта, а таксама і дом, які быў пабудаваны высілкамі праваслаўнай парафіі. Сьвяшчэннік пазбаўлены сваёй кватэры і прымушаны мець куток для сябе ў прыватнай сямьі. Праваслаўных парахвіян Лідскае царквы налічваецца да 4000 чалавек, якія ... прымушаны сілай рэчаў маліцца ў невялічкай цэркаўкекаплічцы на могілках, якая знаходзіцца ад цэнтра места, пры выезьде з Ліды, і ў ранейшыя часы была толькі местам адпявання нябожчыкаў. Царква гэтая ніколі ў сьвяточныя дні, а асабліва ў такія сьвяты, як Каляды, Вялікдзень, ня можа зьмесціць і дзесятай часткі ўсіх, якія хочуць памаліцца"* [11].

Мемуарыстка Яўгенія Ямант пісала што ў Лідзе была *"маленькая праваслаўная царква на могілках. У гэтую царкву з нашага дома трэба было ісці праз усю Сувальскую вуліцу. На могілкі ўваходзілі праз вялікія драўляныя вароты з разьбой блакітнага колеру. Ад варот, якія падчас службы былі адкрытымі, шырокая алея сярод высокіх дрэў на могілках вяла да самога храма. Уздоўж галоўнай алеі стаялі лаўкі, абапіраючыся на старыя металічныя магільныя агароджы. Старажытныя шэрыя помнікі выглядалі велічна. Я не баялася гэтых магіл. Наадварот любіла гуляць па алеі сярод іх.*

*Адразу за царквой знаходзіліся магілы бацькоў маёй мамы. Мама неяк прывяла нас сюды і патлумачыла, хто ляжыць пад гэтым велізарным драўляным крыжам. Пазней мы заўсёды, калі прыходзілі ў царкву, ішлі да гэтых сціплых магіл. Царква была занадта малая, каб у нядзелю змясціць усіх вернікаў. Усярэдзіне было цесна, усе стаялі прыціснуўшыся адзін да аднаго, у кожнага было сваё звычайнае месца. Служба цягнулася да бясконцасці, таму некаторыя спецыяльна прыходзілі пазней і прабіраліся наперад. Наадварот, тыя, хто стаяў наперадзе, прагнулі глынуць свежага паветра. Так што перакартоўка і таўкучка працягваліся бесперапынна. [..]*

*Наша царква была драўлянай, з двума цудоўнымі купаламі-цыбулінамі, пафарбаваная ў блакітны колер. З-за яе невялікіх памераў хор размяшчаўся з правага боку ад царскіх варот. Як вядома, служба ў царкве праходзіць выключна ў суправаджэнні хору. У харыстаў быў асобны ўваход на клірас праз вузкія дзверы. Гэтыя дзверы, клірас і харысты былі для мяне чымсьці незвычайным і недасягальным. Я адчувала іх нейкую святасць.*

*Я звычайна стаяла каля кліраса, услухоўваючыся ў асобныя галасы і адчувала праўдзівую асалоду. Ва ўрачыстыя хвіліны, калі стоячы на каленях, глядзела на свет у высокім акне купала, а мелодыя падымалася ўсё вышэй і вышэй, я адчувала, што мая душа выносіцца разам з ёй. Моцныя галасы пеўчых дасягалі кожнага кутка скляпення, кружыліся там і чароўным дажджом абсыпаліся на галовы стаяўшых на каленях людзей - і на маю таксама. [..]*

*Зімы тады былі марозныя. Халадней за ўсё станавілася на "Вадохрышча", г. зн. 6 студзеня па старым Юліянскім календары, або па так званым старым стылі. У той дзень з царквы ў бок Лідзейкі адпраўляўся хрэсны ход. Натоўп рухаўся павольна, з харугвамі над галовамі. Бацюшка Багаткевіч ішоў пад балдахінам, акружаны вернікамі. Высока над галавой ён трымаў абедзвюма рукамі крыж. Памятаю яго чырвоныя ад марозу далоні і здзіўленне - як ён мог вытрымліваць такі мароз. Дарога была доўгай. З царквы ішлі праз усю Сувальскай вуліцу, затым па Замкавай у наш бок міма замкавых руін выходзілі на вуліцу Гражыны да алтара, пабудаванага перад другім мостам над ракой. Мама казала, што бацюшка засцерагае рукі ад марозу, шаруючы іх спіртам. Але я ўсё роўна дзівілася і вельмі яго шкадавала. Пазней ён прыходзіў да нас на Каляды"* [12].

Ямант пісала, што *"бацюшка Багаткевіч ... быў*

---

[7] Электронны архіў аўтара.

[8] ЛЕВ. 1916. № 3. С. 11.

[9] Гл: Лаўрэш Л. Л. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900-1939 гг. Гродна, 2017. С. 109.

[10] Гл. напрыклад: Лаўрэш Леанід. Ксёндз Юзаф Бародзіч і яго ўспаміны, датычныя Ліды // Лідскі летапісец, 2020. 1(89). С. 76-80.

[11] Новае Жыццё № 2, 10 сакавіка 1923.

[12] Ярмонт Е. В тени замка Гедемина. Лида, 1995. С. 54-55, 56, 59.

*вядомы сваёй любоўю да гарачыльных напояў, што мабыць, часткова тлумачылася становішчам ўдаўца. Аднак бацюшку паважалі "як чалавечнага святара""*[13].

З 1919 па 1990-я гг. гэтая царква была адзінай у горадзе. У 1990-я - пачатку 2000-х царква была цалкам перабудавана і стала мураванай царквой-помнікам. Падчас гэтай перабудовы старая драўляная царква знікла. У 1994 годзе з-пад сцяны царквы былі забраны парэшткі генерала Кіпрыяна Кандратовіча і перанесены ў Воранава. Магілу і помнік Марыі Навіцкай, заснавальніцы Лідскай прыватнай жаночай гімназіі, удалося захаваць.



***Лідская Свята-Георгіеўская царква, сучасны выгляд***




***Падзячны медальён князю К. Астрожскаму***

Новая царква пабудавана з выкарыстаннем ужо беларускай сімволікі. Так усе вітражы выкананы ў выглядзе выявы крыжа Ефрасінні Полацкай. У 2014 годзе на сцяне царквы-помніка ўстаноўлены падзячны медальён гетману найвышэйшаму Вялікага Княства Літоўскага князю Канстанціну Астрожскаму.

**Палкавая царква ў Лідзе**

Пасля разгортвання лідскага 172-га пяхотнага палка да 4-х батальённага складу (каля 4 000 жаўнераў і афіцэраў) Свята-Міхайлаўскай царквы ў цэнтры горада стала недастаткова. *"Асабліва на святы ... цяжка было назіраць, як салдацікі стаялі на вуліцы перад храмам і не мелі магчымасці бачыць царкоўную службу ..."*, - пісаў вайсковы дабрачынны святар Міхал Зяленін[14].

Таму, пачынаючы з 1892 г. камандаванне палка імкнулася мець сваю царкву. Першапачаткова, з'явілася думка выкарыстаць былы касцёл кармелітаў, *"які прымыкаў да палкавога афіцэрскага сходу* (афіцэрскі сход месціўся ў былым кляштары кармелітаў - *Л. Л.*). *Дзеля гэтага неаднаразова хадайнічалі перад інжынерным ведамствам аб рамонце касцёла, але кожны раз атрымлівалі адмову"* [15].

Новы камандзір палка палкоўнік Арнольд Фёдаравіч Р'ймерс, прызначаны восенню 1898 г., узяў справу ў свае рукі. Было вырашана прыстасаваць пад царкву *"драўляную казарму 1-й роты, як самы вялікі, сухі і светлы будынак"* [16].

Асвячэнне царквы Святой Тройцы ў ротнай казарме адбылося 6 лютага 1900 г.[17]

Але, здаецца, царква ў памяшканні роты выклікала нязручнасці для службы, і таму да 1910-х гг. 1913 г. Гарадская ўправа арандавала будынак у сына былога маршалка Эміля Сцяпанавіча Буткевіча, які стаяў у раёне горада "Ферма", пад палкавую царкву.

На пачатку 1914 г. "Веснік Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва" паведаміў: *"Ваенная царква месцілася ў здымнай хаце (400 руб. у год), а зараз ужо перанесена ў Паўночны гарадок. Жыхары Фермы (дзе месцілася царква) з чыгуначнікамі, прызвычайваліся наведваць часовую царкву, і яна сталася для іх прыходскай. Таму насельніцтва пачало хадайнічаць аб новай царкве. Ад часовай царквы засталося ўсё царкоўнае начынне. Каля казённага віннага склада маецца царкоўны пляц, на якім плануецца пабудова новага гмаха царкоўна-прыходскай вучэльні. ... Узбуджана хадайніцтва аб пабудове царквы-школы. Хадайніцтва дайшло да кансісторыі і ўладаў губерні. Пры гэтым Земляпарадкавая* (каморніцкая - *Л. Л.*) *камісія адкрывае ў Лідзе ўласную фабрыку па вытворчасці цэментнай цэглы і будаўнічых бетонных канструкцый і таму хоча весці пабудову царквы-школы самастойна"* [18].

Лідскі № 3 казённы вінны склад - гэта зараз карпусы Камбіната дрэваапрацоўкі, якія выходзяць на чыгунку.

У 1912 годзе полк перасяліўся ў новыя казармы.

[13] Ярмонт Е. В тени замка Гедемина. Лида, 1995. С. 32.
[14] Зеленин Михаил. Освящение церкви при Лидском пехотном полку // Весник военного духовенства. 1900. № 17. С. 525.
[15] Там жа. С. 525-526.
[16] Там жа. С. 526.
[17] Там жа. С. 528.
[18] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 4. С. 69.



***Лідская палкавая царква, 1913 г.***

Пасля пераходу палка з прыватных наёмных казарм у новыя казармы за горадам, палкавая царква ўладкоўвалася ў батальённай сталовай (будынак захаваўся да нашага часу). Па штаце пры царкве служыў адзін святар.

**Новая, мураваная, царква і капліца на могілках у Зблянах**

23 чэрвеня 1891 г. у Зблянах была асвечана капліца на могілках. Капліцу самастойна і на свае сродкі пабудаваў селянін гэтай вёскі Сцяпан Трацяк.

Маці Трацяка была рыма-каталічкай, а бацька праваслаўны (як і ўсе беларусы, з былых уніятаў). Трацяк закончыў курс у зблянскім народным вучылішчы і першы час пасля вучылішча жыў разам з бацькам і працаваў на гаспадарцы. Недзе на пачатку 1890-х гг. хлопец выпрасіў у бацькі дазвол пайсці пешшу на багамолле ў Кіева-Пячэрскую лаўру. Кіеў са сваімі святынямі зрабіў на яго вялікае ўражанне, і Сцяпан Трацяк застаўся ў лаўры, выконваў там задарма чорныя работы і марыў пастрыгчыся ў манахі. Але смерць бацькі прымусіла яго вярнуцца на радзіму і заняцца гаспадаркай.

*"Працуючы на гаспадарцы, яму прыйшла думка ўшанаваць памяць бацькоў і пабудаваць на іх магіле капліцу. Думка гэтая глыбока ўрэзалася ў яго набожную душу, і вось гады з чатыры таму, заручыўшыся дабраслаўленнем епіскапа Алексія, Трацяк пачаў выконваць свой план і заняўся падрыхтоўкай матэрыялу. Нарыхтаваўшы будаўнічыя матэрыялы, ён прыступіў да пабудовы капліцы. Цікава, што Трацяк выбудаваў яе асабіста з невялікай дапамогай свайго брата. Ён да таго аддаўся працы, што ў летні час нават і спаў на будоўлі, не толькі днём, але і ноччу, спяваючы рэлігійныя песні. Увесь матэрыял, за выключэннем бярвення і вялікіх камянёў, Трацяком быў дастаўлены да месца асабіста на сваіх руках і плячах. Іконы, напісаныя па яго замове ў Вільні, таксама пешшу былі дастаўлены ім з Вільні. У бягучым годзе ранняй вясной пабудова капліцы была скончана, і Трацяк пачаў клапаціцца аб яе асвячэнні. Капліца ўяўляе сабою выдатны драўляны будынак, зроблены вельмі трывала і старанна. Усе працы сведчаць, што ён выдатны цясляр і слесар"*, - пісалі "Літоўскія Епархіяльныя ведамасці"[19].

Па дабраславенні Літоўскага і Віленскага епіскапа Даната гэтая капліца была асвечана 23 чэрвеня 1891 г. (па старым стылі) Лідскім добрачынным, настаяцелем Лідскага сабора протаіерэем Каяловічам. На ўрачыстасці асвячэння прысутнічалі вернікі Зблянской і суседніх цэркваў. Падчас набажэнства ў алтары духавенству прыслужваў Сцяпан Трацяк, *"горача молячыся Богу і праліваючы слёзы замілавання. У канцы набажэнства між іншым было абвешчана мнагалецце і будаўніку храма. Пасля набажэнства настаяцелем мясцовай царквы, святаром Таваравым было сказана казанне. Падчас цалавання крыжа протаіерэем Каяловічам было раздадзена да трох тысяч крыжыкаў і мноства брашур духоўна-маральнага зместу"* [20].

У 1898 г. "Літоўскія Епархіяльныя ведамасці" надрукавалі артыкул пра Зблянскую царкоўную бібліятэку. Аўтар, які падпісаўся псеўданімам "N." паведаміў, што ў Зблянскай народнай вучэльні размясцілася да 500 асоб, гэта кажа пра вялікія памеры будынка. Потым аўтар зайшоў у царкоўную бібліятэку: *"У бібліятэчным пакоі я знайшоў да 40 чалавек, якія чакалі сваёй чаргі: усе падыходзілі да стала і атрымлівалі жаданую кнігу. Выдадзеная кніга зараз жа запісвалася настаўніцай у асобна для гэтага заведзеную кнігу"* [21].

Як тут не згадаць Зблянскую школу пры грэка-каталіцкай царкве, якая існавала ў XVIII ст.[22] У гісторыі нічога не адбываецца на пустым месцы, заўсёды для нечага добрага патрэбны моцны падмурак. Таму не дзіва, што ў 1915-16 гг. менавіта ў Зблянах з'явілася першая беларуская школа на Лідчыне[23].

У 1866 г. святар Каспяровіч ўзняў хадайніцтва аб пабудове ў Зблянах новай мураванай царквы коштам ў 8000 руб., але поспеху ён не меў. Пры святары Гінтаўце ў 1875 г. справа аб пабудове новай царквы атрымала моцны штуршок, дзякуючы агляду інжынера Старжынскага, які знайшоў, што стары храм існаваць з-за сваёй драхласці больш не можа. Аднак неабходныя 15000 рублёў зноў не далі. Таму святар пераканаў прыхаджан пачаць капітальны рамонт старой царквы. Смерць Гінтаўта перашкодзіла ажыццяўленню гэтых планаў.

[19] ЛЕВ. 1891. № 28. С. 225.
[20] Там жа.
[21] С. Збляны, Лидского уезда // ЛЕВ. 1897. № 18. С. 159.
[22] Гл: Лаўрэш Леанід. Прыход у Зблянах // Лідскі летапісец. 2017. № 3(79). С. 30-48.
[23] Гл: Лаўрэш Леанід. 100 гадоў першай беларускай школе на Лідчыне // Лідскі летапісец 2015. №4 (72). С. 7-9.

Пры яго пераемніку святары Яленскім пытанне пра рамонт царквы не паўставала. Прайшло яшчэ дваццаць гадоў, і думаць пра рамонт старой уніяцкай царквы ўжо было нельга - неабходна было будаваць новы храм. Гэта ўсведамлялі і прыхаджане і святар. Перакананыя святаром а. Таваравым, прыхаджане пагадзіліся даць на новы храм натурай і грашыма 4627 рублёў, акрамя таго сабраць на добраўпарадкаванне храма да 2000 рублёў і "на вечныя часы" ўносіць па 100 р. штогод на падтрымку храма. Дзякуючы гэтаму, справа аб пабудове царквы ў сяле Збляны атрымала добры вынік. З-за вялікіх грошай, якія ахвяравалі вернікі, сінод даў на будаўніцтва 38600 рублёў.



**_Збляны. Будаўніцтва царквы, каля 1900 г._**

Быў створаны камітэт з сялян-прыхаджан пад старшынствам мясцовага святара. Камітэт узяўся за работу, унікаючы ва ўсе дробязі пабудовы, і таму матэрыял для пабудовы царквы атрымалі адборны, праца вялася правільна, тынкоўка выдатна трымаецца ва ўсіх частках царквы. Пры прыёме царквы аказалася, што яна выбудаваная шырэй і даўжэй, чым было ў плане, акрамя таго, звыш каштарысу пабудавана 2-х ярусная званіца з абразом Збавіцеля напісаным на лінолеюме, з тэкстам: *"Прыйдзеце да Мяне ўсе стружданыя і прыгнечаныя, і Я супакою вас"*. Іканастас з абразамі абышоўся камітэту ў 1975 рублёў, з іх 475 рублёў (звыш каштарысу) выплачана з мясцовых сродкаў.

Царква будавалася тры гады. Евангелле ў 180 рублёў, св. посуд за 120 рублёў, харугвы за 70 рублёў, заслоны на прастол і ахвярнік, падсвечнікі - усё гэта набыта на ахвяраванні вернікаў. Абраз Афонскай Божай Маці "Годна ёсць" за 90 рублёў, ахвяраваны вернікам Зблянской царквы Пятром Віткам з Афона. Селянін вёскі Патасконцы Трафім Пышка на асабістыя 100 рублёў ахвяраваў кіёт да гэтай іконы.

Да 10 кастрычніка 1900 г. пабудова была закончана. Пабудаваны храм мае форму візантыйскага крыжа з двух'яруснай званіцай, мае адкрыты купал, унутры якога шмат святла, упрыгожаны трох'ярусным іканастасам з абразамі вядомага жывапісца Малокіна[24] і можа свабодна змясціць да за 1200 чалавек[25].

15 кастрычніка (па старым стылі) 1900 г. у Зблянах быў асвечаны новы мураваны храм: *"Зблянская труухлявая драўляная царква[26], мела ... непрывабны выгляд. Цяпер жа тут збудаваны цудоўны мураваны храм, як абышоўся ў суму каля 30 тысяч рублёў. Амаль адначасова з храмам быў пастаўлены вялікі мураваны будынак жаночай царкоўна-прыходскай школы і прасторны новы дом святара. Усё гэта створана, хоць і на казённыя сродкі, але, галоўным чынам, клопатамі і працамі Зблянскаго святара а. Таварава. Жаночая царкоўна-прыходская школа была вельмі патрэбна ў Зблянах ... уплыў яе ўжо цяпер мацней і глыбей адбіваецца ў народных масах. У гэтай школе, звыш устаноўленых прадметаў, сялянскія дзяўчынкі настолькі паспяхова вывучаюць царкоўныя спевы, што з вучаніц арганізаваны царкоўны хор. Хор гэты смела і нават вельмі стройна спяваў усю архірэйскую службу падчас асвячэння храма, выканаўшы шмат песнапенняў, а пасля службы бліснуў сваім мастацтвам у доме святара, выканаўшы перад прысутнымі, ганаровымі гасцямі харавыя спевы, пераважна духоўнага зместу"*[27].

Асвячэнне здзяйсняў Праўялебны Міхаіл разам з васьмю мясцовымі святарамі суседніх парафій. На асвячэнне сабралася шмат вернікаў, а таксама прысутнічалі: кіраўнік губерні, камергер двара Яго Вялікасці І.С. Лявонцьеў, які прыбыў з Вільні, мясцовы міравы пасярэднік А. С. Мераждкоўскі, павятовы спраўнік А. В. Махцэвіч, старшы памочнік акруговага наглядчыка Лідскай акцызнай акругі А. Д. Кулеша і іншыя асобы[28].

Пасля літургіі царкоўны староста Сцяпан Трацяк на свае сродкі зладзіў у вучылішчы гасціну з дзвюх гарачых страў для 50 жабракоў, разам з членамі царкоўнага папячыцельства прыслужваў ім, і ўбогія дзякавалі ста-

[24] Малокін Георгій († 1905 г.), мастак-жывапісец. На мяжы XIX і XX ст.ст. лічыўся найбольш яркім і прадуктыўным віленскім майстрам, вядомым не толькі ў Вільні. Георгій Малокін да 1893 г. працаваў у кампрамісным стылі, у якім традыцыйны "візантыйскі" стыль спалучаўся з рэалістычнай, халаднаватай манерай пісьма. Больш позьнім яго абразам была ўласцівая стылістыка мадэрну. Разам з тым у сваёй творчасці ён мог спалучаць розныя стылі. Мадэрным ён быў таму, што карыстаўся рознымі тэхнікамі і матэрыяламі: пісаў на драўляных дошках, на палатне, ацынкаваным метале, шкле, медзі. Пахаваны на Ефрасіннеўскіх могілках у Вільні.

[25] Воспоминание о церковных торжествах в с. Збляны, Лидского уезда // ЛЕВ 1901. № 1-2. С. 13-14.

[26] Гл: Лаўрэш Леанід. Прыход у Зблянах // Лідскі летапісец. 2017. № 3(79). С. 30-48

[27] Освящение Зблянской церкви // ЛЕВ. 1900. № 46. С. 358-359.

[28] Там жа.

расту за пачастунак. *"Стараста Трацяк - асоба рэдкая; мужчына сярэдніх гадоў, паводле абяцання халасцяк - манах у міры ... даў на іконы сваё палатно для жывапісу. Усё жалеза, патрэбнае для царквы, прынёс з Ліды за 35 вёрст пешшу. Мае вялікае суцяшэнне - кожны зароблены рубель аддае на добраўпарадкаванне могілкавай царквы. Найсумленнейшы і глыбока рэлігійны чалавек, ён быў праваю рукою святара пры пабудове парафіяльнага храма"*, - адзначыў аўтар артыкула пад псеўданімам *"Відавочца"* [29].

**Філіяльная царква ў Крывічах і цудатворны абраз Божай Маці**

Гэтая царква, пасля таго як была спалена ў 1809 г., верагодна, была адноўлена недзе да сярэдзіны XIX ст.

Сяргей Ігнацьевіч Карскі, стрыечны брат заснавальніка беларускай філалогіі акадэміка Яўхіма Карскага, беларускі этнограф і фалькларыст канца XIX ст., у 1892 г. пісаў: *"Мы скажам некалькі слоў пра адзін такі абраз, пра існаванне якога многія, нават і з духавенства нашай епархіі, нічога не ведаюць. У прыходзе Беліцкай царквы Лідскага павета знаходзіцца прыпісная Крывіцкая царква. Царква невялікая, драўляная, знаходзіцца за дзве вярсты ад прыходскай, пабудаваная на адкрытым полі, званым "Крывічы", з-за чаго і царква атрымала сваю назву. У асяроддзі простага народа розных веравызнанняў гэтая царква вядома далёка за межамі свайго прыходу ў паветах: Лідскім, Навагрудскім, Слонімскімі і ў іншых. Справа ў тым, што ў гэтай царкве знаходзіцца старадаўні цудатворны абраз Божай Маці. Абраз гэты даволі вялікіх памераў, старадаўні, але выдатнага жывапісу. У 1870 г. стараннямі мясцовага святара а. Стэфана Дружылоўскага выява Божай Маці была абкладзена бронзавай высерабранай рызай. На жаль, нягледзячы на наша жаданне, мы не дасталі ніякіх гістарычных дадзеных аб гэтай іконе і таму не можам сказаць нічога пэўнага пра яе мінулае. У цяперашні час, штогод у дзесятую пятніцу пасля Вялікадня, або, як кажа наш народ, "на дзесятуху" і 14 верасня, у дзень святкавання Узвіжання Святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга, у крывіцкай царкве адбываюцца вялікія царкоўныя ўрачыстасці пры ўдзеле ў набажэнстве бліжэйшых парафіяльных святароў і пры вялікім сходзе багамольцаў з простага люду. Ніякія хатнія клопаты, ні кепскае надвор'е - нішто не можа ўтрымаць добрых і набожных простых людзей: усе спяшаюцца памаліцца перад святым абразом Маці Божай і ў шчырасці сэрца выліць перад яе абліччам свае патрэбы і смуткі"* [30].



***Абраз Маці Божай Крывіцкай у Беліцкім касцёле***

Нагадаю, што ў візітацыі 1792 г. згадваецца шанаваны вернікамі абраз, які знаходзіўся ў філіяльнай царкве вёскі Крывічы: *"Найсв. Панны Смуткуючай, на абразе срэбная*



***Царква ў Крывічах. Фотаздымак Адама Віслоцкага, 1923 г.***

[29] Воспоминание о церковных торжествах в с. Зблянах, Лидского уезда.

[30] Карский Сергей. Письма из деревни. // ЛЕВ. 1892. № 51. С. 433-434.



***Копія абраза Маці Божай Крывіцкай з-пад пэндзля баброўскага мастака***

*шата вагой 15 грывен*[31]*. Таблічкі і медаль срэбныя, вагой да 3 $^1/_2$ грывен"* [32]. Верагодна, менавіта гэты абраз зараз захоўваецца ў Беліцкім касцёле пад назвай "Маці Божая Крывіцкая", копія гэтага абраза ёсць і ў Беліцкай царкве. Толькі невядома, у які час і куды падзелася "шата вагой 15 грывен" - амаль што 3 кг срэбра. Таму святару Дружылоўскаму ў 1870 г. і давялося купляць пасярэбраную рызу.

**Святар Стэфан Грудзінскі ў Жыжме**

24 кастрычніка 1898 г. святкавалася 50 гадоў святарскай службы а. Стэфана Грудзінскага. Сын псаломшчыка нарадзіўся ў грэка-каталіцкай сям'і ў вёсцы Лукава Берасцейскага павета. З 1835 па 1839 г. атрымаў адукацыю ў класе прычэтнікаў у Жыровічах. Зразумела, што гэта адукацыя была пачатковага ўзроўню. Пасля атрымання адукацыі пайшоў рабіць цывільную кар'еру, але яшчэ раней пад час вучобы, калі ён спяваў у архірэйскім хоры, яго заўважыў мітрапаліт Сямашка і ў 1839 г. прызначыў дзячком у Алтушскую царкву Берасцейскага павета. Зразумела, што Сямашка збіраў верных сабе людзей і, падобна, Грудзінскі не падвёў свайго патрона. У 1848 г. быў рукапакладзены ў дыяканы і прызначаны ў Новабярозаўскую царкву Бельскага павета (зараз - Польшча).

Не доўга ён прабыў дыяканам, бо ўжо ў 1852 г. рукапакладзены ў святары і прызначаны вікарыем у Дзікушскую царкву ў дапамогу старому бацьку мітрапаліта Іосіфа Сямашкі, настаяцелю гэтай царквы, таксама Іосіфу Сямашку. *"Знаходзячыся побач з протаіерэем І. Сямашкам, а. Стэфан карыстаўся вялікімі ласкамі мітрапаліта ..."*, - пісаў нейкі П. Усціновіч, аўтар артыкула пра Грудзінскага[33].

У 1857 г. памерла яго жонка і пакінула святару пяцёра дзяцей, потым памёр сын Ануфры. У 1858 г. быў прызначаны настаяцелем Жыжмянскай царквы.

Пры дапамозе кіраўніка Віленскай палаты дзяржаўнай маёмасці Глушаноўскага ў Жыжме была пабудавана мураваная царква.

Нізкі ўзровень рэлігійнасці і маральнасці прыхаджан, аўтар артыкула П. Усціновіч, як і належыць, тлумачыць *"варожым рыма-каталіцкім акружэннем ... з-за гэтага п'янства і крадзяжы былі распаўсюджаны сярод прыхаджан. Шынок знаходзіўся каля царквы, і таму амаль што палова тых, хто прыйшоў у царкву, адразу ішлі ў шынок і сядзелі там да вечара, а тыя, хто ўсё ж зайшоў у царкву, пасля службы таксама ... ішлі ў шынок. Па хадайніцтве а. Стэфана ... шынок быў зачынены, прычым справа не абышлася без пратэстаў і супрацьстаяння"*[34].

Пад час службы Грудзінскага былі пабудаваны тры царквы: *"Прыходская, філіяльная з зачыненага касцёла* (верагодна, у Бердаўцы - *Л. Л.*) *і за яго сродкі,*



***Жыжмянская царква, каля 1900 г.***

[31] Грыўна - адзінка вагі каштоўных металаў, прыблізна 196 г.

[32] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41244. Візіты цэркваў Лідскага Дэканата. 1792 г. Арк. 4 адв.

[33] Устинович П. Пятидесятилетие служения священника Жижмянскай церкви Лидского уезда, о. Стефана Грудзинского // ЛЕВ. 1899. № 09. С. 101-102.

[34] Устинович П. Пятидесятилетие служения священника Жижмянскай церкви Лидского уезда, о. Стефана Грудзинского. С. 102.

*на могілках"* [35].

На сродкі ўладальніка Бердаўкі сенатара Дэмбавецкага, які падараваў лес, і Літоўскага епархіяльнага вучылішнага савета, які даў 100 рублёў, у 1895 г. была пабудавана царкоўна-прыходская школа. Таксама, "пры раздзеле зямлі князя Паца а. Стэфан выпрасіў для царкоўнага прычта самы лепшыя зямельныя ўгоддзі ў выглядзе фальварка" [36].

**Асвячэнне мураванай царквы ў Лебядзе**

17 кастрычніка 1889 г. адбылося ўрачыстае ўнясенне і асвячэнне абраза Пакрова Прасвятой Багародзіцы, купленага за грошы прыхаджан па ініцыятыве святара царквы а. Савація Белазерскага. Разам было сабрана 50 руб. 25 кап.[37] Абраз быў замоўлены мастаку Георгію Малокіну, які да кастрычніка добрасумленна выканаў замову. Да асвячэння абраза граф Сімоніч падараваў святарскае ўбранне з залатой парчы. Аўтар артыкула з псеўданімам *"П. Л."* асабліва адзначае бас псаломшчыка царквы Рафаловіча падчас царкоўных спеваў[38].

"Літоўскія епархіяльныя ведамасці" ў артыкуле пра асвячэнне новай мураванай царквы ў Лебядзе, паведамлялі, што Лебяда - старое паселішча, якое заснавана каля 1500 г. Тут каля самай дарогі Ліда - Гародня стаяла трухлявая царква Св. цудатворца Мікалая, якую пабудаваў Трызна. Царква неаднаразова рамантавалася але да 1880-х гг. зусім струхлела: дах, кроквы, бэлькі, настолькі прагнілі і разышліся, і таму храму кожную хвіліну пагражала разбурэнне. Аб пабудове новай царквы за кошт дзяржаўнага скарба першым у 1880 г. пачаў хадайнічаць святар Белазерскі, ён абавязаўся, што сяляне-вернікі даставяць для будаўніцтва 60 куб. сажняў каменю. Рашэнне аб пабудове было прынята ў 1896 г., на гэта было выдзелена 14 660 рублёў. Узніклі некаторыя праблемы з прызначаным старшынём камітэта па будаўніцтве царквы, таксама ўзніклі *"ваганні прыхаджан са справай дапамогі ў будаўніцтве царквы, што замарудзіла пачатак пабудовы"*.

Закладка новага мураванага храма ў імя Св. цудатворца Мікалая адбылася ў другой палове ліпеня 1898 г. Новая царква будавалася каля старой. Каб пашырыць пагост, графіня Сімоніч прырэзала да пагоста невялікі кавалак зямлі. Царква будавалася падрадным спосабам пад назіраннем святара Сяргея Марозава і шасці сялян, якія ўваходзілі ў будаўнічы камітэт.

З большага новая царква была гатова да канца



***Будаўніцтва царквы ў Лебядзе***

1899 г., але пасля зімы 1899-1900 г. у новым гмаху былі заўважаны вялікія недахопы, якія перарабляліся да канца кастрычніка 1900 г. І толькі ў лістападзе 1900 г. будынак быў здадзены камісіі.

Царква асвечана 12 лістапада 1900 г. Але *"трэба заўважыць, што гэтая царква будзе яшчэ патрабаваць рамонту, а адсутнасць агароджы будзе дакорам для прыхода"* [39].

**Капліцы ў маёнтку Тарнова**

8 кастрычніка 1892 г. святар Радзівонішкаўскай царквы Дружылоўскі асвяціў мураваную капліцу ў імя Святога Дзмітрыя Салунскага, пабудаваную ў маёнтку Тарнова: *"Царква ўяўляе сабой прыгожы мураваны будынак у гатычным стылі. Яна пабудавана па загадзе і пад асабістым наглядам графа - стваральніка храма. Над уваходнымі дзвярыма ў прыгожай трох'яруснай калоне ўладкавана званіца, яна ўвенчана конусападобным купалам з крыжам. Шкло ў вокнах упрыгожана святымі выявамі і крыжамі з рознакаляровага шкла. Унутраная аздоба храма таксама ад-*

[35] Устинович П. Пятидесятилетие служения священника Жижмянскай церкви Лидского уезда, о. Стефана Грудзинского. С. 102.

[36] Там жа.

[37] Праз столькі гадоў, мне цікава было чытаць спіс ахвярадаўцаў: графіня Лізавета Дзмітрыеўна Сімоніч (з Маўрасаў, у другім шлюбе Скосырава, маці Барыса Скосырава) - 10 руб., святар Савацій Белазерскі - 5 руб., паручнік гвардыі Дзмітрыеў - 3 руб., валасны пісар Пэцкаль - 2 руб., настаўнік Пётр Лячыцкі - 2 руб., селянін Фама Жамойцін - 2 руб., доктар Г. Гузо - 1 руб., царкоўны стараста Д. Саўрас - 1 руб., царкоўны вартаўнік - Г. Паварга - 1 руб., селянін Антон Пазняк - 1 руб., Кацярына Аляксандрава - 1 руб., селянін Якаў Гамза - 1 руб., селянін Павел Паварга - 1 руб., Еўдакія Паварга - 1 руб., селянін Васіль Тарасюк - 50 кап.

[38] Из с. Лебеда Лидского уезда // ЛЕВ. 1889. № 45. С. 286-287.

[39] Освящение церкви в Лебеде // Литовские епархиальные ведомости. 1900. № 48. С. 377-378.

*розніваецца сваёй вытанчанасцю, яна строга прытрымліваецца царкоўнага характару жывапісу. Царква мае новае каштоўнае начынне. Пад царквой пабудаваны вялікі фамільны склеп дзе знаходзіцца прах нябожчыцы-жонкі будаўніка храма, графіні Кацярыны Іванаўны Маўрас (у дзявоцтве - Сімоніч). У яе памяць і пабудаваны храм.*

*Царква высвечаная ў чацвер, 8 кастрычніка. Гэтае свята наведалі спадар галоўны начальнік края, генерал ад артылерыі Каханаў, віленскі губернатар барон Грэвеніц і іншыя паважаныя асобы, а таксама родныя графа Д. Маўраса. Царква асвечана лідскім дабрачынным протаіерэям Іосіфам Каяловічам з лідскім духавенствам. Храм прысвечаны св. пакутніку Дзмітрыю Салунскаму (дзень памяці 26 кастрычніка). Перад гэтым настаяцель Маламажэйкаўскай царквы Леў Савіцкі правёў у царкве ўсяночную службу. ... настаяцель царквы ў Радзівонішках а. Аляксандр Дружыловіч выступіў з прамовай ..."* [40].

У гэтай жа ўсыпальніцы пад храмам праз чатыры гады быў пахаваны і сам граф Дзмітрый. Калі ў 1939 г. капліца з магільным склепам Маўрасаў была разбурана, з'явіліся чуткі, што графіня Кацярына Маўрас ляжала забальзамаваная ў спірце.

**Царква ў Праважы і эксперымент Плямяннікавай**

Газета "Веснік Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва" ў сярэдзіне 1911 г. паведаміла, што Марыя Мікалаеўна Плямяннікава праз члена праваслаўнага брацтва Е. Н. Дабранскую выказала пажаданне ахвяраваць брацтву ўчастак зямлі памерам у 61 дзесяціну[41]. Дабранская і, вераемна, Плямяннікава ўваходзілі ў рускую жаночую праваслаўна-манархічную арганізацыю, пра якую трэба сказаць некалькі слоў.

Е. Н. Дабранская - дырэктарка Віленскай жаночай Марыінскай гімназіі і, магчыма, жонка старшыні Віленскай археаграфічнай камісіі Ф. Н. Дабранскага, з 1908 г. была членам Віленскага праваслаўнага брацтва, памерла 2 траўня 1914 г.[42] Яшчэ ў 1906 г. у Вільні быў створаны "Віленскі гурток рускіх жанчын", ініцыятарам яго стварэння якраз і выступіла Е. Н. Дабранская, якая заявіла: *"Руская жанчына валодае энергіяй, з'яўляецца стойкай у сваіх перакананнях, у сваёй любові да радзімы ... Бог дасць і тут, у Паўночна-Заходняй ускраіне, каб праца яе прынесла плён велізарнай каштоўнасці і стварыла тут згуртаванае, моцнае нацыянальным духам рускае грамадства"* [43]. Вядома, што мясцовыя грамадскія "рускія" арганізацыі выступалі абаронцамі моцнай манархічнай улады і адзінства Расійскай імперыі, а таксама барацьбітамі з "нацыянальным сепаратызмам" - беларускім і польскім рухам, займалі крайне правую і рэакцыйную частку палітычнага спектра. Пры падтрымцы мясцовых уладаў, быў створаны Рускі ўскраінны звяз ("Русский окраинны союз"), які аб'яднаў усе манархічныя сілы нашага краю. Пад ідэалагічным уплывам гэтага звязу знаходзіліся і рускія жаночыя гурткі. Першы такі жаночы гурток паўстаў у Вільні ў канцы 1906 г. і кіравала ім якраз Е. Н. Дабранская[44].

Юрыдычна справа аб ахвяраванні зямлі Плямяннікавай брацтву была афармлена ў жніўні 1912 г. Па ўмове ахвяравання, брацтва павінна было на працягу двух гадоў пабудаваць у маёнтку Праважа Плямянніакавай царкву, інакш участак вяртаўся да гаспадыні. Каб знайсці неабходныя для будаўніцтва сродкі, брацтва арганізавала будаўнічы камітэт, старшынём якога стаў святар Васілішскай царквы Пігулеўскі. Таксама быў распрацаваны праект і каштарыс будаўніцтва царквы ў памеры 5902 руб., дзяржаўны скарб павінен быў задарма перадаць неабходныя лесаматэрыялы. На сродкі брацтва (у памеры 200 руб.) пачалася нарыхтоўка іншых будаўнічых матэрыялаў. Аднак грошы на пабудову ўсё не знаходзіліся, і таму ў свой час Плямяннікава працягнула тэрмін дамовы яшчэ на 1,5 года[45].

Як вядома, *"за 48 вёрст ад Ліды, па дарозе з мястэчка Васілішкі ў Радунь у Лідскім павеце, месціцца маёнтак Праважа, якім валодае М. Н. Плямяннікава"* [46]. Узнікае пытанне, нашто спатрэбілася царква ў цалкам каталіцкай частцы Лідскага павета? А справа ў тым, што Плямяннікава вырашыла правесці эксперымент - у гэтым каталіцкім рэгіёне Лідчыны яна вырашыла пасяліць праваслаўных сялян і выдзеліла праваслаўнаму брацтву зямлю для прычта царквы, якая будавалася для перасяленцаў. Таксама, магчыма ў растэрміноўку, яна прадавала частку сваёй зямлі праваслаўным сялянам: *"Навокал мох, кустоўе, сосны. Толькі ўдалечыні, за некалькі вёрст* (ад будучай царквы - *Л. Л.*) *бачны новыя пабудовы. Гэта хутары будучых прыхаджан, якія купілі зямлю ў сп. Плямяннікавай, усе яны выключна праваслаўныя, у асноўным з Гарадзенскай губерні, для іх і будзе пабудавана будучая царква. У навакольных вёсках жывуць толькі католікі, ёсць толькі адна - дзве праваслаўныя сям'і ... але і яны фармальна праваслаўныя, бываюць у царкве адзін - два разы ў год. Бо да бліжэйшай царквы два дзесяткі вёрст"* [47].

[40] Карский С. Торжественное освящение церкви в имении Тарново Лидского уезда, генерал-лейтенанта, графа Д. Н. Мавроса // ЛЕВ. 1892. № 41. С. 352-353.

[41] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1911. № 23. С. 445.

[42] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 19. С. 407.

[43] Виленский вестник. 1906. 17 декабря. С. 3.

[44] Лавринович Д. С. Русские женские кружки в общественно-политической жизни Вильно и Минска начала XX века // Религия и общество - 10 : сборник научных статей [сборник материалов научных трудов X Международной научно-практической конференции "Религия и общество", г. Могилев, 10-23 марта 2016 г. Могилев: МГУ, 2016. С. 50.

[45] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1913. № 21. С. 389.

[46] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 1-2. С. 16.

[47] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1912. № 17. С. 293.

Вядома, што перасяленцамі былі ў асноўным беларускія сяляне з-пад Наваградка.

16 жніўня 1912 г. адбылася ўрачыстае закладка новай царквы: *"На месцы калісьці дрымучага лесу, сярод глухіх балот і кустоўя, знойдзена больш-менш роўная і ўзвышаная пляцоўка. Тут раздаліся словы малітвы, і закладзена зерне жыцця новага прыходу. ... На ганаровай закладцы царквы прысутнічала сама ахвярадаўца сп. Плямяннікава, а таксама, як прадстаўніца Віленскага Свята-Духаўскага брацтва, Е.Н. Дабранская, члены будаўнічага камітэта і невялікая колькасць сялян. ... сп. Плямяннікава будзе хадайнічаць аб адкрыцці ў маёнтку Праважа школы. Пажадаем поспехаў яе пачынанням, тым больш, што ў сваім другім маёнтку Гародна, сп. Плямяннікава ўжо адчыніла народную вучэльню і школу малочнай гаспадаркі"* [48].

З прэсы даведваемся, што былы епархіяльны архітэктар А. А. Шпакоўскі (у 1912 г. пакінуў гэтую пасаду) па запрашэнні будаўнічага камітэта, кіраваў пабудовай царквы ў маёнтку Праважа. Адначасова ён рамантаваў царкву ў Біржах і будаваў царкву ў вёсцы Аляксандраўскае Ковенскай губерні[49]. Грошы для будаўніцтва царквы брацтва знайшло ў купца 1-й гільдыі Сцяпана Канавалава, які жыў ажно ў горадзе Енісейску (гэты горад знаходзіцца ў сучасным Краснаярскім краі), сібірскі купец ахвяраваў 5,5 тысяч рублёў. Сродкі дазволілі пабудаваць замест драўлянай бетонную царкву. Бетоннымі работамі кіраваў спецыяліст у гэтай справе інжынер В. К. Гагунцоў. Як і належыць, заліўка бетону ішла бесперапынна на працягу 1,5 месяцаў, і да сярэдзіны восені 1913 г. будаўніцтва храма ў асноўным было закончана[50].

Храм асвечаны 20 кастрычніка 1913 г. у гонар св. Аляксандра Неўскага. У асвячэнні прымалі ўдзел протаіерэй Лідскага сабора а. Каяловіч, намеснік Шчучынскага дабрачыннага а. Куніцкі, святар Пакроўскай царквы (раней мястэчка Сабакінцы, зараз - вёска Першамайская Шчучынскага р-на) а. Дабрынін. "Веснік Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага" брацтва пісаў: *"Перазвон званоў 20 кастрычніка разнёсся над новай Госпадняй нівай. Добрае надвор'е. ... Святары прыступаюць да чыну асвячэння храма. ... да моманту асвячэння прыбыла і Марыя Мікалаеўна. Трапяткія і ўрачыстыя хвіліны. ... Вартай увагі была наяўнасць тут католікаў-просталюдзінаў. Захопленыя ўрачыстасцю, яны забылі сваю сляпую варожасць да праваслаўя і старанна маліліся. ... Пасля заканчэння асвячэння храма, протаіерэй Каяловіч звярнуўся ... з чуллівым словам, у якім ... выказаў бязмежную радасць ... з-за таго, што ў гэтай мясцовасці, дзе раней былі дзікія, непраходныя гушчары, адкуль раздаваліся толькі галасы супраць усяго рускага і праваслаўнага - зараз, ... заззяў праваслаўны храм, які ўнясе ў гэтую, усё яшчэ дзікую мясцовасць, святло Хрыста ..."* [51]. Цікава, што Каяловіч сваімі словамі зрабіў дзікім край, які нічым не адрозніваўся па цывілізаванасці ад іншай Лідчыны, і цалкам зразумела чаму ён гэта зрабіў.

Пасля царкоўнай службы ў маёнтку Плямяннікавай адбыўся абед. На другі дзень, 21 кастрычніка, у новай царкве прайшла літургія.

Не ведаю, ці пра ўсіх перасяленцаў у Праважу пісаў аўтар артыкула ў наступных радках, ці іх было трошкі больш, але ён паведамляў, што: *"У адзін навакольны маёнтак, распрададзены па хутарах, перасялілася 10 праваслаўных сямействаў ... але 8 з іх прадалі свае хутары католікам і паспешна вярнуліся на радзіму"* [52]. "Веснік Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва" тлумачыў гэта ўздзеяннем *"фанатычнага каталіцкага насельніцтвам суседніх вёсак"*[53] а таксама *"адсутнасцю храма і ... націскам іншаверцаў"*[54]. Не ведаю, ці адчувалі беларусы з-пад Наваградка моцнае адчужэнне ад мясцовага насельніцтва? Пра сітуацыю ў 1970-я гг. на Лідчыне, ужо пасля "польскага часу", калі мясцовыя сяляне-католікі ўжо прызвычаіліся да таго, што яны палякі, вядомы беларускі філолаг Юрась Пацюпа пісаў пра існаванне "пэўнай "іерархія даверу" (паміж сялянамі - *Л. Л.*), якую можна апісаць паступенна: 1) "палякі"; 2) католікі ("палякі" і "барцякі"); 3) тутэйшыя (у купе з праваслаўнымі); 4) чужыя ("саветы", "немцы" і г. д.)" [55]. У гэтым сэнсе, сяляне з Наваградчыны былі для сялян з Лідчыны "тутэйшымі" - усё ж сваімі.

Быў яшчэ і сацыяльна-эканамічны момант. Сяляне таго часу інтуітыўна лічылі ўсю навакольную зямлю сваёй, не разумелі, чаму ёй валодае "пан", і заўсёды не любілі прыхадняў, якія чамусьці забіралі сабе іх зямлю. Праз 15 гадоў гэта моцна адчуюць на сябе палякі-асаднікі, якім польскія ўлады надавалі зямлю ў Заходняй Беларусі.

Цытаваны вышэй артыкул, надрукаваны ў "Весніку Віленскага праваслаўнага Свята-Духаўскага брацтва", аўтар з псеўданімам "Сельский" мае цалкам эпічную канцоўку: *"Нешмашматлікіх прыхаджан мае храм у Праважы, яны абкружаны цесным колам фанатычнага каталіцкага насельніцтва, гнёт якога цяжкім ярмом кладзецца на міралюбівае і верацярпімае праваслаўнае насельніцтва ..."* [56].

---

[48] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1912. № 17. С. 293.
[49] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1913. № 13-14. С. 268.
[50] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 1-2. С. 16.
[51] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 1-2. С. 17.
[52] Там жа.
[53] Там жа. С. 16.
[54] Там жа. С. 17.
[55] Пацюпа Юры. Tahafut al-Tahafut // Arche. 2006. №4. С.187-209.
[56] Вестник Виленского православного Свято-Духовского братства. 1914. № 1-2. С. 17.

*Леанід Лаўрэш*

# Новае пра Тэадора Нарбута і яго сям'ю

Усе біёграфы Тэадора Нарбута паведамляюць дзве версіі абставін жыцця гісторыка ў 1812 г. Па адной з іх, ён ціхамірна жыў у сваіх родных Шаўрах і займаўся гісторыяй нашага краю. Па другой версіі, 1812 г. для Нарбута быў напоўнены падзеямі і неверагоднымі ваеннымі прыгодамі[1].

Польскі біяграфічны слоўнік[2] коратка піша пра другую версію падзей 1812 г., як пра магчымую, і грунтуе толькі на кнізе Зоф'і Кавалеўскай "Дзеі паўстання Лідскага..."[3]. Зоф'я Кавалеўская з Лянтоўскіх (1853-1918) нарадзілася ў в. Малыя Бакшты сучаснага Маладзечанскага раёна і ўсё жыццё займалася фальклярыстыкай і этнаграфіяй, даследавала паўстанне 1863 г., з'яўлялася аўтаркай шэрагу кніг і артыкулаў. Тэкст Кавалеўскай грунтуецца на яшчэ жывой памяці жыхароў Лідчыны пра падзеі 1863 г., на асабістых кантактах і размовах з дачкой гісторыка Тэадорай Манчунскай і яго сынам Баляславам Нарбутам. Яе кніга друкавалася як серыя артыкулаў пра паўстанне на Лідчыне ў газеце "Дзённік Віленскі"[4], і пры перавыданні кнігай тэксту адчувальна не хапала добрай рэдактуры.

Тэкст Кавалеўскай мае шэраг дробных недакладнасцяў, якія ў цэлым не псуюць вялікую каштоўнасць усёй кнігі, бо сур'ёзных, сутнасных памылак праца не мае, і я схільны лічыць ніжэй прыведзеныя факты біяграфіі Нарбута вельмі верагоднымі.

Зоф'я Кавалеўская піша, што Тэадор Нарбут, як і ўся наша шляхта чакаў прыходу французаў як збаўлення ад чужой улады. Свае надзеі і пачуцці ён выказваў ва ўзнёслых вершах. У адным з тых тагачасных твораў ён апавядае пра сустрэчу на Замкавай гары ў Вільні з духам Ліздзейкі. Першае, што робіць дух, прыняўшы вобраз арцыкаплана ў такі важны для Літвы момант, - знімае з галавы Тэадора ненавісны трохкутны капялюш рускага войска. Гэты паэтычны твор доўгі час захоўваўся ў сям'і і загінуў падчас падзей 1863 года.

Тым не менш у 1812 г. Тэадор Нарбут знаходзіцца ў складзе рускага штаба ў Вільні, куды перад самым пачаткам вайны прыехаў цар Аляксандр I. Калі Напалеон перайшоў Нёман, рускі штабны афіцэр аўстрыйскага паходжання Морыц Кацэбу (потым стане генерал-лейтэнантам) паведаміў ваеннаму інжынеру Нарбуту пра тое, што маецца загад заўтра, на раніцы, пакінуць старажытную сталіцу Літвы.



- Што думаеш рабіць? - запытаў Кацэбу.

- Схавацца і застацца тут, - шчыра адказаў Нарбут. - Можа сваім на што-небудзь прыдамся.

Калі рускія войскі пакідалі горад, усе дзверы дамоў былі зачынены, а вокны завешаны - горад як быццам вымер. Нарбут схаваўся ў знаёмага купца, і падчас хаосу адступлення яго адсутнасць пры штабе не была заўважана. З першым промнем узыходзячага сонца ў Вільню ўвайшоў французскі авангард начале з аддзелам уланаў князя Радзівіла. Горад умомант абудзіўся ад сну, адчыняліся дзверы, вокны і людскія сэрцы. Месцічаў ахапіў шалёны энтузіязм. Жанчыны кідаліся да коней, гладзілі і нават цалавалі іх.

Падхоплены на вуліцах людскімі натоўпамі, Нарбут выпадкова патрапіў у нейкую невялічкую крамку, дзе зусім змучаны затрымаўся на хвілінку. На стале ў краме ляжалі пашарпаныя старыя лісткі, і аматар гісторыі, як быццам, пазнаў рэшткі "Дыярыюша крыжацкіх дарог на Літве"[5]. Думаю, што менавіта ў гэтым месцы Кавалеўская фантазіравала, ці памыляліся дзеці Тэадора Нарбута, пераказваючы ёй гэтую гісторыю з

[1] Гл: Бломберг Мар'яна Магдалена. Тэадор Матэвуш Нарбут (Остык-Нарбут) з лідскай зямлі гісторык Літвы, інжынер і даследчык старажытнасці, а таксама бацька герояў-паўстанцаў. Варшава - Ліда, 2011.

[2] Polski Slownik Biograficzny. T. XXII. Wroclaw-Warszawa- Krakow, 1977. S. 537.

[3] Гл: Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego: wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934. Пераклад кнігі надрукаваны ў газеце “Наша слова”.

[4] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego.Wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Dziennik Wilenski. 1934. № 2, 4, 5, 7-11, 13-15, 17, 18, 21-25, 28, 29, 31, 32, 35-39, 41-43, 45, 46, 49-53, 56, 57, 56, 57.

[5] Верагодна, гэта тое, што было выдадзена ў 6-ці тамах у Германіі, з 1861 па 1874 гг. пад назвай "Scriptores rerum Prussicarum. Die Geschichtsquellen der preu?ischen Vorzeit bis zum Untergange der Ordensherrschaft".

"Дыярыюшам...". Тым не менш, даследчыца паведамляе, што Нарбут паспеў нават нешта занатаваць са старога дакумента.

Выйшаўшы з крамкі, гісторык пабег да Зялёнага моста - менавіта там усе чакалі пабачыць Напалеона. Імператар сядзеў на вялікіх бэльках і наглядаў за работай сапёраў якія будавалі мост цераз Вілію - стары мост, пакідаючы горад, спалілі расейцы. За ракой, падпаленае казакамі, гарэла прадмесце разам са складамі збожжа. Каля Напалеона, аточанага цесным колам маршалаў і ад'ютантаў, стаяў тутэйшы настаяцель айцоў-піяраў ксёндз Гладоўскі. Нарбут звярнуўся да ксяндза па дапамогу і расказаў яму, што хоча працаваць перакладчыкам, бо ведае дзевяць еўрапейскіх моваў. Напалеон на хвіліну павярнуў галаву ... Сталёвыя вочы ўважліва агледзелі постаць Нарбута, імператар загадаў прыняць яго ў канцылярыю міністра Басано[6] і болей не звяртаў увагі на просьбіта. Нарбут атрымаў абмундзіраванне і грашовае забеспячэнне - дзесяць франкаў у дзень, сівую кабылу для раз'ездаў і грошы на яе ўтрыманне. А большага ён і не жадаў.

Наша зямлячка, Ганна Патоцкая (з Тышкевічаў) пісала пра герцага Басано: *"Дасягнуўшы высокага становішча ў той час, калі кар'еры наогул рабіліся з надзвычайнай хуткасцю, герцаг Басано быў, верагодна, адзіны, у кім не засталося нічога, што нагадвала б пра яго сціплае паходжанне, але з іншага боку, ён не злоўжываў дасягнутым ім высокім становішчам. Яго манеры, касцюм, размова, наогул усё, за выключэннем яго неймаверна тоўстых лытак, насіла адбітак радавітасці. Праўда, ён не адрозніваўся шыратой і тонкасцю розуму, як Талейран, але затое, валодаючы дзіўным тактам і рэдкай пранклівасцю, меў права трымаць галаву высока сярод выдатных людзей, якія атачалі Напалеона. Акрамя таго, ён быў незвычайна сумленным і бездакорным чалавекам"* [7].

Работы мелася шмат. Герцаг Басано павінен быў ажыццяўляць знешні нагляд за дзейнасцю новага ўрада адноўленага ВКЛ і адначасова кіраваць замежнымі справамі Францыі. Як намеснік імператара, ён змагаўся з непаваротлівасцю і спрэчкамі паміж французскім камандаваннем і літоўскім урадам. Канцылярыя Басано атрымоўвала палітычная і дыпламатычныя паперы рознай важнасці, прыходзілі прыватныя петыцыі, ішла прыватная карэспандэнцыя. Усё гэта патрэбна было прачытаць, зарэгістраваць у кнізе і перакласці. Герцаг Басано ўвесь час, часта нават уначы, меў пытанні і даручэнні, і паколькі Нарбут быў глухі, дык даваў яму пісьмовыя загады. Часта Нарбута пасылалі з важнымі заданнямі, якія ён сумленна выконваў і таму здабыў давер князя і павагу калег.

Але хутка адбылася катастрофа - французскія войскі пачалі адступаць. Нарбут не пакідаў Вільні і з вялікім неспакоем назіраў за тым, як з галоўнага імператарскага штаба наплываюць туманныя загады і няясныя рапарты. Злавесныя весткі ішлі ў Вільню з хуткасцю тэлеграфа, якога ў той час яшчэ не было. У канцылярыі герцага Басано нарастаў хаос. Напалеон таемна прамчаўся праз Вільню і накіраваўся ў Парыж. За Напалеонам спешна рушыў увесь штаб. Ваенная эпапея заканчвалася.

Разам з канцылярыяй Басано, пацягнуўся за Нёман на сваёй Сіўцы і Нарбут. Але ўжо каля Аўгустова ён зразумеў, што не можа бадзяцца недзе на чужыне, і вырашыў застацца на Радзіме. Павярнуў Сіўку і паехаў да свайго сваяка Прота Нарбута, які жыў тут недалёка. Прот - сын вядомага прыгажуна Нарбута, які быў аздобай салона на "чацвярговых абедах" [8] караля Станіслава Панятоўскага.

Спадар Прот і яго дачка Клемянціна прынялі Тэадора са стараліцвінскай гасціннасцю, і гісторык змог адпачыць тут ад перажытага. Час бавілі за гутаркамі пры каміне. Клямуся, займаючыся вышыўкай, уважліва слухала сваяка і выходзіла толькі, каб у стайні папесціць нарбутаву Сіўку.

Тым часам рускія войскі шукалі дэзерціраў. Чуйнае вушка Клямусі з непакоем прыслухоўвалася да ўсіх чутак. І аднойчы яна прыбегла з весткай пра набліжэнне казакаў. Сіўка стаяла каля ганка пад сядлом, але казакі ўжо ўязджалі праз браму. Вершнік адным скокам пераадолеў плот і паскакаў да лесу. За ім пагналіся казакі - яны сыпанулі ўздагон градам куль. Некалькі куль патрапіла ў Сіўку, і яна звалілася каля зарослага густым чаротам возера. Тэадор схаваўся і перасядзеў тут да ночы, але кулі яшчэ доўга свісталі над чаротам.

Калі ўсё сціхла і начны змрок ахінуў зямлю, Нарбут выйшаў са схованкі і асцярожна скіраваўся да бліжэйшай плябаніі. Ксёндз-пробашч сам адчыніў яму дзверы і правёў унутр. Потым пераапрануў Тэадора парабкам і, пасадзіўшы як вазніцу на вазок, загадаў, як быццам везці ксяндза да хворага. Праз некаторы час яны стаялі перад леснічоўкай. Ксёндз паставіў Святы Сакрамэнт на стол, паклікаў усю сям'ю лесніка і загадаў ім прысягнуць, што яны не здрадзяць таму, каго ён прывёз, не выдадуць расейцам, але схаваюць і зберагуць яго ў сябе. Прысягнулі ўсе.

У лясной глушы сярод сумленных людзей Нарбут адчуваў сябе ў бяспецы. Было дамоўлена, што калі Тэадор пойдзе кудысьці з хаты, а ў яе прыйдзе нехта чужы, дык на знак небяспекі будуць вывешаны белыя хусткі. Кавалеўская піша, што менавіта тут, у лясной цішы, Тэадор Нарбут і задумаў напісаць свае будучыя тэксты і пачаў збіраць стараліцвінскія легенды і паданні.

Час ад часу леснічоўку наведваў спадар Прот Нарбут, а яго дачка выкупіла ў казакаў шкуру Сіўкі і загадала пашыць з яе доўгі дарожны куфэрак, у якім гістарыёграф Літвы потым усё жыццё захоўваў свой французскі мундзір, лісты герцага Басано, загады

[9] Юг-Бернар Марэ (1763-1839) - французскі дыпламат, журналіст, адвакат, палітык і дзяржаўны дзеяч, у 1811-1813 гг. міністр замежных спраў, у 1834 г.. прэм'ер-міністр. З 1809 г. насіў ганаровы (беззямельны) тытул герцага Басано.

[7] Графиня Потоцкая. Мемуары. Москва, 2005. С. 97.

[8] На "чацвярговых абедах" караля з найбліжэйшымі паплечнікамі, падданым падаваўся прыклад ашчаднасці і цвярозасці.

Напалеона і іншыя сувеніры тых часоў.

У наступным годзе цар Аляксандр І абвясціў амністыю для ўсіх удзельнікаў ваеннай драмы. Нарбут звярнуўся па ласку манарха і атрымаў звальненне са службы і пагашаную за ўвесь час адсутнасці на службе грашовую запазычанасць.

Менавіта згадка пра гэтыя грошы, атрыманыя за тыя два гады, калі Нарбут служыў Напалеону ці хаваўся ад рускіх, дадае веры ва ўсю гэтую гісторыю, робіць яе сапраўднай і жыццёвай. Гэтага не прыдумаеш, а калі захочаш напісаць гісторыю пра "сапраўднага героя", дык не будзеш узгадваць, што ён узяў грошы ў ворага за той час, калі служыў супраць яго. Тут усё па-нашаму - "б'юць - бяжы, даюць - бяры".

Пасля амністыі Нарбут вярнуўся ў Шаўры і пачаў пісаць. А калі падраслі дзеці, гісторык з-пад страхі часам выцягваў куфар са шкуры сваёй Сіўкі, у якім стары прыхільнік Напалеона хаваў памятныя рэчы тых часоў, паважна вымаў іх і ўзрушана раскладваў вакол сябе. Дзеці з вялікім хваляваннем пачціва маўчалі і слухалі бацьку, а потым нават падносілі да вуснаў яго скарбы. Найбольш хваляваў Тэадора стары мундзір, сукно на ім паблякла, але ўсё яшчэ бліскучыя эпалеты будзілі прывіды 1812 года - часоў яго маладосці і надзеі.

"Старога прыяцеля", як называў ён свой мундзір, гісторык нават ушанаваў вершам, які пачынаўся гэтак:

*Калі я ўсё страціў падчас краёвых бур,*
*Ты адзін са мной застаўся, мой стары мундур!*
*Ты блішчаў на мне ў часы,*
*калі Край быў у патрэбе,*
*Я ж рызыкоўна падстаўляў пад кулі сябе і цебе.*
*Зніклі мае прыгожыя дні,*
*як дым у начных ценях знікае,*
*Але той усё ж шчаслівы, хто ўспаміны мае .*

Тэадор Нарбут жыў гэтымі ўспамінамі і мацаваўся імі да позняй старасці, пры гэтым часта паўтараў: "О, лёс! Хто меў цябе ў нашым краі…" [9].

Такога кшталту расказы Зоф'я Кавалеўская магла пачуць ад дзяцей Тэадора Нарбута, і дадатковую веру ў верагоднасць усіх гэтых прыгод у 1812 г. дадае аўтэнтычны верш Тэадора пра мундзір.

Пасля 1814 г. Нарбут мог спакойна аддавацца працы гісторыка і літаратара. Інжынер Нарбут надрукаваў у "Дзённіку Віленскім" шэраг прац пра тагачасныя дасягненні прыродазнаўчых навук, пра вядзенне сельскай гаспадаркі[10]. Адстаўны капітан пісаў вершы, займаўся археалогіяй і збіраў мясцовы фальклор[11].

Але Тэадор Нарбут займаўся і перакладамі мастацкіх твораў, пра адзін з эпізодаў з гэтай літаратурнай дзейнасці я мушу расказаць падрабязней.

Час пасля 1814 г. у сталіцы Літвы з аднаго боку быў эпохай жывой думкі, бо тут меўся выдатны ўніверсітэт добрага еўрапейскага ўзроўню, але з іншага боку, эпохай узмацнення ўрадавай рэакцыі, рэакцыі не толькі палітычнай але і культурнай і грамадскай, што нават выклікала сімпатыю ў пэўнай частцы грамадства, якая знаходзілася пад клерыкальна-кансерватыўным уплывам. Ахвярай гэтакай рэакцыі, між іншым, стала выданне "Тыгоднік Віленскі". Прычына гэтага сёння нам здавалася б несур'ёзнай і нават смешнай, але ў вачах тагачасных уладаў яна была настолькі важкай, што, як убачым, прыцягнула ўвагу самога ўсерасійскага імператара.

"Тыгоднік Віленскі" быў заснаваны ў 1815 г. Лелявелем і канкурыраваў толькі з "Дзённікам Віленскім", але па сутнасці мала адрозніваўся ад яго, бо друкаваліся ў абодвух газетах тыя ж самыя віленскія прафесары. Але ў 1820 г. выдавец "Тыгодніка Віленскага" кнігагандляр Жулкоўскі вырашыў парваць з руцінай і стварыць новы тып перыядычнага выдання. У канцы 1820 г. ён абвесціў прынцыпы рэформы, сутнасцю якой сталася павелічэнне зместу і разнастайнасці тэм, сярод якіх павінна была з'явіцца нават сучасная мода.

Такі, новы "Тыгоднік" выходзіў у 1821 і 1822 гг., покуль, раптоўна, па царскім загадзе не быў зачынены ў 1822 г. на 12-тым нумары (ад 30 чэрвеня).

Прычыны гэтага доўгі час былі не вядомы. В. Цяхоўскі ў сваёй манаграфіі "Польскія выданні ў Літве", надрукаванай у "Квартальніку Літоўскім" за 1910 г., лічыў, што выданне было зачынена Навасільцавым з-за росквіту культурнага жыцця ў Вільні, якое той хацеў прыгасіць і гэта забарона з'явілася пачаткам шырокага пераследу моладзі па справе філаматаў у наступным годзе.

Рэдактар "Пшэгленду Віленскага" Людвік Абрамовіч у 1921 г. надрукаваў артыкул, з якога бачна, што дакументы канцылярыі віленскага генерал-губернатара за 1822 г. (тэчка № 277) дазваляюць цвердзіць, што сп. Цяхоўскі памыляўся, і смерць "Тыгодніка Віленскага" не была звязана з агульнай плынню палітыкі ўраду, а знаходзілася ў плыні тагачаснай агульнаеўрапейскай думкі, руплівым вызнаўцам і слугой якой, між іншым, быў Каласанты Шаняўскі, дырэктар генеральнага публічнага выхавання ў Польскім каралеўстве, а з 20 траўня 1822 г. яшчэ і генеральны цэнзар. Праўдападобна, што па яго ініцыятыве і была распачатая справа супраць "Тыгодніка Віленскага", бо звярнуў увагу на небяспечны кірунак выдання не хто іншы, як вялікі князь Канстанцін, які быў намеснікам у Варшаве.

21 чэрвеня 1822 г. менавіта вялікі князь Канстанцін піша з Варшавы Літоўскаму ваеннаму губернатару Рымскаму-Корсакаву, што ў № 10 "Тыгодніка Віленскага" былі надрукаваны фрагменты запісак невядомага аўтара пра падарожжы па Іспаніі, *"у якіх, між іншым, апісаны танец фанданга* (народны танец, які выкон-

---

[9] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego. S. 4-7., 10.

[10] Гл: Лаўрэш Леанід. Тодар Нарбут - папулярызатар найноўшых дасягненняў прыродазнаўства // Лідскі летапісец. 2014. № 4 (68). С. 12-13.

[11] Гл: Бломберг Марыя Магдалена. Тэадор Нарбут. Варшава-Ліда, 2011.

ваецца парай пад спевы фанданга, музыку гітары і кастаньет - *Л. Л.*). *Апісанне танцу падаецца праз амаральныя і несамавітыя выразы, а ў іншай частцы артыкула, маюцца кпіны з духавенства і касцельнай іерархіі. З-за гэтага, нумар тут, у Варшаве, не быў дапушчаны да продажу"*. Вялікі князь прапануе пакараць цэнзара, які прапусціў такое выданне.

Яго просьба, відавочна, не засталася без вынікаў. 7 ліпеня губернатар выдае загад паліцмайстру канфіскаваць ўсе экземпляры 10-га нумара як у выдаўца, гэтак і ў падпісчыкаў, а таксама знайсці аўтара гэтых скандальных твораў і далажыць, чаму артыкул быў дазволены да друку цэнзурай.

З рапарта паліцмайстра даведваемся, што выдавец Аляксандр Жулкоўскі меў дазвол цэнзуры за подпісам ксяндза-прафесара А. Клангевіча, а артыкул з'яўляўся перакладам са старой кнігі, зроблены капітанам у адстаўцы Нарбутам з Лідскага павета. Цэнзурны камітэт паведаміў, што кс. Клангевіча часова няма ў Вільні і таму ён не можа нешта ўдакладніць.

Потым паліцмайстар паведаміў, што № 10 "Тыгодніка Віленскага" быў надрукаваны накладам у 500 асобнікаў, з якіх 268 было канфіскавана. Іншыя асобнікі былі дасланы праз пошту ці патрапілі ў рукі невядомых асоб, і зараз паліцмайстар вырашае, як знайсці рэшту выдання.

Канфіскацыя рабілася скрупулёзна. Гэта бачна з ліста нейкага генерала з Адэсы да віленскага ваеннага губернатара Корсакава, у якім генерал паведамляе, што Чарнігаўскі губернатар патрабаваў ад камандзіра 6-га батальёна палкоўніка Руперта здаць 10-ты нумар "Тыгодніка", якім той валодаў. Канфіскаваны экземпляр быў прыкладзены да ліста, дасланага Корсакаву. Зараз гэты № 10 практычна немагчыма знайсці ні ў адным з кнігазбораў. Артыкулы, якія выклікалі гэтакае абурэнне ў вялікага князя Канстанціна, засталіся б для нас таямніцай, калі б не пераклад, прыкладзены да ліста віленскага губернатара Корсакава (ад 17 ліпеня) да міністра ўнутраных спраў. З перакладу даведваемся, што артыкул "Падарожжы ў Іспанію" складаецца з дзвюх частак: "Пустэльнікі" і "Фанданга". У першай, аўтар кажучы пра жыццё шматлікіх і свентаблівых пустэльнікаў у ранейшыя часы, ставіцца да іх вельмі адмоўна і называе злодзеямі, а ў другой частцы, апісваючы іспанскі народны танец, пераказвае анекдот. Змест анекдота ў тым, што пасля забароны фанданга, адмыслова для двух кардыналаў яго станчыла выбраная пара танцораў і кардыналы, не вытрымаўшы, таксама пусціліся ў скокі. Менавіта ў гэтым анекдоце ўлады ўбачылі абразу рэлігіі ды маральнасці і загадалі распачаць следства.

Нефартунны перакладчык і будучы знакаміты гісторык Тэадор Нарбут са свайго маёнтка ў Шаўрах пад канвоем быў прывезены ў Вільню і сазнаўся, што "крымінальны" тэкст пераклаў з кнігі "Voyage en Espagne par Marguis de Langle" якую пазычыў у суседкі спадарыні Ёч з суседніх Мангелішак. Не думаў ён пакрыўдзіць касцёл і ўзяў з выдаўца Жулкоўскага абяцанне не друкаваць пераклад, калі з'явяцца нейкія праблемы з цэнзурай. Улады прынялі тлумачэнне Нарбута і не пакаралі яго.

Дзіўна, але цэнзар, які фармальна з'яўляецца самым вінаватым у гэтай сітуацыі, не быў прыцягнуты да адказнасці, а генерал-губернатар вырашыў цалкам звольніць увесь склад віленскага цэнзурнага камітэта. І ўсю віну пераклалі на выдаўца і яго газету.

19 ліпеня вялікі князь Канстанцін паведаміў генерал-губернатару, што ён склаў рапарт да імператара пра гэтую справу і атрымаў уласнаручны загад цара на месяц арыштаваць выдаўца "Тыгодніка" і цалкам забараніць яму выдаваць газеты. Цэнзурнаму камітэту было загадана больш старанна выконваць свае абавязкі. Так перастаў выходзіць "Тыгоднік Віленскі" [12].

Усё гэта адбывалася ў адносна ліберальныя часы цара Аляксандра І. Жахлівае цараванне Мікалая І было яшчэ наперадзе.

Тэадор Нарбут працягваў займацца сельскай гаспадаркай у сваім маёнтку. Паляпшаў сістэму вырошчвання тэхнічных культур (лёну, канопляў і іншых), а таксама працаваў над пераводам гаспадаркі на прамысловы лад. Заснаваў вінакурню, цукроўню і некалькі майстэрняў. За вырабы з ільну атрымліваў медалі. У 1840-1850 гг. быў ініцыятарам і ўдзельнікам будаўніцтва аздараўленчых устаноў у Друскеніках. Вопыт і веды па апрацоўцы зямлі і атрыманне даходу ад вырошчвання раслін, з якіх атрымліваў валакно для прамысловасці, папулярызаваў на старонках "Віленскай газеты". Адначасова з любоўю і старанна збіраў паведамленні, паданні і рэчы, якія адносіліся да старажытных язычніцкіх і хрысціянскіх часоў Літвы. Вынікі сваіх пошукаў у выглядзе артыкулаў публікаваў у віленскіх і пецярбургскіх часопісах[13]. У 1847-1852 гг. інжынер Нарбут пабудаваў у Эйшышках парафіяльны касцёл. Але галоўнай працай яго жыцця была "Гісторыя літоўскага народа".

У 1835 і 1841 гадах у Вільні пабачыла свет яго вялікая праца ў 9-ці тамах, выдадзеная пад назвай "Гісторыя літоўскага народа" ("Dzieje starozytne narodu litewskiego"). Гэта праца трохі грашыць перабольшанымі фантазіямі, бо абапіраецца на паданні, байкі і легенды. Галоўнымі хібамі яго працы было выкарыстанне ў сваіх творах крыніц, якія паводле меркавання сучасных даследчыкаў не існавалі і былі выдуманыя самім Нарбутам, напрыклад - "Раўданская хроніка" і "Дзённік фон Кібурга".

Прафесар Спасовіч[14] наступным чынам ацэньваў працу Нарбута так: *"... гэта праца вялікая, арыгінальная, але некрытычная"*. А Юзаф Ігнацы Крашэўскі, аддаючы даніну павагі гэтай унікальнай працы,

[12] Abramowicz L. Represje prasowe przed stu laty // Preglad Wilenski. 1921. № 1-2. S. 2-6.

[13] Бломберг Марыя Магдалена. Тэадор Нарбут. Варшава-Ліда, 2011. С. 49.

[14] Уладзімір Данілавіч Спасовіч (1829-1906) - беларускі, рускі і польскі юрыст, грамадскі дзеяч, публіцыст і крытык. - *Л. Л.*

называў яе *"глыбай матэрыялаў, сабраных з розных і вельмі рознай якасці крыніц, бясформенна злепленай грудай камянёў"*.

Пры ўсім пры гэтым Нарбут заслугоўвае вялікай пашаны, як адзін з піянераў у даследаванні мінуўшчыны Літвы і тым, што сваім прыкладам заахвоціў іншых да далейшага вывучэння гісторыі краю. Тэадор Нарбут працаваў бесперапынна і ў 1846 годзе выдаў "Помнікі гістарычных падзей літоўскіх" ("Pomniki do dziejow litewskich…", Wilno, 1846.), у 1847 годзе "Кароткі выклад літоўскай гісторыі" ("Dzieje narodu litewskiego w krotkosci zebrane". Wilno, 1847), у 1856 годзе "Нарысы гістарычныя ..." ("Pomniejsze pisma historyczne, szczegolnie do historii Litwy odnoszace sie". Wilno, 1856.) Некалькі прац Нарбута засталіся ў рукапісах.

Калі першы гістарыёграф Літвы сядзеў, паглыбіўшыся ў даследаванне мінулага, яго жонка ўзяла кіраўнічае стырно ў доме ў свае рукі. Занепалая падчас вайны гаспадарка пачала патроху ўзнімацца, разгаліноўвацца. Перадусім заквітнела хатняе рукадзелле, задавальняючы ўсе патрэбы дому, як гэта было ў большасці тагачасных гаспадарак. Вельмі пашырылася вырошчванне ільну і канапель, адначасова да такой ступені развілося ткацтва, што ткацкія вырабы дому Нарбутаў мелі славу выключных.

Шаўры паволі ператвараліся ў мястэчка. Мелі піва і ўласную гарэлку, якая не абкладалася акцызам, а перараблялася на знакамітыя літоўскія старкі, вядомыя ва ўсім краі і за яго межамі. Вуллі давалі мёд, які таксама перарабляўся на гаспадарцы: з яго выраблялі воцат і настойкі. Ураджаі хлебу на палях былі дастатковымі; лясы, амаль некранутыя, давалі будаўнічы матэрыял, паліва, дзёгаць і смалу; аборы і хлявы адзявалі і кармілі; сады славіліся садавіной, а ставы рыбай. Гэтыя Божыя дары патрабавалі таго толькі, каб прыстасаваць іх для хатняга ўжытку.

Шаўры мелі цэлую арганізацыю ўласных рамеснікаў: цесляры, дахаўшчыкі, сталяры, гарбары, рымары, ткачы, краўцы. Кравец Караль, які абшываў усю сям'ю Нарбутаў з тканін, вырабленых ў гаспадарцы, быў сапраўдным майстрам сваёй справы. Ваколічныя модніцы замаўлялі ў яго свае ўборы. Кухар Юрак мог дагадзіць самым вытанчаным кулінарным густам, а яго "свянцонае" славілася на ўвесь Лідскі павет.

У тагачасным эканамічным жыцці грош не лёгка пакідаў гаспадарскую кішэнь і гэтак жа цяжка ў яе патрапляў, бо сельскагаспадарчыя прадукты былі вельмі танныя. Дом у Шаўрах уяўляў сабой згасаючы тып старалiwвінскіх двароў. Ён яднаў вакол сябе вясковую моладзь, якая падчас вучобы рамёствам знаходзілася пад уплывам народных традыцый. Тое, аб чым пішам, ў тагачасныя "прыгонныя" часы выглядала ідыліяй, аднак акрамя пануючага паўсюдна ўціску вяскоўцаў, часта знаходзіліся двары падобныя да Шаўроў, дзе хаты падданых атачаліся бацькоўскай любасцю і клапатлівай апекай[15].

Пасля паўстання 1831 г., "адстаўны капітан-інжынер" Тэадор Нарбут абвінавачваўся рускімі ўладамі ў тым, што падчас побыту Хлапоўскага ў Лідскім павеце напісаў "пасквіль супраць Расеі". Вядома гэтак жа, што пазней, перад планаваным штурмам Вільні Нарбут чарціў карты горада для генерала Гелгуда, таксама засталіся ўспаміны паўстанцаў пра тое, што адстаўны капітан Нарбут арганізаваў ліццё гармат у Варнях[16].

У паўстанні 1863 г. прынялі ўдзел і абяссмерцілі свае імёны дзеці Тэадора Нарбута. Падчас гэтага паўстання Тэадор Нарбут жыў у Вільні ў жонкі сына Людвіка, куды яго адвезла сям'я, каб не хваляваць 80-ці гадовага старога, а таксама таму, што яго адсутнасць дазваляла дзецям больш свабодна і актыўна прымаць удзел у паўстанчым руху.

Пасля задушэння паўстання жонку Тэадора, Крысціну, саслалі ў Пермскую губерню. Прыгнечаны смуткам, думаючы толькі пра жонку і дзяцей, Тэадор Нарбут ціха згас у Вільні 13 лістапада 1864 года на руках сваёй старэйшай дачкі Яны Кунцэвіч, на Скапоўцы, у доме № 5.

Пасля жалобнага набажэнства ў касцёле Св. Яна труну з целам гісторыка Літвы перавезлі ў Шаўры і пахавалі на могілках пры касцёле ў Начы. Крысціна Нарбут



***Магіла Тодара Нарбута ў Начы***

[15] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego. S. 4-7.
[16] Rabinowiczowna Sara. Wilno w powstaniu roku 1830/31. Wilno. 1932. S. 83.

перажыла мужа на 35 гадоў. Калі ў 1899 г. памерла спадарыня Крысціна Нарбут - жонка Тэадора Нарбута, ксяндзам было забаронена высвеціць труну і магілу. Сям'я і людзі пахавалі нябожчыцу на могілках непасрэдна каля маёнтка Шаўры[17]. Зоф'я Кавалеўская пісала: *“Пахаваць нябожчыцу каля мужа на могілках у Начы, як яна таго хацела, было забаронена. Улада баялася дэманстрацыі, ксяндзу нават было не дазволена суправаджаць труну з целам. Сяляне зрабілі гэта паводле традыцыі: з крыжам і свянцонай вадой, як для сваіх памёршых... Ксёндз праводзіў труну да брамы, а адтуль сяляне на сваіх плячах панеслі яе на вясковыя могілкі, дзе ўжо спачываў сын памёршай Баляслаў. На сціплым надмагіллі маці, Манчунская заказала выбіць такія ж простыя словы: "Маці сыноў. Мела 100 гадоў. Памерла дня 16 ліпеня 1899 года."”* [18].



***Магілы Остык-Нарбутаў у Шаўрах, у тым ліку Крысціны Нарбут і яе сына Баляслава***

Таму гэтак і здарылася, што Тэадор Нарбут пахаваны каля Нацкага касцёла, а яго жонка і дзеці - на былых могілках каля маёнтка Шаўры.

А гісторыю з пахаваннем сына Тэадора Нарбута - Людвіка і байцоў яго аддзела, трэба расказваць асобна.

Пасля паразы аддзела Людвіка Нарбута пад Дубічамі 4 траўня 1863 г. трэба было пахаваць паўстанцаў і, каб аб атрымаць дазвол, патрабавалася адмыслова тэлеграфаваць у Вільню генерал-губернатару Назімаву і атрымаць ад яго гэты дазвол.

На ноч целы забітых паўстанцаў перанеслі ў бабінец касцёла ў Дубічах. Сяброўка Тэадоры Манчуньскай Тоня Табенская, якая займалася пахаваннем, успамінала:

*"З трупаў лілося столькі крыві, што здавалася яны плаваюць у крывавай плыні.*

*Касцельныя бабкі абмылі трупы ад крыві, вясковыя жанчыны, з плачам, як па ўласных сынах, накрылі іх сваёй грубай бялізнай і прасцінамі.*

*Ранкам прыбылі некалькі спадарыняў і спадароў з суседніх гаспадарак. Прывезлі бялізну і адзенне для забітых, посцілкі і бандажы для параненых ...*

*Змрочная сур'ёзнасць ляжала на галовах усіх, хто прыбываў на гэты балючы людскі рытуал... З вялікай роспаччу глядзелі на тое, як палягла моладзь, з якой яны звязвалі так многа надзей, ляжыць як скошаная трава ў бабінцы касцёла. Тут ляжалі найлепшыя і найшляхетнейшыя сыны Лідскай зямлі, яе будучыня, а можа і слава.*

*Ляжаў і ён, камандзір - Людвік Нарбут, у якім не толькі Ліда, але і ўся Літва страціла свайго найслаўнейшага ваяра за вольнасць.*

*З прыбыўшых на пахаванне спадарыняў найбольшую дапамогу аказалі: Тараевіч з Салтанішак і Юзэфа Вісмант - настаўніца.*

*Нарэшце ўсё падрыхтавана.*

*Дванаццаць белых нефарбаваных трунаў былі пастаўлены ў касцёле без катафалка, проста на зямлі і ўтварылі піраміду, верхам якой была абабітая чорным аксамітам труна камандзіра.*

*Развітаўшыся з нягодамі і цяжкасцямі свайго кароткага жыцця, прысвечанага Краю, якое налічвала крыху болей за 31 год, спаў у труне вечным сном Людвік Нарбут, над дванаццаццю сваімі вернымі таварышамі, а людзі, углядваючыся ў яго "дамавіну", як у святыню, выціралі заплаканыя вочы і паўтаралі: "Зусім як Хрыстос з дванаццаццю апосталамі"* [19].

Пахаванне з вялікай урачыстасцю адбылося 24 красавіка (6 траўня). Акрамя шматлікіх сялян прысутнічалі 14 ксяндзоў і каля 200 тутэйшых землеўладальнікаў. Тлумы перапаўнялі касцёл, яшчэ большая колькасць людзей стаяла каля касцёла.

Вялікая, загадзя падрыхтаваная магіла, чакала палеглых за вольнасць. Усе труны былі пастаўлены ў дол у адзін рад. Лідская зямля прыгарнула сваіх верных сыноў, прымаючы іх у сваё лона на вечны адпачынак. З пяску, насыпанага жменямі вырас высокі капец, які закідалі вясновымі кветкамі. Яшчэ не высахлі слёзы ў сем'ях, як гэты курган казакі зруйнавалі капытамі сваіх коней[20].

У 1864 годзе ў гадавіну бітвы пад Дубічамі да магілы прыйшлі сябры загінуўшых разам са спадарыняй

[17] Pod wozem i na wozie : pamiatniki Jozefa Borodzicza, czyli kilka lat pracy duszpasterskiej na Litwie, Bialej Rusi i w glebi Rosyi. Krakow, 1911. S. 21.

[18] Kowalewska Zofia. Dzieje powstania lidzkiego. S. 67-68.

[19] Elzbieta Tabenska. Z doli i niedili. Wspomnienia wugnanki. Krakow, 1897. S. 34-35.

[20] Kowalewska Zofja. Dzieje powstania lidzkiego. S. 54.

Геншаль, сястрой былога сябра арганізацыі. Каля магілы іх адразу ж атачылі жаўнеры і пагналі ў Ліду: "Раз моліцеся на магіле Нарбута, дык вы такія самыя бунтаўшчыкі, як і ён". Аднак, у Лідзе ваенны начальнік Лідскага павета палкоўнік Алхазаў атрымаў "у лапу" 25 рублёў і ўсіх адпусціў[21]. Як тут не ўспомніць словы Вяземскага: "У Расіі суровасць законаў сцішаецца іх невыкананнем", і дадам ад сябе: хабарніцтвам.

У Лідскім павеце людзі яшчэ доўгі час не верылі ў смерць Людвіка Нарбута і спадзяваліся на яго вяртанне. Хадзіла шмат легенд. Вось адна з іх: *"Скульптур Хрыста было тры. Адна ў Вільні на Антокалі, другая ў Дубічах, у касцёле, трэцяя недзе ў свеце, невядома дзе зараз валадарыць. Нарбут не загінуў, але пайшоў у свет шукаць каралеўства трэцяга Хрыста, а як знойдзе, дык прыйдзе разам з ім адпомсціць за ўсе крыўды і забярэ тады з Начы[22] фігуру другога Хрыста"* [23].

У ліпеньскім нумары 1909 г. "Кур'ера Літоўскага" настаўнік пецярбургскай мужчынскай гімназіі пры касцёле Св. Кацярыны Алойзы Сцерла-Арліцкі (Alojzy Sterlo-Oricki) напісаў пра свае ўражанні ад наведвання мястэчка Дубічы. Сярод іншага ён паведаміў: *"На ўзгорку, пасярод маляўнічых могілак, раней стаяў драўляны касцёлік, у ім мелася фігура Пана Езуса. Да гэтай фігуры здалёк прыходзілі пілігрымы, і тут адбываліся дзіўныя рэчы: сляпыя пачыналі бачыць, глухія чуць, нямыя гаварыць, а хворыя выздараўлівалі. У Дубічах заўсёды было шмат паломнікаў.*

*Наступіў 1863 г. Касцёл разабралі на дровы для вайсковай часткі ў Васілішках, цудоўную фігуру разам з алтарамі перавезлі ў касцёл Начы. Гэтак цягналася 40 гадоў.*

*Зараз, калі бліснуў прамень рэлігійнай свабоды, сяляне ў Дубічах вырашылі адбудаваць святыню і перанесці ў яе цудадзейную фігуру Езуса. ... 5 ліпеня адбылося залажэнне кутняга каменя новага касцёла ...*

*На Дубіцкіх могілках разам са сваімі паплечнікамі спіць вечным сном гераічны камандзір паўстанцаў Людвік Нарбут. Доўга я шукаў хоць нейкага помніка ці крыжа з надпісам, і, не знайшоўшы, звярнуўся па дапамогу да сялян, якія стаялі каля могілак.*

*Адзін з іх, сівы як голуб стары, сведка паразы паўстанцаў Нарбута, прывёў мяне на пагорак, падобны на вал які атачае могілкі. Паказваючы на працяглую, але ледзь бачную нізінку, сказаў:*

*- Тут супольная магіла Нарбута і яго таварышаў.*

*І, паказаў месца кожнага з іх:*

*- Тут мы паклалі Красінскага, тут Лукашэвіча, тут двух братоў Бразоўскіх*

*І гэтак паказваючы - сказаў:*

*- А тут ляжыць наш любімы і справядлівы камандзір.*

*Сказаўшы гэта, стары замігаў, па зморшчаным і загарэлым твары пацяклі слёзы.*

*- Там, куды спадар глядзіць, там на балоце палеглі ўсе, - сказаў ён паказваючы мне рукой на супрацьлеглы бераг возера. - Адтуль чуліся стрэлы, але потым усё сціхла, і праз некалькі гадзін нам аддалі знявечаныя целы для пахавання.*

*- Чаму, - пытаю ў яго, - няма помніка ці хоць крыжа з надпісам, што гэта магіла Нарбута і паўстанцаў?*

*- Раней было не можна, а зараз, хоць і можна, але няма каму гэта зрабіць.*

*- А ці засталіся крэўныя, ці можа хто з грамады хоча сціплы помнік паставіць?*

*- Крэўныя? ... не ведаю. Некалькі гадоў таму прыязджаў нейкі багаты спадар, запытаў, дзе магілы паўстанцаў і дзе пахаваны Нарбут. Калі яму паказалі - здзівіўся, што няма помніка, сеў на мураву, пасядзеў пяць хвілін і паехаў. І шмат да яго і пасля яго было такіх наведвальнікаў, і кожны шкадаваў, што няма помніка. Здаецца, нікому гэта не патрэбна.*

*Са смутнымі думкамі я пакінуў старога, а ён яшчэ доўга стаяў каля магілы і пра нешта думаў. Няма там аніводнай кветкі, аніводнага дрэўца. Ці дачакаемся мы хоць сціплага помніка?"* [24]

Як бачым, прыгожа напісаны тэкст настаўніка гімназіі па-свойму тлумачыць, чаму на месцы пахавання паўстанцаў не было помніка.

Праз некалькі нумароў газеты, на тую ж тэму выказаўся Вандалін Шукевіч - член-карэспандэнт Кракаўскай акадэміі ведаў, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі, жыхар суседняй Начы і надзвычай дасведчаны чалавек у гісторыі нашага краю.

Шукевіч паправіў гістарычныя памылкі, пецярбургскага настаўніка, сярод іншага ён паведаміў, што стары касцёл у Дубічах існаваў да 1869 г. і быў зачынены, бо, як быццам, мог паваліцца ад старасці. Яго можна было адрамантаваць, але гэтага зрабіць не дазволілі. Замест рамонту, касцёл быў зачынены і разабраны, а касцельную зямлю, *"урад аддаў папам у Лідзе"*, - піша Вандалін Шукевіч.

Гісторык, паправіўшы настаўніка, пераказаў сапраўдную гісторыя мястэчка Дубічы. Мястэчка заўсёды было каралеўскай маёмасцю, а яшчэ раней - уласнасцю Вялікіх князёў ВКЛ. На супрацьлеглым ад мястэчка беразе возера Пелясы Вітаўт меў паляўнічы двор. З усёй маёмасці, па прывілеі Казіміра Ягелончыка і Жыгімонта І, толькі возера Пеляса і зямля вакол яго была прыватнай маёмасцю Яна Касцевіча, падляшскага ваяводы. Наступнымі пасля Касцевіча ўладарамі возера былі: Радзівілы, Садоўскія, Францкевічы, Тышкевічы, а ў ХІХ ст. ім валодала графіня Ганна Патоцкая-Вансовіч (з Тышкевічаў), пасля яе возера мелі Патоцкія.

[21] Kowalewska Zofja. Dzieje powstania lidzkiego. S. 78-79.

[22] Пасля разбурэння з 1869 г. касцёла ў Дубічах, алтарная фігура Хрыста захоўвалася ў суседнім Нацкім касцёле.

[23] Kowalewska Zofja. Dzieje powstania lidzkiego: wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934. S. 56.

[24] Kurjer Litewski № 158, 16(29) lipca 1909.

Але самае цікавае Шукевіч расказаў пра магілу паўстанцаў 1863 г. Працытую гэты фрагмент тэксту цалкам: *"Магіла Людвіка Нарбута і яго таварышаў, палеглых у бітве каля Дубічаў 22 красавіка (па старым стылі) 1863 г. знаходзіцца на зямлі, якая належыць папам, з-за гэтага да нашага часу цяжка марыць пра ўстаноўку хоць якога помніка. Гэта адзіная прычына яго адсутнасці. Нядбайнасць сваякоў ці грамадскасці не мае да адсутнасці помнікаў ніякага дачынення. Ці зменіцца гэта калі-небудзь да лепшага - хто ведае? Да гэтага часу памяць пра гэтых пакутнікаў мы захоўваем у скарбніцах сваіх душ, і тут ужо даўно стаіць помнік нашым героям"* [25].

"Папы ў Лідзе", якім належала зямля былога Дубіцкага касцёла (дарэчы, таму новы касцёл будаваўся ў баку ад старых могілак) - гэта лідскі дабрачынны таго часу Іосіф Каяловіч, родны брат гісторыка і добра вядомы на Лідчыне, зацяты русіфікатар. Але Каяловіч як барацьбіт з помнікамі - гэта нешта новае пра гэтага чалавека.

І толькі ў 1933 г., дзякуючы ініцыятыве жаўнераў і афіцэраў польскага 76-га Лідскага палка пяхоты, у Дубічах паставілі помнік памяці Людвіка Нарбута і палеглых паўстанцаў. Сродкі на яго пабудову былі сабраны спецыяльным, для той мэты сабраным Камітэтам Лідчыны, на чале якога стаяў генерал Эдвард Рыдз-Сміглы. Праект выканаў прафесар Універсітэта імя Стэфана Баторыя, знакаміты мастак Фердынанд Рушчыц.

А вось як апавядае пра гэта Міхал Шымялевіч: *"У бітвах з захопнікамі ў 1863 г. палегла з Лідскага павета некалькі дзясяткаў чалавек, у тым ліку двое ці трое Янкоўскіх.*

*Нашчадак аднаго з іх, Мар'ян Янкоўскі, стараста ў Глыбокім, потым віца-ваявода Віленскі, у канцы віца-ваявода Беластоцкі, паклапаціўся аб справе ўшанавання памяці трагедыі пад Дубічамі. І паўстаў на месцы бітвы помнік, паводле праекта прафесара УСБ Фердынанда Рушчыца, стараннем камітэта пад кіраўніцтвам генерала броні Рыдз-Сміглага, коштам абывацеляў Лідскага павета і 76-га палка пяхоты (Лідскі полк), мастак-разьбяр - прафесар УСБ Балзукевіч. Помнік з бетону з унутранай каменнай запраўкай. На галоўным баку сімвал Рэчы Паспалітай у бронзе - арол, Пагоня і святы архангел Міхаіл, а таксама надпіс: "За волю нашу і вашу"* (на самай справе: *"1863. За нашу волю і вашу", рэд.). З левага боку дошка са спісам палеглых пад Дубічамі, з правага - тэкст падзякі абывацелям Лідчыны і 76-му п. п.*

*Адкрылі помнік 6 жніўня 1933 года.*

*На аснову помніка прывезлі з Вільні гранітны пастамент помніка Мураўёва, які там, на пляцы Напалеона, тырчаў як агідны ўспамін пра сатрапа...*

*... Маскалі ў 1898 г. паставілі Мураўёву ў Вільні, на пляцы Напалеона, пышны помнік, на якім ён быў прадстаўлены ў велізарнай бронзавай статуі, абапёрты на тоўсты кій. Бачыў асабіста, як у ліпені 1915 г. пры эвакуацыі маскалёў з Вільні падымалі той помнік з гранітнага пастамента, падвешаны на ланцугах да пастаўленага трохкутніка з тоўстых бетонаў. Потым бачыў тую самую статую ў Пецярбургу пад гмахам Музея артылерыі"* [26].

Адкрыццё помніка 6 жніўня 1933 г. было вялікай падзеяй і святам для мясцовага люду. З гэтай нагоды з'явіліся спецыяльныя публікацыі, прысвечаныя Людвіку Нарбуту і студзеньскаму паўстанню, а таксама гісторыі 76-га Лідскага палка пяхоты, якому было нададзена імя геройскага камандзіра (полк у той час дыслакаваўся ў Гародні). У адрозненне ад іншых, гэты помнік перажыў савецкія часы, бо ў савецкай гістарыяграфіі тое паўстанне лічылася толькі сацыяльным і антыцарскім.



**Помнік паўстанцам Людвіка Нарбута ў Дубічах. Пад ім ляжыць пастамент помніка Мураўёву з Вільні**

Пасля пабудовы новага касцёла ў Дубічах, туды вярнулася алтарная фігура Хрыста, якая да гэтага часу захоўвалася ў Нацкім касцёле. А ў цяжкім 1947 г., перад пачаткам нядзельнай службы ў Дубіцкім касцёле, на вачах у сотняў вернікаў, за паўгадзіны аднавілася фігура Хрыста на крыжы які стаяў перад касцёлам[27], і вернікі злучылі ў сваім уяўленні гэты цуд з памяццю пра Людвіка Нарбута.

Дарэчы, у той год на Лідчыне, аднаўленне крыжоў і абразоў стала амаль што масавай з'явай, расказы пра гэта я чуў шмат ад каго, некаторыя з іх запісаны і апублікаваны ў інтэрнэце, але гэта ўжо іншая тэма.

Вось покуль і ўсё новае, што я жадаў расказаць пра Тэадора Нарбута і яго сям'ю.

[25] Kurjer Litewski № 166, 25 lipca (7 sierpnia) 1909.
[26] Міхал Шымялевіч. Збор твораў. ЮрСаПрынт, Гродна, ст. 76.
[27] Ziemia Lidzka. 2002. №1(48).

***Віктар Кудла,***
***выпускнік Ганчарскай сярэдняй школы 1959 года***

# Сачыненне на тэму: “ЗВЕСТКІ ПРА СЯЛЯНСКАЕ ЖЫЦЦЁ, НАВУЧАННЕ, ВУЧНЯЎ І ІХНІ ЛЁС У ГАНЧАРСКАЙ АКРУЗЕ”

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах № 85-94)*

**Раздзел № 11**
**Аповяд пра пасляваенны, мірны час**



**Дзікевіч Мікалай Мікалаевіч**: навучэнец Ганчарскай школы, настаўнік Жучкоўскай пачатковай школы, краязнавец, аўтар гістарычна-этнаграфічных выданняў.

Нарадзіўся 20 верасня 1924 г. у в. Дзітрыкі Беліцкай гміны Лідскага павета Наваградскага ваяводства. Да 1936 г. вучыўся ў Дзітрыкаўскай чатырохкласнай школе, у 1939 г. закончыў Ганчарскую паўшэхную школу, у 1945 г. - Лідскае педвучылішча, пачаў настаўніцкую працу. Служыў у арміі (1946-1947). Закончыў Менскі інстытут фізічнай культуры (1955). 46 гадоў працаваў настаўнікам у школах Лідчыны - Цыбарскай, Дзітрыкаўскай, Папернянскай, Ганчарскай, Нёманскай, да 1993 г. З іх - 44 у Нёманскай (Сялецкай). Узнагароджаны медалямі "За доблесную працу" (1970), "За працоўную доблесць" (1981). Аўтар краязнаўчых кніг "Дзітрыкі. Згукі заснулай цывілізацыі" (200 стар.) "Сялец. Прынёманская рэчаіснасць" (294 стар.), а таксама шэрагу публікацый у перыядычным друку:

*“У 1944 годзе **Зоя Іванаўна Кудла (Шуціла)**, (падчас вайны мая настаўніца беларускай мовы ў Ганчарскай сямігодцы), арганізавала школу ў вёсцы Жучкі.*

*Пасля заканчэння Лідскага педагагічнага вучылішча мяне паслалі 1 верасня 1945 года настаўнічаць ў Жучкоўскую пачатковую школу.*

*Праз паўтара месяца мы з Зояй Іванаўнай з цяжкасцю атрымалі буквары. Новых і тых, што*



*захаваліся з папярэдняга года, хапала па адным на двух-трох вучняў. Дзеці вучыліся з вялікім жаданнем і да Новага года, як і патрабавалася, авалодалі тэхнікай чытання. Добрую дапамогу аказала нам раённая газета "Уперад". Закупіўшы некалькі разоў патрэбную колькасць экземпляраў, я задаваў сваім вучням для дамашняга практыкавання ў тэхніцы чытання лёгкія і зразумелыя артыкулы. На сходах прасіў бацькоў, каб яны далучыліся да гэтай працы і сумесна з дзецьмі чыталі больш складаныя матэрыялы. Буквары, падручнікі і прылады для вучобы куплялі па разнарадцы ў магазінах райспажыўсаюза і ў мясцовых крамах.*

*З вялікай цяжкасцю здабывалі або майстравалі мэблю для класаў. Быў доўгі стол, а пры ім лаўка, збітая з прынесеных бацькамі дошак, пагабляваных зверху. Да стала мацавалі ў лунках чарнільніцы і ручкі. Чарніла часта вылівалася, мазала парты, падлогу і адзенне, што выклікала незадаволенасць у дзяцей і іх бацькоў. За такімі сталамі сядзелі па тры - чатыры*

*вучні. У такіх умовах адны вучні горбіліся, другія амаль што стаялі за сталом падчас пісьма. Сталы ссоўваліся з месца, вучні хваляваліся і злаваліся З-за іх было нязручна выходзіць да дошкі, дый гэта займала шмат часу. Дошкі, хоць і фарбавалі ў чорны колер, але праз паўтара месяца яны выглядалі амаль белымі".*



Там жа у Хаданішках недалёка ад Дітрыкаў абаснаваўся **Буйніцкі Рыгор Міхайлавіч** (1891-1970 гг.) - руплівы гаспадар, майстар на ўсе рукі: на ўсё наваколле славіўся добрай сталяркай - вырабляў вокны, дзверы, на такарным станку выкручваў белясіны, клаў печы і коміны, вырабляў на той час патрэбныя ў сялянскай гаспадарцы кавальскія вырабы: плужкі, асыпнікі, падкоўваў коней…

Рыгор Міхайлавіч і жонка Надзея Аляксандраўна (1899-1970 гг.) выхавалі пяцёра дзяцей. Нажаль, дачка Зоя 1941 года нараджэння - вучаніца 5-ага класа Ганчарскай школы вясной 1953 года атруцілася смарчкамі і памерла.



***Хутар Хаданішкі.***

***На парозе мансарднай хаты Буйніцкіх: Буйніцкі Рыгор Міхайлавіч, жонка - Надзея Аляксандраўна, Тамара Рыгораўна з мужам Жамойдзікам Арсенем, Хрышчановіч Міхаіл і жонка Надзя, Урбановіч Ваня і жонка Валя***



Сын Яўген (1923-2001гг.) увесь час працаваў у калгасе імя Манькоўскіх у вёсцы Дзітрыкі кавалём. Ажаніўся Жэня з Соф'яй з Сяльца. На фатакартачцы маладажоны, сваты, радня і дружына. І я быў прызначаны дружбантам. (Дарэчы, у чэрвені 1962 года і мяне пасля тэхнікума накіравалі заатэхнікам гэтага калгаса. *В.К.*)

Дочка Вольга (1925-2007 г г.) актыўна працавала калгаснай звеннявой.

З сям'і выйшлі і двое працаўнікоў настаўніцкай нівы: Леў і Тамара. Вялікае жаданне вучыцца і рупліва працаваць ім было не пазычаць.

.



***Буйніцкія: Леў і Тамара - настаўнікі***

**Буйніцкі Леў Рыгоравіч** (Леўчык) пасля Дзітрыкаўскай школы закончыў у 1943 годзе Ганчарскую семігодку. А калі адкрылася Лідскае педвучылішча ў 1944 годзе, адразу паступіў і праз тры гады выдатнай вучобы закончыў. Быў па размеркаванні накіраваны ў Фалькаўскую школу настаўнікам пачатковых класаў. Потым за тры гады службы ў арміі ў Ленінградзе ўзмужнеў, многа даведаўся пра гістарычна-культурныя славутасці паўночнай сталіцы. Там уступіў у партыю, што садзей-

нічала накіраванню пасля арміі працаваць старшынём Дубровенскага сельсавета, потым дырэктарам Ярамеевіцкай сямігодкі. Пасля закрыцця школы перавялі настаўнікам геаграфіі ў Ходараўскую сярэднюю школу. Ажаніўся з загадчыцай ФАПа. Паступіў на завочнае адзяленне Магілёўскага педінстытута. Нажаль, пад час сесіі сэрца не вытрымала - памёр 13.07.1969 г. Пахаваны на лясных магілках у Ходанішках.



**_Буйніцкі Леў Рыгоравіч (1928-1969 гг.)_**



**_Буйніцкі Л. Р. - дырэктар Ярамеевіцкай сямігодкі з настаўнікамі і вучнямі з букетамі чаромухі пасля апошняга званка_**



**_Буйніцкі Л. Р. са славутымі на ўсю акругу музыкамі з вёскі Ярамеевічы: Свянціцкі Мечык - акардыяніст, Вацлаў Шмара - скрыпач, малады барабаншчык і стажыроўшчык - музыкант_**

**Тамара** пасля заканчэння Ганчарскай сямігодкі ў 1947 годзе і Лідскага педвучылішча выйшла замуж за настаўніка Жамойдзіка Арсенція Фёдаравіча. Доўгі час настаўнічала ў Сіманах, а калі школку закрылі, працавала ў Беліцкай сярэдняй школе.

Захавалася фатакартка Тамары на памяць для Шуры Германовіч:

*“Пройдут все годы*
*незаметно,*
*К ним невозвратен*
*больше путь,*
*Пусть отпечаток*
*молчаливый*
*Тебе напомнит*
*что-нибудь…*
*Пусть милый взор*
*твоих очей*
*Коснётся карточки*
*моей,*
*И пусть тогда*
*в твоём уме*
*Воскреснет память*
*обо мне…*
*Шурке от Тамары - 1950 год”.*



**Буйніцкая Тамара Рыгораўна (4.11.1931 - 8.09.2007 гг.)**

**Жамойдзік Арсенцій Фёдаравіч** (запісана Віктарам Кудлам на дыктафон 29 снежня 2021 года. А праз тры тыдні, не дажыўшы два месяцы да 95-ці годдзя - 21 студзеня - адышоў на вечны спакой…):

*"Жамойдзікі жылі за Нёманам у вёсцы Юравічы вялікай сям'ёй: чатыры сыны і тры дачкі. Бацьку Фёдара прызвалі ў царскую армію, служыў сем год кавалерыстам. Давялося ваяваць шашкай з немцамі ў Першую сусветную вайну. На жаль фатакарткі не захавалася.*



**_Жамойдзік Арсенцій Фёдаравіч (15.03.1927 - 21.01.2022 гг.)_**

*Пры сталыпінскай рэформе банк у двараніна выкупіў 500 гектараў зямель вакол Беліцы, гэтую зямлю ўзялі за крэдыты 30 сямей. Дзядуля Антон рашыў пакінуць пясчаую з хмызнякамі зямлю і якраз тут выкупіў 60 гектараў.*

*І раздзяліў па 20 га тром жанатым сынам: Міхаілу, Вікенцію, Фёдару. Чацвёртага сына Сямёна-халасцяка прытулілі да братоў.*

*Мая маці Макарэвіч Ганна з Навасад. Беднавата жылі, у бацюшкі дзяцей гадавала. Непісьменная, але разумная. Малілася Богу, пасты датрымоўвала. Ва ўлоні маці я адчуваў дабрату - гэта ўсматкалася ў маю падсвядомасць. Пабудавалі вялікую хату, што*

*палац, і ўся сям'я, больш за 30 душ, жыла багата разам".*

Жамойдзікі вялі здатную гаспадарку. Мелі пару коней, тры каровы, авечкі. На той час добры сельгасінвентар: плугі, жняярку, малацілку, манеж, арфу, сячкарню. Побач працаваў млын Адамчыка на малой рачулцы Ельнянцы, дзе і малолі сяляне з наваколля збажыну.

За польскім часам Арсень вучыўся ў Зарачанскай школе. З Польшчы прыслалі настаўніцу Гелену Квяткоўскую. Прыгожая, цікавая жанчына, вучыла на польскай мове. Там 4 класы скончыў. Роднай мовай размаўлялі толькі ў сям'і і з вяскоўцамі.

Пры першых Саветах прадоўжыў вучыцца ў Беліцкай школе, асвойваў кірыліцу пайшла беларуская родная наша мова. У вайну крыху хадзіў у Беліцу, там закончыў 7 класаў, навучанне вялося на беларускай мове, выкладалі і нямецкую.



***Вясна, 1948 год. Зарачанская пачатковая школа ў Сіманах. Жамойдзік А.Ф., Кучынскі М.М. і вучні***

*"Знячэўку ўсплывае ў памяці, неяк немцы зайшлі пераначаваць. Было гумно вялікае, салому павынасілі, разасланлі і ўляглісяі, а ў гумно не пайшлі спаць і адпачываць. У гумне стаяў бляхан самагонкі. Не адкрылі, не пакаштавалі. Бачыў, як елі. Кожны вайсковец даставаў баклажку, глаток пацягнуў і завінчваў. П'янага немца ні разу не бачыў.*

*Неяк на сажалцы асцямі рыбу біў. Падходзіць мужык: "Хлопчык прадай шчупачка, тут да дзяўчат іду. - Я так вам дам". Аддаў рыбіну. А яго ўжо пільнавалі. Гэта быў камендант мясцовай паліцыі... Яго ўзялі, каб не піснуў. Правёў чырвовых партызан праз паром на Нёмане ў Ліпічанскую пушчу, і яго адпусцілі.*

*Пасля вайны арганізоўвалі калгас. Патрабавалі, каб бацька першым запісаўся. Акаўцы заб'юць і бацьку, і мяне. Паехаў у райана, як мне быць? Перайдзі на кватэру каля школы. Пусціў погаласку, што не жыву з бацькамі, але ціха начаваў дома. А ў Ямантах настаўнік падпісаўся ў калгас, і ў гэтую ж ноч забілі яго і бацьку, будынак спалілі. Сволачы, за што?*

*Раскулачылі Вікенція, роднага брата майго бацькі, вывезлі сям'ю у Казахстан, у горад Чымкент. Сын інжынер-будаўнік, дочка - завуч школы. Яна рана памерла, і я лятаў туды на пахаванне. Смуткасць, нуда навалілася, журбота".* (У кнізе "Памяць" Ахвяры палітычных рэпрэсій. *"Асуджаны 18.04.1952 г. з вёскі Стокі: Жамойдзік Вікенцій Антонавіч - 1897 г.н., жонка Любоў Мікалаеўна - 1900 г.н., сыны: Авенір - 1940 г.н., Мірон - 1943 г.н. Рэабілітаваныя 17.051995 г."*)

Калі вайна пакацілася далей на захад, Арсенцій паступіў у Лідскае педвучылішча. Разам добра вучыўся Леўчык Буйніцкі, таксама Сяргей Германовіч. У 47 годзе пасля заканчэння вучылішча адразу накіравалі настаўнікам у Сіманы. Разам працаваў Кучынскі Мікалай з Ганчароў.

А праз год перавялі ў Чаплічы. Вёска - больш за 50 двароў, і вакол многа хутароў. Дзяцей многа. Адны - пераросткі не хацелі вучыцца і працавалі ў бацькоў на гаспадарцы, а нехта - вясковымі пастушкамі. Але сумеў іх угаварыць вярнуцца на вучобу.

*"Першыя гады там мы настаўнічалі з Паўлам* (прозвішча не ўспомніў) *халасцякамі былі. Ніхто з нас не заляцаўся. На вечарынкі будзем хадзіць, з дзяўчатамі патанцуем на кулэчка і адпускаем, бо праводзіць не трэба. Самі ціхенька дадому, ато мясцовыя кавалеры наладжвалі таўкушкі і могуць пабіць ато і забіць*

*Яшчэ банды хадзілі. Туды і мясцовых падбіралі. Я ужо на калейцы стаяў. Саштургнуць маглі за дробязь. Да мяне прыходзілі. "Я ў памочнікі для вас не падыходжу".*

*Быў выпадак, мы былі на вечарынцы. На перапынку селі за стол пачаставацца. Каля мяне падсадзілі нейкага мужчыну. Была спрэчка, знайшоў слова і я, сказаў: "Я - не даносчык, нам ніякі Азём не патрэбен.*



Ёсць энкэвадысты, што яго шукаюць, а я вучу дзяцей".

І што самае дзіўнае: як пазней высветлілася, побач сядзеў Азём, яго зналі і пра яго ведалі многія жыхары вёскі.

Аднойчы адкрыты ўрок праводзілі. З настаўнікамі іншых школ селі за сталы паабедаць. Зайшлі акаўцы, яны акружылі нас з ружжамі і па-польску: "Хто малітву ўмее - выходзьце праз дзверы, а хто не умее - праз вокны ўцякайце", - усіх паразганялі. Потым пра гэты выпадак на сходзе бацькам расказаў:"Я прыехаў не з той мэтай, каб з ружжамі мяне акружалі, а з той, каб дзяцей вучыць і побач з вамі спакойна жыць…"



Жаніўся з Тамарай Буйніцкай, малодшай на чатыры гады. Таксама закончыла педвучылішча. Знатная гаспадыня. Нарадзіла двух сыноў і дочку. Жылі ў Чаплічах на кватэры ў вяскоўцаў, бясплатна здымалі пакой.

Знаеце, да чаго дайшло так, што галадалі настаўнікі. Прышлося ад бацькі карову прывесці і пасвіць па калейцы ў вясковай чарзе. Затое дзеткам было малако, смятана, і ў бойцы білі масла.

Аднойчы з суседам сядзелі за чаркаю. "Скажы белым, што ў мяне кароста на руках". Перасталі мяне трывожыць. Я не удзельнічаў ні ў якой арганіўацыі, быў пільны, я - ні касмамолец, ні партыец.

У мяне вельмі складаным было жыццё.

Брат Валодзя, старэйшы на 2 гады. Яго гвалтам забралі ў Армію Краёву, каб не пайшоў у чырвоныя партызаны. Спачатку яна ваявала супраць немцаў, потым зверствавалі супраць саветаў. Нават ружжо брату не далі. Брат у бацькоў вёў гаспадарку, з белапалякамі не ўдзельнічаў ні ў якой бойні, але стаў закладнікам. Пасля вайны засудзілі на 8 гадоў, заслалі ў Сібір, працаваў на лесанарыхтоўцы, прастыў. Памёр, там і закапалі.



Прайшло дзесяць гадоў тэрору, пакутаў і слёзаў. Ашуканыя, пакінутыя на волю лёсу лідарамі, ахопленыя роспаччу шараговыя акаўцы прадаўжалі шлях у прорву. Шкада загінулых мірных грамадзян, байцоў, шкада многіх простых людзей у радах АК, зачумленых прапагандай і загінулых у бяссэнсавай і бязглуздай барацьбе,

Добра памятаю, як дзесьці ў 54 годзе міліцыя даведалася, што на хутары каля Няцечы начуюць азёмаўцы. Вайскоўцы вакол акружылі хату і стрэлам разбудзілі. Крыкам патрабавалі здацца, то жывымі пайдзеце пад суд. Мурын скаціўся і здаўся. Азём адмовіўся. Прывезлі маці, каб угаварыла сына здацца. Некалькі разоў хадзіла ў хату. Прасіла, каб здаўся. Развітаўся.

Палез на гарышча, запаліў страху і сігануў з дымам на гарод. Салдаты заўважылі і паверху пусцілі чаргу. Трэба было ўзяць жывым. Ён прылёгшы за плотам з аўтамата пасануў па акружаўшых. Салдат пальнуў у яго насмерць.

Азём не забіў ні аднаго мірнага чалавека. Мурын забіў брыгадзіра калгаса".

**З успамінаў чэкіста Казьяніна.**

"Апошнія выстралы на Лідчыне прагучалі 26



красавіка 1954 г.

Яны былі звязаны з ліквідацыяй тэрарыстаў Озіма і Мурына.

Пра Вацлава Озіма хацелася б сказаць асобна. Спрытны, хітры, вёрткі… Меў за плячыма салідны баявы вопыт. Ваяваў на фронце, быў узнагароджаны савецкімі і польскімі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны вярнуўся ў родныя мясціны, устанавіў кантакт з рэшткамі акаўцаў.

8 гадоў на нелегальным становішчы. Ён чуў небяспеку за вярсту, умеў выйсці сухім з вады ў любой складанай сітуацыі. Ва ўсякім разе, тройчы кругом яго сціскалася кальцо, і заўсёды яму ўдавалася вышмыгнуць.

У апошні раз наткнуліся на Озіма выпадкова.

*У вёсцы Жомайдзі быў забіты калгасны брыгадзір. Падазрэнне пала на яго папярэдніка, аднавяскоўца Мурына. Два супрацоўнікі міліцыі і чэкіст прыехалі да Мурына з ператрусам. Адзін з іх зрушыў з месца куфар і заўважыў вечка ад склепа.*

*Вечка быццам крыху прыпадымалася, але невядомая сіла цягнула яго назад. Тады старэйшы лейтэнант паднатужыўся і пацягнуў з такой сілай, што вечка адскочыла і... на яго пагрозліва глянуў аўтамат Озіма.*

*А ў супрацоўніка міліцыі нават пісталета ў руках няма.*

*"Вацэк, бі бандытаў!" - раўнуў Мурын, збіў з ног aпepaтыўнiкa-капітана, кінуўся ў сенцы і быццам у ваду кануў.*

*Озім шум паднімаць не стаў, стральбу не адкрыў. Маланкава сігануў праз вакно на панадворак, а праз імгненне яго і след прастыў.*

*Хто б мог падумаць, што Мурын - даўні хаўруснік Озіма. Вось і апошні іхні прыстанак - убогая, старэнькая хатка беднай мнагадзетнай сям'і. Озім і Мурын у гэты час моцна спалі на гарышчы пасля добрай чаркі гарэлкі. У дзесяць гадзін па ранку мы вырашылі іх разбудзіць: "Здавайцеся!".*

*Мурын скаціўся з гарышча і паўзком да нас: "Озім загадаў перадаць, здавацца не будзе".*

*Озіма загадана ўзяць жывым. Але і сваіх людзей пасылаць на заведамую смерць на дзевяты год па вайне недаравальна,*



***Чаплічы. На фоне бярвенчатай сцяны і саламянай страхі хлявушка. На цікавай фатакартцы ззаду стаяць Тамара Рыгораўны і настаўніца. А вось вучні ў поўны дзіцячы рост з цікавымі тварамі і на той час у характэрным адзенні і абутку… Хлапчукі добра "нагала" пастрыжаны, дяўчынкі з заплеценнымі касамі.***



***Арсенцій Фёдаравіч, Тамара Рыгораўна з вучнямі***

*Прывезлі сюды маці Вацлава - яна жыла дзесьці непадалёку.*

*Аблічам і паводзінамі яна пакінула моцнае ўражанне. Статная, прыгожая жанчына з сівымі валасамі, разумны, спакойны і пранікліві позірк.*

*"Ідзіце і перадайце сыну, калі здасца дабраахвотна, для яго яшчэ не ўсё згублена. Можа, застанецца жыць".*

*Трынаццаць разоў падымалася яна на гарышча і вярталася назад. Калі спусцілася з гарышча ў апошні раз, цвёрда прамовіла: "Усё! Больш не пайду. Вацак развітаўся са мною. Альбо ўцячэ, альбо загіне".*

*Ніводзін мускул не зварухнуўся на твары мужнай, гордай полькі, ні адна слязінка не выкацілася з патухлых вачэй. Адчуваецца, сама нас не баіцца і не паважае, гатовая да ўсяго. У ранейшыя гады яе, невінаватую, за правіны сына саслалі б далёка, а так спакойна ад'ехала ў Польшчу.*

*У гэты час са страхі, каля цаглянага коміна, у неба паднімалася стужка чорнага дыму. Мажліва салома ўзгарэлася ад куль у ходзе перастрэлкі ці яе падпаліў сам Озім?*

*Заўважылі, як у густой плыні чорнашэрых клубоў дыму па зямлі да частаколу кінулася чалавечая постаць і затаілася ў самым куточку агароджы. Мы пачалі набліжацца да плоту. Озім узнавіў стральбу. Нечая чарга з аўтамата прымусіла яго змоўкнуць навекі.*

*Так, усё было скончана 26 красавіка 1954 г.”*

*Менавіта тут і прыйшоў нарэшце доўгачаканы супакой на гэтую, шчодра палітую кроўю зямлю.*

*Адпрацавалі і пражылі там, у Чаплічах, 11год, і слава Богу, што яны прайшлі больш-менш здавальньяльна ...*

*Старэнькія бацькі ў Стоках хварэлі. Цяжка было ім гаспадарку весці, і па прось-*

*бе мяне з Тамараю перавялі ў Сіманы. Прыехаў. Гляжу - вакол школы пасуцца каровы, на ганачку сядзяць пастухі і смаляць махорку. Паехаў у Райана, расказаў. Далі грошы на плот. Я потым гэтую школу агарадзіў 400 метраў - цэлы гектар. Садок засадзілі яблынямі, слівамі. Дзяцей было нямнога, навучыў іх шчапіць дрэвы. Яблыкі, слівы здавалі. Дзецям бясплатна выдавалі чай, потым купіў тэлевізар.*

*Першакласнікі вучыліся з вялікім жаданнем і да Новага года, як і правіла, авалодвалі тэхнікай чытання. На сходах прасіў бацькоў, каб і яны сумесна з дзецьмі чыталі. Буквары, падручнікі куплялі па разнарадцы ў мясцовых крамах.*

*Тамара добра вучыла. Многа ўзнагарод мела. Вельмі добрая да дзяцей, вучні любілі яе -мамай звалі, і бацькі з удзячнасццю паважалі за здольнасць.*



*Мы хадзілі пару кіламетраў пяшком да школы, дзеці выбягалі насустрач, віталіся і няслі сумку з падручнікамі і ядой на абед.*

*Каля бацькавага дома сам пабудаваў вось гэтую хаціну. Я вельмі паважаю Савецкі Саюз. Тады сельсавет выпісаў нарад 25 кубоў лесу за 100 рублёў. За Дзятлавам мой сваяк - дваюрадны брат - ляснічы памог спіліць 25 вялікіх сосен. Работнікі тралявалі і пагрузілі на самаход з платай па рублю, а я ім яшчэ больш даў. У Жучках на пілараме распілавалі бярвенні на дошкі, потым зрабілі вагонку. Кожная дошчачка прайшла мае рукі, падшыў столь. Так і атрымаўся дабротны дом. Пасадзіў сад. Развёў пчолы.*



***Каля сваёй хаты ў Стоках: Арсенцій Фёдаравіч, Тамара Рыгораўна і суседка з дочкай, сыны Толя, Жора, дочка Зоя***

*Паехаў у Баранавічы на выведку, як паступіць у інстытут, а адразу напісаў сачыненне, і залічылі, закончваў настаўніцкі інстытут у Менску.*

*Мне амаль 95 год. Маю і берагу тры дыпломы. Прапаноўвалі дырэктарам у сярэднюю школу - трэба было ўступіць у партыю. Адмовіўся.*

*Я быў асцярожны ...*

*Сястра, Галіна Сягла, на два гады маладзей за мяне, слава Богу, жыве ў Скамін Бары. Другая, Жэня - настаўніца, выйшла замуж за другога Сяглу - Фёдара - старшыню Бердаўскага сельсавета. Абоіх ужо няма ў жывых...*

*Сыны Толя, Жора і дочка Зоя былі здольнымі вучнямі, спагадлівымі працаўнікамі на прысядзібнай гаспадарцы. Здатна закончылі школу, паступілі ў Гарадзенскі настаўніцкі інстытут і, атрымаўшы дыпломы, прадоўжылі бацькоўскую настаўніцкую працу на Лідчыне".*



**Каханоўская (Ражнова) Ядвіга Міхайлаўна** 08.12.1935 г.н., в. Дроздава:

*"Жыхары вёскі Дроздава жылі небагата... Сем'і былі вялікія. Наша, напрыклад, складалася з 8-мі чалавек: 5 дзяцей, бацька, маці і бабуля (па маці)*

*Часцей за ўсё я ўспамінаю пасядзелкі ў нашым доме, калі збіраліся за чытаннем кніг. Трое старэйшых дзяцей: брат Браніслаў, сёстры Ірына і Леакадзія, вучыліся ў польскай Ганчарскай школе. Самым адукаваным, канешне, быў старэйшы - Браніслаў. Ён свабодна размаўляў на польскай мове. Браніслаў браў кнігі, запальваў лямпу і чытаў услых. Былі кнігі і на рускай мове, рускіх пісьменнікаў. Часам, ён спыняўся, і дзяды пачыналі ўспамінаць сваё жыццё ў Сібіры. Усе яны ў Першую сусветную вайну былі ў бежанцах у Расіі. Памятаю, у доўгія зімовыя вечары, тата Міхаіл Феліксавіч, не запальваючы лямпы, чытаў на памяць вершы Лермантава, Пушкіна, ці браў скрыпку і іграў прыемныя мелодыі.*

*У вайну нярэдка дзень пачынаўся са страшных звестак. Хтосьці з суседзеў прыносіў навіны аб пажарах ў суседніх вёсках, аб забітых і замучаных земляках.*

*У нашу вёску заязджалі і "белыя". Як заўсёды - ноччу. Стук у вокны, дзверы і: "Одэмкні!"- прыводзілі ў жудасны страх усю чалавечую сутнасць.*

*На трэці дзень пасля вызвалення Лідчыны былыя партызаны: мой дваюрадны брат Гена Шут, (ён быў выбраны 3-цім сакратарам райкама камсамолу), Браніслаў Каханоўскі (мой родны брат), Фёдар Курыла і, магчыма, Лёня Данэйка селі на павозку і паехалі ў Ліду для далейшага праходжання службы. Даехаўшы да ракі Дзітва, вырашылі кінуць у раку застаўшуюся ў іх трафейную гранату, каб налавіць рыбы для гарадскіх сяброў. Генадзь і Браніслаў злезлі з воза, спусціліся да ракі, а пры спробе кінуць, граната ўзарвалася ў руках Гены і цяжка параніла. Яго палажылі ў воз і паганялі, чым хутчэй, каня. У Лідскім шпіталі выратаваць Гену не ўдалося.*

*Хавалі Гену Шута з ваеннымі ўшанаваннямі якраз ў дзень перазахавання забітых акаўцамі ў Беліцы дроздаўцаў, у тым ліку яго дзеда Сямёна і бабулю Зою.*

*Чарга вазоў з трунамі, а абапал натоўп родных і аднавяскоўцаў рушыла ў Ганчары. Генадзя пахавалі каля самай дарогі, амаль насупраць дома Кучынскіх і Міцюкевічаў, а забітых аднавяскоцаў - на могілках каля царквы.*

*Паступова моладзь пачала ажываць. Збіраліся на "вячоркі": пралі, вязалі.... Часцей збіраліся ў нас, паколькі былі падросшыя дзве сястры: Рэня і Лёдзя, і былі добрыя лямпы. Збіраліся і ў Махнача. Там таксама былі дзве дзяўчыны: Анюта і Вольга. Вячоркі былі малалікія. Засталіся ў вёсцы ў асноўным дзяўчаты, бо хтосьці з маладых хлапцоў загінуў, жывыя пайшлі на фронт ваяваць. Вяскоўцы многа працавалі і дзяцей сваіх таксама прывучалі да працы.*



**Чацвёрты клас Ганчарскай школы (фотакартка Каханоўскай Ядвігі Міхайлаўны, а прозвішчы вучняў па звестках Кумпяк Крысціны - яе аднакласніцы.**

***Настаўніца - Валянціна Іосіфаўна Закржэўская.***

***Вучні:** **Буяк Бронак, Буяк Васіль, Грос Сцяпан, Дычак Вера, Дычак Валодзя, Каханоўская Ядзя, Казак Валянцін, Касарэўская Галя, Козел Валянцін, Шут Анісся, Шут Марыя, Ліхарад Валодзя, Урбановіч Лёдзя, Урбановіч Генрых, Урбановіч Валодзя***

*Дзеці разам з дарослымі хадзілі ў поле: палолі бульбу, лён, градкі ў агародах, пасвілі хатнюю жывёлу: кароў, авечак, а самыя меншыя - курэй.*

*Адразу пасля вызвалення восенню1944 года дзеці з навакольных вёсак нахлынулі ў Жучкоўскую пачатковую школу. Школу абсталявалі ў драўлянай хаціне (былы ўладальнік, нехта Франак, з'ехаў у Польшчу). Вучні розных узростаў ад 7-мі да 15-ці гадоў вучыліся ў двух пакоях і ўмоўна дзяліліся на класы. Замест парт уздоўж сцен стаялі доўгія лаўкі, на якіх папярок ляжалі дошкі. Падчас вусных урокаў мы сядзелі на лаўках, а на пісьмовых станавіліся на калені і так пісалі. Вучыла ўсіх нас Зоя Іванаўна Шуціла з в. Супраўшчына. Затым прыслалі настаўнічаць Мікалая Мікалаевіча Дзікевіча.*

*У трэці клас я перайшла ў Ганчарскую школу, дзе нас вучыла Дуня Сямёнаўна Кучынская - муж яе- Вячаслаў Мікалаевіч. Яна была строгая, асабліва даставалася перарosткам.*

*Чацвёрты клас прыняла Валянціна Іосіфаўна Закржэўская і заставалася нашым класным кіраўніком да сярэдзіны сёмага класа. На жаль, яна вымушана была нас пакінуць па прычыне пераводу яе мужа, дырэктара нашай школы, Кірылы Фёдаравіча Дзятлава, у іншую школу раёна (у перыяд нашай вучобы яна выйшла за яго замуж).*

*Гэтую настаўніцу я ўспамінаю і памятаю ўсё жыццё. Была яна прыгожая, энергічная, адукаваная, эрудыраваная, патрабавальная. Давала выдатныя веды па сваіх прадметах. Выкладала геаграфію, батаніку, заалогію і некаторы час - нямецкую мову і не толькі. У вольны ад урокаў час мы прасілі яе застацца і пагаварыць з намі. Апавяданні былі пра прыроду, аб кнігах, пісьменніках, гарадах, гістарычных асобах. Яе расповеды пра гарады Ленінград, Пушкін, Пецяргоф, аб Эрмітажы- бударажылі дзіцячае ўяўленне. Калі праз дзесяцігоддзі я пабывала ў гэтых месцах, было ўражанне, што ўсё гэта я ўжо бачыла. Геаграфію ведалі "на зубок."*

*З заплюшчынымі вачамі, або стоячы спіной да геаграфічнай карты, маглі паказаць размяшчэнне рэк, азёр, гор і да т.п. У яе не было любімчыкаў. Мы яе "баяліся", паважалі і любілі. Праводзячы, плакалі наўзрыд. Шкада, не ведаю, як склаўся лёс гэтага светлага, разумнага чалавека...*

*Алгебру, і геаметрыю вёў Канстанцін Іванавіч Буйніцкі - дасканалая супрацьлегласць нашай класнай. Казалі, што ён добра ведаў свой прадмет, але выкладаў яго лянiва, груба. Толькі вельмі здольныя і ўседлівыя ведалі гэтыя прадметы добра. Большасць жа - слаба. Мне вучоба давалася лёгка, запамінала ўсё, што распавядалі на ўроках. Дома злёгку гартала*



падручнік, таму ўседлівасцю не вызначалася.

Рускую мову і літаратуру выкладала Марыя Ярмалаеўна Карашкова , пасля замужжа Кучынская. Тлумачальны, пісьменны настаўнік, да ўсіх вучняў ставілася роўна - не перадузята. Простая, руская, адкрытая душа.

Беларускую мову і літаратуру - Лілея Мікалаеўна Пісарэвіч, пасля замужжа - Буяк. Добры прадметнік. Як чалавек, мне не імпанавала. Была з хітрынкай, любіла "пашаптацца", былі любімчыкі. Гэта маё суб'ектыўнае меркаванне.



**Лілея Мікалаеўна Буяк ( Пісарэвіч) - класны кіраўнік з вучнямі**

Па іншых прадметах настаўнікі з класа ў клас часта мяняліся. Апошні год фізіку выкладаў рослы, смуглы, кучаравы Сяргей Кучура. Запомнілася, як на нашым выпускным ён хораша іграў на срыпцы.

Клас быў вельмі дружны. Разам збіралі школьную бібліятэку, удзельнічалі ў самадзейнасці. Дзесьці ў 5-м,ці 6-ым класе на раённым аглядзе школьнай самадзейнасці, які праходзіў у Доме піянераў (цяперашні ЗАГС) заваявалі першае месца. Атрымалі прыз - стос сшыткаў, алоўкаў і іншых школьных прылад. Нашай радасці не было межаў. Клас лідыраваў ва ўсіх школьных справах, і па паспяховасці - таксама.

Калі з'яўляліся замест урокаў "фортачкі" - у памяшканні шчыльна зачынялі дзверы і вокны. Аднакласнік Буяк Браніслаў з Бенявіч даставаў гармонік і іграў, а ўсе астатнія весяліліся.

Штогод у дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі і 1-ага Мая, навучэнцы ад 1-га да 7-га класаў і настаўнікі школы выходзілі на дэманстрацыю. Шыхтаваліся ў калону і з песнямі ішлі ад школы праз усю вёску Ганчары. Каля апошняга дома (гэта быў дом партызанскай сям'і Ярашэвічаў) разварочваліся і ішлі назад тым жа шляхам. На магілку Генадзя Шута ўскладалі вянок, сплецены з дзеразы і галінак елкі. Збіралі дзеразу ў лесе вучаніцы з в. Бенявічы Надзя Заека і Крысціна Кумпяк. Кветкі і вянок да магілы ўскладалі яшчэ і ў Дзень Перамогі 9 Мая.

У памяшканні нашага класа я ўпершыню ўбачыла кіно. Гэта былі дзве карціны: пра Зою Касмадзям’янскую і Марытэ Мельнікайтэ. Затым паказ кінакарцін адбываўся ў сельскай хаце-чытальні. Першыя фільмы ў ёй былі “Джульбарс", "Бітва на мяжы", "Маладая гвардыя" і іншыя.

Шлях у школу з вёскі быў не блізкі - тры кіламетры пясчанай дарогі, кіламетр якой - грэбля ды балота. У вясенне-асенні перыяд па ёй немагчыма было прайсці. Даводзілася ісці ў абход па чыгунцы, што дадавала яшчэ кіламетры два.

З хутара, які знаходзіцца каля лесу, хадзіла драздоўская Марыя Шут, а да 5-га класа з ёй яшчэ хадзіў Міша Курыла (дарэчы, трагічна загінуў, з-за нейкай сваркі ці папроку бацькоў кінуўся пад цягнік. В.К.).

Успамінаецца кур'ёзны выпадак. Адзін вучань класа напісаў крэйдай на спіне іншага вучня "СССР" і пачаў смяяц-ца і прамаўляць: "Сталін Стоіць Сто Рублёў". Увесь клас рагатаў. Шум дайшоў і да іншых класаў і настаўнікаў. Пасля ўрокаў у клас увайшлі настаўнікі, дырэктар школы, і пачалося высвятленне. "Хто?".

Усе маўчалі, маўчаў і віноўнік інцыдэнту. Высвятленне доўжылася гадзіны тры, да ночы. Безвынікова. Пайшлі дадому "героямі", амаль "маладагвардейцамі".

Неяк у гутарцы з піянерважатай сказалі, што хочам быць камсамольцамі. У студзені 1951 года з райкама камсамолу прыехала да нас Ніна Сямёнаўна Махнач. Арганізавала сход, на якім адбываўся прыём у камсамол. Сход праходзіў доўга, абмяркоўвалі кожнага з нас: вучоба, паводзіны, удзел у школьным жыцці, паводзіны ў побыце. У выніку былі прынятыя ўсе 23 чалавекі.

У школе было два сёмыя класы. Наш, чамусьці "Б", складаўся з пастаянных вучняў школы. Клас "А" - з навучэнцаў, якія прышлі з іншых пачатковых школ у нашу школу ў пяты клас. Гэты "А" клас сядзеў і чакаў заканчэння нашага сходу, пасля якога мы пайшлі іх агітаваць. У класе была глухата, нас не пачулі. Уступіў у камсамол адзін вучань - Косця Сучкоў - сын мясцовага ветэрынара.



*Сям'я драздаўцоў Каханоўскіх - былыя навучэнцы Ганчарскай школы розных перыядаў.: сядзяць Ваня, Бронак, стаяць: Лёдзя, жонка Вані - Зоя, Хромін Андрэй - муж Рэні, Ядвіга з сынам Сяргеем і Рэня*

*Па-рознаму склаўся лёс навучэнцаў 7 "Б" класа. Дзевяць з выпуску атрымалі вышэйшую адукацыю. Сярод іх браты Георгій і Леанід Шуцілы. Першы атрымаў сельскагаспадарчую, і працаваў большую частку свайго жыцця ў родным калгасе, а на пенсію пайшоў з пасады старшыні калгаса "Нёман" Лідскага раёна. Астатнія - сярэднюю спецыяльную.*



*Аднакласнікі : Каханоўскі Іван, Дзявятая Вера, Кудла Ігар*

Другі школьны будынак пабудаваны ў 1950 годзе з перавезенай хаты раскулачанага і вывезенага ў Сібір Чылека.

Пазней атынкованы глінай і пабелены вапнай, пакрыты хваёвай гонтай. На ўваходзе - ганачак, далей - сенцы, напроста - настаўніцкая з адзіным акном, а ў класных пакоях па 4-ры акны: злева - 6-ты клас, направа - 7-мы.

У зімовыя, шэрыя дні памяшканні асвятляліся газавымі лямпамі з разліку 15 літраў газы на 1 лямпу ў месяц

Школьныя будынкі абаграваліся дровамі з разліку 8 кубаметраў дроў на адну печку. Парадак падрыхтоўкі класаў да пачатку навучальнага дня вызначаўся загадам дырэктара школы, дзе былі распісаны час пачатку і заканчэння прапалкі печак, забеспячэнне санітарных норм для ажыццяўлення навучальнага працэсу.

Настаўнікам 1 раз у месяц бясплатна выдаваліся 2 літры газы на асвятленне кватэр, напісанне вучэбных планаў, канспектаў, праверку сшыткаў.

Навучальныя класы былі абсталяваны



сталамі з дошак на крыжаваных ножках для 5-ці вучняў. Праз некалькі год сталы былі заменены драўлянымі вучнёўскімі партамі з паліцамі для кніг і адкіднымі дошкамі.

Некалькі пазней для асвятлення школы выкарыстоўваліся рухавікі і генератары. Сітуацыя з асвятленнем змянілася ў 60-ыя гады ў сувязі з электрыфікацыяй населенага пункта.

**Кумпяк Крысціна Канстанцінаўна** - 25.011936 г.н.з Бенявіч.



Расказала, як беняўскія дзеці і падросткі яшчэ пры немцах хадзілі ў старую школу, што каля царквы. Па дарозе са страхам праскоквалі каля нямецкага бункера. Вакол была агароджа вышынёй больш за два метры з круглых бярвенняў у два рады, а паміж радамі - пясок. Па вуглах стаялі вышкі, з вокан тырчалі кулямёты, гучна "шпрэхалі" немцы...

*"Калі канчалася вайна, над вёскай ляталі*

*самалёты, грымелі выбухі бомбаў, мы хаваліся ў бульбяных ямах.*

*Неяк світанкам заскачылі на падворак адступаючыя немцы. З хлявушка выцягнулі парсюка, пальнулі ў галаву і саломай асмалілі. Разабраўшы, свежаніны наеліся, забралі з сабой і крыху валялася на падворку. Злавілі канюгу, запраглі ў падводу, прывязалі карову і пагналі...*

*Вайна пайшла далей.*

*Маці з Бандароў - Жыдзень Ганна Іосіфаўна.*

*Бацьку Канстанціна Іванавіча 1912 г.н. забралі ў армію. Служыў дзесьці каля Мастоў. Там вайскоўцы рамантавалі мост цераз Нёман. Нам жылося ў страхах, белапалякі здзекаваліся з вяскоўцаў. Днём яны хаваліся каля касцёла ў Агародніках. Там жыў Чылек, які пасля эміграцыі ў Амерыцы выкупіў многа зямліцы, адбудаваўся, развёў жывёлу, прадаваў бярозаўскім шкловарам сваю прадукцыю - жыў зажытачна. Жонка Чылечыха, сваячка маёй мамы, была баявой і разумнай, абараняла аднавяскоўцаў ад акаўцаў.*

*Мелі две дочкі адна Броня выйшла замуж за Бялецкага Валянціна ў Беняві́чы, другая Галя - за Парасяніка ў Ганцавічы. Пасля ўстанаўлення савецкай улады яго раскулачылі і вывезлі ў Сібір.*

*Неяк ноччу загарэлася наша хата. Тушылі ўсёй вёскай, але адзін канец развалі́ўся. Пісьмом паведамалі бацьку. І ён праз пару дзён прыбег да нас разам з Чырвоным Колем і Заекам Міцем.*

*Пачаў разбіраць абвугленыя бярвенні, прывёз з лесу новыя і за пару тыдняў змацаваў сцяну. Ноччу прыехалі самаходам ваенныя, забралі, арыштавалі бацьку, засудзілі на 5 го . Так, аж да 47-га года працаваў на лесанарыхтоўцы ў паўночных раёнах Комі АССР".*



***Пасляваенны вучэбны год. Ганна Іосіфаўна Заека - аднавяскоўка Кумпяк Крысціны, у адным класным пакоі вучыла першаклашак і трэцекласнікаў***

Кожны вучэбны год закончваўся іспытамі па ўсіх прадметах для вучняў 4 і 7-га класаў. Экзамены прымалі строга, заўсёды прысутнічалі ў камісіі прадстаўнікі Райана. Чатырохкласнікам здаўшым экзамены выдавалі пасведчанне аб пачатковай адукацыі. У некаторых, асабліва перарасткаў, на гэтым адукацыя заканчвалася, і яны пераходзілі на сялянскую працу - на той час да бацькоў-адзіналічнікаў... Сямікласнікі паступалі вучыцца ў вучылішчы, а некаторыя пераходзілі на сярэднюю школу.

Крысціна, закончыўшы школу ў Лідзе, правучылася ў Гарадзенскай гандлёвай школе да 1955 года. Спачатку працавала ў сельскім савеце, разам з Шамяльковай Ганнай - начальнікам вайскова-ўліковага стала.



У Ганчарскую школу перайшла ў 57 годзе лабарантам, бібліятэкарам. У Берасці вучылася на хіміка- біялагічным факультэце і пачала выкладаць у школе біялогію. Выйшла замуж за Ярушчэнку Валодзю, які закончыў дзесяцігодку ў 1957 годзе і доўга працаваў школьным заггасам.



***1951 - 52 вучэбны год. Злева направа настаўнікі: Буйніцкі Кастанцін Іванавіч, Буяк Лілея Мікалаеўна, Качура Сяргей Васільевіч, Шкуратаў Пётр Фёдаравіч - дырэктар, Жывета Анастасія Сямёнаўна, Смірнова Марыя Васільеўна, Смірноў Аляксей Сцяпанавіч, Ліля Антонаўна (прозвішча не ўспомнілі)***



***На фоне пабудовы новай школы: Буяк Лілея Мікалаеўна - класны кіраўнік выкладала беларускую мову і літаратуру больш за тры дзесяцігоддзі***



***Гец Кастанцін Уладзіміравіч - дваюрадны брат Мікалая Дзікевіча выкладаў геаграфію з вучнямі-піянерамі…***



***Сын Мікалая Мікалаевіча Дзікевіча - Валера выдатна вучыўся ў Ганчарскай школе. Заваёўваў дыпломы на абласных і рэспубліканскіх алімпіядах. Паступіў у Маскоўскі інстытут міжнародных адносін. Валодае пяццю замежнымі мовамі і актыўна працуе на адказнай міжнароднай пасадзе***

У наступны навучальны 1952-53 гг. Ганчарская школа атрымала статус сярэдняй. А ў 1955 годзе адбыўся першы выпуск дзесяцікласнікаў: Бобрык Крысціна, Вайтушка Сабіна Баляславаўна, Гурэнда Валянцін С., Дычок Вольга С., Даўлюд Ала С., Кучынская Глафіра К., Кучынская Марыя В., Кучынскі Вячаслаў В., Казак Марыя П., Казак Софія І., Кумпяк Віктар К., Мулінская Валянціна А., Пацко Ірына А., Раік Зінаіда І.,Урбановіч Раман.

У 1965 годзе пабудавана тыповая школа на 320 месцаў.



***У настаўніцкай дружыне больш за чатыры дзесяцігоддзі працавалі старажылы: Буйніцкі Канстанцін, Заека Уладзімір, Папковіч Васіль***

**ПАДСУМАВАННЕ**

У "Лідскай газеце" № 61 за 2014 год надрукаваны артыкул Вольгі Яхантавай і яе ж фатакарткі.

*"2014 год. Урачыста-хвалюючым стаў апошні званок для выпускнікоў Ганчарскай сярэдняй школы. Маленькі, але вельмі дружны клас развітваўся са сваёй роднай школай і гаварыў шчырыя словы ўдзячнасці, павагі і любові настаўнікам. У добры шлях адзінаццацікласнікаў праводзілі бацькі, настаўнікі і шматлікія госці. А таксама былыя яе выпускнікі. Роўна пяцьдзесят пяць год таму (1959 г.) адсюль, таксама сыходзіў у самастойнае жыццё Віктар*



***Вашкевіч Іван Феліксавіч, дырэктар установы адукацыі "Ганчарская дзетсад - сярэдняя школа" прымае ад Віктара Іванавіча Кудлы карціну***

*Кудла.*

*Сёння ён - вядомы на Лідчыне чалавек, былы дырэктар экс. базы "Ніва" ,выдатная асоба, працавіты фермер, таленавіты мастак і здольны краязнавец.*

*На ўрачыстай лінейцы ён перадаў школьнаму музею адну са сваіх карцін, напісаную 50 гадоў таму.*

**Родной школе**

У творчым натхненні, у пошуках лепшага,
Прайшло ў сценах школы нямала гадоў.
Крупіцы разумнага, добрага, вечнага,
Збіраў калектыў і да мэты нас вёў.

З адказнай задачай спраўляўся старанна
Настаўнік, да ведаў шляхі нам адкрыў,
Свае абавязкі выконваў дакладна -
Жыццё разумець нас на ўроках вучыў.

Ды дзе ж адшукаць нам адзіную мерку,
Каб працу, старанне яго ацаніць,
Душу не адкрыеш усю на паверку...
Бо вельмі няпроста настаўнікам быць.

Куды б ні закінуў нас лёс апантаны,
Ніяк не закрэсліць тых школьных гадоў,
Дзе погляды нашы ў жыццё сфармаваны,
Дзе лепшы наш час так імкліва прайшоў...

*Наведала родную школу і выпускніца 1949 года Вольга Кандратаўна Германовіч, былы педагог. Разам з ёю мы з'явіліся на сустрэчу з цяперашнімі настаўнікамі і вучнямі. Усіх здзівіла тое, што праз столькі гадоў у яе захаваліся тыя ж знешнія рысы, прыемны голас і ласкавасць бліскучых вачэй. У дар музею яна перадала ўзнагароду бацькі Кандрата Кандратавіча, удзельніка грамадзянскай і Айчыннай войн".*



***У школьным этнаграфічным музеі: Рудзінская Алена Мікалаеўна- кіраўнік музея, Вольга Кандратаўна Германовіч, Віктар Кудла***

Вось ужо амаль 63 гады, як мы выйшлі са школьных будынкаў, а пачуцці нашыя захаваліся. Хутка праляцелі школьныя гады. Часта ўсплывалі ў памяці эпізоды са школьнага жыцця .

За гэты час некалькі аднакласнікаў і ўсе, з той пары, настаўнікі ўжо адышлі ў вечнасць, але яны жывуць у нашых сэрцах і мы помнім аб іх.

Адыходзяць мае аднагодкі,
Іх сляды замятае пурга,
Пахвалы замаўкаюць і плёткі,
З часам пройдуць і жаль, і туга.

Усё звычайна, разумна, лагічна.
Ёсць пачатак, узлёт і канец.
Ледзь прыкметна мільгае лірычны
Адзінокі і мой каганец.

Звянуць кветкі, развеюцца згадкі,
Наш трывожны забудзецца час -
Узмужнелыя нашы нашчадкі
Шчаслівейшымі будуць за нас.

Вось праз такі адрэзак часу мы зноў адчулі сябе вучнямі. А якой цёплай і цікавай была гэтая сустрэча! Усё тое, што было пачута, убачана і перажыта, зрабіла добрую справу, пакінула незабыўны след у душы.

У снежані 2000 года Ганчарская школа адсвяткавала 100-гадовы юбілей. (Хутчэй трэба было адзначыць 136-я ўгодкі. Па знойдзеных архіўных звестках стала вядома, што ў 1864 годзе ў Ганчарах адкрылася і працавала ў вясковых хатах царкоўна-прыходская школа. А ў 1900 годзе непадалёку ад царквы пабудавана з дрэва першая школа з 5-ці пакояў. Скупыя архіўныя запісы нагадваюць аб навучанні ў тыя часы і апісаны ў "Лідскім летапісцы". Вось ужо ў дзесяці нумарах апублікаваны "Звесткі пра сялянскае жыццё, навучанне вучняў і іх лёс у Ганчарскай акрузе".)

Аб святкаванні падзеі паведамлялася ў "Лідскай газеце": Т. Чарнавус і К. Майская "Зайздросная сталасць" (№ 149, 05.12.2000 г.).

Дзікевіч М.М. меў магчымасць таксама пабываць на святкаванні юбілею школы: вучыўся тут і пазней працаваў. І я таксама разам прысутнічаў на вечары…

Мікалай Мікалаевіч напісаў водгук, але так і не даслаў ні ў адну з газет.

Думаю, што водгук цяпер будзе актуальным.

*"Больш за месяц прайшло з таго часу, калі ў снежні 2000 г. у Ганчарскай сярэдняй школе Лідскага раёна адсвяткавалі стагоддзе юбілею школы. Дастаткова часу, каб забыць нюансы вечарыны, але ўражанне дваякае. Не хацелася ўспамінаць светлавое аздабленне, ад чаго немагчыма было разглядзець вядоўцаў і выступоўцаў, бо лямпы размешаны далёка на сцэне, ды ў зале выключылі святло. Вінаваціць хутчэй патрэбна загадчыка клуба.*

*Сцэнарый не выклікаў асаблівых заўваг. Дрэнна тое, што змест яго чыталі на рускай мове! Дзіўна, але і выступоўцы гаварылі на руска-беларускай "трасянцы". Нейкай выспачкай у акіяне прагучалі ціхія*

*галасочкі прывітання дзетак з дзіцячага садка, ды толькі настаўнік пачатковых класаў Яраслаў Мікалаевіч Кучынскі размаўляў на сакавітай з гумарам беларускай мове.*

*Няўжо ніхто з прадстаўнікоў раёна і мясцовай грамадскасці не карыў сябе, калі ўзяла слова намеснік начальніка абласнога ўпраўлення адукацыі Вера Грышачка і вельмі змястоўна павіншавала на роднай мове калектыў школы, былых вучняў са стагадовым юбілеем.*

*Вельмі была б удзячна Кацярына II, што за 100 гадоў у Ганчарскай школе збылася яе задума: беларусы размаўляюць на рускай мове. Калі спытаў у супрацоўніцы райана аб такім становішчы, тады атрымаў адказ: "У нас двухмоўе, ды і сам прэзідэнт размаўляе на рускай мове". А калі заўтра прэзідэнт пачне размаўляць на польскай або літоўскай мовах?"*



***Віктар Кудла, Мікалай Мікалавіч і Вольга Іванаўна Дзікевічы***

А з архіўных матэрыялаў публікуем наступныя звесткі:

**Дырэктары Ганчарскай школы з 1944-га года**
***Спіс складзены на падставе архіва аддзела адукацыі Лідскага райвыканкама***

1. Буйніцкі Канстанцін Іванавіч, 1915 г.н., у 1929-35-х гадах у настаўніцкай семінарыі ў г. Шчучын. З 5 жніўня 1944 года - загадчык пачатковай школы;

2. Шайнога Уладзімір Сцяпанавіч, 1914 г.н., у 1928-1934- х гадах вучыўся ў Беластоку, з 20.01.1945 па 1947 год - дырэктар сямігадовай школы.

3. Дзятлаў Кірыл Фёдаравіч - з 9.01.1946 г. па 31.03. 1951 г.

4. Шкуратаў Пётр Фёдаравіч - з 31.03.1951г. па 12.08.1953 г.

5. Пазьняк Іосіф Людвігавіч, 1930 г.н. У 1949 -1953 гадах - факультэт матэматыкі Гарадзенскага педінстытута. Дырэктар з 13.08.1953 г. па 3.08.1955 г.

6. Шандзяровіч Анатоль Аляксандравіч, 1927 г.н. У 1951-1955 гадах Менскі педінстытут. Дырэктар з 3.08.1955 г. па жнівень 1957 года.

7. Клябанаў Арон Мендзелеявіч, 1904 г.н. У 1949 -1953 гадах Менскі пед інстытут. Дырэктар з 1.09.1957 па 23.08.1960 г.

8. Філістовіч Іван Мікалаевіч, 1934 г.н. У 1953-1958 гадах Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Дырэктар з пачатку навучальнага 1960 па 1969 год.

9. Мікалаева Надзея Сяргееўна, 1931 г.н. Дырэктар з пачатку навучальнага1969 года па 11.08 1976 г.

10. Марчукевіч Казімір Іосіфавіч, 1946 г.н., факультэт матэматыкі Гарадзенскага педінстытута ў 1968 годзе. Дырэктар са жніўня 1976 года - па 28.08.1981 г.

11. Разумовіча Генадзь Мікалаевіч, 1955 г.н., у 1976 годзе факультэт фізікі і астраноміі Гарадзенскага педінстытута. Дырэктар з навучальнага1981 па жнівень 1989 г.

12. Шафранаў Уладзімір Паўлавіч, 1954 г.н., у 1976 годзе факультэт фізікі Гарадзенскага педінстытута. Дырэктар з 28 жніўня 1989 па 31 жніўня 2012 года.

13. Вашкевіч Іван Феліксавіч, 1966 г.н., у 1990 годзе скончыў геаграфічны факультэт Берасцейскага педінстытута. Дырэктар з 2012 г па 2019 год.

14. Буйко Раман Васільевіч,1969 г.н. З пачатку навучальнага 2019 года па сёнешні дзень дырэктар Ганчарскай дзетсад - сярэдняй школы.

Хачу заклікаць, каб усе навучэнцы, незалежна ад узросту, ушаноўвалі сваіх настаўнікаў, тых, хто бескарысна дзяліўся сваімі ведамі, не шкадаваў свайго часу, каб надзяліць змястоўнымі ведамі, выхаваць вучняў адданнымі грамадзянамі нашай любімай Беларусі, дзе можна дабротна, спакойна жыць, з годнасцю працаваць.

Шаноўныя чытачы! Даражыце гэтым дабром, дзяліцеся ўспамінамі са сваімі нашчадкамі, сустракайцеся з аднакласнікамі і настаўнікамі! Шануйце сяброўства! Цёплых Вам усім сустрэч і прыемных ўспамінаў!

Чытайце ў дзесяці нумарах “Лідскага летапісца” "Звесткі пра сялянскае жыццё, навучанне вучняў і іхні лёс у Ганчарскай акрузе".

Хачу сказаць на развітанне
Для тых, хто твор мой дачытаў
І задае сабе пытанне,
Ці праўда ўсё, што напісаў?
Магу, спадарства, вас заверыць:
Я тут хлусні не дапусціў,
Паверыць можна ці праверыць,
Бо ўсё праз сэрца прапусціў.

*Леанід Лаўрэш*

# Стары дом паміж сучасным Ліцэем № 1 і Еўраоптам

Раней я чамусьці не звяртаў увагі на гэты вялікі, драўляны будынак, вокны якога зараз забіты дошкамі і ў якім ніхто ўжо не жыве. Дом стаіць у самым цэнтры горада, паміж сучасным Ліцэем № 1 па вуліцы Ленінская і Еўроптам па вуліцы Гагарына (каардынаты будынка: 53°53'18.7"N 25°17'44.1"E). Праграма-навігатар OsmAnd падказвае, што паштовы адрас будынка - Ленінская, 23 А.

Знешні від дома кажа, што пабудаваны ён недзе ў 1920-х ці, як найпазней, у 1930-х гг. З поўдня да гэтага старога дома прыбудаваны доўгі барак, які можна датаваць 1950-мі гг. Параўнанне сучаснага сатэлітнага здымка і аэраздымка, зробленага 17.04.1944 г., паказвае, што гэты драўляны будынак і насамрэч існаваў да 1944 г.

Вядома, што ў частцы сучаснага ліцэя, пабудаванай на пачатку XX ст., першасна знаходзілася жаночая прагімназія[1], потым польская дзяржаўная гімназія[2], потым аддзел Пракуратуры Акруговага Віленскага суда і Карны аддзел Акруговага суда[3]. Адрас былой гімназіі - вуліца Каменская (3-га Траўня), 45. Недалёка ад гэтага будынка, у доме № 53 прадавалася разліўное піва віленскага бровара "Шапэн". Улічваючы вялікую шчыльнасць тагачаснай забудовы, у старым будынку, які мяне зацікавіў, мог месціцца гэты піўны бар. Цікава, што тагачасная розніца паміж домам № 45 і 53 такая самая (8 дамоў), як і зараз паміж ліцэем (Ленінская, 15) і гэтым старым будынкам (Ленінская, 23 А), - усе тыя ж 8 дамоў.







Вуліца Гагарына ў 1920-30-х гг. мела назву "вуліца Домб-Бярнацкага". У тэлефонным даведніку 1939 г., на гэтай вуліцы меўся толькі адзін вялікі будынак - алейня "Шэмен" (вул. Домб-Бярнацкага, 38)[4]. Таварыства "Шэмен" належала нейкаму Шапетыньскаму і суполцы. У 1920-х гг. таварыства месцілася на вуліцы Сувальскай, а пазней пераехала ў будынак па вуліцы Домб-Бярнацкага (сёння - Гагарына)[5]. Ёсць верагоднасць, што ў старым будынку, які мяне зацікавіў, знаходзілася менавіта алейня "Шэмен".

На жаль, ужо няма людзей, якія маглі б расказаць мне пра гэты будынак. Што б ні месцілася раней ў гэтым старым, драўляным гмаху, стаяць яму засталося ўжо няшмат часу, таму хутка ад яго застануцца толькі фотаздымкі.

Фотаздымкі:

01- Злева - сучасны здымак з сатэліта, справа - аэрафотаздымак 17.04.1944 г. На абодвух стрэлкай пазначаны будынак, пра які ідзе гаворка.

02-03 - здымкі будынка 02.03.2022 г.

---

[1] Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900-1939 гг. Гродна, 2017. С. 23-25.

[2] Там жа. С. 158-161.

[3] Там жа. С. 208., 411.

[4] Там жа. С. 409.

[5] Там жа. С. 298.

***Альжбета Табенская***

# З долі і няволі

## *Успаміны выгнанкі**

### VI

Праз некалькі дзён мяне адвезлі ў Сушчэўскую частку (паліцэйскі ўчастак), дзе я застала дзвюх полек: пані Дызманьскую і панну Браніславу Вечаркоўскую. Першая - маладая ўдава і, падобна, заможная кабета, другая - нешчаслівая, хворая на галаву, якая жыла ў пп. феліцыянак у Варшаве, у альтанцы, у садзіку на першым паверсе, а на другім паверсе быў пакойчык, дзе жыла пані Тэкля Траханоўская, таварышка далейшага майго падарожжа з Масквы ў Томск. Траханоўская, не зважаючы на настойлівыя просьбы пп. феліцыянак, каб не ўлазіла ў справы, якія маглі б скампраментаваць яе перад урадам, і ў якія ім, манашкам, умешвацца было нельга, бо толькі на такіх умовах далі ёй у іх жыллё. Траханоўская кпіла з манашак і са слова ім дадзенага і выконвала без іх ведама нейкія даручэнні. У выніку гэтага прыйшлі раз жандармы з паліцыяй для правядзення ператрусу, салдаты атачылі альтанку, а тут з акна выпаў гаршчок кветак з нейкай пад ім схаванай паперай Нацыянальнага ўрада, здаецца, з нейкім мандатам. Каля ног салдата, які стаяў унізе, аказалася гэтая папера, а паколькі гэта адбылося пад акном п. Вечаркоўскай, абвінавацілі яе ў стасунках з Траханоўскай і пасля допытаў і турмы выслалі на жыхарства ў Арэнбургскую губерню. П. Вечаркоўская баялася маёй кампаніі, са страхам глядзела на маю арыштанцкую вопратку і прыдумала сабе, што яе высылаюць па волі ксендза Дунаеўскага, пазней ксендза-біскупа і кардынала кракаўскага. Пісала яна князю Абаленскаму лісты па-французску і высокім стылем апавядала пра свой без віны праслед і маліла адаслаць яе ў Край. Князь узяў тую справу да сэрца і, выклікаўшы мяне ў другі пакой, запытаў, ці сапраўды ўсё так, як п. Вечаркоўская гаворыць? Я адказала, што нявінная п. Вечаркоўская ў справе, у якой не толькі найменшага ўдзелу не брала, але нават пра яе не ведала, гэта праўда, але праўда ёсць таксама і тое, што хворая на галаву, і выказванні, якія робіць пра кс. Дунаеўскага, пра феліцыянак і пра мяне, ёсць ураенні хворай думкі. Князь дазволіў п. Вечаркоўскай паехаць у Цітаўскія казармы, каб пабачыцца з Траханоўскай і пагаварыць з ёй пра тую справу, бо ў камісіі гаварылі, што Траханоўская прызналася ў стасунках і знаёмстве з ёй. Не ведаю, што пазней з п. Вечаркоўскай сталася, узбуджала яна ў мяне літасць сваімі паводзінамі. Нейкі вязень, расеец, якога высылалі ў Арэнбургскую губерню за нейкае злачынства і які бегла гаварыў па-французску, моцна яе апякаў, і яна яму моцна давярала. Праз тыдзень выехалі мае таварышкі з Сушчэўскай часткі, а мяне перавезлі Цітаўскія казармы, дзе князь Абаленскі дазволіў мне застацца да прыезду сястры. Знайшла тут вялікую кампанію палітычных вязняў і паміж імі с.п. Вітольда Гажыца. Тут я пазнаёмілася з Тэкляй Траханоўскай, да якой прыязджала п. Вечаркоўская.

З Цітаўскіх казармаў дазволілі мне паехаць да касцёла, дзе мела шчасце выслухаць святую імшу, спавядацца і прыняць Пана Езуса (прычасціцца, *рэд.*). Таварыства знаёмых і знаёмства з п. Траханоўскай добра на мяне ўплывала. Я паважала яе як старэйшую векам, вышэйшую розумам, як тую, якая не паддаецца роспачы, а пры тым мае здароўе слабейшае, чым у мяне. Прыходзіў да нас часта Гажыц, быў да мяне вельмі дабразычлівы, мы з ім гаварылі адкрыта пра многія рэчы; быў бедалага прыгнечаны духам, спазнаўшы шмат інтрыг, пры тым яго асуджалі за здраду нашай справе, за тое што выдаў некалькі абывацеляў Лідскага павета, дзе быў цывільным начальнікам. Я не верыла таму, бо на няшчасце дапускаліся розныя падазрэнні і паклёпы, чым няшчасныя самахоць сваю нядолю павялічвалі. Гажыц быў праваслаўны, маці, падобна, - з уніятаў, аднак ён сваёй веры не любіў і ў наступнае жыццё не верыў.

Вельмі зычлівай да мяне была пані Ляшчынская, удава, добрая, лагодная і хворая кабета, а таксама яе знаёмая - вясёлая і энергічная асоба, прозвішча якой сёння не памятаю. У Цітаўскіх казармах быў адзін малады, шаноўны хлопец па імені Станіслаў, кухар па прафесіі. Ён прапанаваў мне, каб з яго дапамогай я занялася прыгатаваннем абедаў для таварышаў па падарожжы, я згадзілася на гэта, і ў час побыту нашага ў той вязніцы і пазней яшчэ ў дарозе аж да месца прызначэння Станіслава ў арыштанцкія роты некаторыя з нашых таварышаў мелі добрыя, здаровыя і не дарагія абеды, бо ішлося нам не пра заробак, а пра нейкі занятак і дапамогу таварышам. Станіслаў умела ўзяўся за працу, пакупка патрэбных прадуктаў ніякай цяжкасці не ўяўляла, бо мяса, масла, рыбу розных гатункаў, словам, усё, што толькі патрэбна было, мы мелі ад перакупшчыкаў, якія

* Пераклад з польскай мовы Станіслава Судніка. Паводле “Z doli i niewoli. Wspomnienia wygnanki”. Кракаў, Друк В. Карнецкага, 1897.

сядзелі пад брамай вязніцы. Станіслаў гатаваў і выдаваў абеды. Я вяла рахункі і распараджалася грашыма.

Мы жылі разам, п. Траханоўская і я, і хоць абедзве былі ўжо не маладыя, бо я мела 35 гадоў, а яна яшчэ на 10 гадоў старэйшая за мяне, прытым праўдамоўная і патрабавальная, гарнуліся да нас маладыя людзі, якія адчувалі недахоп сямейнай зычлівасці дамашняга агменя. Кожны з іх меў за сабой балючую мінуўшчыну, а што за будучыня іх чакала? Марнавалася велізарная колькасць моладзі: так, напрыклад, два браты Левандоўскія - Канстанцін і Мечыслаў, студэнты ўніверсітэта - на месцы ссылкі працавалі ў шынку; п. Юзаф Сільванд, студэт апошняга курса ўніверсітэта ў Пецярбургу - нейкі час працаваў на вёсцы ў мужыка, потым недзе ў іншым месцы за вучэнне дзяцей далі яму жыллё ў кухні і нейкую спажыву, але і ў тым яму хутка адмовілі, бо ім здалося, што занадта мала для іх умеў. І так многія з той прыгожай, добрай моладзі, якая магла б сабе светлую будучыню наваражыць, мусілі здольнасці свае закопваць у неадпаведнай іх прызванню працы. Калі сёстры-віленкі даведаліся, што я займаюся кухняй і што мне не хапае вопраткі, прыслалі для мяне адпаведныя рэчы: былі там фартухі, ватовая алжырка з дамашняга сукна, у белыя паскі з блакітным, трохі бялізны, спадніччку з кафтанікам, гарусавы каптурык на галаву, вялікі парасон ад дажджу, кніжкі для набажэнства: “Вастрабрамскі алтарык”, “Прыклад Пана Езуса” і да т.п. Я не магла даведацца прозвішчы асоб, якія мне гэта прыслалі, але былі яны тыя самыя, якія бралі чынны ўдзел у вітанні мяне, калі вярталася. Якая я ўдзячная тым шаноўным віленкам за памяць пра мяне, пра майго бацьку, які цярпеў у вязніцы, пра маю сястру Антаніну, якая, бедалага, прабыла 15 месяцаў у турме. Найперш чатыры месяцы ў цытадэлі, у вільготай, цёмнай камеры, без змены вопраткі, і так, як была апранута пры арышце летам, так чатыры месяцы прабыла, потым трапіла ў яшчэ горшую Дамініканскую турму, а потым яшчэ на некалькі месяцаў яе замкнулі ў сакрэтную. Ад тых высакародных віленак мелая яна толькі за Божую ласку апеку. Няхай іх за гэта неба ўзнагародзіць. Князь Абаленскі быў нястомны ў сваёй апецы над намі, падчас, калі іншыя ўрадоўцы высокага рангу часта карысталіся паслугамі сваіх падуладных, ён сам заўсёды кожны дзень у розны час прыходзіў да нас, заўсёды прыносячы нам магчымыя палёгкі. Прыходзіла да нас часта пані Ганчарова, якую мы памылкова называлі паняй генеральшай, залатвіла яна пакупку рэчаў, патрэбных для вопраткі, таму і я, даючы ёй 7 рублёў, прасіла купіць якое-небудзь цёплае футарка і галёшы. Купіла мне салопку на футры з шэрага зайца з чорным кацінным каўняром і цёплыя галёшы, магла я ўжо неяк так, нібы трошкі лепей прыадзецца і кажухом не карыстацца. Пасля гэтага ўсяго роспач мая пачала ўступаць месца хрысціянскай пакоры, а думка пабачыць сястру пры пераездзе, а можа і злучэння з ёй на далейшае падарожжа была маёй наймілейшай марай. Не раз у сне выгуквала: “Антося! Антося!”, - з-за чаго разбуджаная пані Тэкля адразу назаўтра мяне пытала, якога гэта я Антося клікала. Дакучала яна мне не раз нейкімі падазрэннямі, не верыла або не хацела верыць, што я пра тое, як казала, глупства для сябе ніколі не думала, маючы пакліканне настаўніцы, як капланкі, дадзенае мне ад Бога. Бо калі б і мела калі нейкія мары выйсці замуж, ці ж на гэта тады быў час і становішча, мне так збалелай, нешчаслівай, так нядоляй сям’і маёй і Бацькаўшчыны прыгнечанай у такія пустыя мары ўдавацца? Але немагчыма было паню Тэклю пераканаць, маўчанне мусіла быць адзінай абаронай. Тым часам найнеспадзяванай дайшла да нас вестка, што нам усім: мужчынам, жанчынам і дзецям загадана выехаць. І гэта быў загад нашага тагачаснага апекуна князя Абаленскага. Трое таварышаў нашых уцяклі, і ў выніку гэтага ўсіх іншых загадалі выслаць. Кожны лёгка адгадае мае і пані Тэклі страхі, калі пра гэта даведаліся. У Маскве мы былі ад паловы лістапада да 5 сакавіка 1864 года. Нельга і так было б вымагаць даўжэйшага побыту ў Маскве; калі б не гэты выпадак, пачакалі б, можа, яшчэ пару тыдняў да паляпшэння дарогі, цяпер аднак трэба было пагадзіцца з лёсам і паўтарыць у думках: “Такі лёс выпаў нам, сёння - тут, заўтра - там”. Песенька, якую нашыя таварышы хорам па дарозе і пры выездзе з этапаў спявалі. Выязджаючы з Цітаўскіх казармаў развіталіся са шчырым жалем з п. Ляшчынскай і іншымі таварышамі. прыгаворанымі на пасяленне ў еўрапейскай Расіі, і падаліся з п. Тэкляй на ўказаныя нам вазы. Таварыства наша складалася з маладых людзей, апранутых у кажухі і брадзяхі з каляровымі латкамі на плячах. Былі яны прыгавораны да пасялення ў Сібіры з пазбаўленнем усякіх правоў, да катаржных работ або ў арыштанцкія роты. Смутны вобраз узнік перада мной пры выездзе з Цітаўскіх казармаў, але не было часу на роздум, трэба было хутка сядацца на высокі воз, наладаваны рэчамі, і добра трымацца, каб не зляцець, што пры фатальнай дарозе і вялікіх выбоінах магло лёгка здарыцца. Везлі нас хутка, каб не спазніцца на адыходзячы цягнік; кабеты крычалі, калі сані правальваліся ў глыбокія выбоіны, дзеці плакалі; даехалі мы аднак да вакзала без ніякага здарэння, але страшна абляпаныя граззю. На чыгунцы афіцэр, які з намі прыехаў, выказваў літасць да жанчын, размяшчаў іх як мага найлепей, а п. Тэклю і мяне размясціў у вагоне, прызначаным для яго і салдатаў; даў мне на падсцілку сваё футра і падушку, то я неўзабаве, заснуўшы смачна, некалькі гадзін праспала. А першай гадзіне ночы спыніліся ва Уладзіміры на Клязьме, дзе цягнік затрымаўся на тры чвэрці гадзіны, пасля чаго паехалі ў Ніжні Ноўгарад. З чыгуначнага вакзала адвезлі нас у астрожную турму, якая называлася “Перасыльнай”; адтуль этапным шляхам высылалі вязняў у далейшае падарожжа на Сібір. Каб дабрацца да вязніцы, трэба было пераправіцца цераз раку, дзе ўжо ў многіх месцах вада стаяла на лёдзе. Караван наш быў велізарны; жанчыны і слабейшыя мужчыны ехалі на вазах, мацнейшыя разам з жаўнерамі ішлі пеша. Кацап, які вёз пані Тэклю і мяне, апавядаў нам, як уласна ў гэтым месцы ўтанула нядаўна некалькі чалавек; таму страх быў агульны, дзякуй Богу - цераз раку шчасліва пера-

браліся. Нарэшце прыязджаем мы на этап, але паколькі перад выездам нашым з Масквы не прыйшло сюды ніякага распараджэння, мы мусілі доўга чакаць на санях, пакуль нас упусцяць, і так таго першага, так нас даўней пужаўшага этапа мы чакалі цяпер з нецярпеннем, і калі ўжо дзверы ў яго адчыніліся, то, хто мог, бег, каб чым найхутчэй размясціцца, кожны пачуваўся змучаным і патрабаваў адпачынку, асабліва тыя, якія прамоклі, пеша ідучы цераз Волгу. Пра нас ніхто не думаў, і нічога дзіўнага, кожны з нас пачаў тое, страшнае самім аповедам, этапнае жыццё, тое жыццё, у якім кожны быў асобна адарванай адзінкай і мусіў думаць толькі пра сябе і не зважаць на іншых. Гэта звычайна называецца эгаізмам і ёсць дзіцем крайняй нядолі і вынікаўшай з яе маральнай галечы. Нехта нарэшце дапамог пані Тэклі залезці на нары, я, здаецца мне, сама на іх узабралася; п. Тэкля размясцілася ў куточку пры сцяне, далей я, а за мной п. Пётр Янкоўскі, з якім я пазнаёмілася ў Місіянерскай турме ў Вільні. П. Пётр Янкоўскі, хочучы дачакацца аднаго з калегаў, які заставаўся яшчэ ў кскс. місінераў у Вільні, застаўся ў Ніжнім Ноўгарадзе. Нары і этапы незвычайны стрэс у мяне абуджалі, таму я вырашыла ехаць на месца майго прызначэння без затрымкі ў дарозе. Гэтыя нязносныя этапы і нары пасля заваявання Сібіры былі пабудаваны для расійскіх цывільных і палітычных злачынцаў; ад часоў царыцы Кацярыны пачалі там размяшчаць і няшчасных палякаў, як у месцах адпачынку, пастаўленых па дарозе.

П. Тэкля намагалася застацца ў Ніжнім Ноўгарадзе; шмат жанчын з простага люду таксама хацела чакаць на мужоў. Прыкра мне было адной ехаць, але мусіла. Напіўшыся гарбаты, прыгатаванай адным з таварышаў, развіталася з усімі і пайшла сядацца на воз.

Чакаючы некалькі гадзін на вывазку нас на другі этап, бачачы, што аказалася адна сярод мужчын зусім незнаёмых і чужых, паддалася смутным думкам, поўнаму сумненню. Бо зніклі падманныя надзеі вызвалення Бацькаўшчыны з няволі, паўставалі мне перад вачыма ўсялякія пераследы, уся нядоля нашага Краю пасля паўстання, прыгавор для 300 000 чалавек з розных сфер нашай супольнасці на змарнаванне па турмах, этапах і ў Сібіры. Любімы мой бацька, пакінуты ў турме, уся сям'я, поспех якой быў маім шчасцем, зруйнавана, і маё ўласнае становішча ахвоты да жыцця не дадавала. Пагружаная ў такія думкі, найнеспадзяванней убачыла некалькі жанчын з простага люду і п. Тэклю, якіх вялі на выезд, бо стараннi іхнія застацца ў Ніжнім Ноўгарадзе аказаліся бевыніковыя. Уцешылася іхнім відам і шкадавала, што аддавалася непатрэбнаму смутку, забыўшы, што воля Бога ўсім кіруе, што Бог пасля непрыемнасцяў суцяшэнне пасылае і што ніколі не пакідае тых, хто ў яго веру мае. Ад Ноўгарада сунуліся далей і далей амаль без ніякіх змен, заўсёды ў адным парадку, робячы па 20 вёрст у дзень і адпачываючы на этапах.

Звычайна перад выездам з этапа будзілі нас вельмі рана, перад усходам сонца, а потым па некалькі гадзін на возе чакаць загадвалі. На этапах заўсёды тыя самыя нязручнасці; голаду толькі не было, бо маючы гарбату, ад часу да часу малако, яйкі і мяса, выжыць можна было. Пасля прыбыцця на этап адразу парадкавалі сабе месца для сну. Часта здаралася, што афіцэр уступаў нам свой пакой на этапе, дзе мы з п. Тэкляй размяшчаліся, даючы яшчэ месца некалькім мужчынам. Афіцэр праводзіў ноч паблізу ў сваіх знаёмых ці падначаленых. П. Тэкля, як варшавянка, не была пазбаўлена сваёй вопраткі, пры тым мела пасцель у валізцы, з чым зручней было ёй падарожнічаць. Прыбыўшы на этап, даставала з валізкі дыванок, на які клала пярыну і падушкі і пасля малога падсілкавання забіралася на спачын. Драўляная скрынка і валізка былі маім ложкам; прысланая мне віленкамі падушка з вялікай хусткай і бурка былі добрай пасцеллю, на якой, калі толькі не было насякомых, спала выдатна.

На пятым па чарзе этапе, дзе мы мелі двухдзённы адпачынак, пабудзіла мяне ў першую ноч моцнае, колькікратнае пастукванне ў маёй скрынцы; мала зважаючы на тое, заснула неўзабаве нанава. На другую ноч былі такія моцныя ў скрынку ўдары, што аж ложка пані Тэклі затрэслася; прачнулася п. Тэкля і спаўшыя ў тым пакоі паны і запалілі свечку, аказалася, што аднаго з паноў схапілі канвульсіі, перапужаныя таварышы ўбачылі яго з тварам, уткнутым у падушку; малады гэта быў і моцны мужчына, з цяжкасцю ўдалося яго падняць, уся падушка была заліта крывёю, мог бы задушыцца, каб яго яшчэ на некальуі хвілін так пакінулі.

Мы з паняй Тэкляй не заўсёды разам ехалі, пры кепскай дарозе асобна было нам выгадней, тым больш. што п. Тэкля часта патрабавала мужчынскай дапамогі - прызвычаеная да выгодаў, старэйшая ўжо векам і слабога здароўя з цяжкасцю пераносіла такое падарожжа на Сібір. Са мной нейкі час ехаў пан Юльян Дзядзюль, малады, добры чалавек, у дарозе распавядаў мне пра сваю маладую жонку, з якой мусіў расстацца, падтрымліваў воз, каб не перавярнуўся і мяне, каб не вылецела, ва ўсім зычліва мне дапамагаў. Зычлівымі таксама для мяне былі паны Ігнацы і Пётр з нашага павета, лідзяне; п. Напалеон Враноўскі, малады і прыстойны маладзён з Каралеўства Польскага, які доўгі час складаў у дарозе кампанію п. Тэклі, а ехаў у Табольскую губерню, прыгавораны да пасялення з пазбаўленнем шляхецтва. На сёмы дзень нашага падарожжа мы спыніліся ў Васілії-Шурскім, павятовым горадзе Ніжне-Наўгародскай губерні, тут мы мелі днёўку. Спраўнік быў такі ветлівы, што дазволіў мужчынам прабыць той дзень у горадзе, у тамтэйшых жыхароў, а нам з п. Тэкляй не толькі свае два пакоі саступіў, але яшчэ даў каня для перавозкі нашых рэчаў. Такі адпачынак у выгадным. чыстым памяшканні быў для нас вялікім дабрадзействам; не на зямлі седзячы, як звыкла, а за столікам у кампаніі паноў Маргевічаў і Н. Враноўскага пілі гарбату. Дзве ночы мы там прабылі, пазней нас павезлі далей. Дарога была кепская, этапы агідныя. Пераехалі мяжу Ніжне-Наўгародскай і Казанскай губерній, дзе слуп з гербам Казані (алень з бронзы) тую мяжу паказваў. Дагэтуль везлі нас чарамісы, люд, які адрозніваўся ад расейцаў вопраткай і мовай. Прымушаныя адступнікам Юзафам Сямашкам

прыняць праваслаўе за часы цара Мікалая I, чарамісы кепска гавораць па-расійску, жанчыны апранаюцца, як мужчыны, носяць кашулі, спушчаныя на шаравары; наверх апранаюць капоты, гладкія спераду і фальдованыя ззаду. Спадніц зусім не носяць, а доўгія боты і нязграбна завязаная на галаве хустка дапаўняюць строй. Жанчыны, як і мужчыны, зусім не грашаць прыгажосцю.

Далей мы мелі вёску чувашоў, тыя самі не ведаюць, якой яны веры, гавораць, што вераць у рускага Бога, моляцца ў рускай царкве, а святкуюць пятніцы. Чувашы яшчэ брыдчэйшыя за чарамісаў. Жанчыны носяць шапкі на галовах, у вопратцы не адрозніваюцца ад мужчын, толькі што на шыі вешаюць металічныя манеты заміж пацеркаў. Усе нас шкадавалі, называючы невінаватымі і няшчаснымі. У Васіліі-Шурскім я хадзіла гатаваць есці да адной кабеты: маленькі пакойчык з перагародкай, чысцютка і ўзорна трыманы, усё кухоннае начынне як найстаранней памыта, уладальніца ветлівая, гасцінная, гаварыла, што мае да палякаў вялікае спачуванне, дапытвалася пра прычыны нашай высылкі і расплакалася, слухаючы маё апавяданне. Была гэта ўдава з чацвёркай дзяцей, бедная, але працавітая і парадачная жанчына; прыйшоўшы першы раз да яе застала яе піўшай гарбату з разынкамі заміж цукру, чым і мяне адразу пачаставала.

Пазней мы мелі два дні вельмі кепскай дарогі і гаротнае жыццё ў этапных памяшканнях. Нарэшце спыніліся ў мястэчку Чабаксары Казанскай губерні. З-за кепскай навесну дарогі і разліву рэк трэба было на нейкі час заставацца ў Чабаксарах. Мы атрымалі пакой у нейкага адстаўнога салдата з грубаватым абыходжаннем, размясціліся неяк так з паняй Тэкляй, я была два дні хворая на горла; жонка салдата, была трохі больш гжэчная за яго, прыслужвала нам, падавала самавар, хоць мы адмаўляліся ад таго, але яе настойлівасці мусілі ўступіць, на кепска нам гэта выйшла, бо пры выездзе ўсе дні былі палічаны і за ўсё заплаціць сказана, што нас амаль зруйнавала. У дзень Звеставання Н. П. Марыі глыбокі смутак мяне агарнуў: летась у сваім краі з любімай сям'ёй гэтае свята адзначала - сёлета дзе я ёсць, а праз год дзе буду?

Наша мужчынскае таварыства было памешчана ў этапе, частаколам абгароджным. Ажывілася тут наша моладзь, хадзілі па падворку, спявалі польскія песні, развесяліла іх вясновае сонца і тое, што за частакол часам па двое - па трое з салдатам ім выйсці дазвалялі. Мы нудзіліся і моцна сумавалі, асабліва я, бо ніякай работы мець не магла. У Чабаксарах нічога купіць нельга было, нічога для чытання мы не мелі, адзіным заняткам маім было гатаванне нейкай яды, пра якую я ніколькі не клапацілася, бо найменшага апетыту не адчувала. Непакоілі мяне ўспаміны пра бацьку, пакінутага ў вязніцы, пра ўсю сям'ю, сэрца рвалася да іх, мучылі згрызоты сумлення, што бацьку свайго пакінула, будучыня ўяўлялася як пропасць для ўсяго народа нашага як для выгнанцаў, так і для тых, хто застаўся ў Айчыне пад уладай Мураўёва і яму падобных. Сны мае, у якіх, як у люстэрку, адбіваліся дзённыя перажыванні, былі таксама жудасным спадарожнікам з нядоляй і з роспаччу, што з яе вынікала.

Даведліся нарэшце, што маем пакінуць Чабаксары. Фурманкі, якія тут называюцца падводамі, стаялі ўжо другі дзень да нашага вывазу падрыхтаваныя; брацці нашыя пастанавілі патрабаваць і прасіць улады ў Казані, каб прызначылі больш як чатыры капейкі штодзень на пражыццё, і не хацелі выязджаць без задавальнення іхняй просьбы, гаворачы, што пры такім ліхім жыцці сіл не маюць для далейшага падарожжа. Этапны начальнік, афіцэр, які нас суправаджаў, і начальнік інваліднай каманды ўжывалі ўсялякія спосабы, каб нахіліць іх да выхаду, але нашы пастанавілі трымацца на сваім. Правадыр нашай партыі, якога называлі старастам, п. Сломскі агульнае жаданне выказаў. Назвалі яго за гэта зачыншчыкам і гразілі кайданамі, калі будзе ўпарціцца. Два разы тэлеграфавалі ў Казань, адказу не было. Этапны і інвалідны начальнікі даставілі для страху кайданы і роту ўзброеных салдат; сышлося многа люду, хацеўшага паглядзець на сцэну, якая мела адбыцца з палякамі. Калі б у той час каторы з нас адазваўся не гжэчна, або гнеўна павысіў голас, без сумнення быў бы закуты ў кайданы, але ўсе найспакойней, найгжэчней і аднадушна адказвалі, што не збіраюцца бунтаваць і таму толькі выйсці не могуць, што сіл няма. Начальнікі адказалі, што гэта "дваране" ва ўсім вінаваты, бо просты люд не бунтуе, таму дваране будуць за гэта пакараны. Вербную нядзелю і вялікі панядзелак мы прабылі ў Чабаксарах у грунтоўнай падрыхтоўцы да падарожжа. Нарэшце пасля трохтыднёвага там побыту, у вялікі аўторак мы выехалі ў далейшае падарожжа, маючы абяцанне чыноўнікаў, што ўлада зробіць усё, што зможа, каб мы мелі большыя кармавыя. Надвор'е вясенняе, не кепскае, вазок не трасецца, таварыш мой п. Дзядзюль у добрым гуморы, таму ехалі шпарка і не заўважылі, што зноў этап наблізіўся. На этапе, дзе не палілі, было вельмі холадна; галава і зубы ў мяне разбаляліся, мела гарачку і не магла спаць. Назаўтра адбылася нейкая замінка з фурманкамі, мы доўга іх чакалі, затое потым без адпачынку праехалі дзве станцыі 19 і 30 вёрст і познім вечарам спыніліся на начлег. Вялікі чацвер, вялікую пятніцу і вялікую суботу мы былі ў дарозе, у якой спазналі розных прыгод і прыкрасцяў. Плылі Волгай сем вёрст, надвор'е было ціхае і мілае, калі б у іншым месцы і ў іншых акалічнасцях, у такім шаноўным таварыстве было б прыемна, цяпер жа ні на што не зважалі, усе да ўсяго былі абыякавыя. Староста маёй партыі п. Рытвінскі паставіў самаварчык і пані Тэклю, мяне, а таксама некалькі калегаў частаваў гарбатай. Аказаліся нарэшце на беразе, на высокай гары павятовы горад Свяжск падаўся нам прыгожым; два паны ўзвялі мяне на гэтую стромую гару, але так была змучаная, што ледзве магла аддыхацца. Тут чакалі нас дзве роты салдатат, прысланых для супакаення нашай партыі, і два ці тры афіцэры. Капітан Пузына, добры чалавек, дазволіў перад выездам пані Тэклі і мне зайсці ў рэстаран на снеданне, і так быў пры гэтым памяркоўны, што не даў нам жаўнераў для нямілага тава-

рыства, але сам іх замяніў. Выйшаўшы ў горад, купіла ўсяго, што мне магло быць патрэбным для пячэння, якое я збіралася спячы ў Казані для таварышаў падарожжа. Тым часам у Казань мы дабрацца не маглі, бо Волга разлілася на некалькі вёрст. Са Свяжска мы выехалі а 9-й раніцы, ішоў моцны дождж. Мы прыбылі на халодны этап, дзе прамоклыя да ніткі нават абсушыцца не маглі, і так, зусім не распранаючыся, мы з паняй Тэкляй леглі спаць. Была так моцна стомленая, што не магла спячы да гарбаты нейкага пячэння, каб несумненна таварышам зрабіць прыемнасць. Прыйшло мне ў галаву, як летась праводзіла гэтае свята ў доме майго бацькі з сёстрамі і дамашнімі. Мы былі на разарэкцыі ў васілішкім касцёле, і ўжо там усіх агарнуў смутак, што ўжо не было паміж намі шаноўнага кс. пробашча Сырвіда. Ён заўсёды ў гэты дзень адпраўляў набажэнства, прамаўляў казанне падчас сумы і складаў любячым яго парафіянам свае найлепшыя зычэнні, а потым запрашаў на свянцонае. У гэтым годзе быў ксёндз-пробашч у вязніцы, у руках Мураўёва, а таварышы яго, калегі Станіслаў Ішора з Жалудоцкай парафіі, Рамуальд Зямацкі - ваверскі пробашч і Адам Фалькоўскі - пробашч з Ішчалны былі расстраляны. (Ксёндз Станіслаў Ішора малады, не меў і 30 гадоў, пасля прачытання Маніфеста Нацыянальнага ўрада выехаў быў з дому, але калі праз некалькі дзён ксёндз-пробашч быў арыштаваны, у той жа час вярнуўся аб'явіць, што без ведама і волі пробашча гэта зрабіў. Ксёндз Зямацкі і ксёндз Фалькоўскі самі прачыталі маніфест, за што першы ў Вільні, другі ў Лідзе былі расстраляны. Ксёндз Ануфры Сырвід памёр у Спаску ў Тамбоўскай губерні.) Прыпомніла сабе, як у мінулым годзе пасля набажэнства падышла да мяне п. Стэфанія Юльянава П. і дрыготкім ад страху голасам прамовіла: "Ці ведаеш, што наш абаронца, вызваліцель Людвік Нарбут разбіты пад Новым Дваром! Ян Францкевіч быў у Новым Двары, чуў страляніну і гэтую сумную вестку нам прынёс!" Лёгка ўявіць, як хутка гэтая вестка ўсіх дасягнула і ўсіх уразіла. Не чакаючы на бацьку і сяцёр я вярнулася дадому каламажкай, на якой бацька да касцёла прыехаў, і адразу падалася на вёску шукаць шаноўнага і нашай справе адданага Юзафа Ляпешу і з ім разам падацца на месца бітвы і спраўдзіць вестку пра яе вынікі. Не застаўшы аднак Ляпешы дома, вярнулася да сябе, падрыхтавала свянцонае для сям'і і для службы, а з касцёла над'ехаў бацька разам з сёстрамі. Зрабіў мне бацька вымову, што яму нічога не сказала пра мой ад'езд; заняты пошукамі мяне па касцёле не даведаўся нават пра дайшоўшую да ўсіх сумную вестку. Пры дзяленні свянцоным яйкам са слязамі віншавалі мы самі сябе з тымі святамі, маючы на думцы такую грозную і няпэўную будучыню, якая нас чакала. Пасля свянцонага і кавы бацька пайшоў спачыць у свой пакой, а мы з сястрой Антосяй паехалі з яго дазволу да суседзяў Араноўскіх. Але тое непераадольнае жаданне даведацца пра лёс Нарбута і яго таварышаў папхнула нас у Новы Двор. аддалены ад нас на дзве з паловай мілі.

Там ад ксендза пробашча Райцэвіча, які нас ветліва і ласкава прыняў, даведаліся пра ўдалы вынік бітвы і пасяшаліся дадому падзяліцца з бацькам той жаданай ведамасцю. Уцешыўся стары тым, што ад нас пачуў, і не гневаўся, што мы яго на так доўга аднаго пакінулі. А цяпер што за свята! Бацька мой і сястра ў вязніцы, я ў падарожжы на Сібір, у абрыдзелым этапе. Занятая такімі думкамі, доўга не магла заснуць. На досвітку калегі заспявалі Алялюя. Не маю слоў, каб выказаць тое, што ў гэтую хвілю адчула. Плакала горка, маючы перад вачыма мінуўшчыну, цяпершчыну і будучыню. О, колькі ж многа чалавек перажыць і перанесці можа!... Потым прыйшлі калегі павіншаваць нас са святам, з тых 30 чалавек, якіх я сталавала ў Чабаксарах, з'явіўся толькі адзін малады хлопец, Антоні Урбасевіч, студэнт Маскоўскага ўніверсітэта, вельмі пачцівы і высакародны, з якім шмат размаўлялі пра яго сям'ю; паказаў нам фатаграфію сваёй сям'і і кніжку для набажэнства, якую заўсёды насіў у паперу абгорнутую і трымаў у вялікім шанаванні. Іншыя яго калегі пасароміліся прыйсці, не маючы іншай ад дарожнай вопраткі. П. Тэкля зрабіла мне вымову, што спраўдзіліся яе перасцярогі, што тыя панове не цанілі зусім маёй працы; можа быць, але я заставалася на тым, чаго шукала, г.зн., каб у працы мець забаву і асалоду ад прыкрага жыцця. Не я адна была ў той дзень сумная, у многіх мужчын ад думак пра сям'ю, прыяцеляў і сваякоў балючая сляза ўпала. Пан Рытвінскі з балесным уздыхам паведаміў: "У мінулым годзе меў маці, цяпер яе не маю". Правялі з паняй Тэкляй той дзень за гарбатай з добрымі вяршкамі і калачамі; на другі дзень, маючы мяса і ўсё, што трэба для печыва, занялася з дапамогай шаноўнага кухара Станіслава прыгатаваннем абеду на 30 чалавек. Аднак вялікія прыкрасці спазнала ў даставанні дроў і патрэбнага начыння, бо ва ўрачыстае свята ўсе жыхары былі п'яныя. Паўдня ў кухні прабыла, галава мне разбалелася, а таварышы былі незадаволеныя, бо з абедам спазнілася.

На другі дзень, не маючы ўжо патрэбных прадуктаў і жадаючы заняцца рамонтам зношаных рэчаў, апавясціла таварышаў, што абедам заняцца не магу. Скончыўшы свае заняткі, чытала трохі гісторыю Бантка, якую мне пазычыў п. Урбасевіч.

Назаўтра мы паплылі параходам у Казань; дзень быў пагодны. Волга шырокая і паўнаводная, кампанія выдатная. Не мелі аднак яе берагі і яна сама такой для нас прыгажосці, як нашы любімыя рэкі. Лясы зеленню яшчэ не пакрытыя, вёскі смутныя, без садзікаў рабілі на нас прыкрае ўражанне. Калі мы прыбылі ў Казань, наглядчык, нейкі падпалкоўнік, сустрэў нас з суровай, грознай мінай і выказаўся такім чынам:

- На бунты ёсць у мяне кайданы і розгі.

П. Тэклю і мяне загадаў замкнуць асобна; праз нейкі час афіцэр, які суправаджаў нашую партыю і таму называўся намі парцыённым, прыйшоў да нас і выклікаў мяне да наглядчыка, які стаяў за некалькі дзясяткаў крокаў ад яго. Не хочучы быць яму паслушнай, сказала, што хворая і прашу, каб палкоўнік сам паклапаціўся да мяне падысці. Падышоў і гнеўна сказаў:

- Ступать сейчас же и не разговаривать! (Ісці цяпер жа і не размаўляць).

Разгневаная на яго, сказала, што прыйду, калі рэчы збяру. Калі я прыйшла на месца выкліку, з'явіўся праз хвілю палкоўнік і, звяртаючыся да мяне, сказаў, што ведае ад парцыённага афіцэра, што добра сябе паводзіла і што адукаваная, а на п. Тэклю, звярнуўшы строгі погляд, закрычаў, што гэта яна ўсю партыю бунтавала ў Чабаксарах, што я магу выходзіць на дзядзінец, а ёй нельга, і паўтарыў грозна пра кайданы, розгі і нейкія чаравікі. Бедная п. Тэкля так перапужалася, што аж прыхварэла.

## VII

У Казані мы знайшлі трыццаць шэсць брацціяў-варшавякаў з ліку тых, што ў Варшаве за ўдзел у арганізацыі публічным судом былі прысуджаны ў войска, але за тое, што не хацелі прынесці прысягі цару, былі прысланы пад вайсковы суд у Казань. Тут, прыгавораныя на два месяцы на хлеб і ваду, сядзелі ўжо некалькі месяцаў у Казані, заўсёды цвёрдыя ў сваім пастанаўленні, прымусілі ўлады моцным супрацівам і энергічнымі выступленнямі да стварэння ім патрэбных умоваў; выламалі дзверы турмы, збілі аднаго з прыгнятальнікаў, аблаялі астатніх. З тога часу дазволілі аднаму з вязняў выходзіць штодзень у горад для залатвення патрэбных пакупак. Жывуць яны вельмі ашчадна; для захавання свабоды думак і разнастаення часу вынайшлі сабе забавы і працу. Арганізавалі гімнастыку, вучаць мовы, словам не бяздзейнічаюць, а такім спосабам перамагаюць нуду. З уладамі трымаюцца адважна, з годнасцю, так што паважаюць іх і наглядчыкі. Спраўныя гэта, энергічныя і шляхетныя маладзёны. Пасля нашага прыбыцця адразу пазнаёміліся з намі, атачылі нас увагай і дапамагалі ў залатвенні нашых патрэбаў. Падзівіліся мы з паняй Тэкляй на іх разважлівасць і шляхетнасць характару. Як толькі мы прыехалі, адзін з іх пан Віткоўскі паставіў самавар і сам яго нам прынёс; другі раз зрабіў такі ветлівы ўчынак п. Антоні Цішэўскі. П. Тэкля знайшла ў іх зычлівых братоў, то таксама выступала перад імі, як перад старымі прыяцелямі, апавядала пра прыкрасці, якія ў няшчасным падарожжы ад таварышаў і ад уладаў спазнала; акрыяла бедалага трохі духоўна. Раптам нам паведамілі, што маем выязджаць. Я, не прадчуваючы такога раптоўнага выезду, рыхтавала сабе абед і ўласна, калі павернутая да агню ў нашым пакоі смажыла кавалак мяса, пачула нейкі нязвыклы рух і незнаёмыя галасы, кінула свой занятак і ўбачыла салдатаў са зброяй, крычаўшых:

- Ступайте сейчас же! Убирайтесь прочь! (Выходзьце зараз жа! Вон!)

Як найхутчэй сабралася на выхад, праз некалькі хвілін мы былі ўжо ўсе на дварэ і ўбачылі ўзброеных салдатаў з нейкім лысым афіцэрам, сапраўдным д'яблам, на чале. Быў гэта экспедытар. З ім то і пайшлі жаўнеры ў другі дом для адпраўкі пазасталых з нашай партыі. Там знайшлі моцны супраціў, шаноўныя варшавякі з запалам баранілі сваіх братоў, а калі адзін з жаўнераў ударыў прыкладам вязня, атрымаў за тое ў зубы, дайшло да бойкі. Удары жаўнераў не былі моцныя, загадалі ім, напэўна, толькі настрашыць вязняў; ніхто не быў ні забіты, ні паранены. Для супакаення вязняў выклікалі губернатара; ён сам не прыйшоў, але прыслаў свайго ад'ютанта; нашы брацці падалі яму скаргу, што ўжо тры дні не даюць нам кармавых і да т.п. Пан Ілініч, малады хлопец, выступіў ад імя ўсіх, просячы меру справядлівасці, якой не знае маскоўскі ўрад; калегі ацанілі яго добрае жаданне, але прамовай яго не былі задаволеныя. Лысы экспедытар быў вельмі перапужаны і не мог схаваць свайго страху. Ад'ютант як бы не разумеў, што яму гавораць, намагаўся выйсці, але яму заступілі дарогу. Пры ім пан Карызна аблаяў экспедытара, і скончылася на тым, што выпусцілі двух арыштантаў: ліцвіна і караняжа, для якіх розгі ўжо былі падрыхтаваны. Пры адходзе афіцэра высунуўся недарэчы адзін з маладых людзей з падзякаю, іншыя яе паўтарылі, пра што потым усе шкадавалі.

Мы выехалі з Казані а 6-й вечарам. Горад вельмі прыгожы, мае прыгожае размяшчэнне, парк і прыгожыя дамы, усё, што мы праездам угледзець маглі, зрабіла на нас прыемнае ўражанне, а калі заўважылі наш каталіцкі касцёлік, узрадавалася душа нашая, мужчыны знялі шапкі, каб ушанаваць Бога ў найсвяцейшым сакрамэнце, мы з п. Тэкляй заплакалі. Убачыўшы могілкі, прамовілі "Анёл Панскі" за душы, спачываўшых на іх нашых суродзічаў. Я не прадчувала тады, што буду некалі ў Казані і спазнаю шчасце ўбачыць сястру маю Антаніну. Але пра тое потым. Падарожжа з Казані было досыць прыемнае, на этап мы прыбылі а 1-й ночы. З пачаткам вясны падарожжа па этапах стала больш зносным; за некалькі гадзін прыкрага знаходжання на этапе ўзнагароджвала нас выдатная, прыбраная ў захапляльныя шаты прырода. Што раз прыгажэйшыя лясы, велізарныя абшары прыгожых лугоў і шырокі гасцінец, з абодвух бакоў абсаджаны дрэвамі. нагадваў нам нашыя паштовыя тракты, заўважала не раз у найпрыгажэйшых мясцовасцях падабенства да нашых родных мясцін. дзякавала Пану Богу за сонца, якое мне і суродзічам маім свяціла, за паветра, якое ўсіх і ўсё на зямлі ажыўляе, але калі ў думках аказвалася каля бацькі, сёстраў, братоў, то ўжо слёз утрымаць не магла і гаручымі слязамі плакала. Раз, памятаю, калі ў нядзелю сядзела на парозе не ведаю ўжо якога этапа, пагружаная ў падобныя думкі, заўважыла воддаль плакаўшую сялянку-жмудзінку, якая, углядаючыся ў даль, нейкую песню ці малітву нудна цягнула; я не магла зразумець, што сялянка тая да мяне прамовіла, тады падышоў п. Францішак Рапцэвіч, малады хлопец, які мне часта ў падарожжы складаў кампанію і патлумачыў мне яе словы. Кабета гэтая, молячыся сёння, прыпамінае сабе парафіяльны касцёл, набажэнствы ў ім, малітвы люду, спевы капланаў, святыя абразы, тыя дарогі і сцежкі, якімі да касцёла хадзіла, і плача. Сказала яму:

- Мы, жанчыны, без зброі, сілай схопленыя, нічо-

га дзіўнага, што знаходзімся там, куды нас вязуць, але вы - моцныя, узброеныя і маладыя, чаму вы тут? Лепей было б, каб наш жоўты пясок вочы вам прысыпаў і магіла ваша была аброшана слязамі суродзічаў.

Няшчасная гэтая ўдава ў адным з баёў страціла адзінага сына, дачка памерла яшчэ перад паўстаннем; выслана разам з іншымі жанчынамі з ваколіцы Ібян, далучылася да адной з тамтэйшых сямей і з ёй свой лёс з'яднала.

Не раз здаралася, што афіцэр дазваляў нам прайсціся трохі наводдаль ад этапа. Аднойчы, шпацыруючы з адной малой дзяўчынкай - Міхалевічаўнай, прайшла вярсты з тры. Мы мовілі пацеры і забылі пра нашае становішча. добра было нам на душы. Тады мы сустрэлі нейкую кабету, арыгінальна апранутую; ішла яна, трымаючы малога хлопчыка за ручку, і абое дзіка неяк на нас глядзелі. Бачачы, што ў фартуху несла яйкі, я спытала, ці б мне такіх не прадала; перапужаная кабета адказала мне: "Бельмель", што значыць "Не разумею" і схавалася, чым найхутчэй разам з хлопчыкам у стаяўшую наводдаль хатку. Ні ў той хатцы, ні каля яе нікога не было, а тое жыллё і тая жанчына вельмі мяне заінтрыгавалі. Вярнуўшыся на этап распавяла таварышам, якое мела спатканне, і адразу салдаты расказалі, што гэта татарская люднасць. Маюць яны непераможны недавер да сваіх захопнікаў хрысціян, усю сваю маёмасць хаваюць ад іх, у дамках амаль пуста, бо яны хаваюцца ў схованках, калі згледзядзь мінакоў або салдатаў.

1 (13) траўня мы мелі днёўку ў павятовым горадзе Малмыжы. Здалёк заўважылі велізарны белы мураваны дом, так як і ў малых гарадках, найлепей выглядаў астрог, які знаменаваў панаванне Расіі ў краі, ёй захопленым. На трэці дзень мы выехалі з Малмыжа а 9-й гадзіне раніцы, пакідаючы ў астрозе 68 нашых брацціяў, найбольш мазураў з простага люду, засуджаных у арыштанцкія роты ў Вятку. З імі застаўся шаноўны кухар Станіслаў Кушчык, які нам у Маскве і Чабаксарах рыхтаваў абеды і быў вялікай для нас дапамогай. Заплакаў бядак, развітваючыся з намі, мы ўсе так яго шкадавалі; п. Рытвінскі, наш староста, сабраў для пазасталых бедакоў малую складку, бо выпала толькі па 2 зл і 7 грошаў на кожнага. Бедныя тыя людзі не мелі нічога больш, акрамя атрымоўваных 4 кап штодзённа, т.зв. "кармавых". Голадна і холадна ім было, бо ўжо ў Казані адабралі ў іх кажухі, хаця паветра нічога агульнага з цяплом не мела.

Сем вёрст ехалі паштовым гасцінцам, дарога была дасканалая, потым дванаццаць вёрст плылі на барках, таму ўсім нам тое падарожжа было прыемнае. Угаварылі Післяка, які меў самавар, каб арганізаваў гарбату, а так кожны, маючы нейкі запасік хлеба, масла вяндліны, меў у цэлым някепскі падмацунак. Ад ракі да этапа правезлі мяне з п. Тэкляй на малым тарантасіку, а паколькі этап быў вельмі малы, размясцілі нас на вёсцы.

5 траўня мы былі на этапе Вялікі Кільмеш. Потым ехалі ўвесь час праз вялікі лес; са мной ехаў пан Рапцэвіч і апавядаў пра сваю сям'ю і пра сваю радзімую старонку, пра прыгоды свайго дзяцінага і юнацкага веку, а мне зноў прыпаміналіся нядаўнія часы, любімая мая радня, якая весела праводзіла час, і як заўсёды, пасля такіх успамінаў зрабілася мне смутна; на думку пра другога брата Цыпрыяна, якога ўжо не мела ўбачыць на зямлі, нічога тады яшчэ не прадчуваючы, сардэчна аднак плакала.

Даехалі мы да Сямсюла. Далі нам добры, чысты пакойчык на вёсцы. Я запрасіла да нас хворага п. Васілеўскага, зрабіла яму гарбату з цытрынай, а калі трохі паляжаў, лепей яму стала, мусіў аднак уступіць месца п. Тэклі, якая была вельмі незадаволена, што яе дазволу на прыём п. Васілеўскага не спытала. Калі мы пілі гарбату, прыйшоў адведаць нас пан Маргевіч, размаўлялі трохі пра яго сям'ю; казаў, што нейкі час хварэў, а прычынай яго нездароўя быў неспакой за жонку і дзяцей. Ад часу выезду з Казані мелі мы з паняй Тэкляй служку; называўся Ясь Рагеліс, працавіты жмудзін, вельмі пачцівы хлопец, прыслужвае нам ахвотна, а ў вольную хвілю шые сабе кашулі. Служыў у войску гадоў 15, вярнуўся дадому з белым білетам, не меў з чаго жыць, калі завязалася паўстанне, пайшоў служыць святой справе, за што быў высланы ў Табольскую губерню на пасяленне. Бачачы яго працаваўшым, не раз думала: "Хто ж будзе залатвіваць патрэбы яго старога бацькі, хто падумае пра яго!" У Сямсюле першы раз пачула спеў салаўя, выспеўваў так прыгожа, як у нашым краі. Прыпомнілася мне, як адной прыгожай травенскай ноччу ў нашым садзе з братам Цыпрыянам і сястрой Антанінай слухалі падобны спеў. Ах, я не ўмела дзякаваць тады Богу за ўсё, што мне прызначаў і цешыцца ў дадзеную хвілю спазнаным шчасцем!

Ноччу цёплы дождж ык асвяжыў усю прыроду, а калі засвяціла сонца, уся мясцовасць, як бы прыбраная ў свежыя шаты зелені, прадставіла вачам цудоўны від. Прыбыў на той этап з Малмыжскага шпіталя пан Вярбіцкі, на працягу месяца хварэў на тыф, і цяпер быў яшчэ вельмі аслаблены і бледны. Апавядаў, што ў тым шпіталі пра лячэнне хворых зусім не думаюць, лекар ніякіх парад не дае, дазваляе есці такую ежу, якая хворым шкодзіць, таму за сваё вяртанне да здароўя ўдзячны пан Вярбіцкі толькі Божай дапамозе, а не іншай якой. З Сямсюла мы вельмі хутка прыехалі ў Кажыль. Памясцілі нас у пісара, жонка якога, полька, была досыць сімпатычнай кабетай, але хцівая і на грошы лакамая. Я даведалася, што ў іх нейкі час знаходзілася манашка, сястра міласэрнасці з Вільні Ганна Дамброўская, 70-гадовая бабулька, пазбаўленая ўсіх правоў, з манашскай сукні вынятая і пераадзетая ў брадзяжную. Трапіла яна ў вязніцу наступным чынам: да адной з сясцёр таго ж ордэна і таго ж дому, у якім была сястра Дамброўская, да сястры Ганны Гаеўскай прыйшоў аднойчы нейкі мужчына, прадставіўся яе сваяком, назваў прозвішчы родных сясцёр, з якімі яна пасля паступлення ў кляштар не падтрымлівала ніякіх стасункаў, але якія сапраўды былі яе роднымі, сказаў, што яго пераследуе паліцыя, і просіць схаваць яго ў кляштары. Сястра Ганна Гаеўская паверыла мнімаму сваяку і пагаварыла пра тое з п.

Дамброўскай; не прадчуваючы ніякай здрады, прынялі шпіёна як найбольш гасцінна, накармілі яго, дапамаглі вопраткай і трохі грашыма і паказалі ў горадзе знаёмых, у якіх у выпадку патрэбы знайшоў бы патрэбную дапамогу. Неўзабаве з'явіўся гэты здраднік з паліцыяй, паказаў на абедзвюх сясцёр, гаворачы ім у вочы, пра што з ім гаварылі, паказвае месца, дзе мелі схаванае нейкае кампраментуючае іх перад урадам пісьмяцо, і вось вынік той здрады: манашкі аказаліся высланымі з Краю; сястра Гаеўская - у адну з губерняў еўрапейскай Расіі, здаецца, у Тамбоўскую; сястра Дамброўская, як больш вінаватая - на Сібір, у Томскую губерню.

Я пазнаёмілася з імі абедзвюма ў дарозе; першая малодшая, мацнейшая і лягчэй асуджаная, несла цяжкі крыж нядолі, бо мукі і згрызоты сумлення, што міма волі сталася нагодай няшчасця вельмі ёй шанаванай манашкі - ужо старой і да таго ж вельмі хваравітай; а другая ў Нарыме была вялікім дабрадзействам для няшчасных выгнанцаў.

Выязджаючы з Томска, у якім не захацелі ёй дазволіць асесці, купіла лекаў і розных зёлак, якімі лячыла потым не толькі сваіх, але і тамашніх жыхароў. У нядзелі і святочныя дні збіраліся да яе католікі на супольную малітву і пабожныя чытанні. На Куццю арганізоўвала яна вячэру, дзялілася з выгнанцамі аплаткамі, якія ўмела пячы; на Вялікдзень рыхтавала свянцонае, на якое ўсе складаліся. Сціплыя і бедныя былі тыя пачастункі, але тое паяднанне пад Божым дахам на выгнанні, тая супольная малітва, харавыя спевы пабожных песняў і чытанне слова Божага былі для бедалаг сапраўдным дабраславенствам. Пазней быў туды сасланы нейкі ксёндз, а потым, яшчэ праз паўтара гады ці болей, знаходзіўся шаноўны рэктар семінарыі ў Варнях на Жмудзі кс. Юзаф Давідовіч, адзін з хрысціянскіх светачаў за часы жудаснага Мураўёва, гэтага Нярона нашай зямлі. Не ведаю, што сталася з сястрой Дамброўскай, бо пасля 6-гадовага знаходжання ў Томску я выехала ва Усходнюю Сібір і не магла атрымаць карэспандэнцыі ад знаёмых. Здзіўляла толькі заўсёды такая вялікая міласэрнасць Божая і апека над ёй, што ў веку ўжо падхадзяшчым, прытом слабаватая, магла перанесці цяжкае і знясільвальнае падарожжа па этапах у Сібір.

Дабрадзеем яе быў афіцэр, які суправаджаў партыю і заўсёды саступаў ёй сваё месца, а Бог удзяляў ёй сілаў і здароўя для перадолення ўсякіх невыгод і цяжкасцяў.

У Кажулі, у шпіталі памерла з тыфознай гарачкі 8 нашых брацццяў. Этапавы начальнік, паляк, католік дазволіў пахаваць іх на астрожных могілках, дзе спачывала некалькі яго дзяцей. Год назад ні адзін з тых васьмі не думаў, што такой смерцю ў тым месцы закончыць жыццё. Сумняваюся, ці звесткі пра памёрлых і рэчы, якія пасля іх засталіся, пераслалі асіроцелым сваякам, бо адрасоў не было.

Пан Антоні Урбасевіч, пра якога я ўжо не раз успамінала, пасля доўгіх старанняў дабіўся нарэшце свайго. Скарбовыя грошы, якія зваліся кармавымі, давалі шляхце па 15 капеек, а вязням з простага люду па 4 капейкі, ад гэтага часу дзялілі пораўну. Ён таксама арганізваў тое, што пачалі вучыць непісьменных, а таксама праводзілі павучальныя гутаркі.

Мы выехалі з Кажуля, маючы аднаго хворага на тыф; тры дні ён быў зусім непрытомны; пры хворым ехалі два таварышы, адзін цалкам здаровы, другі ўжо хворы; абодва не заўважылі, як ім у дарозе згас таварыш, без братняй малітвы, без каплана і свечкі. Быў гэта каваль з простага люду, Францішак Масілоўскі; двух сыноў адправіў у паўстанне, а сам памёр на чужбіне. Пан Рытвінскі прасіў "парцыённага" афіцэра дазволіць пахаваць памерлага перад выхадам нашай партыі; пасля доўгіх угавораў афіцэр згадзіўся і дазволіў 19 калегам заняцца пахаваннем нябожчыка. Месца яго спачыну называецца Жузі, за сялом Дэбеса. І так мы патроху трацілі таварышаў падарожжа; у Чабаксарах, Казанскай губерні, пахавалі маладога, якога любілі ўсе калегі, Франкоўскага, тут вось Масілоўскага, а мелі з сабой 25 хворых на тыф. Енчылі бедакі, едучы на траскіх вазах, пазбаўленыя клопату сваякоў і ўсякіх выгод, свежае паветра было іхнім адзіным лякарствам. Паны Рапцэвіч, Гроцкі і Бесякерскі былі найбольш клапатлівыя каля хворых; астатнія сыноўскай апекай атачалі хворага пана Сымпліцыя Пяткевіча, а клопат Божы быў над усімі.

На свежым вясеннім паветры падарожжа нашае ў лёгкіх тарантасах было нават прыемным; толькі начлегі і днёўкі ў цесных этапах, багатых на рознага роду паразітаў, або размяшчэнне ў вясковых хатах, дзе для прыгатавання абеду печы распалялі да немагчымага. былі для нас нязносныя. На этапе Дадброўскае мы з п. Тэкляй былі ветліва прыняты жонкай этапнага начальніка ў ахайным і чысцюткім памяшканні, якога ад часу зняволення не бачылі.

Прырода, прыбраная ў маёвую зеляніну, захапляла нас сваім выглядам, падсаладжвала нашыя маральныя мукі так, што нейкі спакой уступіў мне ў сэрца. Непакоіла нас аднак маўчанне газет адносна нашай справы, мы не ведалі, што робіцца на Бацькаўшчыне, што з брацціямі паўстанцамі.

Пакінуўшы Дaброўскае, мы праехалі добрай дарогай 26 вёрст і спыніліся ў Аханьску а 11-й гадзіне раніцы. Насупраць этапа ўбачылі шпіталь, з якога выглядала некалькі нашых брацццяў; я падышла спытаць пра іхняе здароўе і якія маюць умовы? Адказалі, што ў кожным шпіталі на этапнай дарозе ніякіх лекарскіх клопатаў не адчуваюць і ніякіх умоваў не маюць. У той жа час пачуўся крык на этапе; афіцэр загадаў набіваць зброю, бо этап быў настолькі малы, што ледзьве палова вязняў магла памясціцца ў ім, таму нашы ў той этап заходзіць не хацелі, што было названа бунтам, і на нашую ветлівую просьбу пра размяшчэнне ў некалькіх сялянскіх хатах, што некаторыя з афіцэраў дазвалялі, адказалі нам грубасцю і пагрозамі. Мы з п. Тэкляй доўга сядзелі на сонцы, нарэшце далі нам памяшканне ў сутарэнні з салдатамі; былі там яшчэ тры кабеты, жмудзінкі, хворыя на гарачку. У шпіталі каля нашага памяшкання я сустрэла няшчасную п. Гувальд з Вільні, прыгаворану да катаржных работ на 4 гады, бо знайшлі ў яе шафы

перапоўненыя абуткам і вопраткай для паўстанцаў. Арыштавалі яе спачатку ў выніку даносу, а потым двое яе дробных дзетак, пачастункам цукеркамі і пяшчотаю ашуканыя, на пытанне, што робіць мамуся, адказалі, што шые з цёцяй вопратку, і паказалі месца, дзе тую вопратку хавае. Да якіх падступстваў даходзілі подлыя маскоўскі шпегі!

У тым сутарэнні апанавалі нас раямі насякомыя, нельга было ад іх абараніцца, змена бялізны таксама нічога не давала, так што трэба было выйсці і цэлую ноч праседзець на дварэ.

Чацвёртага ліпеня прыбылі мы ў Пермь. Прыезд у кожнае месца быў прыкры і пакутлівы для нас; вось і ў Пярмі сядзелі цэлы дзень на дварэ, трэба было чакаць, пакуль знойдуць якое-небудзь памяшканне. Далі нам нарэшце нейкае малюсенькае памяшканне; пані Тэкля адразу занялася ўладкаваннем ложка, г. зн. паслання на лавах, а тут увайшлі да нас некалькі паноў з бліжэйшых знаёмых, аднак аднаго, які без нашага дазволу там размясціўся, вымушаны былі выправадзіць. Быў гэта нейкі пан Сулькоўскі, немалады ўжо чалавек, які, здаецца, пасля вяртання ў край скончыў раптоўнай смерцю. Я звыкла пры размяшчэнні рабіла пратэкцыю маім звычлівым аднапаветнікам і тым, хто нам дапамагаў у дарозе, але шкода мне заўсёды было таго пана Сулькоўскага. Прысутныя карысталіся нашай гасціннасцю: Колышка, цёзка павешанага ў Вільні Баляслава Колышкі, Круповіч і яшчэ некалькі.

Даведаўшыся, што ў адным месцы гатуюць танныя абеды, сказала пра тое маім таварышам, і 20 чалавек карысталіся з гэтага адкрыцця. У Пярмі сустрэлася мне вельмі мілая неспадзяванка: праз акно ад дома паліцыі заўважыла праходзіўшую знаёмую мне таварышку па вязніцы сястры маёй Антаніны, п. Ідалію Бандзынскую. Клікнула яе і пасля сардэчнага прывітання даведалася, што маці яе была прыгаворана на 8 месяцаў заключэння ў пермскай турме. Атрымаўшы ад оберпаліцмайстра дазвол пайшла яе адведаць. Запомнілася мне, як яна ціха, спакойна пераносіла тое прыкрае жыццё. П. Ідалія, міленькая паненка, здаецца, выйшла замуж за пермскага паліцмайстра, немца на ўрадавай службе. Калі прыйшла да іх, застала абедзвюх за шыццём кашуль для вязняў-палякаў. П. Ідалія са слязамі апавядала мне, якім прыкрым ёсць для яе побыт у вязніцы; прасілі, каб я засталася ў Пярмі на два тыдні, але я не згадзілася на тое, пастанавіўшы без затрымак прадаўжаць шлях да месца майго прызначэння. Праз пару дзён мы выязджалі з Пярмі а трэцяй раніцы. Невыносны быў такі ранні пад'ём, спаць жудасна хацелася, асабліва пані Тэкля гэта прыкра пераносіла. Хацела яна застацца на нейкі час у Пярмі, пакрыўджаная нявеtлівымі паводзінамі таварышаў па падарожжы; партыя наша складалася ў большай частцы з моладзі рамесніцкага класу, і хоць была і шляхта, але без належнага хатняга выхавання, не ўмеўшая паважаць ні ўзрост, ні нядолю. З гэтай прычыны падарожжа нашае было прыкрым, але нельга было прадбачыць, як бы было далей, можа яе памясцілі б з цывільнымі злачынкамі, расіянкамі, а можа як прыгаворваную да катаржных работ памясцілі б яе з кайданнікамі. Я хацела адразу не лезці з парадамі, але пры такіх думках, бачачы яе смутнай і плакаўшай, пачала прасіць, каб ехала з намі. У Пярмі далучылі да нас больш вязняў, так што партыя наша складалася з 315 чалавек; паміж навапрыбылых, як мы падазравалі, было некалькі шпегаў.

Ад Чабаксар, дзе мы пахавалі Франкоўскага, мелі мы заўсёды хворых на тыф; пад'язджаючы да Екацярынбурга захварэў паміж іншых пан Антоні Урбасевіч; не хацеў бядак расставацца з калегамі, якіх, нягледзячы на іхнія недахопы, палюбіў усёй душой, але лекары прызналі неабходным пакінуць яго ў шпіталі. На гэтую вестку заплакаў бядак, як дзіця. Найбольш шкадаваў свайго прыяцеля. Не знаючы стану свайго здароўя, моцна перажываў, што калегі не хочуць браць яго з сабой. Праводзячы яго, выязджаўшага ў шпіталь, так зламанага мукамі фізічнымі і маральнымі, я не магла ўстрымацца ад слёз і як роднага брата з болем праводзіла. Назаўтра я пайшла ў шпіталь, каб яго адведаць; тады першы раз адкрыта выгаварыўся мне, што мае крыўду на калегаў, якія ў хваробе зусім яго пакінулі, што калі ў дарозе дождж яго намачыў, то на этапе не паклапаціліся пра сухую пасцель, спаў на мокрым, а ніводзін з калег не падышоў да яго, каб на яго глянуць.

- Пані адна сястрой мне была, - сказаў.

- Бо я ў пану бачыла брата, - адказала яму са слязамі.

Паміж хворымі п. Яскулоўскі з Берасцейскага павета пачуваўся найгорай, быў непрытомны, пазнаў мяне ўсё ж і прасіў, каб я яго яшчэ на другі дзень адведала. Я выканала тое пажаданне, пайшла назаўтра развітацца з хворымі, гатова была нават застацца з імі, але ўзважыўшы добра акалічнасці, зразумела, што ім бы гэта ні на што не прыдалося, а сябе папхнула б у пропасць. Хворыя самі нават прасілі, каб не заставалася; я наняла двух добрых людзей, каб даглядалі хворых, і з жалем развіталася з імі. Урбасевіч не разумеў таго, што хворы на тыф і перажываў, што доктар Акуліч памясціў яго разам з хворымі на тую гарачку, быў зусім прытомны. Чула, што быццам бы выздаравеў, але з ліку тых, хто застаўся ў Екацерынбургскім шпіталі, нікога ўжо ніколі не бачыла.

Апошнія ночы ў Пярмі зусім не магла спаць, праходзілі ў мяне перад вачыма вобразы палеглых братоў паўстанцаў, іх ганебнае смерць ад рукі ката; бачыла стрыечнага брата, Уладзіслава Навіцкага, які, паранены ў балоце пад Дубічамі, не меў сілы, каб з яго выбрацца, і так, стоячы, сканаў... Бачыла Баляслава Колышку, павешанага ў Вільні, і іншых замардованых за жаданне бараніць Бацькаўшчыну. Пыталася, ці той зруйнаваны быт столькіх сямей і зямля, залітая крывёю, нейкі плён дасць, ці гнеў і міласць Божую прынясе, ці ж боль жонак, сясцёр і матак, бачыўшых, як іхнія мужы, браты і сыны на эшафоце гінулі, не перапросіць Бога за нашы і продкаў нашых віны і не вымаліць лепшай для народа нашага долі? У думках маіх узнікала бура, у сэрцы пякло, а ў душы жудасны боль. Не магла супа-

коіцца і з хрысціянскай пакорай маліць пра міласэрнасць Збаўцы, які да апошняй кроплі кроў сваю праліў на крыжы за нас і за тых, якія яго крыжавалі, і ў жудасных муках маліўся да Айца свайго нябеснага, гаворачы: “Ойча, даруй ім, бо не ведаюць, што робяць!” Не ўмела маліцца з пакорай волі Божай і ў ім толькі, а не ў людзях, шукаць уцехі.

Даехаўшы да Кунгара, павятовага горада ў Пермскай губерні, там трохі ажыла. Знайшла пару знаёмых чалавек, між іншымі Уладзіслава Міцкевіча з нашага павета, які разам з бацькам маім быў зняволены ў Вільні ў “святога Пятра”, потым сям’ю Далеўскіх, якая складалася з маці, наймацнейшай старой, і трох дачок: Зузанны, Юзэфы і Ксаверы. Што гэта за высакародныя былі жанчыны, узор патрыётак і хрысціянак, якія пасвяцілі сябе няшчасным і іншых да падобнага пасвячэння заахвочвалі. Як анёлы божыя, на зямлю пасланыя, неслі дапамогу хворым у шпіталі, апякалі іх, аддавалі апошнія паслугі паміраўшым і памёрлым, сустракалі прыбываўшыя партыі выгнанцаў і аказвалі ім мажлівую дапамогу, падсалоджвалі іх смутную долю, цэлыя дні, а часам і ночы праводзілі за шыццём кашуль і бялізны для вязняў. Прынялі да сябе ў навуку беднага хлопчыка, каб яго далучыць да карыснай працы і да ўсёй той дзейнасці самі прыклад падавалі. Я прабыла ў іх двое сутак. Прыйшоўшы да іх я была так змучана нядоляй, такая непрытомная, што не ведала, што рабіць, а яны добрыя, мілыя, так сардэчна мяне прынялі, што як бы святло божае заззяла, зніклі чорныя думкі мае. Запрасілі таксама блізкіх маіх знаёмых пп. Рапцэвіча, Лапінскага і Сакалоўскага; у выніку я супакоілася і прыйшла да сябе. Са смуткам і ўдзячнасцю я пакідала сям’ю пп. Далеўскіх, бо загадалі рушыць далей. Падарожжа станавілася ўсё больш нязносным з-за павялічваўшайся гарачыні і мноства абрыдлых насякомых на этапах.

10 ліпеня мы прыбылі ў Цюмень; размясцілі нас у астрозе, у асобным пакоі пры шпіталі. Мужчынам у этапе было вельмі цесна, душна, паветра жудаснае, у горад ім выходзіць не дазвалялі; у нашым досыць вялікім пакоі размясціліся тры сям’і. На трэці дзень вечарам, калі ўжо дзверы былі замкнёныя, п. Тэкля самлела. Будзіла яе, як магла, нічога не дапамгло, пачала крычаць, клікаць, стукаць у дзверы, прасіць доктара; прыйшоў адзін, потым другі; п. Рапцэвіч застаўся пры хворай пільнаваць ноччу, а лепей ёй не рабілася. Змучаная была бедалага такім складаным і цяжкім падарожжам. Чацвёра сутак мы знаходзіліся ў Цюмені; чым бліжэй мы былі да нашага месца прызначэння і далей ад любімай Бацькаўшчыны, тым смутней нам усім было. Сарваныя без ніякай падрыхтоўкі тым ходам агульных падзей, не мелі разумення пра тое жыццё, якое нас чакала. Я ведала людзей толькі з боку добрага, ідэальнага, на малым прасторы нашай зямлі; пасля вывазкі з краю зразумела, што трэба быць асцярожнай і людзей баяцца. Вельмі мучыла мяне гэтая думка, што сястра мая ў выніку такой недасведчанасці прыме яшчэ больш пакут. 31 ліпеня ўжо выехалі з Цюмені. Мы былі там цэлы тыдзень; хадзіла на могілкі, дзе знайшла 11 свежых магіл, адны з надпісамі, іншыя без; забалела мне ад той абыякавасці калегаў, якія хавалі памерлых сваіх брацця ў, бо ўсе, прынёсшыя свае жыцці на алтар Бацькаўшчыны, заслужылі памяць. Была таксама і ў нашым касцёле, малы гэта касцёлік, як каплічка, адзін толькі алтар, некалькі абразоў, малая гармонія, 6 харугваў і лаўкі па абодвух баках.

Пані Тэкля засталася ў Табольску, шкада мне яе было, бо хоць не раз нязносная яна для мяне была, шанавала я яе і любіла; разумная, практычная, называлі яе эгаісткай, але была сведкай, што астатнім магла падзяліцца з тым, каму сапраўды трэба было, была літасцівай над нядоляй і сапраўднай патрыёткай. Не хацелася ёй спяшацца на катаржныя работы, таму засталася там, дзе ёй трохі лепей было.

Сеўшы на параход, я не адчувала ні прыемнасці, ні нязручнасцяў падарожжа; не маючы чым заняцца і забавіцца, аддалася зноў роспачлівым думкам пра страшную будучыню. Ніякай уцехі, ніякіх жаданняў не адчувала ў сэрцы, толькі велізарная туга мяне агарнула, туга па бацьку, па сёстрах, а асабліва па наймалодшай Антосі, якую выхоўвала. Яна ў настаўніцкай працы была найлепшая, найсумленнейшая, трывалая і бескарысная памочніца мая, калі мне прыйшла думка заняцца выхаваннем дзяцей суседзяў і сваякоў спачатку на вёсцы пры маіх бацьках, а пасля смерці маці нашай - у Лідзе, яна мне была ў думках і днём, і ноччу, у сне і наяву. Ад пачуццяў падобнай тугі няхай Бог захавае кожнага, хто ў Яго верыць! Трэба было аднак жыць і далей, што раз далей ехаць. У тым маім нешчаслівым становішчы ніколі аднак не думала пра скарачэнне сабе жыцця самазабойствам, хаця такой жудаснай мне падавалася смерць на зямлі ворагаў і такой вялікай мая прывязаннасць да зямлі бацькоўскай. Некаторыя жанчыны мелі шчаслівую думку ўзяць з сабой трохі пяску з бацькоўскіх мясцін і хавалі яго, як каштоўную рэлíквію, як лекі супраць тугі, памерлым брацця м пасыпалі трохі той нашай зямлі на вочы, каб ім тая чужая зямля лягчэйшай падавалася.

Бацьку свайго найлепшага я ўжо ніколі не ўбачыла; памёр ён у найвялікшай нядолі і патрэбе: шкадавалі яму ўсяго, нават кавалка хлеба. Так бедалага пісаў да мяне: “Усё ў мяне адабралі, усяго мяне пазбавілі, нічога не маю”. Нейкі час у селяніна свайго, даўнейшага прыгоннага, меў прытулак; у курнай, як на Літве, мужыцкай хаце, з яды маючы толькі капусту, гарох з канапляным алеем; хворы на астму так цэлы пост пераждаў. Як цернь у зраненым целе, так думка пра тую нядолю бацькі майго і ўсіх чальцоў сям’і сэрца маё раздзірае!

*(Працяг у наступным нумары.)*

***Караль Лясковіч***

# Красовы двор і яго суседзі[1]

*"Набліжаюцца мае 70 гадоў, хутка згасне і памяць, таму лічу сваім абавязкам напісаць гэты тэкст".*

*" .. у Кір'янаўцах ... вывучыў беларускую мову ... я сардэчна палюбіў лагодных і мілых беларусаў і, калі пачаў вывучаць гісторыю, даведаўся, што наш род, як і роды іншых землеўладальнікаў, выйшаў з гэтага народа".*

***Караль Лясковіч.***

**Красовы двор і яго суседзі**


**Уступ**

**Частка першая. Манаграфія**

I. Геаграфічна-адміністрацыйнае становішча Ішчалны ў 1939 г.

II. Уладальнікі Ішчалны.

III. Вопіс зямель Ішчалны.

VI. Гістарычныя калекцыі.

VII. Суседзі Ішчалны. Блізкія вёскі.

VIII. Гістарычны тракт (гасцінец).

IX. Бліжэйшыя гарады і мястэчкі.

X. Удзел у грамадскай і дзяржаўнай працы некаторых землеўладальнікаў Шчучынскага павета і іх далейшы лёс.

XI. Буйная зямельная ўласнасць на тэрыторыі Шчучынскага павета, 1919 - 1939 гг.

XII. Генеалагічныя накіды.

**Частка другая: Аповесці**

XIII. Легенды, выпадкі, асаблівасці.

**Частка трэцяя. Вайна і мір**

XIV. Міжваенныя часы, 1921 - 1939 гг.

XV. Пачатак Другой сусветнай вайны.

**Частка чацвёртая. Сямейныя гісторыі**

XVII. Сямейная хроніка ў 1921 - 29 гг.


***Прадмова перакладчыка***

*Мой пераклад змяшчае больш за палову цікавых успамінаў Караля Лясковіча - сына апошняга ўладальніка маёнтка Ішчална. Я не перакладаў апісанні нейкіх сямейных дробязяў, накшталт шлюбаў сёстраў аўтара і інш., а пераклаў і пракаментаваў тое, што з'яўляецца цікавым сёння для нашай гісторыі і культуры. Для аматараў лакальнай гісторыі ў гэтых мемуарах маецца шмат каштоўнай інфармацыі, шмат біяграфічных дадзеных розных людзей, шмат цікавых і павучальных гісторый, але самае цікавае для мяне, гэта адносна падрабязная інфармацыя пра архіў і музей, якія паслядоўна, стагоддзямі збіралі ўладальнікі маёнтка Ішчална і якія зараз цалкам страчаны ў выніку дзвюх сусветных войнаў.*

*Гісторыя маёнтка Ішчална цікавіць мяне ўжо больш за дваццаць гадоў[2] і публікацыя ўспамінаў Караля Лясковіча з'яўляецца важнай прыступкай у збіранні ведаў пра гэты куток нашай радзімы.*

*Хачу заўважыць, што друкаванне гэтага тэксту, верагодна, заканчвае цыкл цікавых і вельмі інфармацыйных успамінаў абшарнікаў-суседзяў, якія жылі прыкладна ў адзін час, былі асабіста знаёмыя паміж сабой і згадвалі самі адзін аднаго ў сваіх мемуарах. Гэта ўспаміны сына апошняга ўладальніка маёнтка Скабейкі Андрэя Раствароўскага (адзін са спадкаемцаў былога велічэзнага маёнтка Вялікае Мажэйкава)[3], уладальніка Малога Мажэйкава Андрэя Брахоцкага[4] і збор успамінаў членаў сям'і Іваноўскіх з маёнтка Лебёдка[5]. Усе разам гэтыя тэксты даюць магчымасць убачыць "аб'ёмную" карцінку жыцця і падзей на Лідчыне канца XIX - першай паловы XX ст.*

*Сканы машынапісу мемуараў Караля Лясковіча ў бібліятэцы Асалінскіх своечасова купіў мой сын Вадзім, за што я яму вельмі ўдзячны.*

***Леанід Лаўрэш.***

**Уступ**

У гісторыі абодвух народаў, а перад усім, у гісторыі Літвы, кароль Аляксандр Ягайла з'яўляецца

---

[1] Karol Laskowicz: (Kresowy dwor i jego sasiedzi). Opracowanie na podstawie wspomnien. // Biblioteka Zakladu Narodowego im. Ossolinskich we Wroclawiu, sygn. 15480/II. S. 1-409. Пераклад Леаніда Лаўрэша.

[2] Гл: Лаўрэш Леанід, Круцікаў Уладзімір. Сонечны гадзіньнік у в. Ішчална // Спадчына. № 2-2000. С. 139-141. 2000. № 2. С. 139-141.; Лаўрэш Леанід, Круцікаў Уладзімір. Гісторыя парафіі ў Ішчалне. 490 гадоў Ішчалнянскай парафіі // Наша слова. № 22 (708), 15 чэрвеня 2005 г.

[3] Раствароўскі Андрэй. Зямля, якой ужо не ўбачыш. Фрагменты ўспамінаў // Ад лідскіх муроў. Выпуск 8. Ліда, 2015. С. 354-394.

[4] Брахоцкі Андрэй. На пераломе дзвюх эпох // Ад лідскіх муроў. Выпуск 9. Ліда, 2020. С. 355-405.

[5] Успаміны сям'і Іваноўскіх // АСОБА І ЧАС. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 9. Укладальнікі: Дзяніс Кандакоў, Аляксандр Фядута. Мінск. 2020. С. 57 - 116.

адным з найвялікшых надаўцаў каралеўскай маёмасці. Пасля яго, наступнымі надаўцамі былі Жыгімонт Стары і Жыгімонт Аўгуст. Прычын раздачы зямель было шмат. Першай з іх была шчодрасць Ягелонаў і жаданне абнавіць грамадскую структуру ВКЛ праз павелічэнне прыватнай уласнасці на зямлю па ўзоры Кароны.

[На пачатку] уся зямля належала вялікаму князю, ён быў абсалютным гаспадаром і ўладаром. Валодаць невялікімі кавалкамі зямлі часамі дазвалялася толькі чальцам пануючай дынастыі, гэтая зямля звальнялася ад дзяржаўных павіннасцяў, але на гэта кожны раз патрабаваўся дазвол князя. Такім дзяржаўцам Лідскага замка быў швагер Ягайлы Вайдыла, ён валодаў воласцю Дуброўня пад Лідай.

Малыя воласці трымалі таксама даўнія князі, такія як Гальшанскія, Гедройці і інш., якія, аднак, свае галоўныя даходы мелі з Русі, дзе вялікі князь вызначаў ім часовую маёмасць "да ласкі" ( J. Choromanski. Historia Litwy).

Іншыя прычыны раздачы зямлі можна было б падаць наступнымі групамі:

а) Пакрыццё дэфіцыту каралеўскага скарбу выкліканага войнамі, інвестыцыйнымі выдаткамі на будову цвердзяў і замкаў (напрыклад Вавель), кампенсацыя коштаў пасольстваў і прадстаўніцтваў. Аднак раздача маёмасці з-за эканамічных прычын, складала толькі некалькі дзясяткаў працэнтаў ад агульнай колькасці. Напрыклад пры Жыгімонце Старым яна склала 45 адзінак маёмасці з агульнай колькасці раздадзеных 405. Гэтым раздачам надавалася наступная праўная форма:

- наданне вячыстай уласнасці як ануляванне пазыкі;
- продаж маёмасці з правам водкупу;
- згода на ўжыванне маёмасці для забеспячэння пазыкі.

б) Пакрыццё (кампенсацыя) выдаткаў падданым:

- за панесеныя з уласнай маёмасці выдаткі на карысць дзяржавы;
- за маёмасць, страчаную на ўсходзе ў выніку: мірнай дамовы 1494 г. (ВКЛ страціла частку Смаленскіх зямель з Вязьмай і частку Вярхоўскага княства з Варатынскам, Мажайскам і Адоевым), перамір'я 1503 г. (зноў страта часткі Смаленскіх зямель. У выніку пазнейшых зменаў межаў, выкананых летам 1508, 1522 і 1537 гг. былі вернуты Любеч і Гомель, але страчаны Смаленск, Ельня і Себеж) і г. д. У XVII ст. пасля казацкіх войнаў страчана Левабярэжная Украіна з Кіевам, вялікая колькасць землеўладальнікаў з гэтай тэрыторыі атрымала ў кампенсацыю землі ў іншых частках Рэчы Паспалітай.

в) Дараванне ў вячыстае карыстанне за вялікія заслугі ці для прыцягнення прыхільнікаў.

г) Пажыццёвае і леннае наданне.

д) Наданне рускім і татарам, якія ўцяклі ў Рэч Паспалітую пад апеку караля, як, напрыклад, Тахтамыш і інш.

Наданнем для выплаты каралеўскага доўгу было дараванне Ішчалнянскіх пушчаў у 1505 г. падскарбію ВКЛ Якубу Давойну.

## Частка першая. Манаграфія

### I. Геаграфічна-адміністрацыйнае становішча Ішчалны ў 1939 г.

Маёнтак Ішчална знаходзіўся ў Навагрудскім ваяводстве, Шчучынскім павеце (створаны ў 1929 г. праз аддзяленне ад Лідскага) з каардынатамі 54° 40' шыраты і 42° 32' даўгаты ў адлегласці 7 км ад чыгуначнай станцыі Скрыбаўцы. Мястэчка ляжыць на старым паштовым тракце XVIII ст. Гародня - Ліда - Маладзечна - Полацк, які быў часткай магістралі Варшава - Пецярбург. У Ішалне гэты тракт перакрыжоўваецца з трактам Васілішкі - Жалудок. Адлегласць ад Ліды - 38 км.

На поўнач, на роўнай адлегласці ад старога паштовага тракту, праходзіць шаша Ліда - Гародня, якая на невялікім кавалку з'яўляецца мяжой маёнтка. На поўдні ад Ішчалны праходзіць чыгунка Ліда - Масты - Ваўкавыск.

### II. Уладальнікі Ішчалны

*(Крыніцы: Ішчалнянскі архіў, Slownik Geograficzny і г. д.)*

**Давойны ў 1505 - 1547 гг.**

**1505 г.** Каронная маёмасць Ягелонаў "Ішчалнянская і Шчучынская пушча" разам з усім, што ў яе ўваходзіла, нададзена ва ўласнасць і дзедзічнае валоданне падскарбію ВКЛ Якубу Давойну, герба Зарэмба.

**1514 г.** Андрэй Якубавіч Давойна, падкаморы надворны літоўскі, сын падскарбія, фундуе ў Ішчалне першы драўляны касцёл пад вызнаннем Найсвяцейшай Тройцы.

**1515 г.** Андрэй Давойна застаўным правам аддае ў шматгадовы ўжытак Ішчалну і Шчучын сям'і Лімантаў.

**1541 г.** Кароль Жыгімонт Аўгуст дазваляе Станіславу Андрэевічу Давойну, мерацкаму старасце, памяняць статус вёскі на мястэчка і адчыніць у Ішчалне рынак.

**1547 г.** Брат і сястра Станіслаў і Ганна, дзеці Андрэя Давойнавіча ўступаюць Ішчалну Лімантам.

Давойны - стары сенатарскі род, добра вядомы ў ВКЛ.

**1547 - 1644 гг. Ліманты**

**1547 г.** Уся ішчалнская і шчучынская маёмасць разам з падданымі: аратымі, агароднікамі, цеслямі, бондарамі, каладзеямі, рымарамі, смалярамі, бортнікамі, бабровнікамі, загоншчыкамі, рыбакамі і ўсялякага іншага роду людзьмі дваровай і палявой работы, з цяглам, чыншамі, дзяржавамі і данню мёдам, а таксама з усімі лясамі, барамі, дубровамі, гаямі і зараслямі, зямлёй ворнай і няворнай, палямі, пасевамі, лугамі, сенажацямі мурожнымі і балотнымі, з рэкамі, бабровымі

гонамі, водамі, ставамі, млынамі і сажалкамі, з корчмамі, драўлянымі будынкамі і гумнамі, усім інвентаром, статкамі, дзікім зверам, птушкамі і пчоламі - на моц урачыстага дароўнага акта, напісанага на беларускай мове[6] стараславянскім алфавітам, пераходзіць ва ўласнасць Лімантаў герба Лімант (не памятаю нагоды гэтага падарунка).

Ліманты прыбылі з Італіі ў XV ст., пасяліліся ў Літве і тут былі асіміляваны.

Можна меркаваць, што Станіслаў Давойна яшчэ пры сваім жыцці, ці як тады пісалі "цёплай рукой", пасля атрымання на гэта дазволу вялікага князя, дараваў маёмасць дачцэ і зяцю, які меў прозвішча Лімант. Гэта магчыма, бо літоўская шляхта толькі на Берасцейскім сойме 1566 г. атрымала права самастойна распараджацца сваёй нерухомай маёмасцю. [...] Ліманты валодалі Шчучынам і Ішчалнай каля 100 гадоў. Цалкам асіміляваныя, яны разам з шляхецкім народам цешыліся дабрабытам, моцнай дзяржавай, развіццём культуры - Рэч Паспалітая ў той час як раз перажывала свой залаты век.

**1616 г.** Маёмасць Лімантаў падзяляецца на дзве роўныя часткі: Ішчалну і Шчучын. Гэтыя часткі больш ніколі не аб'ядноюцца. Два браты Ліманты - Ян і Мікалай дзеляць маёмасць і з захаваннем усіх праўных фармулёвак таго часу атрымліваюць акт падзелу з удзелам сведак.

Са зместу гэтага акта вынікала, што старэйшы брат Ян атрымаў Ішчалну, а малодшы - Шчучын. Кожны атрымаў па 220 валок раллі, падданых таксама падзялілі па-роўну. Плошча лясоў, бароў, сенажацей і пашы дакладна не была вядома, і таму ў дамове мелася клаўзула, што пад залог ў 15 000 злотых, браты абяцалі справядліва перадзяліць гэтыя тэрыторыі пасля будучых абмераў плошчы. Невядома, ці перамерваліся калі-небудзь гэтыя землі.

Мястэчкі Ішчална і Шчучын патроху развіваліся, але ж Шчучын урбанізаваўся значна хутчэй, чым Ішчална. Мястэчка Шчучын стала гандлёва-рамесным і школьным асяродкам, а мястэчка Ішчална і надалей захоўвала аграрны характар, тут жылі толькі некалькі рынкавых гандляроў. Ішчална мела толькі каталіцкую парафію, у Шчучыне акрамя каталіцкай, мелася яшчэ і ўніяцкая парафія.

Пасля падзелу маёмасці ў 1616 г. Ішчална не доўга была ўласнасцю Лімантаў. У 1644 г. яе набыў Ян Паўпята.

У ішчалнянскім архіве было шмат дакументаў і карэспандэнцый, якія характарызавалі стасункі паміж уладальнікамі Ішчалны і Шчучына. Найбольш гэта датычыла пазнейшых уладальнікаў Шчучына - Сцыпіёнаў, поўнае прозвішча якіх было "Дэль Кампа Сцыпіён". Далейшы лёс Шчучына будзе апісаны ў раздзеле "Суседзі Ішчалны". Аднак трэба заўважыць, што ў 1939 г. шчучынская маёмасць належала сям'і князя Уладзіслава Друцкага-Любецкага, які пры таямнічых абставі-нах быў забіты ў сваім іншым маёнтку - Тарэсіне ў 1913 г.

**1644 - 1669 гг. Паўпяты**

Слоўнік геаграфічны сцвярджае, што ў 1644 г. Ішчалну набыла каронная канюшына, княжна Вішнявецкая, а Паўпята купіў маёмасць у Вішнявецкіх. Але гэта памылка.

Сцвярджаю гэта з поўнай упэўненасцю, бо неаднаразова сам чытаў тастамент Яна Паўпяты і добра памятаю дату яго напісання - 1667 г.

У 1644 г. Ішчалну набылі не Вішнявецкія, а Паўпяты, менавіта мсціслаўскі войскі Ян Паўпята герба Сарвікаптур[7].

Пасля 23 гадоў валодання Ішчалнай, у 1667 г. Ян Паўпята памёр, не маючы дзяцей, і перапісаў усю сваю маёмасць (акрамя дробных выняткаў) кляштару Босых кармелітаў у Жалудку.

Яго тастамент ёсць адзіным і першым захаваўшымся дакументам, напісаным на польскай мове. Ён сведчыць пра вялікую набожнасць ахвярадаўцы. Вось што засталося ў маёй недасканалай памяці:

*"У імя Айца і Сына і Святога Духа. Амінь.*

*Я, нягодны слуга Божы і вялікі грэшнік, Ян Паўпята, пан на Ішчалне, адчуваючы набліжэнне гадзіны маёй смерці і будучы ў прытомным розуме і духу, гэтым маім тастаментам пры ўдзеле яснавяльможных паноў сведак, чыню наступнае распараджэнне маёй волі: ... Маю грэшную душу ахвярую ласцы і міласэрдзю Пана Бога Усемагутнага і Тройцы Святой ...*

*На святую імшу за спакой маёй душы запісваю ... тынфаў касцёлам (ідзе пералік касцёлаў і сум). Маё нягоднае цела запавядаю пахаваць у простай, нефарбаванай сасновай труне пад парогам касцёла ў Ішчалне, так каб вернікі, ідучы ў касцёл, тапталі маю магілу нагамі. Маю маёмасць (ідзе пералік усёй маёмасці - нерухомасці, інвентару жывога і нежывога, належных сум ад даўжнікоў і г.д.), як я не маю ні патомства родных майго прозвішча, якія маглі б яе ўспадкаваць, цалкам запісваю кляштару Босых кармелітаў у Жалудку, акрамя наступнай маёмасці для маіх слуг (ідзе пералік маёмасці). Узамен ад вялебных айцоў кармелітаў у Жалудку прашу, абы святая імша за супакой маёй душы адпраўлялася ў кляштарным касцёле штодзённа на вечныя часы ...*

*... А калі хто парушыць гэтае мае астатняе распараджэнне, таго знайду на тым свеце і прызаву на Апошні і Страшны суд перад абліччам Пана Бога Усемагутнага і буду скардзіцца. Дапамажы мне Пан*

[6] Аўтар стала ўказвае мову старых дакументаў як беларускую ці старабеларускую мову і піша пра гэта ў сваім тэксце - *Л.Л.*

[7] Лясковіч памыляецца, насамрэч маёмасцю валодалі Вішнявецкія, князь Канстанцін Крыштаф Вішнявецкі, ваявода брацлаўскі, тагачасны ўладальнік Ішчалны, маючы пільную патрэбу ў грашах, аддаў яе ў 1662 г. у заклад пану войскаму мсціслаўскаму Пятру Яну Паўпяце, а праз некалькі гадоў, калі пан войскі трохі ўзмацніўся фінансава, а князю патрабаваліся грошы і далей, прадаў яму Ішчалну навечна. - *Л. Л.*

*Бог. Аман.*

*У прысутнасці паважаных паноў сведак, Ян Паўпята, сваёй рукой".*

Пад подпісам Паўпяты бачны подпісы і гербавыя пячаткі сведак[8].

Ян Паўпята валодаў Ішчалнай падчас самых вялікіх бедаў і няшчасцяў Рэчы Паспалітай, у часы панавання Яна Казіміра, страшных войнаў і панавання чужых войскаў па ўсёй тэрыторыі дзяржавы, у часы апісаныя Сянкевічам у "Патопе", калі шмат жыхароў нашага краю страціла жыццё ці збегла. Часы былі такія, што жывыя зайздросцілі памерлым. Пасля шматгадовага знаходжання ў татарскай няволі вярнуліся дахаты два пляменнікі Паўпяты. Не мелі яны ўласнага маёнтка, бо, верагодна, ён пайшоў на выкуп з палону, і таму жылі ў сваякоў у Полацкім ваяводстве. Не пабаяліся яны ні праклёнаў памёршага дзядзькі, ні Страшнага суду і распачалі судовы працэс з кармелітамі. Абвінавацілі іх у тым, што тастамент быў адрэдагаваны і аблудным чынам падсунуты паміраючаму, а сведкі падкуплены. Не памятаю, як ішоў працэс, але трыбунал прызнаў тастамент несапраўдным, і маёмасць перайшла да родных. Аднак браты не аселі ў Ішчалне, можа, баяліся што дух дзядзькі будзе ім помсціць, і прадалі маёмасць.

### 1669 - 1676 гг. Вішнявецкія

**У 1669 г.**, у год элекцыі Міхала Вішнявецкага на пасаду караля, маёмасць Ішчална набыла каронная канюшына (жонка канюшага - *Л. Л.*) княжна Яўгенія Карыбут-Вішнявецкая. Вішнявецкія гербу Карыбут свой род выводзілі ад Гедзіміна. Княжна Яўгенія ніколі ў Ішчалне не жыла і нават ні разу тут не была. Для Вішнявецкіх гэта быў толькі адзін з многіх маёнткаў, як суседнія іхнія маёнткі: Вялікае Мажэйкава і Дзітва. У ішчалнянскіх архівах захоўваліся два лісты князя Яромы Вішнявецкага, датычныя вайсковых спраў і з асобай княжны Яўгеніі нічога супольнага не мелі, як і прывілеі караля Міхала. Не змог устанавіць сваяцкія сувязі паміж княжной Яўгеній і Яромай. Але для гісторыкаў, думаю, гэта не з'яўляецца загадкай.

### 1676 - 1694 гг. Францкевічы-Радзімінскія

**1676 г.** Пасля смерці караля Міхала Ішчална праз продаж пераходзіць да падскарбія ВКЛ Казіміра Францкевіча-Радзімінскага гербу Бародзіч.

Францкевічы-Радзімінскія ў той час былі старым сенатарскім родам. Яны валодалі Жалудком, які атрымалі ў пасаг за Ганну Сапяжанку і дзе ў 1682 г. фундавалі кляштар кармелітаў.

Гэта быў род непаспалітых індывідуалістаў, у якім перамешваліся католікі, уніяты і праваслаўныя. І прадстаўнікі роду даходзілі да высокіх пасадаў у сваіх цэрквах.

**У 1371 - 1390 гг.** Сцібор быў каталіцкім біскупам Плоцка.

**У 1610 г.** Юры стаў уніяцкім мітрапалітам.

**У 1620 г.** Ян стаў праваслаўным чарэйскім архімандрытам.

### 1694 - 1702 гг. Скарбак-Важынскія

**Каля 1692 г.** згасае мужчынская лінія Францкевічаў-Радзімінскіх. Маёмасць пераходзіць да дачок. Адна з іх у 1694 г. выходзіць замуж за тыркшлеўскага старасту Гераніма Скарбак-Важынскага герба Абданк, род якога паходзіў са Жмудзі.

Маці Францкевічоўны-Важынскай была з роду Нарушэвічаў і ўнесла значны пасаг узгаданаму вышэй падскарбію ВКЛ Казіміру Францкевічу-Радзімінскаму, таму магчымыя спадкаемцы з бакавых галін роду Нарушэвічаў распачалі судовы працэс супраць Гераніма Скарбак-Важынскага за вяртанне маёмасці. Працэс быў вельмі складаны і распачаўшыся ў XVII ст. пасля смерці цёшчы Гераніма Скарбак-Важынскага, цягнуўся некалькі дзесяткаў гадоў. Супраць нашчадкаў Гераніма Скарбак-Важынскага - Валяў, выступілі сем'і Нарушэвічаў і Мацкевічаў. Пасля працэсу ў ішчалнянскім архіве засталося мноства шматстаронкавых сшыткаў, позвы і рэплікі бакоў. Некаторыя, напісаныя Нарушэвічам, сябрам Пастаяннай Рады[9] ў часы караля Станіслава Аўгуста.

Геранім Скарбак-Важынскі - галоўная постаць у гісторыі і культуры Ішчалны. Ён паважаў гісторыю і збіраў розныя артэфакты, купляў шмат кніг. На кожнай

---

[8] Міхал Шымялевіч пісаў, што Паўпята пры перадачы свёй маёмасці кляштару Босых кармелітаў у Жалудку, запісаў ішчалнянскі фальварак Талматоўшчыну (больш за 6 валок) Марціну Квінце і яго жонцы Люкрэцыі Ліндорфаўне.

*"У двары пана падкаморага лідскага Казіміра Францкевіча Радзімінскага ў той час жыло некалькі бежанцаў, выкінутых сюды ваеннай бурай - муж і жонка Ян Запольскі і Кацярына з Паўпятаў, а таксама браты Павел і Мікалай Янавічы Паўпяты. Яны і распачалі судовы працэс з кармелітамі. Пачаўся гучны на той час працэс. Дапытаны сведкі тастамента: пан Дуброўскі, чашнік і пісар гродскі віленскі, а таксама пан Данілевіч, падстолі ашмянскі. Яны пацвердзілі, што, едучы трактам цераз Ішчалну на сойм у Варшаву, былі запрошаны да хворага Паўпяты і пакінулі свае подпісы на чыстых аркушах паперы, падпісаных тым жа Паўпятом. Прыціснуты прысягай Марцін Квінта прызнаў, што і тастамент, і фундуш, і іншыя дакументы былі на чыстых, толькі з подпісамі, аркушах. І ўжо пасля смерці войскага былі сфабрыкаваны кармелітамі з удзелам яго, Квінты. Пасля чатырох трыбунальскіх дэкрэтаў спрэчка была канчаткова развязана аж у 1678 г. на карысць крэўных Паўпяты, усе запісы яго прызнаны за несапраўдныя, Ішчална прызнана ўласнасцю Запольскіх і Паўпятаў, а віленскія кармеліты прыгавораны да ўплаты тым жа спадкаемцам 3 000 зл. за вывезеную з Ішчалны рухомасць і таксама да вяртання коштаў працэсу ў суме 4 315 зл."*. Гл: Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 69-70.

[9] Пастаянная Рада (Rada Nieustajaca ) - найвышэйшы адміністрацыйны орган Рэчы Паспалітай у 1775 - 1789 гг. Была ўтворана ў сакавіку 1775 г. пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай з падачы расійскай імператрыцы Кацярыны ІІ. Да 1789 г. Рада з'яўлялася галоўным адміністрацыйным органам Рэчы Паспалітай - *Л. Л.*

ягонай кніжцы мелася анатацыя, у якой указвалася: калі, дзе і за якія грошы ён яе набыў. Пасля вяселля пасяліўся ў Ішчалне і сюды перавёз са Жмудзі свае зборы, архівы і бібліятэку, чым значна дапоўніў багаты архіў свайго цесця, які пачалі збіраць папярэднія ўладальнікі маёнтка.

Менавіта Геранім Скарбак-Важынскі заклаў падваліны прыгожага збору скарбаў культуры ў Ішчалне. Ішчалнянскі музей, гэтак званы скарбец быў заснаваны пазней, пасля таго як у XIX ст. Караль Лясковіч пабудаваў новы жылы дом, які атрымаў назву "палац", хоць і быў у лепшым выпадку "палацыкам".

Геранім Скарбак-Важынскі памёр у 1707 г. Пасля яго смерці Ішчална, зноў па-кудзелі, пераходзіць у рукі іншага роду.

**1702 - 1798 гг. Валі**

Ян Валь, жыхар Гданьска, у 1658 г. атрымаў грамадзянства Рэчы Паспалітай і герб Валь. Яго сын (здаецца Юзаф - не памятаю дакладна імя) жаніўся з паннай Важынскай і ў 1707 г. атрымаў Ішчалну. Ад гэтага шлюбу, каля 1743 г., нарадзіўся сын Ян, стараста фрэйданскі (у Інфлянтах). Ён заканчвае пабудову мураванага барочнага жылога дома (пазнейшага скарбца).

Сын Яна Валя, чарговы Юзаф, жэніцца з суседкай з Голдава паннай Мар'янай Вянцковіч, маці якой паходзіла са старога роду Трызнаў, фундатараў уніяцкай царквы ў Голдаве. Сужэнцы Юзаф і Мар'яна (з Вянцковічаў) Валі на месцы драўлянага касцёла будуюць за ўласныя грошы прыгожы барочны мураваны парафіяльны касцёл. Гэты касцёл стаіць да нашага часу і служыць не толькі сваім парафіянам, але і ... як арыенцір журавам падчас іх вандровак.

**У 1758 г.**, калі была скончана будова касцёла, Юзаф Валь, як вынікае з дакументаў, якія захаваліся, акрамя пасады старасты фрэйданскага мае яшчэ пасаду гарадзенскага харунжага.

Наколькі Юзаф Валь быў добрым гаспадаром, які пакінуў пасля сябе шмат слядоў сваёй дзейнасці, настолькі яго сын, таксама Юзаф, быў чалавекам вельмі слабога характару і нават неразумнікам. Прыціснуты моцнай індывідуальнасцю свайго бацькі, вырас няздольным да самастойных учынкаў. Ва ўзросце больш за 40 гадоў жаніўся па вялікім каханні са значна маладзейшай, прыгожай паннай Агнешкай Шукевіч з маёнтка Крупава. Шукевічы не былі вельмі багатай сям'ёй, і таму на згоду бацькоў Агнешкі паўплывала тое, што Валь абяцаў запісаць увесь маёнтак на маладую жонку, калі яна згодзіцца выйсці за яго замуж. Маёнтак Ішчална быў ласым кавалкам. Закаханы стрымаў свае слова. За дзень да шлюбу перапісаў сваёй будучай жонцы ўсё, што меў і такім чынам стаў яе слугой і нявольнікам. Пра нейкія пачуцці з боку маладой жонкі не магло быць і размовы. Прыгожая кабета стала жорсткай жонкай. Агнешка беспардонна выкарыстоўвала свае перавагі - узрост і прыгажосць - і атрымала ўладу разам са сляпым каханнем мужа.

Ніхто з тых, хто завітваў да іх у госці, не думаў, што гэты стары, які сядзіць на далёкім, не ганаровым канцы стала з'яўляецца сапраўдным гаспадаром маёмасці і мужам, і таму ўдзяляў сваю ўвагу толькі маладой гаспадыні.

Малодшая сястра Агнешкі - лагодная і паслухмяная Элеанора выйшла замуж за землеўладальніка з Гародні, лідскага суддзю Караля Лясковіча гербу Кораб - высокага, стройнага мужчыну з рашучым і дэспатычным характарам. Дзве непадобныя сям'і настолькі сябравалі, што разам жылі ў Ішчалне.

Караль Нарбут, крайчы і земскі пісар, дасціпны і вясёлы чалавек, ведаючы, як жывуць гэтыя дзве пары, арганізаваў паміж жанатымі лідскімі землеўладальнікамі дзве арміі (групоўкі): Валяў і Лясковічаў.

Усе мужы, якія падпарадкоўваліся сваім жонкам, атрымлівалі чыны ў арміі Валяў аж но да генерала, а тыя, якія трымалі сваіх жонак у руках, былі запісаны ў армію Лясковіча. Армія Валя мела нават сваіх капеланаў, гэта былі пробашчы, якімі кіравалі іх гаспадыні. Афіцэрам абодвух армій выдаваліся патэнты, падпісаныя іх камандуючым і начальнікам штаба з васковай пячаткай і апісаннем учынку, за які ён атрымаў намінацыю[10]. [...]

**У 1796-1798 гг.** памёр Юзаф Валь, і адразу за ім памерла і яго бяздзетная жонка. Ішчалнянская маёмасць пераходзіць да сястры Элеаноры з Шукевічаў Лясковіч.

**1798 - 1822 гг. Лясковічы**

**У 1798 г.** Элеанора перапісала сваю маёмасць мужу. Распачалося энергічнае кіраванне Караля Лясковіча, які нядоўга займаў пасаду харунжага Лідскага павета. Праз некалькі гадоў у іх нарадзілася дачка Францішка Лясковіч.

Караль меў вялікія планы. Вырашыў зрабіць з занядбанага маёнтка сапраўдную панскую рэзідэнцыю і на пачатку XIX ст., пачаў збіраць будаўнічыя матэрыялы для шматгадовай будоўлі.

Бурыліся драўляныя будынкі, а на іх месцы паўставалі мураваныя: сталярня, стэльмашарня са складам матэрыялаў на першым паверсе і з сушняй да другім, кузня, стайні - цугавая і вазоўня. Потым хаты для слугаў, і толькі пасля ўсяго гэтага, па праекце добрага архітэктара, у стылі "неакласічны ампір", пачаў будаваць новы жылы дом. Дом быў закончаны каля 1809 г., пасля чаго хутка запоўнены мэбляй, выкананай у стылі сваёй эпохі. Знутры дом быў абабіты дубовымі панелямі. Першы паверх старога жылога дома (скарбца) быў аддадзены пад бібліятэку, архіў і збор помнікаў мінуўшчыны, тут жа зроблены і гасцінны пакой. Калі дачка падрасла, гучныя паляванні і суседскія пасядзелкі ўступілі месца вытанчаным балям.

**У 1820 г.** Францішка, дачка віца-маршалка Лідскага павета (Караля Лясковіча), дзяўчына, якая прыгожа спявала і грала на арфе, выйшла замуж за суседа з

[10] Падрабязней гл: Мірон Браніслаў Нарбут. Лідскі павет у сярэдзіне XIX ст. Шлюныя войскі / пераклад Галіны Лаўрэш, каментары Леаніда Лаўрэша // Асоба і Час. Беларускі біяграфічны альманах. Вып. 6. Мінск, 2015. С. 123-124.

Голдава Антона Скарабак-Важынскага герба Абданк, пазнейшага маршалка Лідскага павета.

Гэтак злучыліся два маёнткі - Ішчална і Голдава.

**1822 - 1918 гг. Скарбак-Важынскія**

**У 1822 г.** памёр Караль Лясковіч, і панамі на Ішчалне сталі Важынскія.

Голдава знаходзіцца за 3 вялікія мілі (22 км) ад Ішчалны. Апрача вакальна-музычных здольнасцяў, сямейная памяць не захавала нічога пра асобу Францішкі з Лясковічаў Важынскай. Яна ўсё атрымала ў спадкі ад свайго бацькі і згодна з цывільным кодэксам стала ўладальніцай радавой маёмасці. На партрэце Францішка выглядае жанчынай звычайнай прыгажосці, чыя першая маладосць ужо прайшла. А яе муж Антон - высокі і прыстойны мужчына ў латах (верагодна, успадкаваных ад продкаў).

Скарбак-Важынскія мелі аднаго сына Баляслава. Ён жаніўся з суседкай з вялікага Мажэйкава Марыяй Грабоўскай. Мелі яны чатырох дзяцей: рана памёршага сына Баляслава і тры дачкі: Зоф'ю, Марыю і Ізабелу. Жылі шумна, з вялікімі выдаткамі, і таму грошай з двух маёнткаў не хапала. Калі да гэтага дадаць азарт Баляслава, дык неўзабаве сям'я мела шмат даўгоў. Каля 1880 г. Баляслаў, не маючы чым заплаціць картачныя даўгі, учыніў самазабойства. Убачыўшы мёртвага мужа, тут жа каля яго ад інфаркту памерла і жонка. Тры дачкі засталіся сіротамі. Апеку над імі прыняў родны брат маці, граф Станіслаў Грабоўскі - уладальнік Вялікага Мажэйкава, даўнейшай маёмасці Хадкевічаў (нашчадкаў гетмана Караля Хадкевіча).

Станіслаў Грабоўскі быў добрым гаспадаром і таленавітым адміністратарам. Яго апека была вельмі дабрадзейнай для сірот. Пад яго кіраўніцтвам Ішчална ачысцілася ад даўгоў, усе будынкі былі ўпарадкаваны і пабудавана шмат новых, мураваных (напрыклад вялікія стадола і абора), над падапечнымі сёстрамі апекаваліся цёткі (родныя сёстры іх маці), і дзяўчынкі атрымалі добрае выхаванне і адукацыю.

Апякун Станіслаў Грабоўскі з-за сваёй гаспадарлівасці і шляхетнага сэрца цешыўся павагай як сярод землеўладальнікаў, гэтак і сярод сялян, аднак сваёй сям'і не меў. Памёр безпатомна ў Парыжы падчас Першай сусветнай вайны.

Ніводная з сясцёр Важынскіх не выйшла замуж, усе памерлі паненкамі ў часы Першай сусветнай вайны: Зоф'я у 1917 г. у Хельсінкі, Ізабела ў 1916 г. у Вільні, а самая малодшая Марыя развіталася з гэтым светам 20 лютага 1920-га года ў Варшаве.

На падставе судовага выраку, маёнткі якія пасля іх засталіся, як родавыя, былі вернуты: Ішчална адышла Лясковічам, а Голдава нашчадкам па пабочнай лініі Антона Скарабак-Важынскага.

З-за вайны, вялікая судовая праца была скончана толькі ў 1920 г., але з-за бальшавікоў передача маёмасці адбылася ў 1921 г.

**1921 - 1939 гг. Лясковічы**

**У 1921 г.** новымі ўладальнікамі Ішчалны сталі не блізкія паміж сабой сваякі Юзаф, Станіслаў і Юльян Лясковічы. У выніку сямейнага паразумення ў Ішчалне пасяляецца сям'я Юзафа Лясковіча, якому па законе належыць палова маёмасці Ішчалны (Станіславу і Юльяну па адной чвэрці). У 1924 г. пасля абмеру зямлі і лясоў, зямельнай рэформы і передачы часткі зямлі вайсковым асаднікам Лясковічы атрымалі 2 200 гектараў. Пасля сямейнага добраахвотнага падзелу, двор Ішчална разам з 1000 гектарамі стаў маёмасцю майго бацькі Юзафа Лясковіча. З астатніх 1200 гектараў каля 700 атрымала сям'я майго дзядзькі Станіслава, які на той момант ужо не жыў, і каля 500 гектараў высакаякасных лясоў атрымаў Юльян Лясковіч.

Юзаф кір'янаўскі і Караль ішчалнянскі (сыны Антона) былі братамі. Юзаф - сын Караля і Станіслаў - сын Фелікса[11], былі ўнукамі Юзафа (сына Антона), а Юльян - яго праўнукам. Новы ўладальнік двара Ішчална Юзаф Караль Філіп Неруш Лясковіч, нарадзіўся ў 1858 г. і з'яўляўся сынам Караля, уладальніка маёнтка Шумск, што каля Вільні. Пасля смерці бацькі ў 1861 г. стаў уладальніка Шумска - прыгожага маёнтка з мураваным палацам з 5 000 гектараў зямлі. Пасля паўстання 1863 г. уласнасць малога уладальніка па "найвышэйшым дазволе цара" была прададзеная за карцёжныя даўгі яго апекуна. Маёмасць набыў віленскі генерал-ад'ютант Лабынцаў, а сірата пайшоў туляцца па свеце. Да паўналецця карыстаўся дапамогай сваякоў сваёй маці, а потым да 1921 г. зарабляў на жыццё працай чыноўніка.

**1937 - 1939 гг. Апошнія ўладальнікі**

**У 1937 г.** Юзаф Лясковіч памёр і быў пахаваны на касцельным цвінтары ў Ішчалне. Маёнтак у роўных частках успадкавалі: яго жонка Юзэфа (памерла ў 1957 г.), старэйшы сын Габрыэль (памёр у 1959 г.), малодшы сын Караль (які з'яўляецца аўтарам манаграфіі і жыве да гэтага часу) і тры дачкі Яніна, Ева, Ірэна. Яны і былі апошнімі ўладальнікамі Ішчалны да 17 верасня 1939 г. Пасля гэтага дня Ішчална, як і ўсе маёнткі, стала дзяржаўнай маёмасцю.

**У 1941 г.** сюды прыйшлі немцы. Гэта не прынесла вяртанне маёнткаў ранейшым уладальнікам. Яны засталіся дзяржаўнай маёмасцю, але ў некаторых з іх

[11] У гісторыі вядомы Ляскоўскі (Лясковіч) Войцех Альберт, сын Фелікса, дваранін Лідскага павета. Да паўстання 1863 г. яго бацька валодаў маёнткамі Кір'янаўцы і Пяткаўшчына Лідскага павета. Падчас паўстання агітаваў дваровых людзей удзельнічаць у ім, таму яго маёмасць на падставе распараджэння віленскага губернатара ад 27.06.1863 і пастановы Віленскага грамадзянскага праўлення ад 23.07.1863 падлягала секвестру. Пастановай ваеннага суда прысуджаны да смяротнага пакарання і канфіскацыі маёмасці. Прысуд выкананы (да 01.10.1864). Гл: Матвейчык Д.Ч. Удзельнікі паўстання 1863-1864 гадоў, біягр. слоўнік. 2016. С 354.

У 2019 г. у Вільні быў ганарова перапахаваны разам з іншымі паўстанцамі, у тым ліку і Кастусём Каліноўскім.- *Л. Л.*

ранейшым гаспадарам было дазволена жыць у якасці нанятых адміністратараў.

**Лёс Ішчалны пасля 1945 г.**

Пра тое што адбывалася ў Ішчалне я даведаўся з пісьма сястры Ірэны:

*"Бог учыніў цуд, бо дазволіў мне нарэшце наведаць улюбёнае месца, дзе прайшлі добрыя і радасныя дні маёй маладосці. Каралю, была ў Ішчалне, ужо тры дні прайшло пасля той кароткатэрміновай выправы, а я ўсё яшчэ не магу прыйсці да сябе. Падчас кожнага наведвання Вільні марыла даехаць да Ішчалны, але з-за адміністрацыйных праблем гэта было немагчыма. Але ў пэўную хвіліну пачула магічнае слова "Ліда". Адкінула ваганні і паехала туды са знаёмай вільнянкай. З Ліды сама заехала ў Ішчалну на таксоўцы. Праз 37 км збочваем улева і міма нашых парафіяльных могілак прыязджаем да ішчалнянскага касцёла. Уяві сабе - стаіць такі ж, як і раней! Не паверыла сваім вачам, мусіла яго нават памацаць. Але ўсе брамы і вароты былі зачынены. Агарнула мяне роспач ад таго, што мусіла паехаць адсюль ні з чым. На шчасце аднекуль з'явілася дзяўчынка, якая паінфармавала мяне, што ў суседнім будынку (там дзе жыў арганіст), жыве старая, якая мае ключы ад касцёла. Яна і пусціла мяне да магілы нашага бацькі і ў касцёл. Касцельны цвінтар не змяніўся, захаваліся ўсе магілы Лясковічаў, Важынскіх, Грабоўскіх. На крыжы ў бацькі надпіс так добра чытэльны, як быццам учора напісаны. Трава старанна выкашана, нідзе слядоў бруду ці смецця. Званіца цэлая, і званы на месцы. Здаецца, пры заходзе сонца звоняць так, як раней на Анёл Панскі. Раз на месяц сюды даязджае ксёндз з Ваверкі - сівы стары, і званыззываюць парафіян на малітву. Прыходзяць усе. На франтоне святыні кідаецца ў вочы стары валяўскі надпіс. Памятаеш гэты верш са Святога Пісьма: "Лісіцы маюць ямы свае, птушкі маюць гнёзды свае, а Сын Чалавечы не мае дзе галаву прыкланіць". Гэтыя словы ўзрушваюць да глыбіні. Міжволі прыйшло ў галаву, што і мы не маем свайго гнязда. Плачу, калі пішу да цябе гэтыя словы пра наш родны дом.*

*Старая ключніца назвалася Стасяй. Спаткала ў яе другую старую, якая мае ўжо 70 гадоў і ў часы маёй маладосці заўсёды на Божае Цела прыводзіла дзяцей, якія кідалі кветкі. Жыве яна ў Шчучыне і там апякуецца касцёлам. Выглядае прыгожа: дробныя, далікатныя рысы, чыстыя васільковыя вочы і бязмежная дабрыня ў іх. Пазнала яе адразу і ледзь не расказала пра тое, хто я. У гэтую выправу пастаралася да непазнавальнасці змяніць свой выгляд. Баялася, каб хто не пазнаў ува мне былую паненку з двара, бо маглі быць дрэнныя наступствы. Аднак папрасіла ў яе адрас для сваёй знаёмай Эміліі Русецкай. "Для панны Велі?", - радасна ўскрыкнула і адказала: "Прашу перадаць ёй прывітанне і сказаць, што я яе добра памятаю".*

*Дала свой адрас і пра мяне не выпытвала. Усталі і ўтрох пайшлі ў касцёл. Аслупянела ад уражання! У касцёле нічога не змянілася. Толькі дадаліся фігуры святых, ліхтары і абразы - усё гэта прывезлі сюды з ліквідаванага шчучынскага касцёла. Калятарскія лавы Ішчылны і Вялікага Мажэйкава накрыты памостамі з дошак, на гэтым памосце стаяць шэсць ліхтароў і фігур. Высока пад скляпеннямі лётала нейкая птушка. Усё ўстрымліваецца ў вялікай чысціні, метал ліхтароў блішчыць, алтар тоне ў жывых, свежа сарваных кветках. Не хапае толькі на амбоне нашага дарагога ксяндза Красадомскага. Можаш сабе ўявіць маё ўражанне! Прайшло трыццаць гадоў, і пад уладай Саветаў Дом Божы застаецца ў ідэальным стане. Нават не верыцца. Усе малітвы, як і раней, адпраўляюцца па-польску. Не бачна ніякіх слядоў рамонту апошніх гадоў, але ксёндз Красадомскі пасля вяртання з Сібіры разам з вернікамі нешта тут напраўляў.*

*Думаю, старыя ўсё ж здагадаліся, што я нехта з ранейшых часоў, бо амаль што праз сілу павялі мяне да маёнтка. Не хацела туды ісці, баялася ўражанняў, але яны так налеглі, што згадзілася. Не, не цікава было аглядаць руіны гэтак дарагога мне месца, бо не люблю шукаць былых слядоў прыгажосці.*

*Пытаеш што пабачыла?*

*Знішчэнне, варварства і пустку. Гэтак выглядалі двары ва Украіне пасля рэвалюцыі 1917 г. у кнізе Зоф'і Косак "Бяроза".*

*Ад каштанавай алеі, якая вяла ад двара да касцёла, засталося некалькі дрэваў, якія дазваляюць прыгадаць, як яна выглядала. Сама алея ў выбоінах і ў гразі пасля нядаўніх дажджоў. Ад уязной брамы і мура, які атачыў сад, не засталося і слядоў. Левы бок алеі ад былой брамы да дома выкарчаваны. Выкарчаваны левы бок саду, двара і парку. Адзінае, каля клумбы ацалелі тры пакалечаныя ліпы. Каля грэблі стаіць стары вадзяны млын, але ён не чынны, бо стаў зарос і стаў плыткім. Не бачна векавой алеі з елак, якая вяла ад двара да тракту і коннай пошты, якая стаяла каля тракту - пазнейшай прафесійнай школы. З даўніх будынкаў, апрача млына, ацалеў толькі дом агародніка і цугавая стайня, якая пасярод пажарышча выглядае нават па-панску, як палац. Акрамя гэтых, усе пабудовы - дом, скарбец, афіцына, аранжарэя і будовы фальварка разабраны да фундамента. На іх месцы толькі парослыя травой пагоркі друзу. На ўсім абшары даўняга двара не ўбачыла слядоў жыцця ці дзейнасці чалавека. Створаны працай шматлікіх пакаленняў асяродак культуры ператвораны ў папялішча.*

*Усё гэта было для мяне вялікім перажываннем і цяжкім выпрабаваннем для сэрца. Бачыла смерць нашага былога жыцця. Аднак, калі Пан Бог дазволіць, паеду сюды яшчэ раз, каб выпытаць старых сялян, ці ацалела што ад ішчалнянскага архіва? На гэты раз толькі прывезла з Ішчалны малы мяшочак зямлі і галінку бэзу.*

*Нездарма дваровыя сабакі вылі перад нашым выездам у 1939 г. Інстынктам ведалі, што запануе тут смерць ..."*

### III. Вопіс зямель Ішчалны

#### Абшар Ішчалны

Ішчална ніколі не была сядзібай магнацкай сям'і ці латыфундыяй нашых "каралевічаў" на Літве. Князям Вішнявецкім належала толькі некалькі гадоў. Была гэта маёмасць сенатараў, але сенатары мелі меншы ўплыў.

Братам Лімантам, якія ў 1616 г. дзялілі свае воласці, не быў дакладна вядомы іх абшар, бо да таго часу ніякі абмер не рабіўся. Тым болей падчас надання маёмасці ў 1505 г. дакладнай плошчы не ведаў ні кароль Аляксандр, ні атрымальнік маёмасці Якуб Давойна.

У тыя часы межы абшараў вызначала традыцыя, а не геаметрычныя вымярэнні. Старыя назвы ўрочышчаў пераходзілі з пакаленне ў пакаленне. Адвечныя пушчы, поўныя балоцістых нізін, рэчак і ручаёў, бароў на прыгорках, цягнуліся бесперапынным пасам. Жыў тут моцны і люты звер: зубры, туры, ласі, алені, сарны, мядзведзі, ваўкі, дзікі, рысі і ўсялякая звярыная дробязь. Толькі дзе-нідзе ў бязлесных анклавах сяліліся людзі.

Аднак існавала своеасаблівая прымітыўная тапаграфія, калі кожнаму кавалку зямлі давалася свая назва. Напрыклад, луг, падзелены пасам лесу, які зваўся Валасоўшчына, з аднаго боку лесу меў назву Раманішкі, а з другога - Прэйцы. Чым менш жыло тут людзей, тым большыя абшары ахоплівала назва. [...]

Ішчалнянскі двор разам з парафіяльным касцёлам, ляжыць на скрыжаванні дзвюх старых дарог: з захаду на ўсход праз Гароднаю, Скідзель, Шчучын, Ішчалну і Ліду, а з поўначы на поўдзень праз Забалаць, Васілішкі, Ішчалну, Жалудок і Орлю. На ўсход, за 2 км ад двара праходзіла мяжа з маёмасцю Хадкевіча, якая раней пачыналася ажно каля Ліды. Галоўнай сядзібай гэтай маёмасці было Вялікае Мажэйкава - некалі ўласнасць Караля Хадкевіча.

Гэты род згас у дваццатых гадах XIX ст., і захаваныя рэшткі былой латыфундыі перайшлі да графаў Грабоўскіх. Падчас Першай сусветнай вайны ў Парыжы, не маючы патомства, памёр уладальнік Вялікага Мажэйкава граф Станіслаў Грабоўскі, пакінуўшы сваім спадкаемцам 5000 гектараў дасканалых лясоў і добрыя аграрныя землі. Спадкаемцамі былі: Верашчакі, Мінейкі, графы Раствароўскія і Ваньковічы. Вялікае Мажэйкава атрымалі Верашчакі, сваякі міцкевічавай Марылі.

За 3 км на поўнач, у кірунку Васілішак, ляжала некалі вялікая маёмасць Кастравіцкіх, ад якой з-за неашчаднасці дзядоў застаўся фальварак Касцянёва. Стыльны палац у Паперні, што каля Ваверкі, яны страцілі пры канцы XIX ст. Кастравіцкія пасля Скіндараў і Александровічаў былі адным са старэйшых родаў на Лідчыне, пасяліліся яны тут у выніку старадаўніх каралеўскіх наданняў.

І зноў, недалёка, за 2 - 3 км на поўдзень мелася мяжа з лясамі Жалудка, якімі валодалі князі Святаполк-Чацвярцінскія. Да 1939 г. мелі яны 17 000 гектараў. Чацвярцінскія атрымалі Жалудок пасля смерці графіні Урускай. У XVIII ст. гэта была маёмасць, знанага ў часы караля Станіслава Аўгуста, Тызенгаўза.

Сціснутая з трох бакоў ішчалнянска-шчучынская маёмасць у заходнім кірунку ішла ажно да мяжы наступнай латыфундыі - Скідзеля, які ў 1939 г. належаў князю Уладзіміру Святаполк-Чацвярцінскаму. У бок Скідзеля ляжаў маёнтак Спуша, які ў 1939 г. меў 40 000 гектараў зямлі і належаў князю Яўстаху Сапегу - амбасадару ў Лондане (памёр у 1968 г. у Кеніі, пакінуўшы там нашчадкам вялікі маёнтак).

Ішчалнянска-шчучынская маёмасць не мела форму прастакутніка, хутчэй яна нагадавала пляму з асобнымі выступамі, пляма была ў шырыню 5 км і ў даўжыню 30 км.

Можна прыняць, што агульная плошча яе ў XVI ст. складала каля 40 000 гектараў і на момант надання (у 1505 г.) не мела шмат апрацаванай зямлі, бо прывілей караля і вялікага князя ВКЛ Аляксандра надаў Давойнам "Пушчы ішчалнянскія і шчучынскія".

**У 1616 г.**, на момант падзелу маёмасці паміж братоў Лімантаў, агульная плошча апрацаваных зямель складала 440 валок, і таму кожны з іх атрымаў па 220 валок. Валока вызначалася як ворная зямля якую можна было завалочыць, г. зн. забаранаваць парай валоў за поўны дзень. У XVI ст. не было яшчэ адзінай меры паверхні і яна тычылася толькі раллі без лугоў, пашаў і лясоў. У 1576 г. прынятая ўстава, па якой валока мела 30 моргаў[12] (як ў ВКЛ, гэтак і ў Кароне). Таму ў Кароне валока гэта каля 17 гектараў, а ў ВКЛ каля 21 гектара (бо літоўскі морг быў на 1/4 большы за польскі). З гэтага вынікае, што Ліманты мелі каля 9 000 ворных гектараў. Паверхня агульнай плошчы маёмасці была значна большай.

З часам, ішчалнянска-шчучынскі абшар паменшыўся з-за падзелаў, продажу, тастаментаў, шлюбаў. Не маю інфармацыі, каб дакладна прасачыць гэтае памяншэнне.

**У 1616 г**. маёмасць была падзеленая на дзве роўныя паловы. У наступныя часы Ішчална ў большай меры паменшыла сваю плошчу, чым Шчучын. Калі ў 1939 г. Шчучын меў каля 8 000 гектараў, і таму можна вызначыць, што перад зямельнай рэформай 1861 г. (адмен прыгону) Шчучын мусіў мець больш за 10 000 гектараў, адсюль ужо недалёка і да 20 000 гектараў на пачатку XVII ст.

Абшар Ішчалны значна паменшыўся, і ў 1918 г. меў 3 200 гектараў. Баляслаў Важынскі, пры якім прайшла рэформа 1861 г., вылучыў з Ішчалны 7 вёсак: Ішчалну (Валоку), Кямянцы, Малыя Баяры, Вялікія Баяры, Карысць, Мацяўцы і Бабры, адначасова лікві-

[12] Морг - адзінка вымярэння плошчы зямлі ў сярэднявечнай Еўропе, роўная прыблізна 0,71 гектара. У выдадзеным у 1884 г. томе VI "Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін" пісалася: "Морг (ням. Morgen (раніца), азначае плошчу зямлі, якую адзін чалавек можа на працягу 1 дня скасіць або ўзараць. Памеры морга былі рознымі". - *Л. Л.*

даваў мястэчка Ішчална, якое да гэтага часу месцілася каля касцёла.

Пры канцы, Важынскія валодалі двума ключамі: Ішчална (3 200 гектараў) і Голдава (каля 2 000 гектараў). Голдава не было шараговым маёнткам Лясковічаў, і таму ў 1922 г. яго ўспадкавала сям'я Валейкаў - сваякоў сёстраў Важынскіх па лініі Юзафа Скарбак-Важынскага.

Ключ Ішчална складаўся з наступных частак:

- непасрэдна Ішчална, фальваркі Прэйцы, Баяры, Даргёўцы, Карысць, Сліваўшчына, Буцёўшчына, Бабры.

- лясныя ўрочышы: Навіны, Карысць, Сліваўшчына, Баяры, Вады, Могілкі, Валасоўшчына, Бабры, Бублiны.

Гэты ключ пасля Першай сусветнай вайны і да 1930 г. страціў наступныя землі:

- 450 гектараў па выплаце тастаментаў Марыі Скарбак-Важынскай. Гэта 20 гектараў у Ішчалне і 430 гектараў у Бабрах (70% лесам);

- 170 гектараў раллі ў Сліваўшчыне і Бабрах ахвяраваны вайсковым асаднікам;

- 20 гектараў лясоў падараваны гаспадарам вёсак Кямянцы і Валока;

- 560 гектараў раздзелены па законе аб зямельнай рэформе 1921 г. 300 гектараў раллі (фальваркі Баяры, Буцёўшчына і Даргёўцы і 260 гектараў лесу ва ўрочышчах Навіны і Бубліны.

Разам абшар ключа Ішчална паменшыўся на 1200 гектараў.

17 верасня 1937 г. маёнтак меў 2 000 гектараў з якіх:

- 1 000 гектараў мела сям'я памёршага Юзафа;

- 700 гектараў мелі сыны памёршага Станіслава (Уладзіслаў і Вітольд);

- 300 гектараў меў Юльян.

Сям'я Юзафа валодала: маёнткам Ішчална, фальваркам Прэйцы, ляснымі ўрочышчамі Валасоўшчына, Могілкі і часткай Навін.

Сыны Станіслава мелі: фальварак Карысць і лясныя ўрочышчы Карысць, Баяры, Вады і частку Навін.

Юльян: лясное ўрочышча Сліваўшчына і частку ўрочышча Навіны, якое падзяліў пасля продажу лесу.

**Землі Ішчалны, 1921 - 1925 гг.**

Стан на 1921 г. - гэта стан перад падзелам паміж спадкаемцамі Марыі Скарбак-Важынскай. Стан на 1925 г. гэта, калі мой бацька Юзаф Лясковіч атрымаў зямлю.

Землі ключа Ішчална былі расцярушаны па вялікай паверхні. Адлегласць паміж найбольш аддаленымі кропкамі дасягала 35 км. Зямля была рознай якасці і па-рознаму ўжывалася.

На пачатку раскажу пра тыя землі, якія адпалі ў 1922-24 гг. і потым пра тыя, якія належалі Юзафу Лясковічу і яго нашчадкам да 1939 г.

У 1921 г. уладанні не мелі цэласнасці. У адрыве ад галоўнага комплексу ляжалі:

- фальваркі Бабры, Буцёўшчына і Сліваўшчына, а таксама лясное ўрочышча Бубліны.

Самы вялікі з фальваркаў - Бабры (каля 500 гектараў) ляжаў каля ракі Дзітвы. Меў комплекс драўляных будынкаў ў пасрэдным стане. Тут сеялася жыта, меліся мокрыя лугі, якія пераходзілі каля ракі ў чарот. Кіраваў фальваркам Багатыровіч. Ён быў з тых, пра якіх пісала Ажэшка ў сваёй кнізе "Над Нёманам". Мешаны лес з перавагай хвойных дрэваў, у асноўным сасны. У лясах тры багністыя азярцы з цвёрдым дном - каралеўствы дзікіх качак. Асаблівасцю Баброў было гняздо чорных бацяноў у лесе. Назва фальварка з'яўлялася рэхам старых часоў - у XX ст. тут баброў ужо не было, і нават ніхто пра іх не памятаў. Дрэвы месцамі мелі да 120 гадоў узросту, і лес быў слаба высечаны.

Фальварак Буцёўшчына разам з лесам меў 50 гектараў і ляжаў за 5 км на захад ад двара. Меў драўляныя старыя будынкі. Зямля тут была дрэннай, але рос прыгожы сасновы лес. Фальварак прададзены добраму і стараннаму гаспадару Мікановічу.

Сліваўшчына ляжала за 11 км на поўдзень, у бок Ражанкі. Фальварак меў 60 гектараў. Атачалі яго самыя каштоўныя дубова-сасновыя стагадовыя лясы Ішчалны. Абавязкі лесніка выконваў стары служка, лагодны і добры чалавек Касцюкевіч. У фальварку меліся спаленыя будынкі, і потым ён быў ахвяраваны ўраду для вайсковых асаднікаў.

Нарэшце, астатнім адасобленым аб'ектам было ўрочышча Бубліны - 4,5 км на захад ад двара і 2 км ад Буцёўшчыны. Тут мелася 78 гектараў прыгожага соснавага лесу, які потым быў прададзены з-за неабходнасці пасляваеннага развіцця нашай гаспадаркі. Зямлю падзялілі паміж гаспадаркамі вёскі Мацяўцы.

30-ці гектарны фальварак Карысць - суцэльныя пяскі. Па непаразуменні ці з-за браку здаровага сэнсу быў узяты ў арэнду. Убогі арандатар плаціў малыя грошы, ці наогул нічога не плаціў.

На поўдзень ад фальварка знаходзілася лясное ўрочышча Карысць - прыгожы сасновы бор з мачтавымі дрэвамі. Пасля падзелу, фальварак выконваў ролю спадчыннай сядзібы Вітольда Лясковіча[13], які, аднак, падчас наездаў жыў у Ішчалне.

Фальварак Баяры меў 200 гектараў зямлі пад жыта і бульбу, а таксама лугі. Кіраваў тут Чачот, як і іншыя кіраўнікі фальваркаў - Багатыровіч і Мікановіч - ён быў засцянковым шляхціцам. Драўляныя будынкі тут доўгі час не рамантаваліся і знаходзіліся не ў лепшым стане. Баяры былі прададзены. Лес урочышча Баяры ўспадкаваў Уладзіслаў Лясковіч. Абшар лясоў большы, чым ў Карысці, але лясы больш слабыя. Падобным

[13] Лясковіч Вітольд Станіслававіч [1891, Вільня - 5.4.1941, ГУЛАГ]. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Да арышту жыў у сваім маёнтку ў Лідскім пав. Віленскай губ. Арыштаваны 27.9.1939. Асуджаны 9.1.1941 асобай нарадай НКВД як "сацыяльна-небяспечны элемент" да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з лагераў НКВД Комі АССР. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Гарадзенскай вобл. - *Л. Л.*

было ўрочышча Вады - простакутнік у 200 гектараў.

Урочышча Навіны належала ўсім траім спадкаемцам. Мела самыя старыя дрэвы - у асноўным сосны і ёлкі да 1 м ў дыяметры.

Урочышчы Валоўшчына і Могілкі мелі якасна найгоршыя, пераважна лістоўныя лясы. Шмат грабу, які ў нашых геаграфічных шыротах рос дрэнна і не быў карысным дрэвам.

Фальварак Прэйцы складаў адзінае цэлае з Ішчалнай. Меў пясчаную зямлю і шмат лугоў.

І нарэшце сама Ішчална, тут зямля была высокай якасці. [...]

**Выкапні**

Найбольшым багаццем Ішчалны быў мяргель, пра які пісаў "Слоўнік геаграфічны". Знаходзіўся адразу пад дзёрнам, і яго капалі як гліну, потым фармавалі ў цэглу і гасілі на вапну. Такім чынам атрымлівалі вапну высокай якасці. Яна выкарыстоўвалася як пры будаўніцтве, гэтак і ў якасці ўгнаення для сельскай гаспадаркі. Як рошчына, ужываўся ў свой час пры будаўніцтве шэрагу касцёлаў у суседніх мястэчках. Нягашаная, выкарыстоўвалася для пабелкі будынкаў. Адкладанні мяргелю цягнуліся уздоўж Ішчалнянкі і зноў выходзілі на паверхню прапз 2 км у Ішчалнянах.

Ва ўрочышчы Навіны і каля яго меліся залежы гліны [...]

У 1923 г. выкапнямі Ішчалны зацікавілася група лясных прамыслоўцаў з інжынерам Корзанам (віленцам) на чале. Яны знайшлі жалезную балотную руду, якая не мела вялікай прамысловай каштоўнасці, але ўплывала на склад вады ў крыніцах каля Навінаў. З'явіўся план пабудовы санаторыя ў Ішчалне. Мы аднесліся да плана без усялякага энтузіязму, і пасля ўсіх падрахункаў план не быў прыняты. [...]

**Лес**

Лясы Лясковічаў займалі 1 500 гектараў і складаліся з дрэваў усіх гатункаў. Тут раслі ўсе віды ягад, грыбоў і арэхаў, якія меліся на геаграфічнай шырыні Ішчалны. Аднак па абшарах маёнтка лясы размяркоўваліся няроўна.

У сасновых і саснова-дубовых барах расло шмат сапраўдных грыбоў (баравікоў). Найбольш іх было ва ўрочышчы Баяры, нераз адтуль за 4 гадзіны збору грыбоў (з 7-й да 11-й) 4 чалавекі прывезлі 1060 баравікоў. Атрымлівалася больш за 1 баравік у мінуту на кожнага грыбніка. Грыбнікамі былі кузэн Юльян, яго жонка - варшавянка, фурман Фелікс і старая няня.

Найменш баравікоў расло ў ліставым урочышчы Валоўшчына і ў Вадах - мешаным лесе з вялікай колькасцю старых елак. [...]

За некалькі гадоў пасля Першай сусветнай вайны на абшары Навіна былі высаджаны сосны. Акрамя іх тут густа выраслі бярозкі і ляшчына. Гэты лес рос на другім баку тракту і быў бліжэйшым да двара. Мы ніколі не хадзілі туды па грыбы. Але, неяк мая сястра Ева, вяртаючыся дахаты, прайшла праз гэтую частку ўрочышча (каля 30 гектараў) і знайшла там пад кустамі ляшчыны шмат баравікоў. У 1936-1939 гг. гэты лес стаў крыніцай грыбоў як для двара, гэтак і для інтэрната прафесійнай школы, які стаяў паблізу.

На больш слабай глебе Ішчалны, прылеглай да Прэйцаў, з часоў Першай сусветнай вайны захаваліся бярозавыя і сасновыя зараслі. Некаторыя нават былі далучаны да сапраўднага лесу. Тут, у маладняку, раслі падбярозавікі і чырвонагаловыя падасінавікі. Раслі яны ў такой колькасці, што грыбнік павінен быў ісці па адмысловым маршруце, каб збіраць толькі лепшыя грыбы. Дарэчы, калі збор баравікоў называўся "грыбабранне" ці "збор грыбоў", дык падбярозавікі і падасінавікі не збіралі, а "рвалі". Калі на вячэру планаваліся грыбы, а часу заставалася мала, кухар казаў дзяўчыне:

- Зоська, скоч, нарві грыбоў!

А летам за сталом рэдка збіралася меней за 15 асобаў.

Тут жа, у сасновым маладняку Прэйцы таксама раслі рыжыкі. Не памятаю, каб калі збіралі зялёнкі, свінушкі, шампіньёны. Аднак калі-нікалі прыносілі з лесу масьлякі ці курачкі. А ў больш адлеглых лясах, такіх як Бабры, Сліваўшчына, Карысць ці Бубліны грыбы збіраліся вельмі рэдка. [...]

Ляшчына і арэшнік раслі ва ўсіх нашых лясах. Аднак сапраўдны рай быў у Сліваўшчыне. Штогод, у першай палове верасня мы выязджалі сюды, па арэхі (11 км ад двара). Госці і старэйшыя гаспадары сядалі на вазы-драбіны, а моладзь гарцавала вярхом. Конных было столькі, колькі мелася ў маёнтку сёдлаў, а ўсе сёдлы былі мужчынскія (з-за ваенных часоў не захавалася аніводнае дамскае сядло). Мелі адно англійскае, адно афіцэрскае аўстрыйскае, адно рускае і два канадскія-жаўнерскія). Гэта былі прыемныя і радасныя выправы. Неяк адна з кузінаў, тып Баські Валадыеўскай[14], гэтак прыціснула на сваім кані, што конь англійскай пароды мусіў пераскочыць цераз паваленую на тракце бярозу ... у выніку Ванда Астрамецкая вылецела з сядла, але ўсё абышлося.

Плёнам гэтых выправаў звычайны былі два поўныя арэхаў стокілаграмовыя мяшкі ад збожжа. [...]

**Дрэвы**

Пушчы Ішчалны, Шчучына, Жалудка, Вялікага Мажэйкава і Гурнофеля межавалі паміж сабой і адначасова зліваліся ў адзінае цэлае, ствараючы разам з дзяржаўнымі лясамі велічэзны лясны комплекс.

Дзядзька і апякун малагадовых сясцёр Важынскіх (Станіслаў Грабоўскі - *Л. Л.*) любіў лес і не быў ласы на грошы. Яго лясы былі вялікім рэзервам дасканалага старога дрэва. Купцы лесу - яўрэі з цікавасцю глядзелі на гэтыя лясы і моцна марылі, выцерабіўшы іх, напоўніць свае гаманцы. Неаднаразовы прыязджалі на пера-

[14] Гераіня рамана Сянкевіча. - *Л. Л.*

мовы, пасля якіх граф Грабоўскі кожны раз выязджаў з імі аглядаць масівы лесу, і кожны раз спакой лесу настройваў яго на сузіранне вечнасці, і ён адмаўляўся. Лес, некрануты сякерай заўсёды аказваў на яго больш моцнае ўздзеянне, чым прывід грошай. Таму купцы заўсёды ад'язджалі ні з чым, і чарговы раз уздымалася яго слава добрага гаспадара. Таму мажэйкаўскія і ішчалнянскія лясы ў ваколіцах моцна адрозніваліся ад іншых.

Швагер Грабоўскага, Баляслаў Важынскі, карцёжнік і шалапут, не шкадаваў лес. Прадаў на высечку вялікі кавалак Навін, але ніякія даходы не маглі нагнаць ягоныя даўгі. Скончыў трагічна, пра што я ўжо пісаў. Граф Станіслаў Грабоўскі змог прышчапіць замілаванне да прыроды ўсім сваім пляменнікам (дзецям сёстраў). Калі яны перанялі кіраванне маёнткам у свае рукі, дык маглі раскашаваць у спакоі, які ім пакінуў дзядзька, але і не думалі мяняць яго на манеты ці банкноты. Трыццаць гадоў сякеры не было чутно ў нашых лясах. Мачтавыя сосны спакойна раслі пад аблокі. Былі ў нас дрэвы мятровага дыяметра, якія памяталі караля Яна III і дажылі да 1939 г.

Першы вялікі і нешчаслівы кантракт на продаж 40000 старых дрэваў падпісалі сёстры Важынскія ў 1913 г. Прыйшла вайна і дэвальвацыя. Купец Стычынскі зарабіў на гэтым мільённую маёмасць, а гаспадыні не атрымалі нічога. У 1918 г. мусілі прадаць 75 гектараў дубу ў Сліваўшчыне, але фінансавы вынік быў такім жа. Гэтак Ішчална страціла большасць каштоўнага дрэва.

**Звяры**

За 30 гадоў да 1915 г., усе абшары паненак Важынскіх, перад усім лясы, былі сапраўдным раем для звяроў і птушак. За выняткам дробнага расходу дрэва на будоўлю і абагрэў памяшканняў, а таксама рэдкага палявання на звяроў для палацавай кухні, гэтыя лясы можна было лічыць сапраўдным запаведнікам ці нацыянальным паркам. Кузіны Важынскія катэгарычна забаранілі паляваць і наогул забіваць звяроў на ўсіх абшарах свайго маёнтка, пры гэтым іх лясная служба падкормлівала звяроў зімой і бараніла іх ад браканьераў ... Таму ішчалнянскія лясы напоўніліся зверам і птушкамі, было тут мноства вавёрак, рабчыкаў, ласёў, куніц і нават трошкі гарнастаяў. Але, як бывае, у наступныя часы былі знішчаны даробкі папярэдніх пакаленняў, і кожнае новае пакаленне ўсё пачынала з чыстай старонкі.

Першая сусветная вайна прынесла пагібель для звяроў, якіх гадавалі сёстры. Ішчална мела асаблівую ўвагу з боку нямецкіх акупантаў. Немцы прымушалі людзей ладзіць для сябе аблаву і палявалі з парушэннем усіх тэрмінаў і звычаяў палявання. Здабывалі як можна больш мяса і скур для арміі.

Пачатае акупантамі ў 1915 г. выбіванне звера прывяло да таго, што ў лясах не засталося аніводнага аленя ці лані, і нават заяц стаўся рэдкасцю. А пасля зыходу немцаў іх працу працягнулі мясцовыя браканьеры. Найлепш перажылі ліхія часы дзікі, ваўкі і лісы [...]

**Рыбы**

Двор знаходзіўся пры збегу двух водастокаў. На поўнач, з Прэйцаў, цёк ручай (не меў назвы) ..., у канцы парку на гэтым ручаі меўся малы стаў з паверхняй у палову гектара. Тут гадаваліся карпы і карасі. Такі сабе падручны запас рыбы. Перабегшы грэблю, ручай далей цёк праз луг да наступнага става, у які ўпадала значна большая за ручай рэчка Ішчалнянка. Такім чынам гэты ручай з'яўляўся прытокам Ішчалнянкі, якая ў сваю чаргу, перад грэбляй Станіславаўскага тракту Гародня - Ліда (яго таксама звалі Кацярынінскім), стварала яшчэ адзін стаў. Некалі, сто гадоў таму, за грэбляй мелася кола млына, якое прыводзіла ў рух фолюш. Але той стаў даўно высах, на яго дне добра расла капуста, а каменны будынак фолюша ператварыўся ў руіны.

Галоўны стаў у 4 гектары з'явіўся ў выніку двухкратнага перагароджвання Ішчалнянкі грэблямі і меў форму васьмёркі. Ніжняя палова мела форму прастакутніка і стварала асобны стаў, люстра якога вясной і восенню была цалкам чыстым, а летам месцамі зарастала водарасцямі. Гэтая палова ўжывалася для спорту - тут лавілі рыбу на вуды і спінінгі, плавала лодка, меўся пляж з мастком. Тут было каралеўства шчупакоў, акунёў, лінёў, ляшчоў і плотак.

Верхняя палова става мела размытыя контуры і меншую глыбіню і таму цалкам зарасла чаротам. ... Ішчалнянскі стаў даваў да 300 кг рыбы ў год [...]

Рэчка, якая выцякала з памежжа ўрочышчаў Навіны і вёскі Кямянцы, у далейшым цячэнні праходзіла праз вёску Ішчалняны. Там меўся вясковы млын. Адсюль рэчка паварочвала да Вялікага Мажэйкава, дзе на яе рэчышчы была пабудавана электроўня маёнтка. Пасля электроўні рэчка цякла ў бок чыгункі.

**IV. Гаспадаранне на абшары**

Абшары Ішчалны ляжаць уздоўж рэчкі Ішчалнянкі.

Пасярод палёў на высокім пагорку прыгожа стаіць бачны здалёк барочны касцёл, званы якога далёка разносяць урачыстыя і мілыя сэрцу гукі, якія аднак, толькі падкрэсліваюць вясковую цішыню. Каля касцёла, у яго цені, месціцца плябанія з балконам, які выходзіць на пагорак з садам. Плябанія мураваная, двухпавярховая, прыстасаваная для з'ездаў на адпусты і вакацыі клірыкаў, яна заўсёды гатова гасцінна адчыніць свае дзверы. За касцёлам стаіць старая драўляная плябанія, яна адрамантавана, і тут месціцца прытулак для старых, ксёндз Красадомскі аддаў старым і свой сад. Акрамя саду мецца гарод і над самым ручаём вясковая лазня з парылкай.

Далей, па левым беразе рачулкі, праз палову кіламетра, наступным пагорак трохі ніжэйшы. Ён штучна падвышаны, і на ім пабудаваны добры, вялікі, дбайна атынкаваны і пабелены жылы мураваны дом. Перад домам традыцыйны круглы газон з дарогай вакол яго. У правы бок ад газона - скарбец, у левы - афіцына.

На спуску з пагорка - цугавая стайня, сабакарня і кузня, яшчэ ніжэй мост над ручаём, а за ім плоскі, вялікі майдан з усімі гаспадарчымі будынкамі і вялікім домам для служкаў фальварка.

Усе будынкі тонуць у моры зеляніны, якое ствара прыгожы парк і сад. Сад перасякае старая алея, якая вядзе да касцёла. Другі парадны выезд з двара вядзе каля стайні і сабакарні на грэблю праз стаў з млынам, а потым праз старую алею з елак да старога тракта эпохі караля Станіслава-Аўгуста. Да пабудовы новай шашы ў 1910-я гг. гэты тракт з'яўляўся галоўнай дарогай паміж Лідай і Гародняй. Таму каля тракта маецца будынак старой коннай пошты ў якім месціцца прафесійная школа для дзяўчат. Насупраць жылога дома-палаца выкапаны стаў з усімі прыемнасцямі: лодкай, рыбалоўствам, пляжам. Большасць будынкаў двара мураваная. [...]



***Напалеон Орда. Ішчална. Сядзіба Лясковічаў, XIX ст.***

### V. Вопіс гістарычнай забудовы

### Жылы дом

Каля 70 гадоў стары дом (скарбец) выконваў ролю жылога дома. Будоўля новага дома, разам з назапашваннем матэрыялаў цягнулася доўгія гады. Наш жылы дом праектаваў той самы архітэктар, які праектаваў і будаваў палац у Паперні, што каля Ваверкі (падобна гэта быў італьянец, фамілія яго страчана) і пасля праектавання мой прадзед пачаў збіраць матэрыялы. За некалькі гадоў была абпалена цэгла і выбраныя яе лепшыя экзэмпляры для будаўніцтва дома, горшыя пайшлі на афіцыну, гаспадарчыя будынкі і агароджу. Адначасова нарыхтоўвалі і гасілі ў ямах вапну. Нарыхтоўвалі і пілавалі лясныя матэрыялы: лепшыя лістоўніцы і сосны на бэлькі, кроквы і падлогі, а дуб на дзверы, вокны, панелі і паркет. Купляліся адмысловыя завесы, спружынныя замкі на дзверы, вялікія, стылёвыя клямкі, металічныя часткі для камінаў, кухонных, пакаёвых печак і пліт. З Навагрудка вязлі кафлю. З рахункаў таго часу вынікае, што са Сліваўшчыны прывезлі лепшае дубовае дрэва, якое сушылася 8 гадоў. Будоўлю закончыў ў 1808-10 гг. харунжы Лідскага павета Караль Лясковіч. У выніку атрымаўся не палац, а малы палацык ў стылі ампір (класіцызм).

Дом у Ішчалне ніколі не перабудоўваўся, а дзверы і вокны былі зроблены настолькі якасна, што і ў 1939 г. нідзе не было шчыліны. Адначасова прадзеды рыхтавалі і ўнутранае начынне дома, і таму хутка, у 1813[15] г. маглі ўжо тут прымаць цара Аляксандра I, які спыніўся і слухаў у доме, як грала на арфе дачка гаспадароў.

Дом быў пабудаваны вельмі грунтоўна. Вонкавыя сцены мелі таўшчыню 90 см, унутраныя - 70 см. Сцены знутры былі абшыты дубовымі панелямі, і іх агульная таўшчыня дазваляла цалкам схавацца адчы-




***План палаца, да 1939 г.***

[15] Памылка, у 1812 г. - *Л. Л.*



***Палац, 1927 г.***



***Палац, да 1939 г.***

неным двухстворкавым дзвярам.

Па звычаі таго часу жылы дом пафарбавалі ў белы колер. Не гледзячы на вялікую моц крокваў, не ўжылі ні дахоўку, ні бляху, а толькі гонту. Белізна дома адцянялася шэрым гонтавым дахам, і дом выглядаў вельмі прыгожым як улетку, на фоне зяляніны, гэтак і залатой восенню і нават пры свецe месяца на чорным тле неба. Аднатыпна з ім былі пафарбаваны і пакрыты таксама скарбец і афіцына.

Жылы дом меў 14 пакояў, сені, калідор, два складскія памяшканні, веранду, два ганкі. Ва ўнутраным плане дом меў дзве анфілады, якія ішлі праз увесь будынак, і таму дом як быццам падзяляўся на дзве розныя часткі - прадстаўнічую і жылую.

У прадстаўнічай частцы меўся: перадпакой, салон, малы салон (круглае памяшканне з нішамі, у якія ўбудаваны невялікія канапы), васьмікутны гасцінны пакой, кабінет, буфетная, прастакутная зала для більярду, пакой для карцін і круглая сталовая. Салон і сталовая акрамя печаў мелі каміны.

Жылая частка была падзеленая калідорам, які вёў на другі ганак. Кожная палова жылой часткі складалася з трох пакояў.

Рухомасць у доме буду апісваць па стане на 1939 г., бо ўсю мэблю разрабавалі і знішчылі падчас Першай сусветнай вайны. З даваеннага часу ацалелі толькі адзінкавыя рэчы, а менавіта: некамплектны салон у стылі Людовіка XV, вялікае венецыянскае люстра, адзін круглы мармуровы стол і адзін стол з арэхавага камплекту, раскамплектаваная спальня, два гадзіннікі XIX ст. (адзін стаячы, шафавы, другі камінны, бронзавы з эмаллю), дзве пашкоджаныя хрустальныя жырандолі, пашкоджаная арфа Францішкі Лясковіч і восем сямейных партрэтаў, сярод іх партрэты Францішкі і яе мужа Антона Важынскага.

У міжваенныя часы 1922-39 гг. акрамя адзінкавай мэблі, як напрыклад: фартэпіяна, старога гданьскага буфета, бібліятэчнай шафы, атаманкі, ложка, стала, крэсла, былі набыты тры камплекты мэблі, а менавіта: спальня чырвонага дрэва, дубовы сталовы набор, ясеневы кабінет і выкананы на замову масіўны кабінетны камплект з гербамі Лясковічаў. Уся мэбля знікла ў 1939 годзе.

**Тэхнічны вопіс жылога дома.**

Дах - вельмі стромкі, гонтавы.

Паддашак - высокі, прасторны з вялікімі комінамі.

Муры - вонкавыя сцены - 90 см, унутраныя - 70 см.

Бэлькі столі - сістэмы Даэрфля, густа пакладзеныя драўляныя бэлькі (36 x 36 см), выкананыя з старога прафіляванага сасновага дрэва.

Столь - гладка патынкаваная, без жывапісу, з гзымсамі ў стылі эпохі. Вышыня - 3,3 м.

Сцены - да 1914 г. у габеленах, пасля 1919 г. маляваныя, клеявыя.

Падлогі - паркет у памяшканнях 5, 6, 7, 9, 12, 14, 15; дошкі ў памяшканнях 4, 10, 16, 17, 23, 24, 25; каменныя пліты ў памяшканні 2; цэгла ў памяшканнях 3, 18, 20.

Дзверы - двухстворкавыя, высокія, масіўныя, таўшчынёй 5 см, з сухога дубу (як і ўсе дубовыя кампаненты ў доме, сушыўся 8 гадоў). ...

Вокны - разам з акяніцамі, дубовыя, двухстворкавыя з засаўкамі. Унутраныя вокны вымаліся, а на зіму мацаваліся адмысловымі шрубамі.

Дубовыя панелі - у вокнах і на сценах да вышыні 2 м - памяшканне 14, у фрамугах дзвярэй - памяшканні 2, 4, 5, 6, 7, 12, 14, 15, 16, 17, 23, 24, 25.

Убудаваныя шафы: памяшканне 4 - для запасаў жыўнасці, памяшканне 7 - у ватэрклазеце, памяшканне 15 - для вопраткі, памяшканне 16 - на акты і гаспадарскія кнігі, памяшканне 23 - для шлафрокаў, піжамаў, бялізны.

Печы - з белай кафлі, высокія, у памяшканнях 2 - 4, 5, 6, 7, 9 - 10, 12 - 14, 15, 16, 17, 24, 25.

Каміны - 5, 14.

Драўляныя сходы - пакой 11, спіральныя, вядуць у кухню, якая месцілася ў піўніцы, 19 - на паддашак, простыя.

Ганкі - памяшканне 1 (галоўны пад'езд). Бетонныя сходы. Перад калонамі дзве добрыя лаўкі. Памяшканне 13 (веранда) абсаджана дзікім вінаградам, тут месціліся стол, 2 лаўкі і крэслы. Сходы ў парк бетонныя.

Піўніцы. Пад домам піўніцы займалі 60 %, каля 400 м$^2$.

Перад галоўным ганкам меўся пад'езд, узмоцнены апорным мурам.

**Парафільяны касцёл**

Гістарычная інфармацыя пра заснаванне касцёла, якую я маю, не заўсёды супадае. Сулістроўскі ў сваім "Слоўніку мясцовасці" падае, што гэты касцёл у 1515 г. пабудавалі Ліманты, а касцельныя крыніцы заснавальнікам касцёла лічаць Андрэя Давойну ў 1514 г. На падставе вывучэння ішчалнянскага архіва і парафіяльных кніг маю права сказаць, што сапраўдную інфармацыю падаюць крыніцы касцёла.

Першым уладальнікам Ішчалны, як я і пісаў пра гэта вышэй, быў Якуб Давойна (Война ці Вайновіч). Яго сына Андрэя ў самых старых дакументах завуць Андрэем Якубавічам Вайновічам. Можна лічыць, што касцёл фундаваны менавіта ім, бо якраз у той час касцёлы і цэрквы будаваліся і ў суседніх маёнтках: Голдаве, Малым Мажэйкаве і інш. Інфармацыя Сулістроўскага не абапіраецца на крыніцы і з'яўляецца вельмі фрагментарнай.

Касцельныя хронікі былі больш дакладнымі, яны кажуць, што першы драўляны касцёл у Ішчалне стаяў на тым самы месцы, на якім у XVIII ст. быў пабудаваны



***Касцёл, сучасны выгляд***



***Сонечны гадзіннік каля касцёла***



***Плябанія, сучасны выгляд***

мураваны, якраз вакол драўлянага касцёла пачало расці мястэчка Ішчална, ліквідаванае падчас зямельнай рэформы 1861 г.

Зараз ужо не памятаю, што казала касцельная хроніка пра акалічнасці, з-за якіх драўляны касцёл быў заменены на мураваны - пажар ці тэхнічная смерць. Умураваная ў левай сцяне касцёла шыльда, з паліраванага ружовага граніту, аздобленая гербамі фундатараў, нічога не кажа пра гэта. Яна падае, што Юзаф і Мар'яна (з Вянскевічаў) Валі за ўласныя грошы і з Божай дапамогай пабудавалі гэты касцёл у 1758 г. і просяць маліцца за спакой іхніх душаў. І больш нічога.

Вялікі касцёл пабудаваны ў стылі барока, і ў ім падчас набажэнства хапала месца для ўсіх парафіян. Касцёл выкладзены каменнымі плітамі і дастаткова ўпрыгожаны знутры. У прэзбітэрыюме маюцца 2 лаўкі калятараў, левая (калі глядзець з боку алтара) для дзедзічаў Ішчалны, а правая для ўладальнікаў Вялікага Мажэйкава. Акрамя кавалка зямлі ў некалькі гектараў пад касцёл, парафія мела 30 гектараў аграрнай зямлі на мяжы Ішчалны і Вялікага Мажэйкава, гэта зямля была выдзелена пароўну ад абодвух маёнткаў.

У Вялікім Мажэйкаве таксама стаіць капліца[16], філіяльная да Ішчалнянскага касцёла. Капліца фундавана ў XVIII ст. графам Хадкевічам. У святы, калі набажэнствы ў капліцы не адпраўляліся, уладальнікі і жыхары Вялікага Мажэйкава прыязджалі ў Ішчалну.

Прыгожы ішчалнянскі касцёл пабудаваны на маляўнічым узгорку, здалёк бачны і мае шэраг цікавых асаблівасцяў.

Па-першае - ён з'яўляецца указальнікам дарогі для пералётных птушак. Кожны жураўліны клін заўсёды робіць над касцёлам кола, пасля чаго змяняе напрамак свайго палёту, схіляючыся ўлева.

Другая асаблівасць - падземны могільнік пад алтаром з трунамі пробашчаў касцёла і правая крыпта, якая з'яўлялася склепам для ўладальнікаў маёнтка. Касцёл стаіць на вапнавым грунце з-за чаго парэшткі пад

[16] Першапачаткова, гэта капліца была грэка-каталіцкай, філіяльнай да Маламажэйкаўскай царквы-крэпасці - *Л. Л.*

зямлёй не разлагаюцца, а толькі высыхаюць, гэтак жа, як у падзямеллях віленскага касцёла дамініканаў.

У бакавой крыпце ляжалі ў трунах забальзамаваныя целы дзедзічаў. У часы Першай сусветнай вайны гэты склеп быў апаганены рознымі нелюдзямі, якія з-за цікавасці і ў пошуках золата адмыкалі труны. Каб гэтага больш не паўтарылася, было вырашана труны закапаць. У 1922 г. пасля пераходу маёнтка ў нашыя рукі мы зрабілі продкам другое, на гэты раз для ўсіх адначасовае, пахаванне.

Перад пахаваннем усе труны былі яшчэ раз адчынены, целы сфатаграфаваны і пасля ўрачыстага набажэнства, жалобна перанесены ў падзямелле, і труны пахаваны. Я сам асабіста браў удзел у пахаванні. Таму хачу расказаць пра тое, што бачылі мае вочы.

У дзвюх самых старых трунах спачывалі старэйшыя Валі - Юзаф і Мар'яна. Ён мужчына сярэдняга росту з моцнай фігурай, апрануты ў кунтуш і ялавыя карычневыя боты. Дасканала захавалася не толькі скура на галаве, валасы і развесістыя вусы, але нават агульны выраз твару. Твар Мар'яны моцна зморшчыўся, на галаве шаль з далікатных брабанскіх карунак. Атласная доўгая сукня колеру выцвілага фіялету і ніякіх упрыгожанняў. На твары разліўся выраз спакою і лагоднай пакорнасці.

Наступная пара - гэта іх сын Юзаф з жонкай Агнешкай з Шукевічаў. Шчуплы мужчына сярэдняга ўзросту ў цёмным сціплым убранні, пашытым па тагачаснай модзе. Стан парэшткаў горшы, чым у бацькі, месцамі бачна цвіль. Яго жонка - невялікая кабета з вострым профілям. Не звярнуў дадатковай увагі на яе строі і на строі яе роднай сястры Элеаноры, пахаванай каля свайго мужа Караля Лясковіча ў трэцяй пары трунаў. Караля пахавалі ў мундзіры віца-маршалка павета з шэрагам вялікіх гузікаў. На гузіках расійскі арол з напалову ўзнятымі крыламі па ўзоры, прынятым падчас панавання цара Аляксандра I. На мундзіры сляды некалі вышытай золатам партупеі для шпагі. Шпагу скралі раней. Наогул, Караль Лясковіч быў высокім мужчынам, не меншым за 190 см з вузкай галавой і вузкім чэрапам.

Усе целы ў параўнанні з іншымі часткамі парэшткаў, мелі ненармальна ўзнятыя жываты, напханыя травой. На ўсіх захавалася ў цэласці скура і валасы. Не на адным твары не павылазілі на паверхню косткі.

У той час я яшчэ не ведаў змест архіваў, і імёны на таблічках мне нічога не казалі. Таму найбольшую ўвагу прысвяціў адзінай вядомай мне на той час асобе сярод уладальнікаў Ішчалны - свайму прадзеду, поўнаму цёзку Каралю Лясковічу, якога я гэтак незвычайна перапахаваў праз сто гадоў пасля яго смерці.

Здымкі нябожчыкаў былі зроблены адным з сяброў майго кузэна Юльяна Лясковіча. Не ведаю пра іхні лёс і не ведаю, ці існуюць здымкі сёння.

Перад пахаваннем я разам з работнікамі зайшоў ў падзямелле касцёла, каб выкапаць долы. На глыбіні 25 см мы знайшлі старыя труны. Дзе б мы не пачыналі капаць яны былі паўсюдна - пакладзены адна каля другой. Гэта спачывалі ранейшыя пробашчы нашага касцёла. Трухлявае дрэва лёгка пасоўвалася, і я зняў некалькі дошак. Пры святле газнічкі ўбачыў высахлыя парэшткі ў сутанах і доўгіх ботах. На абутку ўжо струхлела дратва, і па швах зрабіліся шчыліны, тканіна сутан страціла свой першасны колер і была выцвіла-карычневай. Аналагічна, як і ў нашых продкаў, таксама на ўсіх целах захавалася скура, валасы і высахлае мяса.

Магчыма, целы ўладальнікаў Ішчалны не бальзамаваліся, і на ўсе парэшткі падзейнічала гэтак званае арганічнае бальзамаванне, перад пахаваннем з іх толькі выдалілі вантробы і напхалі травамі. Гэтага не рабілі з целамі пробашчаў. Скура на парэштках была дымна-карычневага колеру, як быццам яе павэндзілі, і яна лёгка ірвалася, падобна як старая скура звера ці абутку. На парэштках пробашчаў я таксама не ўбачыў костак.

Далейшыя пошукі палічыў немагчымымі, мы зачынілі вечкі, уладкавалі зрушаныя труны і засыпалі іх зямлёй, пасля чаго выраўнялі агульны ўзровень грунту.

Назаўтра, пасля жалобнага набажэнства, мы пачарзе перанеслі труны продкаў і паставілі на грунт паверх магілаў пробашчаў. Прысыпалі труны тонкім слоем зямлі, якой хапіла, каб толькі трошкі прыкрыць вечкі.

На падставе агляду пахаваных парэшткаў маю права лічыць, што целы продкаў не павінны былі разлагацца далей. Калі пасля 1939 г. труны зноў не апаганілі, дык яны і зараз спачываюць у тым самы стане ў левай палове касцельнага падзямелля, там, дзе мы іх пахавалі.

**Скарбец**

Барочны будынак гэтак званага "скарбца" планаваўся як жылы дом. Быў пабудаваны ў 1743 г. тагачасным уладальнікам Ішчалны Янам Валем, старастам фрэйданскім. Замена ранейшага драўлянага дома стылёвым і мураваным сведчыла пра важкасць і заможнасць роду. Ян Валь закончыў справу пабудовы ў канцы свайго жыцця. Пасля яго смерці заможнасць і глыбокая каталіцкасць роду была яшчэ выразней падкрэслена яго сынам Юзафам, які разам з жонкай з Вянскевічаў пабудаваў барочны гмах парафіяльнага касцёла ў Ішчалне.



***Скарбец, каля 1920 г.***

Будынак скарбца складаўся з піўніц, першага паверха і фацыяты[17]. Уверсе, на мураваным шчыце мелася дата A.D. 1743. Пад надпісам, над уваходам у дом быў балкон з жалезнай агароджай, на якой меліся ініцыялы "s.J.W.f." (Ян Валь, староста фрэйдански), балкон мацаваўся на чыгунных бэльках. Выйсці на балкон можна было з фацыяты.

Пасярэдзіне першага паверха меўся хол з уваходнай пляцоўкай і сталовая. Па баках хола знаходзіліся жылыя пакоі, якія потым памянялі сваё прызначэнне. У фацыяце былі 4 спальныя пакоі для гаспадароў і гасцей. Разам дом меў 10 пакояў, злучаных з холам. У піўніцах столь трымалі моцныя нервюры з цэглы на вапне. Гэтыя цагліны былі вялікага памеру - большыя, чым стандартная цэгла XX ст. Муры сцен тоўстыя, у тры цагліны, г. зн., каля 90 см, а ўнутраныя сцены 75 см.

У піўніцу можна было ўвайсці праз двое моцных, дубовых дзвярэй. Адзін уваход у піўніцу быў з падворка, праз дзверы ў ганку, далей, уніз вялі цагляныя сходы. Другі ўваход меўся са шчытавой сцяны будынка, адсюль быў уваход у ніжнюю піўнічную залу, геаметрычна яна цалкам паўтарала верхнюю залу скарбца.

Галоўны ўваход на першы паверх замыкаўся аднастворкавымі дзвярамі з тоўстых дубовых дошак, збітых вялікімі цвікамі ручной кавальскай работы. Таксама ручной кавальскай работы былі і завесы, засаўкі і вялізны замок XVIII стагоддзя.

У часы Валяў у піўніцы месцілася кухня, адсюль наверх можна было падняцца па сходах. Верагодна, тут жа была і чалядная. Іншыя памяшканні ў піўніцах выкарыстоўваліся як склады. Аднак, адна левая, тыльная, вонкавая піўніца з моцнымі дзвярыма служыла цямніцай і ўжывалася як пакой для арыштантаў. У валяўскіх інвентарах гэты пакой называўся "пакоем для свавольных людзей".

У часы Караля Лясковіча, які ў канцы жыцця займаў пасаду віца-маршалка павета і таму жыва ўдзельнічаў у публічным жыцці, у Ішчалне адбываліся гучныя з'езды павятовай шляхты. Пасля пабудовы новага дома, ранейшы пачаў выконваць функцыі збройні і афіцыны. Зяць Лясковіча Антон Важынскі меў пасаду маршалка Лідскага павета. Жонка ў пасаг прынесла яму Ішчалну, і ён узбагаціў свае зборы рэчаў культуры. Пры ім збраёўня-афіцына стала скарбцом. А для служкаў у левы бок ад новага дома і насупраць скарбца была пабудавана новая афіцына. На другім паверсе гэтай афіцыны чатыры пакоі і кухню займаў адміністратар маёнтка, а на першым паверсе жылі эканом і пісар.

На першым паверсе скарбца, управа ад уваходу, у адным з пакояў Антон Важынскі зрабіў бібліятэку і збор дакументаў, а ў астатніх пакоях першага паверха размясціў каштоўныя гістарычныя рэчы музейнага характару, у асноўным даўнюю зброю і латы. Пры неабходнасці тут жа жылі госці: больш паважаныя на першым паверсе, а меней паважаныя ў фацыяце.

Кухня і чалядная ў піўніцы сталі непатрэбнымі, і тут пры неабходнасці размяшчаліся слугі гасцей. У неабаграваных піўніцах набіраліся моцы старкі і віны. Падобна, што да адмены прыгону не пуставаў і пакой "для свавольных людзей".

Сын Антона Важынскага - Баляслаў, муж Марыі Грабоўскай з Вялікага Мажэйкава, нарабіў картачных даўгоў. Пасля адначасовай смерці сужэнцаў апеку і кіраўніцтва над маёнткам прыняў швагер, граф Станіслаў Грабоўскі. Выхаваннем сіротаў заняліся іх цёткі, і сіроты атрымалі выдатнае выхаванне і адукацыю, дзве з іх атрымалі навуковыя ступені дактароў. Не дзіва, што каштоўныя гістарычныя рэчы Ішчалны былі акружаны такой апекай і ўвагай, якой да гэтага не бачылі. Будынак быў цалкам перароблены і адрамантаваны, у выніку стаў скарбцом у сапраўдным сэнсе гэтага слова.

З-за таго, што зборы месціліся на першым паверсе, ва ўсе вокны піўніц і першага паверха былі ўстаўлены жалезныя краты. Доступ з кухні ў піўніцы на першы паверх быў замураваны. Паміж фацыятай і першым паверхам былі ўсталяваны моцныя, старанна акутыя жалезам, дубовыя дзверы. Таксама, над малой піўніцай (якая была паміж даўняй кухняй і арыштанцкім пакоем) вымуравалі сакрэтную камору для самых каштоўных рэчаў. Гэтая камора аказалася паміж піўніцай і першым паверхам, на месцы былых сходаў. Падлога першага паверха над каморай з каштоўнасцямі ўзнімалася толькі на якіх 60 см, тут зрабілі спальную нішу, і на ложак трэба было падымацца па дзвюх прыступках. Ложак закрылі парц’ерай, і таму выглядала ўсё цалкам натуральна. Моцныя дзверы ў камору скарбаў выходзілі на вузкую, цёмную лесвічную клетку (адсюль быў ход з першага паверха ў фацыяту). Дзверы глуха замуравалі, атынкавалі і пафарбавалі ў той самы колер, што і суседнія сцены.

Такім чынам атрымалася памяшканне вышынёй каля 2 м і памерамі 1,7 х 3 м. Частка гэтага памяшкання была аддзелена ад унутранай сцяны дадатковым мурам які хаваў сховішча, сцены сховішча ўзмацнілі стальнымі плітамі. Стальных пліт не было толькі з боку каморы, гэтую сцяну замуравалі наглуха, і каб патрапіць у сховішча, трэба было біць цэглу. [...]

У сакрэтнай каморы захоўвалі залатыя і срэбныя нумізматычныя калекцыі, старыя ўпрыгожванні, напрыклад, гузікі ад дэлій (плашч падбіты футрам - *Л. Л.*) і кунтушоў, запанкі з каштоўнымі камянямі, сыгнеты продкаў, ланцужкі, дыяментавая страла цара Аляксандра I, неапраўленыя дыяменты і каштоўныя камяні, залатая шкатулка і г. д.

У каморы скарбаў захоўвалася ўпрыгожаная золатам і бірузой карабеля[18], адпаведна забяспечаная ад карозіі, вялікі сервіз баранаўскай парцэляны, старасвецкія кубкі, кітайская і саская парцаляна, стары рын-

[17] Фацыята - паддашак, мансарда. - *Л. Л.*

[18] Карабеля - крывая шляхецкая парадная шабля ў XVI-XVIII стст., якую выкарыстоўвалі выключна для ўпрыгожвання шляхецкага ўбору - *Л. Л.*

граф[19], старыя каваныя алавяныя ці срэбныя начынні, каштоўныя хрустальныя і шкляныя вырабы, усе яны мелі вялікую гістарычную каштоўнасць.

Для маскавання пераробкі памянялі ўзроўні падлогі паміж холам і сталовай а таксама паміж сталовай і спальняй, паміж імі дадалі па дзве мармуровыя прыступкі. Пераробка была спраектаваная архітэктарам, які жыў у Францыі і трымалася ў сакрэце. Змена ўзроўню падлогі выглядала як фантазія архітэктара. Гэтакую пераробку можна было зрабіць з-за вялікай, 4-х метровай вышыні піўніцаў і 3,5-й метровай вышыні першага паверха.

Пакоі першага паверха выконвалі дзве функцыі - яны былі месцам захавання скарбаў культуры і палацыкам для годных гасцей. У правым пярэднім пакоі паставілі адмыслова дапасаваныя да памераў кніг стэлажы, тут жа стаяла бюро, мяккі фатэль і некалькі крэсел. На бюро стаяла лямпа, ляжалі каталогі, меўся прыбор для пісьма (у тым ліку і з гусінымі пёрамі).

У гэтым пакоі была бібліятэка, яе моцныя дзверы замыкаліся на ключ. У супрацьлеглым пакоі, улева ад хола, у куфрах захоўваліся лісты, інвентары і сшыткі спраў за некалькі стагоддзяў. Асобна, у ганаровых зашклёных кніжных шафах, ляжалі каралеўскія прывілеі і пяць слуцкіх пасаў.

У холе захоўвалася рыцарская зброя, на сценах задніх пакояў вісела іншая розная зброя. Акрамя таго, ранейшая сталовая, перароблeная ў гасціную, выконвала ролю аднaчасова чытальні, курыльні, пакоя для розных нарад і пакоя для картачнай гульні. Два бакавыя спальныя пакоі засталіся спальнямі, сюды была перанесена старая, каштоўная мэбля, турэцкая парча, персідскія дываны. Каштоўныя рэчы са скарбца з'яўляліся здабыткамі трох апошніх родаў, якія гаспадарылі ў Ішчалне: Валяў, Скарбак-Важынскіх і Лясковічаў. Зброя засталася ад Валяў і Важынскіх, кніжныя зборы ў асноўным ад Важынскіх, архівы збіраліся з пачатку XVI ст. Нумізматыка, упрыгожванні, парцаляна і інш. збіралася стагоддзямі. Ніводнага з гаспадароў Ішчалны ў XVII - XX стст. немагчыма вылучыць з шэрагу іншых калекцыянераў.

На жаль я ніколі не бачыў ішчалнянскіх збораў у непарушным стане. Мы атрымалі Ішчалну пасля кузынак Важынскіх. Першы раз я быў тут у 1921 г. пасля дзвюх войнаў - Першай сусветнай і Польска-савецкай, праз 2 гады пасля смерці апошняй уладальніцы. Чатыры гады вайны і адсутнасць гаспадароў - часу хапала для поўнага спусташэння.

У першы візіт я ўбачыў пусты дом з працякаўшым дахам, выгараўшы скарбец з моцна пашкоджанымі ад атмасферных ападкаў скляпеннямі.

Калі, вясной 1922 г., мы атрымалі Ішчалну, пробашч, мясцовы часовы кіраўнік і некалькі гаспадароў з суседніх вёсак вярнулі нам нешта з ацалелай мэблі, за гэта, відочна, мы адпаведна аддзячылі.

Аднак, мы атрымалі адзінкавыя рэчы, фрагменты былых камплектаў. З ацалелых дакументаў і рэшты рэчаў, з аповядаў даўніх служкаў Важынскіх, з зычлівай інфармацыі суседзяў, са шматразовых уважлівых аглядаў скарбца, праз дэдукцыю, я стварыў для сябе вобраз былога. Пэўна, гэты вобраз не дакладны, але ў асноўным правільны.

Як дайшло да пажару ў скарбцы, чаму згарэў разам з ім дом і які лёс мелі скарбы культуры, я напішу ў раздзеле пра Першую сусветную вайну.

### VI. Гістарычныя калекцыі

Найкаштоўнейшай часткай сваёй рухомай маёмасці ўладальнікі і ўладальніцы ўважалі зборы рэчаў культуры і гісторыі, якія тут знаходзіліся, найперш - старадрукі і архівы. Вялікую вартасць мелі гэтыя старыя кнігі, дакументы і лісты, бо яны адлюстроўвалі сваю эпоху. Як, напрыклад, гістарычная аповесць - мемуары Паска[20].

Да Першай сусветнай вайны кнігазбор, які налічваў тысячы тамоў, быў добра каталагізаваны і старанна захоўваўся. Пасля вайны засталося ледзь некалькі сотняў кніг. З архіва зніклі каралеўскія наданні і прывілеі.

У знішчэнні найкаштоўнейшых збораў пісьменства бралі удзел усе: рускія войскі, мясцовы людзі з двара і з бліжэйшых вёсак. Магчыма, невялікая частка кніг была забрана "на памяць", а можа нават і, "каб было што пачытаць". Магчыма, некаторыя рэчы трапілі ў рукі знаўцаў, але большасць была знішчана пры распальванні печаў, выкарыстана як папера для пакункаў альбо на цыгаркі.

З ваеннага пагрому 1914 - 1920 гг. не ацалеў ніводзін каталог, і таму мой аповед будзе абмяжоўвацца толькі тымі дакументамі, якія захаваліся і патрапілі пад маю апеку. І як гэтыя рэшткі дакументаў, аповед таксама будзе фрагментарным і неўпарадкаваным. А выкліканы ён не толькі прагай да аб'ектыўных гістарычных ведаў, але і пачуццём замілавання да нашага народа і яго гісторыі.

Я быў народжаны ў Расіі і пражыў там першыя 17 гадоў свайго жыцця, аднак выхоўваўся ў любові да Польшчы і ўзвышэнні ўсяго польскага. Таму працаваў з ішчалнскімі зборамі цэлыя дні і тыдні, але ж без ніякага плану. Шукаў дапамогі ў гісторыі польскай літаратуры - Ігнацыя Хржаноўскага, у трылогіі Сянкевіча, мемуарах Паска і ў гістарычных аповесцях Крашэўскага. Перачытаў шмат гэтай і падобнай літаратуры - усё што захоўвалася ў бібліятэцы. Я штудзіраваў старыя кнігі і дакументы, шматразова перачытваў тыя кавалкі, якія мне падабаліся і, дзякуючы гэтаму, праз столькі гадоў я ў стане цытаваць самыя цікавыя і характарыстычныя фрагменты. Але, на жаль, гэта толькі аматарскі аповед, а не навуковая праца.

Ішчалнянская бібліятэка была велічэзнай. Нават у тым, што ад яе засталося, я знайшоў польскія, лацінскія,

[19] Металічная пласціна з гербам ці выявай святога, якую рыцары насілі на грудзях - *Л. Л.*

[20] Гл: Jan Chryzostom Pasek. Pamietniki. opr. Roman Pollak. Warszawa: Panstwowy Instytut Wydawniczy, 1987.

французскія, нямецкія, англійскія, італьянскія і рускія кнігі.

Зборы спраў сягалі часоў Ягелонаў. Трымаў у сваіх руках друкі і дакументы нават з XVI ст. Самымі каштоўнымі ацалелымі кнігамі лічу: Volumina Legum[21], Соймавыя дыярушы, Літоўскія статуты, Статут Ласькага[22], гярбоўнікі Папроцкага і Нясецкага, старыя малітоўнікі ў драўляных вокладках, апраўленых у белую скуру і з пазалочанымі акуццямі, а таксама тэксты нашых пісьменнікаў Залатога веку і ўспаміны Яна Хрызастома Паска.

Падобна на тое, што кнігі польскіх пісьменнікаў былых стагоддзяў захоўваліся ў камплекце, але да мяне дайшлі адзінкавыя тамы творчасці Каханоўскага, Рэя, Фрыча-Маджэўскага, Гарніцкага, Бельскага, Кромера як па-польску, гэтак і на латыні. Не шмат засталося і ад кніг іншаземных пісьменнікаў таго часу, іхнія кнігі часцей былі напісаны на латыні.

Літаратурную творчасць XVII ст. найперш рэпрэзентавалі Жыццяпісы святых і Казанні Пятра Скаргі. У Казаннях запомнілася розніца ў тэкстах, напісаных у Кракаве, калі ён ужываў старапольскі канчатак "bych", як прамаўлялася ў Шлёнску ці ў Чэхіі, і ў Казаннях, напісаных у Варшаве.

Пасля пераносу сталіцы Жыгімонтам III, гэта значыць пасля 1596 г., Скарга пачаў ужываць ужо новыя формы канчаткаў "bym" і "bys".

Апрача Скаргі, ацалеў Пасак (“Мемуары”), Вацлаў Патоцкі (“Ogrod, ale nie plewiony, brog, ale co snop to inszego zboza, kram rozlicznego gatunku” і г. д.), Морштын і некалькі іншых, якіх ужо не памятаю. Кнігі гэтыя ўтрымлівалі прамовы і гавэнды, якія з сучаснага погляду належала б уважаць за байкі. Не раз аўтары змяшчалі розныя веды пра сусвет у звычайныя кнігі. У адной кнізе быў раздзел гістарычны - ён расказваў гісторыю да караля, які ў той час кіраваў, раздзел астранамічны - нават ў XVII ст. тут сцвярджалася, што Сонца абарочваецца вакол Зямлі, раздзел геаграфічна-легендарны, фізіялагічны - з апісаннямі хвароб і лекаў, кулінарных запісак і іншага. Самы сапраўдны "Ogrod plewiony".

Шмат старых кніг мела карычневыя скураныя вокладкі, кнігі былі надрукаваны на пергаментнай паперы вялікімі прыгожымі лацінскімі ці гатычнымі літарамі.

Хіба што, былі кнігі ўсіх польскіх аўтараў XVIII ст. і ўся французская літаратура эпохі асветніцтва ў арыгінальных выданнях. У бібліятэцы таксама знайшоў тамы Шэкспіра, Байрана і Уальда на англійскай мове, Расіна, Русо, Вальтэра, Бальзака і іншых па-французску, Шылера, Гётэ, Гейне, Канта і іншых па-нямецку, Пушкіна, Чэхава, Тургенева, Льва Талстога і іншых па-руску, і таксама кнігі па-італьянску.

Акрамя рэштказ былой багатай бібліятэкі, часткова захаваліся сямейныя архівы ўладальнікаў Ішчалны. Тое, што засталося, змяшчалася ў адным абабітым скурай куфры, які раней служыў багажнікам вялікай карэты, у якую ўпрагалася чацвёрка коней. Верагодна, архіў быў прыгатаваны для транспартавання, але вывезці яго не паспелі. Былі там дакументы, лісты і пісьмы ад 1500 года аж но да апошніх часоў, я працягваў захоўваць там і свае дакументы, датычныя маёмасці. Я далучыў тастамент Марыі Важынскай, судовы вырак, па якім Ішчална патрапіла да нас, іпатэчныя дакументы, акт падзелу маёнтка, даведкі аб перадачы зямлі асаднікам, даведкі аб выкананні спраў па тастаменце, умовы куплі-продажу лесу, парцаляцыі зямлі[23] і г.д.

Са старадаўніх актаў там былі прывілеі, наданні, патэнты, узнагароджанні, тастаменты, фундушы, дароўныя акты і акты падзелу зямлі, судовыя працэсы, выракі трыбунальскіх судоў з часоў трохкаралеўся, позвы, штрафы, рэабілітацыі, наказы, адозвы і гетманскія лісты, лісты канцлераў, ваяводаў, маршалкаў канфедэрацый, рускіх губернатараў, загады аб наборы рэкрутаў, пастановы рускіх судоў, маніфесты, скаргі, просьбы, заставныя лісты, а таксама векселі, рэестры, інвентары, каштарысы, рахункі, квіткі выплат, рэляцыі, нататкі, пратаколы з'ездаў сям'і (як напрыклад пратакол з'езду 12-ці мясцовых Лясковічаў падчас шлюбу Францішкі Ляскавічоўны і Антона Важынскага ў 1820 г.), генеалогіі, каштоўныя прыватныя лісты, якія адбіраліся на працягу стагоддзяў.

Як я ўжо пісаў, зніклі арыгіналы каралеўскіх наданняў і прывілеяў з навешанымі васковымі пячаткамі канцлера, і я не ведаю, што з імі сталася. Праўдападобна, цёткі Важынскія вывезлі іх разам з упрыгожаннямі і самымі каштоўнымі экзэмплярамі збораў.

Сярод пакінутых дакументаў некаторыя мелі аўтэнтычныя подпісы каралёў і малыя канцлерскія пячаткі, а іншыя подпісы і гербавыя пячаткі вядомых асобаў з допісамі: "Рукой сваёй".

Самыя старыя дакументы былі напісаны па-беларуску страславянскім алфавітам[24] (у часы Яна Ольбрахта[25], Аляксандра і Жыгімонта Старога). Тады час адлічваўся ад стварэння сусвету. На некаторых дакументах было напісана "Жыгімонт I, кароль польскі", але пераважна "Жыгімонт I, Міласцю Божай кароль Польскі ..." [26]. Пазнейшыя дакументы, з часоў Жыгі-

[21] Валюміна Легум (лац. Volumina Legum - збор законаў), шматтомны збор законаў, сеймавых пастаноў, прывілеяў і іншых заканадаўчых актаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы, Беларусі, Літвы і правабярэжнай Украіны з 1347 да 1793-1795. - *Л. Л.*

[22] Ян Лаські або (польск. Jan Laski, 1455-1531) - арцыбіскуп Гнезненскі і прымас Польшчы ў 1510-1531 гг. Меў вялікі ўплыў на дзяржаўныя справы і кіраваў складаннем статута Ласькага - першай кадыфікацыі польскага права. - *Л. Л.*

[23] Парцэляцыя - падзел зямлі на дробныя ўчасткі.

[24] У тэксце: *"byly pisane w jezyku bialoruskim pisownia staroslowianska"*. - *Л. Л.*

[25] Ян I Ольбрахт (Jan I Olbracht; 1459-1501) - польскі кароль з 1492 г. па 1501 г., трэці сын Казіміра IV Ягелончыка. - *Л. Л.*

[26] На тым месцы дзе аўтар паставіў тры кропкі заўсёды пісалася: *"і Вялікі князь ВКЛ"* - *Л. Л.*

монта Аўгуста былі ўжо напісаны лацінскім алфавітам, хоць і на беларускай мове - дзяржаўнай мове ВКЛ. Пасля пераносу сталіцы дзяржавы ў Варшаву дакументы пачалі пісацца таксама і па-польску. З поступам часу па-польску ўсё часцей і часцей, але ўсяроўна з дамешкам трасянкі. Толькі ў 1697 г. польская мова стала дзяржаўнай на тэрыторыі ВКЛ. Адзін з дакументаў, падпісаны Вялікім князем Літвы Аляксандрам, пачынаўся са словаў: *"Аляксандр, сам Гаспадар"* - такі тытул ужывалі Вялікія князі. ...

Усе дакументы і лісты былі калісьці старанна ўпарадкаваны, апісаны і пранумараваная. Было іх шмат, памятаю надпіс на адным з сшыткаў дакументаў № 1300. Як належыць, усе паперы адной справы ці адной тэматыкі сшываліся ў сшытак ядвабным шнурком.

Пераважна гэта былі судовыя працэсы ці дакументы, датычныя ўласнасці на нерухомасць. Да самых цікавых, якія былі сапраўдным адбіткам эпохі, належалі:

- Акты куплі-продажу ці даравання. У іх скрупулёзна выкананы ўсе юрыдычныя формулы і запісаны абавязкі бакоў, указана колькасць падданых, ці так званых "душ", пералічана, хто з іх агароднік, баброўнік, бортнік, рыбак, рымар і г. д.

Пералічваліся ўсе магчымыя гатункі зямель: пушчы, лясы, бары, палі, гароды, сенажаці, пашы, балоты і нават броды і "бабровыя гоны". Усе магчымыя сінонімы, якія акрэсліваюць факт пераходу ўласнасці, напрыклад прадае, даруе-аддае, зракаецца, перадае, робіць чын уласнасці і г. д.

Гэткія формулы ўжываліся таксама ў дакументах як на беларускай, гэтак жа і на польскай мовах. Былі яны напісаны гэтак дэталёва нават ў дробязях, каб не выклікаць магчымасці якой-небудзь неадпаведнасці. Напрыклад "бабровыя гоны" згадваліся нават тады, калі ў наяўнасці іх ужо не было, але яны калісьці меліся, ці наадварот, па прыродных умовах, маглі б з'явіцца ў будучыні.

Акты пачыналіся на ўзор каралеўскіх, з узгадвання персаналіі і тытула. Напрыклад: *"Я, Юзаф Валь, пан Ішчалны, харунжы гарадзенскі і староста фрэйданскі, гэты актам аб'вяшчаю ..."*.

- Дакументы судовых працэсаў, якія цягнуліся гадамі і нават дзесяцігоддзямі, з позвамі, эксплікацыямі, рэплікамі, выракамі. Часта пра важныя маёмасныя справы, але часамі пра дробязі, як, напрыклад, працэс паміж маім прадзедам Каралем Лясковічам і магутным суседам Хадкевічам з Вялікага Мажэйкава аб межах сенажацяў. Спрэчнай сенажаццю з'яўляўся луг Раманішкі, які ў выніку быў палюбоўна падзелены паміж абодвума дварамі, пры гэтым як мяжа быў выкапаны глыбокі роў, які потым яшчэ сто гадоў размяжоўваў тут Вярашчакаў і Лясковічаў.

- Тастаменты, з іх самым цікавым быў тастамент Яна Паўпяты ад 1667 г., пра яго я напішу ў раздзеле "Уладальнікі Ішчалны".

- Рэабілітацыі. Памятаю толькі адну, на беларускай мове, выдадзеную рыцару, які вярнуўся з татарскай няволі.

- Спісы даўжнікоў, застаўныя акты, маніфесты. Сярод іншых, знайшоў даўгавую запіску Білевічам, дадзеную кімсьці з Пілсудскіх на Жмудзі. Паказаў гэты дакумент маршалу Пілсудскаму і атрымаў падзяку ад яго цывільнай канцылярыі. Таксама меўся маніфест апошняга віленскага ваяводы, князя Міхала Геранімa Радзівіла, як апекуна малагадовага Дамініка Радзівіла, да ўсіх, каму застаўся вінен Караль Пане Каханку. Пасля яго засталося шмат даўгоў, і спіс крэдытораў заняў некалькі старонак. Маніфест быў надрукаваны ў нясвіжскай друкарні. Караль Лясковіч з Ішчалны меў у заставе 2 радзівілаўскія фальваркі: Смолач і Бабры, з якіх Бабры набыў ва ўласнасць.

### Інвентары

Самы цікавы дакумент гэтага кшталту быў напісаны ў 1743 г. Янам Валем: *"Рэестр усёй маёй рухомасці, кляйнотаў, сукняў, футраў, срэбра, волава (посуду) і начынняў, а таксама вупражы і коней, якія здатны да ваеннай патрэбы"*. Думаю, што гэты рэестр быў зроблены падчас перасялення ў новапабудаваны дом. Кожны прадмет падрабязны апісаны.

**У спісе кляйнотаў** звярталі на сябе ўвагу залатыя гузікі да плашча, падбітага футрам, і кунтуша, запанкі, завушніцы, бранзалеты, розныя каштоўныя камяні і перлы без аправы.

**У спісе начыння** фігуравалі вялікія, аздобленыя, срэбныя келіхі, малыя келіхі і кілішкі, алавяныя паўміскі, збаны, талеркі, медныя катлы.

**У спісе ўбранняў** самымі цікавымі былі невядомыя зараз гатункі тканін, іх колеры і дробязныя заўвагі пра стан адзежы. У раздзеле пра "Кунтушы і кунтушыкі" чытаем: *"...у гэтага кунтуша бракуе двух гузікаў"*, наступны *"паношаны"* і г. д. Было шмат жупаноў, жаночых спадніц, індэракаў[27], футраў і каптуроў з футра. Футры куніцы, собаля, лісы, а таксама мядзведзя і рысі (па адной). Скуры розных звяроў, уключна нават з сарокай.

**У спісе "розных тканін"** прысутнічаюць ядвабныя, атласныя, злататканыя тканіны, а таксама дываны, турэцкія малітоўнікі, кілімы і пяць слуцкіх паясоў.

**У "Рэчах да ваеннай патрэбы"** апісана ўсялякая вупраж, сёдлы і зброя ... Найлепей захаваўшыся да XX ст. і самы прыгожы камплект вупражы для каня тастаментам Марыі Важынскай быў запісаны разам са слуцкім пасам і карабеляй "Першаму Начальніку незалежнай Польскай дзяржавы".

**У калекцыі зброі** Валя меліся: карабелі, сярод якіх самай прыгожай была ўзгаданая вышэй, яна зроблена ў XVI ст., доўгія мячы, шаблі, палашы, буздыганы, дзіды, калчаны, пісталеты, ручніцы, кальчугі, шоламы, панцыры, панцырныя рукавіцы, налакотнікі, накаленнікі, шпоры і іншае.

[27] Верхняя спадніца, андарак - *Л. Л.*

Да маіх часоў датрывала толькі рэшта збораў. Пасля таго, як аддалі Пілсудскаму, запісаныя яму рэчы, у Ішчалне засталіся толькі: адна кальчуга, пара рукавіц, у якіх скура пад сталёвымі пласцінамі ўжо збуцвела, пагнуты шолам, адна вялікая шпора і частка налакотніка.

**Коні.** Шмат месца ў рэестры Ян Валь прысвяціў сваім двум табунам коней: арабскіх паўкровак і польскіх. Падзяляе коней на:

а) Жарабцы, мерыны, малыя рабочыя конікі, кабылы, маладыя кабылы.

б) Старых і маладых жарабцоў, маткі табуна, коні аб'езджаныя, трох- і двухгодкі, перазімкі і моладзь.

в) Дрыганты, цугавая коні (цуганты), хуткія коні (цэкуны), інаходцы (шляпакі), коні для лёгкіх ездакоў, паштовыя і рабочыя. Масць гэтых коней рэестр не вызначаў. Не было ніякіх згадак пра лоўчых птушках. Відочна, Валь не быў аматарам такога палявання. Не згадваюцца і сабакі, але іх павінна было быць шмат.

Пры самым канцы рэестра коратка згадваюцца кнігі. "Кніг розных ...". Не памятаю колькасці, але гэты спіс быў невялікі.

**- Дакументы фінансава-эканамічныя:** вэкселі, рахункі, каштарысы, спісы будаўнічых матэрыялаў, справаздачы адміністратараў, дарадцаў і эканомаў. Тут мяне найбольш цікавілі дакументы, якія датычылі пабудовы Каралем Лясковічам жылога дома. Рахункаў пабудовы Валямі касцёла і скарбца альбо не было, альбо яны не захаваліся.

**- Лісты.** Гэты раздзел архіва найбольш мяне цікавіў. На першае месца, відочна, я ставіў каралеўскія лісты з арыгінальнымі, гэтак дарагімі сэрцу, подпісамі каралёў. Гэтыя лісты мелі малыя сургучныя канцылярскія пячаткі.

З усіх каралёў самы доўгі тытул ужываў Уладзіслаў IV, а менавіта: *"З Божай ласкі Уладзіслаў IV, кароль польскі, вялікі князь літоўскі, прускі, жмудскі, мазавецкі, інфляндскі, смаленскі, чарнігаўскі, кіеўскі, валынскі etc.; дзедзічны кароль шведскі, гоцкі і вандальскі, абраны цар маскоўскі"*. Пісалася гэтак перад казацкашведскім патопам, калі Рэч Паспалітая дасягнула ўсходнімі межамі да Вязьмы і Харкава, калі яшчэ не мінулі часы яе максімальнай магутнасці.

Як падчас набажэнства, чытаў я гэтыя подпісы: *Sigismundus Rex, Sigismundus - Augustus Rex, Stefanus Rex* і г.д. І сярод іх адзіны па-польску: *Ян III - кароль.* Гэта подпіс Яна Сабескага, героя з-пад Вены.

Лісты, скіраваныя да падданых, мелі розны змест. Найчасцей гэта былі адказы ў справах, скіраваных да трона. Пасля каралеўскіх лістоў, наступныя па іерархіі стаялі лісты гетманаў, лісты маршалкаў канфедэрацый і ваяводаў, царскія ўказы і лісты расійскіх губернатараў.

Чытаючы гэтыя афіцыяльныя дакументы рознага зместу, не мог пазбавіцца ад уражання, што друкарка для пісьма пазбавіла ўрадавую карэспандэнцыю старадаўняй прыемнасці, прынізіла і забрала душу. Нават лісты губернатараў з боку гледжання пачцівасці стаялі вышэй, чым урадавыя лісты адроджанай пасля 1918 г. Польшчы.

За афіцыяльнымі лістамі ішлі лісты суседзяў, братоў-шляхты. Яны заўсёды утрымлівалі тытул адрасата і заўсёды заканчваліся зваротам *"Ваш найніжэйшы слуга"*.

У эпоху Вазаў і Сабескага шмат трасянкі. Лісты не адрасаваліся *"do kogos"*, а толькі *"komus"*.

Да XIX ст. лісты звычайна не мелі канвертаў і замыкаліся сургучнай пячаткай з адбіткам сыгнета. З першай паловы XIX ст. з'явіліся канверты, але яшчэ без паштовых марак.

Пры канцы гэтага раздзела трэба згадаць пра лісты ад знаных у гісторыі, а яшчэ больш з трылогіі Сянкевіча ці кніг Крашэўскага, асоб.

Лісты з 1500-га года збіралі ўсе ўладальнікі Ішчалны ... Ацалела некалькі лістоў кароннага маршалка з часоў Жыгімонта Старога - Пятра Кміты, Вішнявецкіх (сярод іх два лісты ад Яромы), ад Януша, Багуслава і іншых Радзівілаў, ад Сапегаў, ад гетмана Караля Хадкевіча, некалькі лістоў Масальскіх, якім належалі Веркі пад Вільняй, уладальнікаў Слоніма і Іўя Агінскіх, Білевічаў, Трызнаў, Саламарэцкіх, аршанскага харунжага Якуба Кміціча. Дарэмна шукаў лісты Андрэя Кміціча - не знайшоў, бо Андрэй жыў толькі ў фантазіі Сянкевіча.

Захоўваліся лісты як вядомых у Краі можнаўладцаў: Патоцкіх, Замойскіх, Сангушкаў і іншых, гэтак і іншых, цалкам ужо невядомых.

У адрозненні ад сваіх продкаў і папярэднікаў, сёстры Важынскія мелі вялікую карэспандэнцыю з замежнымі сябрамі, у асноўным на французскай мове, сустракаліся таксама лісты па-нямецку і па-англійску.

**Лёс гістарычных збораў**

Ваенныя спусташэнні і масавы выезд з Крэсаў прывялі да таго, што каштоўнасць падобных збораў у розныя часы была рознай. Перад 1-й Сусветнай вайной па вялікіх дварах, расцярушаных па абшарах былой Рэчы Паспалітай ад Дняпра да нямецкай мяжы і ад Інфлянтаў і Вярміі да Карпатаў і Чорнага мора, знаходзілася шмат гістарычных дакументаў. Прапаную пачытаць пра гэта выдатна напісаныя мемуары Гіпаліта Корвін-Мілеўскага "Успаміны пра семдзесят гадоў" *. Першая вайна і руская рэвалюцыя прынеслі да скасавання польскай культуры на ўсіх абшарах даўняй Рэчы Паспалітай на ўсход ад мяжы, праведзенай Рыжскай дамовай.

Страты пасля 2-й Сусветнай вайны былі страшэнныя. Тое, што ацалела пасля гэтага пагрому, зараз мае найвышэйшую каштоўнасць. Мае ж акалічнасці скалаліся гэтак, што я не змог уратаваць нічога акрамя ... памяці. Набліжаюцца мае 70 гадоў, хутка згасне і памяць, таму лічу сваім абавязкам напісаць гэты тэкст.

*(Працяг у наступным нумары.)*

---

* Hipolit Korwin-Milewski. Siedemdziesat lat wspomnien (1855 - 1925), *рэд.*

# *Найбольш значныя гістарычныя выданні апошняга часу*

У Магілёве выйшаў зборнік навуковых артыкулаў удзельнікаў XII Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць".






У менскім выдавецтве "Белпрынт" пабачыла свет кніга Станіслава Крэпскага і Арыны Клімовіч "Тапонімы роднага краю і побыт яго насельнікаў".




У гарадзенскім выдавецтве "ЮрСаПрынт" пабачыла свет кніга Івана Будніка "Вяртанне з забыцця". Наклад 90 асобнікаў.




У Менску ў выдавецтве Зміцера Коласа выйшла кніга Сымона Барыса "Беларускі этнаграфічны тлумачальны слоўнік", 218 с.







У Менску ў выдавецтве "Беларуская навука" выйшла кніга Алеся Марціновіча "Гісторыя праз лёсы", Т. 1. 336 ст. Наклад - 700 асобнікаў.

У Менску ў выдавецтве "Беларуская навука" выйшла кніга Алеся Марціновіча "Гісторыя праз лёсы", Т. 2. 352 ст. Наклад - 700 асобнікаў.



***Віктар Кудла. Абеліск.*** *Алей.*